# КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА БЕЛАРУСІ

Беларускі дзяржаўны універсітэт
Кафедра крымінальнага права

# КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА БЕЛАРУСІ

## (закон, злачынства, адказнасць)

Навучальны дапаможнік
Пад рэдакцыяй дацэнта А.У.Баркова

Мінск
1997

УДК 343(476) (075.8)
ББК 67.99(4 Бел)8я 73
К 85

ББК 67.99(2)8я 73

А.У. Баркоў, І.А.Грунтоў, Т.І. Доўнар і інш.: Навуч. дапам.

К 85 Крымінальнае права Беларусі: (закон, злачынства, адказнасць): Навуч. дапам./ А.У. Баркоў, І.А. Грунтоў Т.І. Доўнар і інш.; Пад рэд. А.У. Баркова. – Мн.: Завігар,1997.–...с.

ISBN 985–6187–06–0.

У навучальным дапаможніку на падставе дзеючага крымінальнага заканадаўства з улікам перспектыў яго развіцця аналізуюцца важнейшыя раздзелы агульнай часткі айчыннага крымінальнага права: вучэнні аб крымінальным законе, злачынстве, крымінальнай адказнасці. Змешчаны кароткі нарыс гісторыі крымінальнага права Беларусі.
Дапаможнік разлічаны на студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў юрыдычных навучальных устаноў, а таксама на практычных работнікаў і асоб, якія самастойна вывучаюць права.

ББК 67.99(4 Бел) 8а 73

ISBN 985–6187–06–0

© Калектыў аўтараў, 1997

# Ад аўтараў

Шаноўны чытач! Гэта кніга – першы навучальны дапаможнік па крымінальнаму праву Беларусі, які выдадзены на беларускай мове. Першы ў гісторыі айчыннай юрыдычнай адукацыі!

Вядома, што аўтары сутыкнуліся з шэрагам цяжкасцей пры распрацоўцы крымінальна-прававой тэрміналогіі на беларускай мове. Былі выкарыстаны падыходы, якія заложаны ў Юрыдычным энцыклапедычным слоўніку 1992 г. выдання, а таксама падыходы, якія знайшлі адлюстраванне ў сучасным крымінальным заканадаўстве. Але шмат катэгорый і паняццяў азначаны па беларуску ўпершыню.

Мы выказваем асаблівую падзяку за дапамогу па пытаннях ужывання беларускай мовы доктару філалагічных навук, прафесару Любові Адамаўне Антанюк. Рэдактар і аўтары шчыра дзякуюць за тэхнічную дапамогу ў падрыхтоўцы кнігі Святлане Шабуневіч.

Паважаны чытач! Аўтарскі калектыў будзе вельмі ўдзячны Вам за прапановы і заўвагі адносна формы і зместу навучальнага дапаможніка. Накіроўвайце іх на кафедру крымінальнага права Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

# Глава I

# ПАНЯЦЦЕ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА

## §1. Прадмет, задачы, прынцыпы і сістэма крымінальнага права

Крымінальнае права як адна з галін дзеючай сістэмы права ўяўляе сабой сукупнасць устаноўленых дзяржавай прававых норм, якія замацоўваюць і рэгулююць пэўныя грамадскія адносіны ў адпаведнасці з патрабаваннямі і інтарэсамі грамадства. Аднак у адрозненне ад іншых галін права (канстытуцыйнага, грамадзянскага, працоўнага і г.д.) сацыяльнае прызначэнне крымінальнага права ў жыцці грамадства асаблівае. Яно забяспечвае ахову грамадства і яго членаў ад злачынных пасягненняў шляхам прызнання адпаведных грамадска небяспечных дзеянняў у якасці злачынных і забароны такіх дзеянняў пад пагрозай крымінальнай адказнасці за іх учыненне. У сваёй сукупнасці нормы крымінальнага права вызначаюць, якія грамадска небяспечныя дзеянні ў тым ці іншым грамадстве з'яўляюцца злачынствамі і якім мерам уздзеяння крымінальнай адказнасці падлягаюць асобы за ўчыненне адпаведных злачынстваў. Таму асноўная функцыянальная асаблівасць крымінальнага права ў тым, што яно ахоўвае ад злачынных пасягненняў пазітыўныя грамадскія адносіны, якія рэгулююцца нормамі іншых галін права. Пры гэтым ахова грамадскіх адносін зусім не азначае, што крымінальнае права тым самым і змястоўна рэгулюе дадзеныя адносіны. Крымінальнае права толькі забараняе пад пагрозай крымінальнай адказнасці ўчыненне злачынных дзеянняў, якія ўяўляюць небяспеку для функцыянавання грамадскіх адносін, падтрымліваемых грамадствам і дзяржавай, у тым ліку і шляхам іх пазітыўна–прававога рэгулявання. Грамадскія адносіны, якія ахоўваюцца крымінальным правам, складаюць прадмет пазітыўнага

прававога рэгулявання іншых галін права або наогул рэгулююцца агульнапрынятымі правіламі супольнага жыцця. Так, нормы канстытуцыйнага права рэгулююць адносіны, якія звязаны з дзяржаўным уладкаваннем, функцыянаваннем палітычнай і эканамічнай сістэм грамадства, са становішчам чалавека, яго правамі і абавязкамі; грамадзянскае права - маёмасныя адносіны (у тым ліку адносіны ўласнасці), а крымінальнае права ахоўвае гэтыя адносіны, прызнаючы адпаведныя дзеянні, якія ўяўляюць небяспеку для грамадства, усталяванага ў ім канстытуцыйнага ладу, для грашовай і крэдытнай сістэм, уласнасці, у якасці злачынстваў.

Ахову грамадства ад злачынных пасягненняў крымінальнае права выконвае шляхам усталявання і рэгулявання ахавальных праваадносін. Прадмет крымінальнага права складаюць ахавальныя праваадносіны двух відаў: так званыя агульныя ахавальныя праваадносіны і канфліктныя ахавальныя праваадносіны.

Наяўнасць агульных ахавальных крымінальна–прававых адносін абумоўлена ўстанаўленнем крымінальным законам забароны пад пагрозай крымінальнай адказнасці на ўчыненне злачынных дзеянняў. У сувязі з гэтым, з моманту прыняцця і ўступлення крымінальнага закону ў сілу паміж дзяржавай (яе адпаведнымі органамі) і грамадзянамі ўзнікаюць прававыя адносіны на глебе выканання патрабаванняў крымінальнай забароны на ўчыненне злачынных дзеянняў. Адзначаныя ахавальныя крымінальна–прававыя адносіны носяць агульны характар, паколькі датычацца кожнага чалавека, які знаходзіцца ў сферы дзеяння дадзенага крымінальнага закону. У межах агульных ахавальных крымінальна–прававых адносін рэалізуецца вельмі важны для кожнага грамадзяніна комплекс правоў і абавязкаў у адносінах да дзяржавы, які мае сваёй мэтай забяспечыць: па–першае, выкананне крымінальна–прававой забароны шляхам пагрозы крымінальнай адказнасцю за яе парушэнне; па–другое, крымінальна–прававую недатыкальнасць кожнага, хто дзейнічае і пры гэтым не парушае патрабаванняў крымінальнага закону.

Крымінальнае права таму і права, што яно ўсталёўвае дапушчальную меру свабоды грамадзяніна шляхам вызначэння ў сваіх нормах таго, што забаронена пад пагрозай крымінальнай адказнасці і што не забаронена.

Крымінальна-прававая забарона злачыннага дзеяння пад пагрозай крымінальнай адказнасці мае сваёй мэтай прадухіліць учыненне злачынных дзеянняў. У тым жа выпадку, калі асоба, нягледзячы на такую забарону, учыняе злачынства, то з гэтага моманту паміж дзяржавай і асобай, якая ўчыніла злачынства, узнікаюць канфліктныя ахавальныя праваадносіны на глебе прыцягнення вінаватага да крымінальнай адказнасці.

Доўгі час у навуцы крымінальнага права існаваў погляд, што выкананне патрабаванняў крымінальна–прававой забароны (устрыманне грамадзян ад учынення злачынных дзеянняў) ажыццяўляецца па–за праваадносінамі. Да прадмета крымінальна–прававога рэгулявання адносілі толькі канфліктныя ахавальныя праваадносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з учыненнем злачыннага дзеяння паміж асобай, якая ўтварыла гэтае дзеянне, і дзяржавай. Аднак адзначаныя праваадносіны абумоўлены наяўнасцю агульных ахавальных праваадносін і фактычна ўзнікаюць у выніку парушэння апошніх.

Асаблівасць крымінальнага права заключаецца таксама ў метадзе, з дапамогай якога яно ўсталёўвае і рэгулюе ахавальныя праваадносіны, падтрымлівае нарматыўнасць і агульнаабавязковасць крымінальна–прававой забароны. Такім метадам з'яўляецца нарматыўна прадугледжаная ў крымінальным праве пагроза крымінальнай адказнасці, а таксама рэальнае прымяненне яе ў выпадках учынення злачынства.

Такім чынам, **крымінальнае права** ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, якія ўстанаўліваюць з мэтай аховы грамадства і ўсталяванага ў ім правапарадку забарону на учыненне грамадска небяспечных дзеянняў пад пагрозай крымінальнай адказнасці за іх здзяйсненне і ў сувязі з гэтым вызначаюць, якія дзеянні з'яўляюцца злачынствам і якія меры крымінальнай адказнасці павінны прымяняцца да асоб

за ўчыненне адпаведных злачынстваў.

Крымінальнае права па свайму паходжанню і прызначэнню мае сацыяльны характар. Як нарматыўна–публічная сістэма прававой аховы грамадства ад злачынных пасягненняў крымінальнае права паявілася з узнікненнем дзяржавы. Ва ўмовах падзелу грамадства на антаганістычныя класы (перыяд рабаўладальніцкага і феадальнага, ранні перыяд капіталістычнага грамадства, а таксама пры аўтарытарных, дыктатарскіх рэжымах кіравання грамадствам) крымінальнае права набывае класавы характар. Яно становіцца сродкам, з дапамогай якога кіруючы апарат дзяржавы абараняе інтарэсы эканамічна або палітычна пануючага кола грамадства. Аднак трэба адзначыць, што крымінальны закон нават у перыяд адкрытага прыгнечання аднаго класа другім (эканамічна ці палітычна пануючым) выяўляе не толькі вузкакласавыя, але і агульначалавечыя інтарэсы. Без гэтага немагчыма ніякая чалавечая супольнасць, а таму і класавае панаванне. Замацаванне ў крымінальным праве ў якасці прыярытэтных аб'ектаў аховы агульных чалавечых каштоўнасцей – аб'ектыўная неабходнасць, вынік гістарычнага развіцця чалавечай супольнасці і цывілізацыі. Для крымінальнага права большасці сучасных дэмакратычных краін характэрна яго разуменне і ацэнка сацыяльнай ролі з агульначалавечых пазіцый, паколькі значная большасць злачынстваў ні аб'ектыўна, ні суб'ектыўна не мае класавага характару, учыняецца не па класавых матывах, а па матывах, якія супярэчаць агульным уяўленням грамадства аб маралі, этыцы, паняцці гонару і г.д. Аб'ектам злачынных пасягненняў у канчатковым выніку заўсёды з'яўляецца чалавек з яго індывідуальнымі патрабаваннямі і інтарэсамі, правамі і абавязкамі, якія ў грамадскай супольнасці набываюць характар грамадскіх адносін і ў залежнасці ад значнасці гэтых адносін для існавання самаго чалавека і чалавечай супольнасці ставяцца пад крымінальна–прававую ахову дзяржавы.

Крымінальнае права, як і іншыя з'явы чалавечай цывілізацыі, адлюстроўвае ўзровень эканамічнага, палітычнага, культурнага і духоўнага развіцця грамадства. На першых

стадыях развіцця грамадства і дзяржаўнасці крымінальнае права адкрыта ахоўвала класавыя інтарэсы (Законы Ману, Руская праўда, Статуты Вялікага княства Літоўскага). Аднак неабходнасць падтрымання стабільнасці ў грамадстве, забеспячэння яго небяспекі вымушала дзяржаву адлюстроўваць у праве наогул і ў крымінальным праве, у прыватнасці, агульнасацыяльныя патрабаванні і інтарэсы (ахова здароўя і жыцця чалавека, прыроднага асяроддзя, забеспячэнне знешняй бяспекі грамадства і належнага эканамічнага і грамадскага парадку, барацьба з прафесійнай і арганізаванай злачыннасцю).

Па меры дасягнення грамадствам пэўнага ўзроўню цывілізаванасці, удасканалення дзяржаўна–палітычных структур, росту легітымнасці палітычнай улады крымінальнае права павінна і будзе набываць характар агульнаправавога сродку барацьбы са злачыннасцю як з'явай, якая ўяўляе сабой самавольства канкрэтнай асобы (асоб) адносна агульнасацыяльных каштоўнасцей чалавечай цывілізацыі. Рэформа крымінальнага права, якая праводзіцца ў Заходняй Еўропе і краінах СНД, мае менавіта такі накірунак. Ахова чалавека, яго законных правоў і інтарэсаў, прававога парадку ў грамадстве з'яўляюцца галоўнымі ў Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь (далей замест слоў "Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь" ужываюцца скарачэнні "КК Беларусі" ці "КК"). Усе іншыя аб'екты крымінальна–прававой аховы (уласнасць, палітычны лад, сістэма кіравання і г.д.) разглядаюцца крымінальным законам у кантэксце інтарэсаў канкрэтнага чалавека і грамадскай супольнасці, маюць сваёй мэтай забяспечыць дасягнуты ўзровень згоды і кампрамісу ў грамадстве.

Сацыяльнае прызначэнне крымінальнага права ў грамадстве вызначаецца яго задачамі, якія непасрэдна сфармуляваны ў арт.1 КК Беларусі. У гэтым артыкуле гаворыцца: "Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь мае задачай абарону жыцця і здароўя чалавека, яго правоў і свабод, канстытуцыйнага ладу, дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, уласнасці, прыроднага асяроддзя, устаноўленага правапа-

радку ад злачынных замахаў. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь садзейнічае папярэджванню злачынных замахаў, выхаванню грамадзян у духу выканання законаў Рэспублікі Беларусь".

Наяўнасць сістэмы аховы грамадства ад грамадсканебяспечных пасягненняў аб'ектыўная неабходнасць для ўсякай грамадскай супольнасці. Функцыя аховы грамадства, існуючага ў ім эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага парадку ўскладаецца на дзяржаву, сістэму яе праваахоўных органаў. Крымінальнае права з'яўляецца для дзяржавы тым прававым сродкам, які выкарыстоўваецца ёю для аховы ўсталяваных у грамадстве адносін.

Ахавальная задача – гэта асноўная сацыяльна–вызначальная функцыя крымінальнага права. Для ажыццяўлення гэтай задачы Крымінальны кодэкс Беларусі вызначае, якія грамадсканебяспечныя дзеянні з'яўляюцца злачынствамі, замацоўвае падставы і ўмовы крымінальнай адказнасці, устанаўлівае пакаранні і іншыя меры крымінальнай адказнасці, што могуць быць прыменены да асоб, учыніўшых злачынствы, а таксама прымусовыя меры медыцынскага і выхаваўчага характару ў адносінах да асоб, учыніўшых грамадска небяспечныя дзеянні.

Ахавальную задачу крымінальнае права выконвае шляхам усталявання і рэгулявання асобных грамадскіх адносін, якія па свайму зместу і накіраванасці маюць ахавальны характар, паколькі ўзнікаюць у сувязі з устанаўленнем пад пагрозай крымінальнай адказнасці забароны на учыненне злачынных дзеянняў (агульныя ахавальныя праваадносіны), а таксама адносін, якія ўзнікаюць у сувязі з учыненнем злачыннага дзеяння і магчымым прыцягненнем адпаведнай асобы да крымінальнай адказнасці (канфліктныя ахавальныя праваадносіны).

Крымінальнае права не можа выконваць сваю ахавальную задачу інакш, як праз сістэму прававых адносін і іх адпаведнага рэгулявання. Задачы аховы грамадства ад злачынных пасягненняў і рэгуляванне так званых ахавальных праваадносін існуюць і рэалізуюцца побач і адначасова.

Крымінальнае права, вызначаючы найбольш небяспечныя для грамадства дзеянні ў якасці злачынстваў і забараняючы іх учыненне пад пагрозай крымінальнай адказнасці, безумоўна, выконвае і задачу папярэджвання злачынных пасягненняў, выхавання грамадзян у духу выканання патрабаванняў устаноўленага ў грамадстве правапарадку. Задача папярэджвання злачынных пасягненняў ажыццяўляецца шляхам грамадскага і дзяржаўнага асуджэння на падставе норм крымінальнага закону грамадска небяспечных дзеянняў як злачынстваў; забеспячэннем непазбежнасці адказнасці тых, хто, нягледзячы на пагрозу крымінальнай адказнасці, учыніў злачынства, яе справядлівасцю, адпаведнасцю крымінальнай забароны сацыяльным умовам і маральнаапраўданым пачуццям грамадства.

Сутнасць і змест крымінальнага права вызначаюцца прынцыпамі, на якіх грунтуецца сістэма прававых норм, інстытутаў, мер крымінальнай адказнасці як прававых сродкаў барацьбы са злачыннасцю. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь грунтуецца на прынцыпах законнасці, роўнасці грамадзян перад законам, непазбежнасці адказнасці, асабістай і вінаватай адказнасці, справядлівасці, гуманізму і дэмакратызму. Адзначаныя прынцыпы вызначаюць адпаведнае становішча і змест не толькі цяперашняга крымінальнага закону, яго разуменне і ўжыванне, але і характар заканадаўчай дзейнасці ў галіне крымінальнага права наогул.

**Прынцып законнасці** ў крымінальным праве ўяўляе сабой наступнае:

1) Сістэма прававой забароны грамадска небяспечных дзеянняў у якасці злачынстваў і ўстанаўленне крымінальнай адказнасці за іх учыненне могуць быць рэалізаваны толькі шляхам прыняцця адпаведнага закону (крымінальнага кодэкса) заканадаўчым органам дзяржавы. Больш таго, у арт.2 КК замацавана, што гэты кодэкс з'яўляецца адзіным крымінальным законам, які дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Ніякія іншыя законы, пакуль яны не ўключаны ў КК, не могуць вызначаць злачыннасці адпаведных дзеянняў і ўжывацца непасрэдна.

2) Злачынным можа быць прызнана толькі дзеянне, якое

прама прадугледжана ў якасці такога ў крымінальным законе. Аналогія пры вызначэнні злачыннасці дзеяння недапушчальная. У сувязі з адзначаным, у ч.2 арт.3 КК Беларусі гаворыцца: "Ніхто не можа быць прызнаны вінаватым ва ўчыненні злачынства, а таксама падвергнуты крымінальнаму пакаранню інакш, як па прыгавору суда і ў адпаведнасці з законам". Наяўнасць учынення злачынства, характар крымінальнай адказнасці, магчымасць і выпадкі вызвалення злачынца ад крымінальнай адказнасці вызначаюцца толькі крымінальным законам.

**Прынцып роўнасці грамадзян перад законам** азначае, што пры вырашэнні пытання аб злачыннасці адпаведнага дзеяння дзяржава ўлічвае перш за ўсё агульнасацыяльныя інтарэсы, а не пэўныя інтарэсы канкрэтных груп і колаў грамадства, а прыняты крымінальны закон і прадугледжаная ім крымінальная адказнасць ужываюцца ва ўсіх выпадках учынення асобай злачынства незалежна ад яе паходжання, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, палітычных перакананняў, полу, адукацыі, мовы, адносін да рэлігіі, роду і характару заняткаў, месца жыхарства.

**Прынцып непазбежнасці адказнасці** з пункту гледжання крымінальнага закону замацоўваецца: па–першае, у сістэме прававых норм і інстытутаў, якія накіраваны на стымуляванне дзейнасці па раскрыццю злачынстваў або на спыненне злачыннай дзейнасці; па–другое, у наяўнасці ў крымінальным законе альтэрнатыўных пакаранню мер рэалізацыі крымінальнай адказнасці, дапушчальнасці вызвалення ад яе толькі ў прадугледжаных крымінальным законам выпадках, калі вінаваты можа быць выпраўлены мерамі ўздзеяння іншага характару. Прынцып непазбежнасці крымінальнай адказнасці рэалізуецца і шляхам устанаўлення выключна дакладных фармулёвак пры вызначэнні зместу злачынных дзеянняў, выключэннем магчымасці іх неадназначнага разумення.

**Прынцып асабістай адказнасці** азначае, што да крымінальнай адказнасці можа быць прыцягнута толькі асоба, якая

сваімі дзеяннямі ўчыніла злачынства ў якасці выканаўцы або саўдзельніка. Крымінальная адказнасць не можа ўскладацца на членаў сям'і злачынца, яго сваякоў, сваімі мерамі яна ўздзейнічае толькі на асобу злачынца, абмяжоўвае яго асабістыя або маёмасныя правы.

**Прынцып вінаватай адказнасці** заключаецца ў тым, што наяўнасць віны асобы ва ўчыненні злачыннага дзеяння – суб'ектыўная падстава для крымінальнай адказнасці. Якое б цяжкае па грамадска небяспечнаму выніку дзеянне ні ўчыніла асоба, яна не падлягае крымінальнай адказнасці, калі не ўстаноўлена яе віна ва ўчыненні дадзенага злачынства. Прынцып суб'ектыўнага стаўлення – краевугольны камень, на якім грунтуецца інстытут крымінальнай адказнасці.

**Прынцып справядлівасці** адпаведна патрабуе ад заканадаўчых і праваахоўных органаў замацавання і ажыццяўлення такой сістэмы аховы грамадства ад злачынных пасягненняў шляхам пагрозы і ўжывання крымінальнай адказнасці, якая не супярэчыла б маральнаапраўданым пачуццям чалавека, агульначалавечаму ўяўленню аб дабры і зле, цывілізаванаму ўзроўню свабоды, а ўскладаемая на злачынца крымінальная адказнасць адпавядала б цяжкасці ўчыненага злачынства і ступені віны. З гэтай мэтай Крымінальны кодэкс Беларусі ўстанаўлівае дастаткова разнастайную сістэму мер уздзеяння крымінальнай адказнасці (ад асуджэння без прымянення пакарання да асуджэння з пазбаўленнем волі).

**Прынцып гуманізму** крымінальнага права выяўляе адпаведныя адносіны да чалавека як аб'екта крымінальна–прававога ўздзеяння, з аднаго боку, і як аб'екта крымінальна–прававой аховы, з другога. Пры гэтым у другім сваім значэнні праблема гуманізму ў крымінальным праве павінна атрымаць больш адметнае выражэнне. Крымінальны закон павінен аддаваць перавагу чалавеку, яго правам і інтарэсам як прыярытэтным аб'ектам крымінальна–прававой аховы. Гэта зафіксавана ў вызначэнні задач крымінальнага закону, паняцця неабходнай абароны, фармулёвак адпаведных відаў злачынстваў.

Што датычыцца гуманізму мер крымінальна–прававога

ўздзеяння, то з іх выключаны меры, якія зневажаюць чалавечую годнасць або маюць па свайму характару пакутлівы накірунак. У дадзеным значэнні прынцып гуманізму крымінальнага права вызначаецца мэтамі крымінальнай адказнасці, відамі, памерамі і правіламі ўжывання пакарання.

**Прынцып дэмакратызму** ўяўляе сабой сістэму дэмакратычных прыярытэтаў і патрабаванняў, якія павінны заўсёды захоўвацца пры вырашэнні пытанняў крыміналізацыі грамадска небяспечных дзеянняў. Крымінальны закон не павінен абмяжоўваць дапушчальныя межы чалавечай свабоды, дзейнасць дэмакратычных інстытутаў грамадства, патрабаваць ад чалавека дзеля грамадскіх інтарэсаў пад пагрозай крымінальнай адказнасці таго, што супярэчыць яго прыродным пачуццям (напр., устанаўліваць крымінальную адказнасць за адмову бацькоў абвінавачанага ад дачы паказанняў). Прынцып дэмакратызму патрабуе наяўнасці альтэрнатыўных крымінальнай адказнасці мер уздзеяння, сістэмы грамадскага ўладкавання і выхавання асоб, якія былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за ўчыненне злачынства.

Сістэма прававых норм, якія складаюць змест крымінальнага права, падзяляецца на дзве часткі – Агульную і Асаблівую. Такі падзел крымінальнага права – вынік яго гістарычнага развіцця, абагульнення вопыту і практыкі прымянення норм крымінальнага права. У працэсе законатворчасці ў галіне крымінальнага права паступова пачалі вылучацца нормы, маючыя абагульнены характар у адносінах да норм, якія вызначалі прыкметы канкрэтных злачынстваў (агульнае азначэнне злачынства, стадыі наўмыснай злачыннай дзейнасці, саўдзел у злачынстве, абставіны, якія выключаюць крымінальную адказнасць, віды пакарання і агульныя пачаткі прызначэння пакарання і г.д.). Сёння нормы Агульнай часткі крымінальнага закону вызначаюць задачы крымінальнага права, дзеянне крымінальнага закону ў прасторы і часе, паняцце злачыннага дзеяння і віны як падстаў крымінальнай адказнасці, формы яе рэалізацыі, віды пакарання і агульныя пачаткі прымянення пакарання, падставы і ўмовы вызвалення ад крымінальнай адказнасці і пакарання, асаблівасці

крымінальнай адказнасці непаўналетніх.

У нормах Асаблівай часткі даецца пералік і азначэнне канкрэтных відаў злачынстваў, а таксама мер пакарання, якія могуць быць прызначаны асобе, якая ўчыніла адпаведнае злачынства.

Нормы Агульнай і Асаблівай частак крымінальнага права арганічна звязаны паміж сабой. Нельга, напр., вызначыць прыкметы канкрэтнага злачынства без уліку паняцця віны і агульных прыкмет суб'екта злачынства, што даецца ў нормах Агульнай часткі крымінальнага закону. Правільнае прымяненне пакарання за ўчыненне злачынства магчыма толькі пры выкананні агульных патрабаванняў, якія прадугледжаны ў нормах Агульнай часткі. Такім чынам, пры прымяненні норм крымінальнага права неабходна ўлічваць унутраную ўзаемасувязь норм Агульнай і Асаблівай частак крымінальнага закону.

Па сферы дзеяння і ў значнай меры па характары сваіх задач крымінальнае права цесна звязана з крымінальна–выканаўчым і крымінальна–працэсуальным правам. Усе тры галіны права накіраваны на вырашэнне агульнай задачы барацьбы са злачыннасцю. У комплексе названых галін крымінальнае права займае вядучае, базавае месца, паколькі ў сваіх нормах вызначае, якія грамадска небяспечныя дзеянні з'яўляюцца злачынствамі і якія меры крымінальнай адказнасці могуць прымяняцца за адпаведныя злачынствы. Крымінальна-працэсуальная дзейнасць па выяўленню злачынства і злачынца, збору доказаў, разгляду крымінальнай справы ў судзе (крымінальна–працэсуальнае права) і, нарэшце, фактычнае прымяненне ў адносінах да асуджанага прызначаных судом мер уздзеяння крымінальнай адказнасці (крымінальна-выканаўчае права) магчымы толькі таму, што крымінальнае права вызначыла для гэтага адпаведныя грамадска небяспечныя дзеянні ў якасці злачынных і ўстанавіла крымінальную адказнасць за іх учыненне.

Адзначаныя галіны права маюць розны прадмет рэгулявання. У адрозненне ад крымінальнага права, крымінальна–працэсуальнае права рэгулюе дзейнасць (адносіны па расследаванню злачынстваў і ажыццяўленню судаводства ў стаўленні да асобы, якая ўчыніла злачыннае дзеян-

не). Крымінальна–працэсуальныя адносіны ўзнікаюць і змяняюцца на падставе адпаведных актаў працэсуальнай дзейнасці (пастанова аб узбуджэнні крымінальнай справы, аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага і г.д.).

Прадмет крымінальна–выканаўчага права складаюць адносіны, якія ўзнікаюць паміж асуджаным за злачынства і органам дзяржавы, які выконвае (рэалізуе) меры ўздзеяння крымінальнай адказнасці, адносна парадку і ўмоў прымянення гэтых мер уздзеяння.

Крымінальнае права мяжуецца і з адміністрацыйным правам, якое, акрамя таго, што рэгулюе адносіны ў сувязі з выканаўча–распарадчай дзейнасцю органаў дзяржавы, выконвае яшчэ і функцыю аховы грамадства ад учынення адміністрацыйных правапарушэнняў. Па ступені грамадскай небяспекі адміністрацыйныя правапарушэнні ўяўляюць значна меншую небяспеку для грамадства, чым злачынствы, і таму забараняюцца пад пагрозай адміністрацыйнага спагнання. Па сваіх прававых выніках меры адміністрацыйнага спагнання хоць і маюць нейкае падабенства да крымінальнага пакарання (арышт, папраўчыя работы, штраф), аднак наогул менш рэпрэсіўныя, прымяняюцца не на падставе асуджэння вінаватага ў якасці злачынца.

## §2. Навука крымінальнага права

Навука крымінальнага права ўяўляе сабой сістэму ведаў аб сацыяльна–гістарычнай абумоўленасці і заканамернасцях усталявання, змянення і функцыянавання прававых сродкаў уздзеяння на злачыннасць шляхам вызначэння кола злачынных дзеянняў і іх забароны пад пагрозай крымінальнай адказнасці за іх учыненне.

Прадмет навукі крымінальнага права складаюць перш за ўсё злачынства і крымінальная адказнасць як сацыяльна–прававыя з'явы і звязаныя з гэтым крымінальна–прававыя інстытуты, формы іх нарматыўнага выяўлення і замацавання ў крымінальным законе. Такім чынам, можна адзначыць, што аснову навукі крымінальнага права ўтварае комплекс ведаў адносна функцыянавання сістэмы прававых норм, якія

складаюць змест дадзенай галіны права. Аднак гэта не значыць, што навука крымінальнага права па свайму зместу зліваецца з крымінальным правам як галіной права. Крымінальнае права як галіна права ёсць сукупнасць прававых норм, якія рэгулююць пэўныя грамадскія адносіны. Навука крымінальнага права не рэгулюе грамадскія адносіны, а вывучае (фарміруе сістэму ведаў) уласцівымі ёй навуковымі метадамі нормы крымінальнага права, а таксама тыя грамадскія адносіны, якія рэгулююцца крымінальным правам.

Навука крымінальнага права вывучае прававыя нормы не толькі з пункту гледжання фармальна–лагічнага аналізу і растлумачэння, а даследуе іх у цеснай сувязі з сацыяльнымі ўмовамі, раскрывае сацыяльныя вытокі злачынства, абумоўленасць прававых сродкаў барацьбы са злачыннасцю, вывучае практыку і эфектыўнасць іх выкарыстання, распрацоўвае прапановы па ўдасканаленню крымінальнага заканадаўства.

У прадмет навукі крымінальнага права ўваходзіць таксама даследаванне гісторыі развіцця крымінальнага заканадаўства і навуковых канцэпцый у галіне барацьбы са злачыннасцю, вывучэнне крымінальнага права замежных краін.

У даследаванні праблем крымінальнага права навука карыстаецца агульнанавуковым метадам дыялектычнага аналізу. Прымяненне гэтага метаду ў навуцы крымінальнага права патрабуе вывучэння інстытутаў крымінальнага права і сістэмы прававых норм, якія іх вызначаюць, ва ўзаемасувязі і развіцці з сацыяльна–эканамічнымі ўмовамі грамадства. Па сутнасці, метад дыялектычнага аналізу ўключае ў сябе і метад фармальна–лагічнага аналізу норм крымінальнага закону, дапаўняючы апошні патрабаваннем правядзення такога аналізу на падставе асэнсавання сацыяльнага зместу прававых норм.

У навуцы крымінальнага права выкарыстоўваюцца таксама метады канкрэтна–сацыялагічнага, параўнальна–прававога і сістэмна–структурнага аналізу норм крымінальнага права. Метад канкрэтна–сацыялагічнага аналізу дазваляе даследаваць пытанні эфектыўнасці дзеяння і прымянення норм крымінальнага закону, у прыватнасці, эфектыўнасць прымянення таго ці іншага віду пакарання. Шляхам

параўнальна–прававога аналізу навука крымінальнага права вывучае ў параўнанні аднародныя нормы і інстытуты крымінальнага права розных краін і на гэтай падставе дае абагульненыя рэкамендацыі аб магчымасці выкарыстання замежнага вопыту ў галіне крымінальнага права. Метад сістэмна–структурнага аналізу мае на ўвазе разгляд норм крымінальнага права або асобных яго інстытутаў як адзінай унутрана ўзгодненай сукупнасці (сістэмы). На падставе гэтага метаду магчыма выявіць унутраныя супярэчнасці паміж асобнымі нормамі і інстытутамі крымінальнага закону, унесці прапановы па іх ліквідаванню.

Задачы навукі крымінальнага права вызначаюцца прадметам яе даследаванняў і накіраваны на фарміраванне аб'ектыўнай навуковай канцэпцыі барацьбы са злачыннасцю шляхам выкарыстання норм і інстытутаў крымінальнага закону.

Працэс сацыяльнага абнаўлення ўсіх бакоў грамадскага і палітычнага жыцця, які пачаўся пасля развалу адміністрацыйна–камандна сістэмы, ідэалогіі дзяржаўнага таталітарызму і партыйнай аднадумнасці, даў моцны штуршок рэфармаванню крымінальнага права, развіццю аб'ектыўна–навуковых даследаванняў у галіне крымінальнага права. Сёння перад навукай крымінальнага права стаіць задача аднавіць сапраўдны змест і прызначэнне крымінальнага права на падставе прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, справядлівасці і міласэрнасці, аб'ектыўнай ацэнкі дабра і зла, сапраўдных грамадскіх інтарэсаў.

У абагульненым выглядзе аднаўленне крымінальнага права павінна ажыццяўляцца па двух асноўных узаемазвязаных накірунках: дэпалітызацыі і паслядоўнай гуманізацыі навукі, заканадаўства і практыкі яго прымянення. Крымінальна–прававая палітыка дзяржавы можа быць эфектыўнай, калі ажыццяўляецца на навуковай аснове, а не на ідэалагічных устаноўках той ці іншай партыі. Рэфармаванне крымінальнага права, якое зараз праводзіцца ў Рэспубліцы Беларусь, адбываецца на падставе навуковай канцэпцыі і мадэльнага праекта КК, распрацаванага вучонымі кафедры крымінальнага права Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

На сённяшнім этапе развіцця навукі крымінальнага права

неабходна адзначыць наступныя першачарговыя яе задачы: распрацоўка на падставе фундаментальных даследаванняў рэкамендацый па ўзмацненню гарантый крымінальна–прававой аховы чалавека, яго правоў і законных інтарэсаў; паслядоўная гуманізацыя і дыферэнцыяцыя крымінальнай адказнасці, пашырэнне мер уздзеяння крымінальнай адказнасці, якія не звязаны з прымяненнем пакарання; распрацоўка альтэрнатыўных крымінальнай адказнасці мер уздзеяння на асоб, якія ўчынілі злачынствы; правядзенне даследаванняў у галіне крымінальна–прававой аховы рынкавых адносін, распрацоўка адпаведных навуковых усталяванняў.

Навука крымінальнага права мяжуе з шэрагам іншых навук, якія таксама даследуюць праблемы барацьбы са злачыннасцю (крыміналогіяй, крыміналістыкай, судовай псіхіятрыяй, судовай медыцынай, судовай статыстыкай).

Вырашаючы агульную з адзначанымі навукамі задачу садзейнічання барацьбе са злачыннасцю, навука крымінальнага права аднак істотна адрозніваецца ад гэтых навук па прадмету свайго даследавання.

Так, калі крымінальнае права вывучае асобныя віды злачынстваў з пункту гледжання іх азначэння ў крымінальным законе, то крыміналогія даследуе злачыннасць у аспекце яе прычын і распрацоўкі мер папярэджвання. Крыміналогія вывучае становішча злачыннасці ў грамадстве (яе узровень, дынаміку, структуру), распрацоўвае меры яе папярэджвання і пры гэтым выкарыстоўвае паняцці, якія вызначаюцца навукай крымінальнага права (злачынства, саўдзелу і г.д.).

З паняцця злачынства і яго канкрэтных відаў зыходзіць такая самастойная навука як крыміналістыка, якая вывучае прыёмы і метады выяўлення і расследавання злачынстваў шляхам збірання, фіксацыі і даследавання доказаў учынення злачынства.

Крымінальнай адказнасці падлягае толькі асоба, якая ўчыніла злачынства ў стане свядомасці. Псіхіку ж чалавека з погляду стану свядомасці і бессвядомасці ў момант учынення злачыннага дзеяння вывучае судовая псіхіятрыя.

Пры вырашэнні шэрагу пытанняў кваліфікацыі пры ўчы-

ненні такіх злачынстваў, як забойства, нанясенне цялесных пашкоджанняў і іншых, навука крымінальнага права абапіраецца на вывады судовай медыцыны, якая вывучае біялагічныя пытанні паняцця смерці, шкоды здароўю.

Важнае значэнне для навукі крымінальнага права мае судовая статыстыка (яе крымінальна–прававы раздзел) – навука, якая займаецца ўлікам учыненых злачынстваў і ўжываемых да злачынцаў мер уздзеяння крымінальнай адказнасці, а таксама іх аналізам з мэтай выяўлення тэндэнцый і заканамернасцей у злачыннасці, уплыву ўжываемых мер крымінальнай адказнасці на яе ўзровень і дынаміку.

Прадмет навукі крымінальнага права складае аснову курса крымінальнага права як вучэбнай дысцыпліны, якая выкладаецца ў вышэйшых юрыдычных навучальных установах. Глыбіня выкладаемых у вучэбным курсе пытанняў крымінальнага права вызначаецца праграмай і колькасцю гадзін, якія адводзяцца на іх вывучэнне. Зразумела, што больш глыбокае і ўсебаковае засваенне крымінальна–прававой тэорыі патрабуе самастойнага вывучэння студэнтамі спецыяльнай навуковай літаратуры.

Сістэма курса крымінальнага права як вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам падзяляецца на Агульную і Асаблівую часткі.

У дадзеным навучальным дапаможніку разглядаюцца пытанні, якія адносяцца да Агульнай часткі Крымінальнага кодэкса Беларусі.

## *Літаратура:*

Курс советского уголовного права: В 6–ти т. М., 1970. Т.13; Курс советского уголовного права: В 5–ти т. Л., 1968. Т. 1, 1971. Т. 2; Горелик И.И., Тишкевич И.С. Вопросы уголовного права (Общей части) в практике Верховного Суда БССР. Минск, 1973; Келина С. Г., Кудрявцев В.Н. Принципы советского уголовного права. М., 1988; Наумов А.В. Введение в уголовное право // Государство и право. 1993. № 11. С.71; Смирнов В.Г. Функции советского уголовного права. Л., 1965; Фефелов П.А. Понятие и система принципов советского уголовного права. Свердловск. 1970.

# Глава 2

# КРЫМІНАЛЬНЫ ЗАКОН

## §1. Паняцце крымінальнага закону

Адзінай крыніцай крымінальнага права Беларусі з'яўляецца крымінальны закон. **Крымінальны закон** – гэта заканадаўчы акт, прыняты Парламентам Рэспублікі Беларусь, які змяшчае агульныя палажэнні крымінальнага права, устанаўлівае падставы і прынцыпы крымінальнай адказнасці, вызначае, якія грамадска небяспечныя дзеянні з'яўляюцца злачынствамі, прадугледжвае пакаранні ці іншыя меры крымінальна–прававога ўздзеяння да асоб, вінаватых ва ўчыненні злачынства.

Толькі крымінальны закон, а не які–небудзь іншы нарматыўны акт, вырашае пытанні крымінальнай адказнасці. Гэта тлумачыцца тым, што крымінальная адказнасць — вострая форма дзяржаўнага прымусу, якая закранае лёс чалавека, у значнай ступені абмяжоўвае правы асобы. Толькі заканадаўчая ўлада павінна вызначаць прынцыпы крымінальнай адказнасці, кола дзеянняў, якія прызнаюцца злачынствамі, віды і памеры пакаранняў, іншыя меры крымінальна–прававога ўздзеяння. Гэта вынікае з пункта 2 арт.97 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Адпаведна з арт.2 КК Беларусі адзіным крымінальным законам, які дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, пытанні крымінальнай адказнасці не могуць вырашацца ў нейкіх асобных законах, прысвечаных барацьбе з тым ці іншым злачынствам або злачынствамі. Ва ўсіх выпадках нормы крымінальна–прававога зместу павінны ўключацца ў Крымінальны кодэкс і прымяняцца як адпаведныя артыкулы КК Беларусі.

Крымінальны закон – гэта юрыдычная база, аснова ажыццяўлення барацьбы са злачыннасцю, гэта прававы падму-

рак крымінальнай палітыкі дзяржавы. Крымінальны закон мае задачай абарону жыцця і здароўя чалавека, яго правоў і свабод, канстытуцыйнага ладу дзяржаў і грамадскіх інтарэсаў уласнасці, прыроднага асяроддзя, устаноўленага правапарадку ад злачынных замахаў. Крымінальны закон мае вялікае папераджальнае, прафілактычнае значэнне. Сам факт існавання крымінальнага закону аказвае прэвентыўнае ўздзеянне не толькі на няўстойлівых асоб, схільных да здзяйснення злачынстваў, але і на законапаслухмяных грамадзян, бо крымінальны закон выхоўвае ў людзей адмоўныя адносіны да тых учынкаў, якія адпаведна з законам вызначаны як злачынствы.

Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь – гэта сістэматызаваны крымінальны закон, які быў прыняты 29 снежня 1960 г. 4–ай сесіяй Вярхоўнага Савета рэспублікі 5–га склікання і ўведзены ў дзеянне з 1 красавіка 1961 г. (гл.: Крымінальны кодэкс Беларускай ССР (на беларускай і рускай мовах). Мінск, 1961). КК 1960 г. спалучаў нормы агульнасаюзнага (былога СССР) і рэспубліканскага крымінальнага заканадаўства. У яго склад увайшлі тры Законы СССР, прынятыя 25 снежня 1958 г.: Асновы крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік, Закон аб крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя злачынствы, Закон аб крымінальнай адказнасці за воінскія злачынствы (гл.: Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР. 1959. № 1. Арт.6, 8, 10). У астатняй частцы ў змест КК уваходзілі нормы рэспубліканскага крымінальнага закону і асобныя нормы агульнасаюзнага заканадаўства. З 1960 г. змест КК Беларусі істотна змяніўся і зараз у значнай ступені адрозніваецца ад першапачатковага. Асабліва значныя змяненні і дапаўненні былі ўнесены ў КК пасля прыняцця 27 ліпеня 1990 г. Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь" і 15 сакавіка 1994 г. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (гл., напр.: Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1993. № 22. Арт.278; 1994. № 2. Арт.176).

## §2. Структура крымінальнага закону

КК Беларусі ўяўляе сабой лагічна і юрыдычна абгрунтаваную сістэму крымінальна–прававых норм. Ён падзяляецца

на Агульную і Асаблівую часткі, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на раздзелы з суцэльнай нумарацыяй. Агульная частка ўключае пяць раздзелаў:

Раздзел 1. Агульныя палажэнні

Раздзел 2. Аб злачынстве

Раздзел 3. Аб пакаранні

Раздзел 4. Аб прызначэнні пакарання і аб вызваленні ад пакарання

Раздзел 5. Аб прымусовых мерах медыцынскага і выхаваўчага характару

Асаблівая частка КК Беларусі ўтрымлівае раздзелы ад шостага да шаснаццатага (раздзел дзесяты выключаны):

Раздзел 6. Дзяржаўныя злачынствы

Раздзел 7. Злачынствы супраць уласнасці

Раздзел 8. Злачынствы супраць жыцця, здароўя, свабоды і годнасці асобы

Раздзел 9. Злачынствы супраць палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых правоў грамадзян

Раздзел 10. (выключаны)

Раздзел 11. Злачынствы ў сферы прадпрымальніцтва і іншай гаспадарчай дзейнасці

Раздзел 12. Службовыя злачынствы

Раздзел 13. Злачынствы супраць правасуддзя

Раздзел 14. Злачынствы супраць парадку кіравання

Раздзел 15. Злачынствы супраць грамадскай бяспекі, грамадскага парадку і здароўя насельніцтва

Раздзел 16. Воінскія злачынствы

КК Беларусі мае дадатак: Пералік маёмасці, якая не падлягае канфіскацыі па прыгавору суда.

Агульная і Асаблівая часткі КК знаходзяцца ў арганічным адзінстве. Нормы Агульнай часткі змяшчаюць абагульненыя палажэнні аб злачынстве і пакаранні і датычацца ўсіх норм Асаблівай часткі. Ужыванне пэўных норм Асаблівай часткі КК заўсёды звязана з прымяненнем тых ці іншых прававых прадпісанняў Агульнай часткі.

Кожны раздзел КК складаецца з артыкулаў, якія маюць суцэльную нумарацыю для ўсяго кодэкса. Артыкул змяшчае

адну крымінальна–прававую норму (арт.42) ці некалькі (арт.48). Асобныя прававыя прадпісанні выдзяляюцца ў часткі артыкулаў. Часткамі артыкулаў называюць абзацы, якія пачынаюцца з вялікай літары і паслядоўна адлічваюцца: частка першая, другая, трэцяя і г.д. У артыкуле ці ў частцы артыкула могуць выдзяляцца пункты, якія маюць нумарацыю (арт.37) або літарнае абазначэнне (арт.100). Асаблівасць ёсць у раздзеле 16 КК, дзе абзацы артыкулаў называюцца пунктамі і маюць літарнае абазначэнне.

З дапамогай гэтай "сістэмы каардынатаў" мы маем магчымасць коратка сфармуляваць прававую ацэнку (кваліфікацыю) учыненага вінаватым. Напр., запіс "ч.2 арт.15, п."а" арт.100 КК" сведчыць, што асоба прыцягваецца да крымінальнай адказнасці за замах на забойства з карыслівай мэтай.

Для таго, каб забяспечыць нязменную нумарацыю артыкулаў, ужываюцца спецыяльныя правілы ўнясення змяненняў у крымінальны закон. Калі пункт, артыкул ці раздзел выключаюцца з КК, іх нумар захоўваецца (гл., напр., п.1 ч.3 арт.48; арт.66; раздзел 10). Калі ў КК уключаецца новы артыкул, яму прысвойваецца нумар папярэдняга артыкула з дабаўленнем пометы 1, 2, 3 і г.д. (гл., напр., арт.$7^1$, $219^1$ $219^7$). Ва ўсіх выпадках выключэння артыкула з КК, дапаўнення КК новым артыкулам, змянення рэдакцыі артыкула ў афіцыйным тэксце закону ўказваецца, якім нарматыўным актам і калі ў КК унесена змена, крыніца і дата афіцыйнага апублікавання гэтага акта.

Асаблівая частка КК з'яўляецца сістэматызаваным вычарпальным пералікам канкрэтных відаў злачынстваў і прадугледжаных за іх учыненне пакаранняў. Пераважная большасць артыкулаў Асаблівай часткі называе злачынства, яго прыкметы і пакаранне за яго. Гэтым тлумачыцца асобая структура норм Асаблівай часткі КК, якія складаюцца з дзвюх частак: дыспазіцыі і санкцыі.

**Дыспазіцыя** – гэта тая частка крымінальна–прававой нормы, якая раскрывае прыкметы злачынства ці дае яго назву. Выдзяляюць пяць відаў дыспазіцыі: простая, апісальная, бланкетная, спасылачная, змешаная.

Простая дыспазіцыя дае назву злачыннага дзеяння, але не

ўказвае яго асобных прыкмет. Простая дыспазіцыя сустракаецца рэдка, калі заканадаўца лічыць, што значэнне слоў у назве злачынства зразумела ўсім грамадзянам і няма неабходнасці ў дадатковым тлумачэнні. Прыкладам з'яўляецца дыспазіцыя ч.1 арт.104 КК: "Забойства, учыненае па неасцярожнасці ..."

Больш распаўсюджана апісальная дыспазіцыя, якая не толькі дае назву злачынства, але і ўказвае прыкметы гэтага злачынства. Напр., у арт.129 КК сказана: "Знявага, гэта значыць наўмыснае прыніжэнне гонару і годнасці асобы, выражанае ў непрыстойнай форме ..."

Бланкетная дыспазіцыя не дае поўнага пераліку ўсіх прыкмет злачыннага дзеяння і накіроўвае да іншых нарматыўных актаў, якія не маюць крымінальна–прававога характару (некрымінальныя законы, дэкрэты, указы Прэзідэнта, пастановы ўрада, загады міністраў і г.д.). Напр., для ўсведамлення прыкмет арт.137 КК "Парушэнне правілаў аховы працы" неабходна звярнуцца да адпаведных нарматыўных актаў, якія змяшчаюць правілы тэхнікі бяспекі, прамысловай санітарыі або іншыя правілы аховы працы.

Спасылачная дыспазіцыя патрабуе, каб для разумення прыкмет пэўнага злачынства мы звярталіся да іншай крымінальна–прававой нормы. Напр., у п."а" арт.228 КК гаворыцца: "Невыкананне загаду начальніка, учыненае пры адсутнасці прыкмет, указаных у пункце "а" артыкула 227 гэтага Кодэкса ..."

Дыспазіцыя, якая спалучае ў сабе рысы некалькіх яе відаў з'яўляецца змешанай. Напр., дыспазіцыя арт.$206^2$ КК утрымлівае рысы апісальнай, бланкетнай і спасылачнай. У гэтай дыспазіцыі апісваецца адна з прыкмет злачынства: "Выпуск у эксплуатацыю заведама тэхнічна няспраўных транспартных сродкаў ...", потым заканадаўца адрасуе да спецыяльных нарматыўных актаў: "або іншае грубае парушэнне правілаў іх эксплуатацыі...", а затым робіцца спасылка на КК: "калі гэта выклікала вынікі, указаныя ў артыкуле 206 гэтага Кодэкса".

**Санкцыя** – гэта частка крымінальна–прававой нормы,

якая прадугледжвае від і памер пакарання за злачыннае дзеянне, указанае ў дыспазіцыі. Па ступені канкрэтызацыі віду і памеру пакарання выдзяляюць тры віды санкцый: абсалютна нявызначаная, абсалютна вызначаная і адносна вызначаная. У сваю чаргу абсалютна вызначаная і адносна вызначаная санкцыі могуць быць альтэрнатыўнай і адсылачнай.

Гісторыі крымінальнага права вядома абсалютна нявызначаная санкцыя, якая не ўказвае від пакарання і яго памер. Такі від санкцыі не адпавядае патрабаванням законнасці і адсутнічае ў дзеючым крымінальным заканадаўстве.

Абсалютна вызначаная санкцыя дакладна называе від пакарання і яго памер. Такія санкцыі пазбаўляюць суд магчымасці індывідуалізаваць пакаранне з улікам асаблівасцей кожнага злачынства і асобы вінаватага. Таму ў крымінальным праве Беларусі зараз такіх санцый дзве (але яны альтэрнатыўныя): адпаведна з арт.252 КК самавольнае пакіданне поля бітвы ў час бою або адмова ў час бою дзейнічаць зброяй "караецца смерцю або пазбаўленнем волі тэрмінам на пятнаццаць гадоў". Аналагічная санкцыя ў арт.253 КК "Добраахвотная здача ў палон".

Дзеючаму крымінальнаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь больш уласціва адносна вызначаная санкцыя. Яна называе від пакарання і вызначае межы, у рамках якіх суд з улікам абставін справы, цяжару учыненага і асобы вінаватага ўжывае канкрэтную меру пакарання. Напр., разглашэнне дзяржаўнай тайны (ч.1 арт.72 КК) "караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў". Іншы раз у законе ўказваецца толькі верхняя мяжа пэўнага віду пакарання: адпаведна з ч.1 арт. 105 КК давядзенне да самагубства "караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў". У такіх выпадках ніжняй мяжой пакарання будзе яго мінімальны памер, які ўстаноўлены нормамі Агульнай часткі КК для канкрэтных відаў пакаранняў: для пазбаўлення волі – тры месяцы (арт. 23), для папраўчых работ – два месяцы (арт.27), для штрафу– дзесяць мінімальных заработных плат (арт.30) і г.д.

Альтэрнатыўная санкцыя называе некалькі відаў пакаран-

няў, памеры якіх могуць быць абсалютна ці адносна вызначаныя. Як раней адзначалася, альтэрнатыўныя абсалютна вызначаныя санкцыі маюць арт. 252 і 253 КК. Альтэрнатыўнымі ў сваёй большасці з'яўляюцца адносна вызначаныя санкцыі. Напр., адпаведна з ч.1 арт.166[1] бяздзейнасць улады "караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады на тэрмін да пяці гадоў, або штрафам".

Санкцыя арт.69 КК з'яўляецца адсылачнай, бо гэты артыкул не ўтрымлівае ўказанняў на віды і памеры пакаранняў, а накіроўвае да ўжывання санкцый іншых артыкулаў раздзела 6 КК.

## § 3. Дзеянне крымінальнага закону ў часе

Адпаведна з ч.1 арт.6 КК, "злачыннасць і каральнасць дзеяння вызначаюцца законам, які дзейнічаў у час учынення гэтага дзеяння". У сувязі з гэтым неабходна ўстанаўліваць: час здзяйснення злачынства; які крымінальны закон у гэты час дзейнічаў; ці захаваў ён сілу да моманту разгляду крымінальнай справы ў судзе.

Часам учынення дзеяння прызнаецца час учынення грамадска небяспечнага дзеяння (бяздзейнасці) незалежна ад часу надыходу вынікаў. Калі закон апісвае злачынства як шэраг некалькіх узаемазвязаных дзеянняў, час здзяйснення злачынства вызначаецца на момант учынення апошняга з неабходных дзеянняў. Напр., спекуляцыя (арт.150[6] КК) лічыцца скончанай у момант перапродажу хоць бы часткі тавараў. Калі злачынства не было даведзена да канца па прычынах, якія не залежаць ад волі вінаватага (напр., яго затрымалі ў час спробы учыніць злачынства), момант спынення злачынных паводзін і будзе часам учынення злачынства.

Неабходнай умовай прымянення крымінальнага закону з'яўляецца дакладнае вызначэнне моманту ўступлення яго ў сілу. Гэты момант можа быць названы заканадаўцам. Напр., Закон Рэспублікі Беларусь, прыняты 1 сакавіка 1994 г., быў уведзены ў дзеянне адпаведна з Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з 1 мая 1994 г. (гл.: Ведамасці Вярхоўнага

Савета Рэспублікі Беларусь. 1994. № 12. Арт.176 і 177).

У тых выпадках, калі заканадаўца не называе момант уступлення закону ў сілу, дзейнічаюць агульныя правілы, якія звязваюць вызначэнне гэтага моманту з часам афіцыйнага апублікавання закону. Гэтыя правілы ўстаноўлены ч.5 арт.104 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: "Законы падлягаюць неадкладнаму апублікаванню пасля іх падпісання і ўступаюць у сілу праз дзесяць дзён пасля апублікавання, калі ў самім законе не ўстаноўлены іншы тэрмін".

Законы Рэспублікі Беларусь уступаюць у сілу на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь адначасова па сканчэнні дзесяці дзён пасля іх афіцыйнага апублікавання ў "Ведамасцях Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь" і газетах "Звязда", "Народная газета". У выпадках перпашапачатковага апублікавання законаў у названых газетах дзесяцідзённы тэрмін адлічваецца з даты такога апублікавання. Момантам сканчэння тэрміну з'яўляецца надыход 24.00 гадзін дзесятага дня (дзень апублікавання не ўлічваецца).

У свой час прыняты і ўступіўшы ў сілу крымінальны закон спыняе дзеянне ў выніку яго адмены ці замены іншым законам. Магчымы выпадкі, калі крымінальны закон страчвае сілу ў сувязі са сканчэннем тэрміну яго дзеяння ці ў сувязі з адпадзеннем абставін, якія выклікалі прыняцце гэтага закону (у цяперашні час такіх законаў няма).

Такім чынам, пытанне аб тым, які крымінальны закон падлягае прымяненню, вырашаецца шляхам супастаўлення моманту ўступлення крымінальнага закону ў сілу і моманту ўчынення злачынства. Калі злачынства здзейснена пасля ўступлення ў сілу новага крымінальнага закону, ужываецца гэты закон, калі злачынства ўчынена раней, прымяняецца былы крымінальны закон.

Па агульнаму палажэнню, якое прынята ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, закон не мае адваротнай сілы, г.зн. не распаўсюджваецца на тыя грамадскія адносіны, якія ўзніклі да ўступлення закону ў сілу. Аднак у заканадаўстве аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці маецца выключэнне з гэтага правіла. У прымяненні да крымінальнага

права аб гэтым гаворыцца ў ч.2 і 3 арт.6 КК:

"Закон, які ўстараняе каральнасць дзеяння або змякчае пакаранне, мае адваротную сілу, гэта значыць пашыраецца таксама на дзеянні, учыненыя да яго выдання.

Закон, які ўстанаўлівае каральнасць дзеяння або ўзмацняе пакаранне, адваротнай сілы не мае."

**Адваротная сіла закону** – гэта распаўсюджванне палажэнняў новага, больш мяккага закону на дзеянні, якія ўчынены да ўступлення яго ў сілу.

Патрабаванне ч.2 арт.6 КК з'яўляецца праявай прынцыпу гуманізму, які выключае пакаранне асобы па нормах былога крымінальнага заканадаўства, бо новае ўстараняе злачыннасць і каральнасць дзеяння наогул або змякчае пакаранне за падобнае дзеянне.

Пры вырашэнні пытання, з'яўляецца новы закон больш мяккім ці не, трэба ўсебакова параўнаць новы і былы законы па ўсіх параметрах. У прыватнасці, закон будзе больш мяккім, калі: 1) змяншае максімальную ці мінімальную мяжу пакарання; 2) пры нязменным асноўным пакаранні абавязковае дадатковае пакаранне замяняе факультатыўным; 3) змяншае верхнюю або ніжнюю мяжу дадатковага пакарання, альбо ўводзіць больш мяккі від дадатковага пакарання; 4) наогул адмаўляецца ад дадатковага пакарання; 5) уводзіць альтэрнатыўную санкцыю, якая дазваляе ўжываць больш мяккае пакаранне, чым раней. Больш мяккім прызнаецца крымінальны закон, які прадугледжвае крымінальную адказнасць пры наяўнасці змякчальных акалічнасцей.

У тых выпадках, калі з часу ўчынення злачынства да моманту разгляду справы ў судзе крымінальнае заканадаўства змянялася неаднаразова, узнікае пытанне аб магчымасці ўжывання "прамежкавага закону". Асаблівасць "прамежкавага закону" ў тым, што ён уступіў у сілу пасля ўчынення злачынства і змякчыў пакаранне за яго, але да моманту разгляду справы ў судзе быў заменены новым, больш строгім законам.

Ці можа "прамежкавы закон" прымацца да ўвагі адпаведна з ч.2 арт.6 КК? Судовая практыка зыходзіць з таго, што

параўнанню адпаведна з правіламі ч.2 арт.6 КК падлягаюць толькі два законы: які дзейнічаў у час здзяйснення злачынства і які дзейнічае на момант разгляду справы ў судзе, а "прамежкавы закон" не прымаецца да ўвагі. Прафесары кафедры крымінальнага права Белдзяржуніверсітэта І.І.Гарэлік і І.С.Цішкевіч выказвалі іншы погляд на гэтую праблему, але ён не атрымаў значнай падтрымкі (гл. спіс літаратуры).

Правілы аб адваротнай сіле крымінальнага закону, сфармуляваныя ў КК Беларусі 1960 г., на жаль, датычацца толькі норм, якія вырашаюць пытанне аб злачыннасці і каральнасці дзеяння. Да крымінальна–прававых норм іншага характару (прымяненне даўнасці, вызваленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання, пагашэнне і зняцце судзімасці і г.д.) правілы ч.2 арт.6 КК не выкарыстоўваюцца.

## §4. Дзеянне крымінальнага закону ў прасторы

Навука крымінальнага права выдзяляе чатыры прынцыпы, якімі вызначаецца дзеянне крымінальнага закону ў прасторы: тэрытарыяльны прынцып, прынцып грамадзянства, рэальны прынцып і універсальны прынцып. КК Беларусі 1960 г. у арт.4 і 5 замацоўвае прымяненне трох прынцыпаў: тэрытарыяльнага, грамадзянства і універсальнага.

Адпаведна тэрытарыяльнаму прынцыпу (арт.4 КК) усе асобы, якія ўчынілі злачынства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, нясуць адказнасць па КК Беларусі. Гэта могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне, а таксама асобы без грамадзянства. У арт.52 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гаворыцца: "Кожны, хто знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, абавязаны выконваць яе Канстытуцыю, законы і паважаць нацыянальныя традыцыі".

Юрыдычная трактоўка паняцця тэрыторыі шырэй за геаграфічную. Са зместу арт.1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 1992 г. "Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь"(гл.: Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1992. № 31. Арт.509) – гэта суша, унутраныя воды,

нетры і паветраная прастора, якія абмежаваны вертыкальнай паверхняй, праходзячай па лініі Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь.

Пад паветранай прасторай Беларусі разумеецца атмасферны слой над сушай і ўнутранымі водамі рэспублікі. Нетры Беларусі — гэта падземная прастора пад паверхняй сухапутнай і воднай тэрыторыі краіны.

Да тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прыраўноўваюцца і іншыя аб'екты: ваенныя водныя і паветраныя судны пад сцягам Рэспублікі Беларусь або з апазнавальнымі знакамі рэспублікі незалежна ад месцазнаходжання; грамадзянскія водныя і паветраныя судны пад сцягам ці апазнавальнымі знакамі краіны, калі яны знаходзяцца ў адкрытым моры (нейтральных водах) або ў адкрытай паветранай прасторы.

Для прымянення тэрытарыяльнага прынцыпу неабходна дакладна вызначыць месца ўчынення злачынства. Злачынства прызнаецца ўчыненым на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі злачыннае дзеянне хоць бы часткова ўчынена на яе тэрыторыі. Гэта можа быць у выпадках, калі злачынства пачата ў Беларусі, або пачата за мяжой краіны, але працягвалася ці скончылася ў рэспубліцы. Напр., у Беларусі мела месца падрыхтаванне да злачынства, ці злачынцы часова выконвалі ў рэспубліцы частку сваіх дзеянняў, або менавіта ў нашай краіне наступілі вынікі злачынства, пачатага за мяжой Рэспублікі Беларусь.

Частка 2 арт.4 КК робіць выключэнне з тэрытарыяльнага прынцыпу дзеяння крымінальнага закону ў прасторы: "Пытанне аб крымінальнай адказнасці дыпламатычных прадстаўнікоў замежных дзяржаў і іншых грамадзян, якія, згодна з дзеючымі законамі і міжнароднымі дагаворамі, не падсудныя па крымінальных справах савецкім судовым установам, у выпадку ўчынення гэтымі асобамі злачынства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вырашаецца дыпламатычным шляхам."

Не падлягаюць крымінальнай адказнасці па крымінальнаму заканадаўству Беларусі за дзеянні, якія ўчынены на тэрыторыі Беларусі, асобы, якія карыстаюцца **дыпламатычным імунітэтам**. Дыпламатычны імунітэт ад крымінальнай адказнасці замацаваны ў Венскай канвенцыі аб

дыпламатычных зносінах 1961 г., Венскай канвенцыі аб консульскіх зносінах 1963 г., Венскай канвенцыі аб прадстаўніцтвах дзяржаў пры міжнародных арганізацыях універсальнага характару 1975 г. Асабісты імунітэт прадастаўляецца кіраўніку (паслу, пасланніку, павераному ў справах) і персаналу прадстаўніцтва (саветніку, гандлёваму прадстаўніку, ваеннаму аташэ, сакратарам пасольства і г.д.), членам іх сямей. Кіраўнікам дзяржаў, урадаў, міністрам замежных спраў, кіраўнікам іншых вышэйшых устаноў дыпламатычны імунітэт прадастаўляецца ў поўным аб'ёме. Консульскія службовыя асобы, у тым ліку і глава консульскага прадстаўніцтва (генеральны консул, консул, віцэконсул, консульскі агент), карыстаюцца імунітэтам ад крымінальнай адказнасці толькі ў тым, што датычыцца іх службовай дзейнасці. Аднак на падставе двухбаковых консульскіх пагадненняў прывілеі пералічаных асоб могуць быць пашыраны.

Непадсуднасць судам Беларусі распаўсюджваецца і на прыбыўшых у Рэспубліку Беларусь прадстаўнікоў замежных дзяржаў, на членаў парламенцкіх і ўрадавых дэлегацый, служачых міжнародных арганізацый. Напр., дыпламатычным імунітэтам надзелены суддзі Эканамічнага Суда Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

4 лютага 1997 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ № 126 "Аб забеспячэнні неабходных умоў для дзейнасці Выканаўчага сакратарыята Садружнасці Незалежных Дзяржаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь", якім да ўваходжання ў сілу адпаведнага Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Садружнасцю Незалежных Дзяржаў устаноўлена, што выканаўчы сакратар СНД, его намеснікі і члены іх сямей карыстаюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прывілеямі і імунітэтамі, якія прадастаўляюцца дыпламатычным прадстаўнікам замежных дзяржаў. Прывілеямі і імунітэтамі карыстаюцца супрацоўнікі Выканаўчага сакратарыята СНД, якія займаюць пасады, прыраўнаваныя да дыпламатычных. Яны, у прыватнасці, не падлягаюць юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь у адносінах да дзеянняў, учыненых імі пры выкананні

службовых абавязкаў, валодаюць асабістай недатыкальнасцю. Пастаянныя паўнамоцныя прадстаўнікі дзяржаў–удзельніц СНД пры статутных і іншых органах Садружнасці, а таксама члены іх сямей карыстаюцца прывілеямі і імунітэтамі, якія прадастаўляюцца дыпламатычным агентам і членам іх сямей у адпаведнасці з Венскай канвенцыяй аб дыпламатычных зносінах 1961 года.

Дыпламатычны імунітэт не выключае злачыннасці і каральнасці дзеяння, але ён не дазваляе разгляд справы судом Рэспублікі Беларусь без згоды акрэдытуючай дзяржавы. У выпадках выразна выяўленай згоды адпаведнай дзяржавы вінаваты можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці па КК Беларусі. Пры адсутнасці падобнай згоды замежны грамадзянін, які карыстаецца дыпламатычным імунітэтам, абвяшчаецца непажаданай асобай (persona non grata) і павінен пакінуць у вызначаны тэрмін межы Рэспублікі Беларусь.

Асаблівыя правілы ўстанаўлівае Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй па пытаннях юрысдыкцыі і ўзаемнай прававой дапамогі па справах, звязаных з часовым знаходжаннем воінскіх фарміраванняў Расійскай Федэрацыі са складу Стратэгічных сіл на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (гл.: Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1996. № 33. Арт.602).

Адпаведна з арт.4 гэтага Пагаднення па справах аб злачынствах і іншых правапарушэннях, учыненых на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь асобамі, якія ўваходзяць у склад воінскіх фарміраванняў, або членамі іх сямей, як агульнае правіла, прымяняецца заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дзейнічаюць яе кампетэнтныя органы. У арт.5 Пагаднення сказана: "Артыкул 4 гэтага Пагаднення не прымяняецца па справах аб злачынствах і іншых правапарушэннях, учыненых асобамі, якія ўваходзяць у склад воінскіх фарміраванняў Расійскай Федэрацыі, і членамі іх сямей у месцах дыслакацыі гэтых фарміраванняў, за выключэннем выпадкаў учынення агульнакрымінальных злачынстваў супраць грамадзян Рэспублікі Беларусь, або ўчыненых супраць Расійскай Федэрацыі або асоб, якія ўваходзяць у склад воінскіх фарміра-

ванняў Расійскай Федэрацыі, і членаў іх сямей, а таксама па справах аб воінскіх злачынствах.

Па справах аб злачынствах, указаных у гэтым артыкуле, прымяняецца заканадаўства Расійскай Федэрацыі, дзейнічаюць яе кампетэнтныя органы..."

Пад тэрмінам "асобы, якія ўваходзяць у склад воінскіх фарміраванняў" разумеюцца ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу ў складзе воінскіх фарміраванняў, а таксама цывільны персанал, працуючы ў воінскіх фарміраваннях, і асобы, камандзіраваныя ў воінскія фарміраванні, за выключэннем грамадзян Рэспублікі Беларусь.

**Прынцып грамадзянства** замацаваны ў ч.1 арт.5 КК, дзе гаворыцца: "Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія ўчынілі злачынствы за мяжой, нясуць крымінальную адказнасць па гэтаму Кодэксу, калі яны прыцягнуты да крымінальнай адказнасці або аддадзены пад суд на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь." Калі грамадзянін Рэспублікі Беларусь, будучы за межамі краіны, здзейсніць дзеянне, якое адпаведна з КК Беларусі мае прыкметы злачынства, то незалежна ад таго, пакаральна гэта дзеянне ў краіне знаходжання ці не, ён павінен несці крымінальную адказнасць па закону Рэспублікі Беларусь.

У ч.2 арт.5 КК адзначаецца: "На тых жа падставах нясуць адказнасць асобы без грамадзянства, што знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь, якія ўчынілі злачынствы за межамі Рэспублікі Беларусь."

**Універсальны прынцып** дзеяння крымінальнага закону ў прасторы датычыцца пытанняў адказнасці замежных грамадзян за злачынствы, якія яны ўчынілі па–за межамі Рэспублікі Беларусь. Ч.4 арт.5 КК указвае: "Замежныя грамадзяне за злачынствы, учыненыя за межамі Рэспублікі Беларусь, нясуць адказнасць па крымінальнаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь у выпадках, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі."

КК Беларусі 1960 г. не замацоўвае **рэальны прынцып** дзеяння крымінальнага закону ў прасторы. Сутнасць гэтага прынцыпу ў тым, што дзеянне КК пэўнай дзяржавы распаўсюджваецца на іншаземцаў, якія ўчынілі злачынствы

хоць і за межамі гэтай дзяржавы, але супраць ахоўваемых крымінальным законам інтарэсаў гэтай дзяржавы. Прадстаўляецца, што ў мэтах папярэджвання цяжкіх злачынстваў супраць Рэспублікі Беларусь з боку іншаземцаў, якія знаходзяцца за мяжой, неабходна замацаваць у КК Беларусі адзначаны прынцып дзеяння крымінальнага закону ў прасторы.

У тых выпадках, калі асоба, якая ўчыніла злачынства на тэрыторыі Беларусі, знаходзіцца за мяжой, або калі, будучы за мяжой, злачынства здзейсніў грамадзянін Беларусі, які ўхіляецца ад вяртання ў рэспубліку, узнікае пытанне аб выдачы злачынцаў. Выдача злачынцаў (экстрадыцыя) – гэта выдача па просьбе ці патрабаванню адной дзяржавай другой дзяржаве асобы, якая ўчыніла злачынства, з мэтай прыцягнення яе да крымінальнай адказнасці або для выканання ў адносінах да яе прыгавору. Абавязак выдачы злачынцаў узнікае ў дзяржавы, калі яна звязана палажэннямі адпаведнага дагавору. Такі абавязак Рэспубліка Беларусь мае на пачатках узаемнасці на падставе Канвенцыі аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах, падпісанай у Мінску 22 студзеня 1993 г. краінамі-членамі СНД (гл.: Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1993. № 28. Арт.375). Прыкладам двухбаковага пагаднення з'яўляецца Дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Літоўскай Рэспублікай аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах, падпісаны ў Вільнюсе 20 кастрычніка 1992 г. (гл.: Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1993. № 17. Арт.202).

Згодна з ч.3 арт.10 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, "Грамадзянін Рэспублікі Беларусь не можа быць выдадзены замежнай дзяржаве, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь".

Выдачы падлягаюць асобы, якія ўчынілі крымінальныя злачынствы, злачынствы супраць міру, чалавечнасці і ваенныя злачынствы. Экстрадыцыя магчыма толькі тады, калі дзеянне, здзейсненае асобай, злачынна і пакаральна ў абедзвюх дзяржавах. Дзяржава можа дамагацца выдачы

злачынца ў трох выпадках: калі злачынец з'яўляецца яе грамадзянінам, калі злачынства ўчынена на яе тэрыторыі, калі дзяржаве гэтым злачынствам нанесена шкода.

Адпаведна з арт.12 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь "Рэспубліка Беларусь можа надаваць права прытулку асобам, якія церпяць праследаванне ў іншых дзяржавах за палітычныя, рэлігійныя перакананні або нацыянальную прыналежнасць". Прадастаўленне прытулку замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства – гэта суверэннае права Рэспублікі Беларусь, якое адпавядае прынцыпам міжнароднага права. Артыкул 14 Усеагульнай Дэкларацыі Правоў Чалавека 1948 г. указвае, што кожны чалавек мае права шукаць прытулку ад праследавання ў іншых краінах і карыстацца гэтым прытулкам, акрамя выпадку праследавання, сапраўды заснаванага на ўчыненні непалітычнага злачынства, ці дзеяння, што супярэчыць мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У Дэкларацыі аб тэрытарыяльным прытулку, прынятай Генеральнай Асамблеяй ААН у 1967 г., падкрэсліваецца, што правам прытулку не павінны карыстацца асобы, якія здзейснілі злачынствы супраць міру, чалавечнасці і ваенныя злачынствы.

## §5. Тлумачэнне крымінальнага закону

Практычная рэалізацыя кожнай нормы крымінальнага закону патрабуе выяўлення яе сапраўднага сэнсу, раскрыцця яе прызначэння. Гэта забяспечвае дакладнае і аднастайнае разуменне і прымяненне крымінальнага закону, выдаленне незразумеласцей і магчымых памылак пры яго рэалізацыі, што з'яўляецца важнай перадумовай законнасці.

Пад тлумачэннем крымінальнага закону разумеюць дзейнасць органаў правасуддзя, службовых асоб, вучоных і асобных грамадзян па ўстанаўленню зместу норм крымінальнага права. Тлумачэнне патрэбна ў працэсе праватворчай дзейнасці, пры ажыццяўленні правасуддзя, рэалізацыі норм крымінальнага права суб'ектамі права, у навуковай дзейнасці, пры выкладанні крымінальнага права студэнтам. Тлумачэнне крымінальнага закону адрозніваюць па яго прыёмах, аб'ёму, суб'екту і юрыдычных выніках.

Па прыёмах вылучаюць граматычнае (тэкставае ці філалагічнае), сістэматычнае, гістарычнае, лагічнае тлумачэнне.

Граматычнае тлумачэнне грунтуецца на аналізе сэнсу асобных слоў нормы, пабудовы фраз, расстаноўкі знакаў прыпынку і г.д. Для ўсведамлення сэнсу закону іншы раз патрабуецца марфалагічны, этымалагічны і сінтаксічны разбор яго тэксту. Напр., спекуляцыя (арт.$150^6$ КК) вызначаецца ў законе як "скупка ... і перапродаж". Наяўнасць злучніка "і" сведчыць аб тым, што для гэтага злачынства абавязкова спалучэнне двух названых дзеянняў. Адваротны прыклад у арт.213 КК, дзе гаворыцца: "Нашэнне, хаванне, выраб або збыт агнястрэльнай зброі ..." Сінтаксічны аналіз паказвае, што кожнае з пералічаных дзеянняў можа разглядацца як самастойнае скончанае злачынства.

**Сістэматычнае тлумачэнне** грунтуецца на ўстанаўленні сувязей і ўзаемазалежнасцей тлумачанай нормы з іншымі, блізкімі паводле зместу нормамі і прававымі інстытутамі, на вызначэнні месца, якое займае пэўная норма ў структуры нарматыўнага акта, напр., КК. Супастаўленне арт. 208 КК "Парушэнне дзеючых на транспарце правілаў" з іншымі артыкуламі, якія прадугледжваюць адказнасць за транспартныя злачынствы (арт.81, 82, 206, 241–243 КК), дазваляе вызначыць характар парушэнняў і кола адказных асоб па арт.208 КК. Робіцца вывад, што суб'ектамі гэтага злачынства з'яўляюцца пешаходы, веласіпедысты, паганятыя жывёлы, а таксама іншыя асобы, якія не пералічаны ў другіх артыкулах аб транспартных злачынствах. Супастаўленне арт.120 КК "Злоснае ўхіленне ад уплаты аліментаў або ад утрымання дзяцей" з арт.80, 95, 125 Кодэкса аб шлюбе і сям'і Рэспублікі Беларусь дазваляе вызначыць асоб, якія адказваюць па арт.120 КК. Імі з'яўляюцца не толькі бацькі, але і юрыдычна прыроўненыя да іх асобы – усынавіцелі, а таксама асобы, якія пазбаўлены бацькоўскіх правоў.

**Гістарычнае тлумачэнне** дазваляе зразумець крымінальны закон шляхам аналізу сацыяльнага значэння нормы, яе мэт, намеру заканадаўцы, грамадска–палітычных абставін, якія абумовілі прыняцце тлумачанай нормы. Гэты від тлума-

чэння, у прыватнасці, прадугледжвае вывучэнне гістарычнай сітуацыі, тэксту законапраекта, вынікаў яго абмеркавання ў спецыяльных камісіях, дакладах і спрэчках у заканадаўчых органах.

**Лагічнае тлумачэнне** – гэта выкарыстанне законаў фармальнай логікі для ўсведамлення сэнсу крымінальна–прававой нормы цалкам або часткова. Прыкладам лагічнага тлумачэння з'яўляецца п.7 Пастановы № 7 Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 17 верасня 1993 г. (гл.: Судовы веснік. 1993. N 4. С.18), у якім гаворыцца, што па сэнсу закону пад умяшаннем у дзеянні работніка міліцыі, якое цягне адказнасць па арт. $188^2$ КК, неабходна разумець наўмысныя дзеянні, якія маюць мэтай перашкодзіць выкананню ім службовых абавязкаў.

У выніку тлумачэння сапраўдны змест нормы можа быць вызначаны з рознай ступенню адпаведнасці слоўнай фармулёўцы закону. У залежнасці ад "аб'ёму" тлумачэння выдзяляюць літаральнае, пашыранае і абмежаванае тлумачэнне.

**Літаральнае тлумачэнне** заключаецца ў трактоўцы палажэнняў закону строга ў адпаведнасці з яго тэкстам, згодна з "літарай закону". Тлумачэнне ў гэтым аб'ёме павінна з'яўляцца тыповым для судовай практыкі і навукі крымінальнага права.

**Пашыранае тлумачэнне** заключаецца ў больш шырокім разуменні зместу нормы, чым гэта вынікае з тэксту артыкула. Напр., арт.121 КК указвае: "Злоснае ўхіленне ад уплаты па рашэнню суда сродкаў на ўтрыманне непрацаздольных бацькоў ..." Пры літаральным тлумачэнні адказнасць за гэта злачынства павінны несці толькі дзеці пацярпеўшых, аднак прыёмы сістэматычнага і лагічнага тлумачэння дазваляюць пашырыць кола асоб, якія адказныя: гэта ўсыноўленыя, пасынкі і падчарыцы.

**Абмежаванае тлумачэнне** мае месца, калі сэнс нормы разумеецца вужэй за змест артыкула. Напр., арт.155 КК прадугледжвае адказнасць за выраб або захоўванне з мэтай продажу самагону або "іншых моцных спіртных напіткаў дамашняй выпрацоўкі". Аднак судовая практыка пад моцнымі спіртнымі напіткамі дамашняй выпрацоўкі разумее толькі тыя напіткі, якія выпрацаваны шляхам аддзялення перагонкай

або іншым спосабам алкагольнай масы ад прадуктаў браджэння. Такім чынам, піва ці віно, зробленыя шляхам натуральнага браджэння, не лічацца прадметам гэтага злачынства.

Тлумачэнне крымінальнага закону адрозніваецца і ў залежнасці ад таго, які орган ці якая асоба даюць тлумачэнне. Па суб'екту тлумачэння вылучаюць легальнае, аўтэнтычнае, судовае і дактрынальнае тлумачэнні.

**Легальнае тлумачэнне** даецца органам, які адпаведна з законам мае правамоцтвы тлумачыць закон. Відам легальнага тлумачэння з'яўляецца **аўтэнтычнае тлумачэнне,** якое даецца органам, які прыняў закон. Адпаведна з п.2 арт.97 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Парламент Рэспублікі Беларусь дае тлумачэнне законаў. Прыкладам аўтэнтычнага тлумачэння можа быць п.6 Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 1 сакавіка 1994 г. "Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь" (гл.: Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1994. №12. Арт.177).

**Судовае тлумачэнне** даецца крымінальнаму закону ў працэсе яго прымянення і абагульнення судовай практыкі. Неабходна выдзеліць судовае тлумачэнне, якое даецца ў прыгаворах, вызначэннях і пастановах судоў усіх інстанцый па канкрэтных крымінальных справах. Такое тлумачэнне абавязкова толькі ў адносінах да пэўнай крымінальнай справы. Іншы характар маюць тлумачэнні па пастановах Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, па пытаннях прымянення заканадаўства, у тым ліку крымінальнага. Гэтыя тлумачэнні па з'яляюцца абавязковымі для ўсіх судоў, іншых органаў і службовых асоб пры прымяненні імі крымінальнага закону.

**Дактрынальнае (навуковае) тлумачэнне** крымінальнага закону даецца навуковымі ўстановамі, вучонымі ў манаграфіях, падручніках, каментарыях да закону, навуковых артыкулах і іншых публікацыях, у лекцыях. Дактрынальнае тлумачэнне ўлічваецца ў праваторчай дзейнасці, спрыяе павышэнню эфектыўнасці крымінальнага заканадаўства і практыкі яго прымянення, садзейнічае фарміраванню ў грамадзян правасвядомасці.

У залежнасці ад юрыдычных вынікаў, да якіх прыводзіць тлумачэнне, вылучаюць афіцыйнае і неафіцыйнае тлумачэнне.

**Афіцыйнае тлумачэнне** мае дырэктыўны характар, яно абавязковае да выканання, даецца ўпаўнаважаным на тое органам у спецыяльным акце (напр., Пастанова Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь аб судовай практыцы па крымінальных справах), адрасавана канкрэтнаму колу органаў і службовых асоб. Афіцыйным з'яўляецца легальнае і судовае тлумачэнне. Яно бывае нарматыўным і казуальным. Нарматыўнае тлумачэнне абавязковае для ўсіх органаў і службовых асоб, падведамасных органу, які ажыццяўляе тлумачэнне, і пашыраецца на ўсё кола выпадкаў, прадугледжаных тлумачанай крымінальна–прававой нормай. Гэта забяспечвае правільнае і аднастайнае прымяненне закону. Казуальнае тлумачэнне – гэта афіцыйнае тлумачэнне крымінальна–прававой нормы, якое даецца судом або іншымі кампетэнтнымі органамі і службовымі асобамі паводле разгляду канкрэтнай крымінальнай справы.

**Неафіцыйнае тлумачэнне** даецца ў выглядзе рэкамендацый, парад, каментарыяў практычнымі работнікамі і іншымі асобамі. Відам неафіцыйнага тлумачэння з'яўляецца дактрынальнае тлумачэнне.

## *Літаратура:*

Блум М.И. Действие советского уголовного закона в пространстве. Рига, 1974; Блум М., Типле А. Обратная сила закона. Действие советского уголовного закона во времени. М., 1969; Бойцов А.И. Действие уголовного закона во времени и пространстве. СПб., 1995; Валеев Р.М. Выдача преступников в современном международном праве. Казань, 1976; Горелик И.И., Тишкевич И.С. Вопросы уголовного права (Общей части) в практике Верховного Суда БССР. Минск, 1973. С.722, 5866; Дурманов Н.Д. Советский уголовный закон. М., 1967; О дипломатических сношениях: Венская конвенция ООН от 18 апреля 1961 г. // Белорусская ССР в международных отношениях. Многосторонние международные договоры, конвенции и соглашения БССР (1960–1980). Минск, 1983. С.30; О консульских сношениях: Венская конвенция ООН от 24 апреля 1963 г. // Посольское и консульское право в избранных документах. М., 1972. С.30.

# Глава 3

# ПАНЯЦЦЕ ЗЛАЧЫНСТВА

## §1. Паняцце і прыкметы злачынства

Паняцце злачынства звязана са з'яўленнем у грамадстве дзяржавы і права. Узнікнуўшы, дзяржава ў выдаваемых ёю прававых нормах вызначае, якія дзеянні (або бяздзейнасць) з'яўляюцца злачыннымі і якія меры пакарання павінны прымяняцца за іх учыненне. Безумоўна, што яшчэ задоўга да гэтага, пры першабытным ладзе асобныя члены ўчынялі грамадска небяспечныя дзеянні, якія супярэчылі існуючым тады нормам паводзін, норавам і звычаям. Да гэтых людзей прымяняліся розныя меры ўздзеяння: кроўная помста, выгнанне і іншыя, якія не з'яўляліся крымінальным пакараннем. Інакш кажучы, грамадска небяспечныя ўчынкі, эксцэсы, канфлікты як сацыяльная з'ява ўзніклі і існавалі задоўга да з'яўлення дзяржавы і права, а таксама самога паняцця злачынства.

Паняцце злачынства ў розных дзяржавах з моманту іх узнікнення ў значнай частцы было розным, як былі рознымі і пакаранні, якія прымяняліся за ўчыненне злачынстваў. Гэта абумоўлівалася рознымі сацыяльнымі ўмовамі жыцця людзей, іх звычаямі і традыцыямі. На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва паняцце злачынства мянялася, паколькі мяняліся сацыяльныя ўмовы жыцця людзей.

Цяпер ў розных краінах сацыяльныя ўмовы жыцця людзей з іх супярэчнасцямі, звычаямі і традыцыямі ў значнай частцы адрозніваюцца, а таму прызнанне тых або іншых учынкаў злачынствамі ў іх таксама розніцца. Напр., у Егіпце прызнаецца злачынствам збіранне акуркаў на вуліцах, а ў Нігерыі – парушэнне няпісаных сямейных законаў, якія выяўляюцца ў непаважлівасці ці непаслушэнстве старэйшым членам сваёй сям'і.

Злачынства – не толькі крымінальна–прававая, але і са-

цыяльная з'ява. Злачынства – сацыяльнае, таму што яно ўчыняецца ў грамадстве і робіць замах на існуючыя ў ім грамадскія адносіны, прычыняе гэтым адносінам пэўную шкоду. Да таго ж злачынства ўчыняе чалавек – член дадзенага грамадства. Акрамя таго, і прычыны ўчыняемых злачынстваў сацыяльныя. У іх якасці выступаюць розныя супярэчнасці, іншыя негатыўныя з'явы, уласцівыя дадзенаму грамадству.

З паняццем злачынства цесна ўзаемазвязана такое паняцце, як злачыннасць. Гэтыя паняцці хоць і блізкія паміж сабою, аднак не з'яўляюцца тоеснымі. Злачынства -- гэта адзінкавы акт паводзін чалавека, які крымінальны закон прызнае злачынным. Злачыннасць жа -- гэта сукупнасць усіх здзейсненых злачынстваў у канкрэтным грамадстве за пэўны час. Яны суадносяцца паміж сабой як адзінкавае і агульнае.

У КК Рэспублікі Беларусь паняцце злачынства даецца ў арт.7. У ім гаворыцца: "Злачынствам прызнаецца ўчыненае вінавата грамадска небяспечнае дзеянне (дзеянне або бяздзейнасць), забароненае гэтым Кодэксам." Як гэта вынікае з дадзенага азначэння, закон называе тры прыкметы злачынства: грамадская небяспечнасць, процiпраўнасць і вінаватасць.

Грамадская небяспечнасць як прыкмета злачынства заключаецца ў небяспечнасці дзеяння для грамадскіх адносін, у прычыненні ці пагрозе прычынення ім пэўнай шкоды. У канцэнтраваным выглядзе гэтыя грамадскія адносіны пералічаны ў арт.1 КК, у якім прадугледжваецца, што КК Беларусі мае задачай ахову жыцця і здароўя чалавека, яго правоў і свабод, канстытуцыйнага ладу, дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, уласнасці, прыроднага асяроддзя, устаноўленага правапарадку.

Грамадская небяспечнасць злачынства, хоць і не паддаецца пачуццёваму ўспрыманню, існуе аб'ектыўна, незалежна ад нашай свядомасці і можа быць пазнана шляхам высвятлення шкоднага ўплыву дадзенага дзеяння для грамадскіх адносін.

Характар і ступень грамадскай небяспечнасці таго ці іншага злачынства вызначаецца перш за ўсё яго аб'ектам, г.зн. тымі грамадскімі адносінамі, на якія робіць замах грамадска не-

бяспечнае дзеянне (ці бяздзейнасць). Чым важней ахоўваемыя крымінальным законам грамадскія адносіны, тым вышэй ступень грамадскай небяспечнасці дадзенага злачынства. Так, напр., асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы (арт. арт. 61–69 КК) больш грамадска небяспечныя, чым злачынствы супраць парадку кіравання. Забойства больш грамадска небяспечнае, чым цялесныя пашкоджанні любой цяжкасці.

Ступень грамадскай небяспечнасці злачынства ў многім залежыць ад яго аб'ектыўных прыкмет і перш за ўсё ад той шкоды, якая наносіцца ці можа быць нанесена грамадскім адносінам. Чым большая шкода прычыняецца (або ствараецца пагроза прычынення такой шкоды), тым вышэй грамадская небяспечнасць такога злачынства. Так, напр., раскраданне ў буйным памеры, учыненае шляхам крадзяжу, значна больш небяспечнае, чым просты крадзёж (гл. арт.87 КК). На ступень грамадскай небяспечнасці ўплываюць і такія аб'ектыўныя прыкметы, як спосаб, месца, час, абставіны ўчынення злачынства. Напр., незаконнае паляванне з выкарыстаннем аўтамотатранспартных сродкаў (ч.2 арт.163 КК) больш грамадска небяспечнае і больш строга караецца законам, чым незаконнае паляванне без такіх сродкаў (ч.1 арт.163 КК).

Значна ўплываюць на грамадскую небяспечнасць злачынства і суб'ектыўныя прыкметы: віна, матыў і мэта. Так, напр., грамадская небяспечнасць наўмыснага цяжкага цялеснага пашкоджання (ч.1 арт.106 КК) значна вышэй, чым неасцярожнага цяжкага цялеснага пашкоджання (ч.1 арт. 112 КК). Забойства з карыслівай мэтай або з хуліганскіх намераў (п."а" і "б" арт.100 КК) больш небяспечнае, чым забойства пры адсутнасці вышэйназваных матываў (арт.101 КК).

Ступень грамадскай небяспечнасці злачынстваў знаходзіць сваё юрыдычнае выяўленне ў санкцыях Асаблівай часткі КК. У санкцыях артыкулаў Асаблівай часткі КК за асабліва грамадска небяспечныя злачынствы прадугледжваецца пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на працяглыя тэрміны або нават пакаранне смерцю. Злачынствы, якія не складаюць вялікай грамадскай небяспечнасці, паводле КК караюцца

пазбаўленнем волі на кароткія тэрміны, папраўчымі работамі без пазбаўлення волі, штрафам ці іншымі больш мяккімі мерамі пакарання, чым пазбаўленне волі.

Грамадская небяспечнасць – прыкмета любога злачынства. Адсутнасць яе азначае, што ўчыненае дзеянне (ці бяздзейнасць) не можа быць прызнана злачынствам. частка 2 арт.7 КК прадугледжвае: "Не з'яўляюцца злачынствам дзеянне або бяздзейнасць, якія хоць фармальна і маюць прыкметы якоганебудзь дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, але з прычыны малазначнасці не з'яўляюцца грамадска небяспечнымі."

Будзе адсутнічаць грамадская небяспечнасць злачынства, напр., пры крадзяжы малакаштоўнай маёмасці (алоўка, пачка запалак і г.д.), хаця фармальна тут маюцца ўсе прыкметы злачынства, прадугледжанага арт. 87 КК.

У многіх выпадках малазначныя дзеянні могуць быць супрацьпраўнымі і шкоднымі з пункту гледжання адміністрацыйнага, працоўнага, грамадзянскага права і таму цягнуць за сабой адпаведную адказнасць. З пункту гледжання крымінальнага права малазначныя дзеянні або зусім не з'яўляюцца грамадска небяспечнымі, або маюць вельмі малую ступень грамадскай небяспечнасці. Таму ч.2 арт.1 КК і прадугледжана, што "Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь вызначае, якія грамадска небяспечныя дзеянні з'яўляюцца злачыннымі, і ўстанаўлівае пакаранні, што павінны быць ужыты да асоб, якія ўчынілі злачынствы." З закону выцякае, што не ўсе грамадска небяспечныя дзеянні прызнаюцца злачынствамі, а толькі такія, якія маюць адпаведную ступень грамадскай небяспечнасці. Напр., дробнае раскраданне маёмасці, учыненае асобай у першы раз, наогул кажучы, прадстаўляе грамадскую небяспечнасць і будзе цягнуць за сабой адміністрацыйную адказнасць. Крымінальнай жа адказнасці тут не можа быць, паколькі гэтыя дзеянні ў крымінальна–прававым сэнсе не маюць істотнай грамадскай небяспечнасці з прычыны іх малазначнасці.

Прызнанне таго ці іншага грамадска небяспечнага дзеяння (бяздзейнасці) злачынным або незлачынным залежыць ад волі заканадаўца.

Другой прыкметай злачынства з'яўляецца проціпраўнасць грамадска небяспечнага дзеяння (бяздзейнасці). Проціпраўнасць як прыкмета злачынства азначае, што дадзенае дзеянне (бяздзейнасць) забаронена крымінальным законам пад страхам прымянення пакарання. Адны крымінальна-прававыя нормы Асаблівай часткі КК забараняюць учыняць пэўныя дзеянні (напр., тайнае раскраданне маёмасці, крадзеж, арт.87 КК), іншыя ж абавязваюць асобу выконваць указаныя ў законе дзеянні, а ўхіленне ад такіх дзеянняў цягне за сабой крымінальную адказнасць (напр., неаказанне дапамогі хвораму, арт.126 КК). Ніякае дзеянне не можа быць прызнана злачынствам, калі яно не прадугледжана крымінальным законам. У КК, які дзейнічае ў Рэспубліцы Беларусь, дадзены вычарпальны пералік злачынстваў.

Трэцяя прыкмета злачынства –вінаватасць. Яна прадугледжана не толькі ў ч.1 арт.7 КК, але і ў арт.3 КК, дзе вызначана, што крымінальнай адказнасці падлягае толькі асоба, якая вінавата ва ўчыненні злачынства. Дадзеная прыкмета злачынства адлюстроўвае тое, што грамадска небяспечнае дзеянне (бяздзейнасць) учыняецца асобай наўмысна ці неасцярожна, г.зн. вінавата.

Невінавата ўчыненае дзеянне, якую б грамадскую небяспечнасць яно ні складала і якія б цяжкія вынікі ад яго ні былі, не можа быць прызнана злачынствам, паколькі крымінальнае права Рэспублікі Беларусь (арт.арт.3 і 7 КК) выключае аб'ектыўнае стаўленне ў віну, г.зн. адказнасць за дзеянне (бяздзейнасць) без віны. Асоба ўчыняе грамадска небяспечнае дзеянне (бяздзейнасць) без віны тады, калі яна не ўсведамляла небяспечны характар свайго дзеяння, не прадбачыла, не абавязана была або не магла прадбачыць грамадска небяспечных вынікаў свайго дзеяння (бяздзейнасці). Крымінальная адказнасць у такіх выпадках выключаецца, а ўчыненае дзеянне не можа разглядацца як злачынства.

Злачынства не мысліцца без пакарання. Таму чацвёртай прыкметай злачынства з'яўляецца пакаральнасць. У ч.2 арт.1 КК прадугледжана, што крымінальнае заканадаўства ўстанаўлівае пакаранні, якія падлягаюць прымяненню да асоб,

якія ўчынілі злачынствы. Канкрэтныя пакаранні за ўчыненне таго ці іншага злачынства прадугледжаны ў санкцыях артыкулаў Асаблівай часткі КК. Віды і памеры пакаранняў у іх залежаць ад грамадскай небяспечнасці злачынства.

Не з'яўляецца злачынствам дзеянне, хоць і забароненае крымінальным законам, калі яно не цягне за сабой крымінальнага пакарання. Так, напр., нельга прызнаць злачынствам парушэнне статутных правілаў каравульнай службы пры змякчаючых акалічнасцях (п."б" арт.244 КК), паколькі санкцыя дадзенага пункту артыкула не прадугледжвае прымянення крымінальнага пакарання за гэта дзеянне, а прадугледжвае ўжыванне мер, якія вызначаны ў Дысцыплінарным статуце Узброеных Сіл.

Пакаральнасць як прыкмета злачынства зусім не азначае, што абсалютна ва ўсіх выпадках учынення грамадска небяспечнага дзеяння (бяздзейнасці) павінна ўжывацца пакаранне. Пакаранне мае сваёй мэтай выпраўленне і перавыхаванне асобы, якая ўчыніла злачынства. Таму ў тых выпадках, калі гэтыя мэты могуць быць дасягнуты іншымі сродкамі, адпадае і неабходнасць у рэальным прымяненні крымінальнага пакарання. Частка 3 арт.10 КК прадугледжвае, што калі выпраўленне асобы, што ўчыніла ва ўзросце да васемнаццаці гадоў злачынства, якое не выклікае вялікай грамадскай небяспекі, магчыма без ужывання крымінальнага пакарання, суд можа прымяніць да такой асобы прымусовыя меры выхаваўчага характару, якія не з'яўляюцца крымінальным пакараннем (арт.60 КК). Магчымасць вызвалення ад крымінальнай адказнасці і пакарання прадугледжана пры наяўнасці пэўных падстаў, напр., у арт.арт.48 і 49 КК.

Такім чынам, на аснове вышэйсказанага злачынства можна вызначыць як грамадска небяспечнае, крымінальна-праціпраўнае, вінаватае і пакаральнае дзеянне (бяздзейнасць), якое робіць замах на ахоўваемыя крымінальным законам грамадскія адносіны.

## §2. Адрозненне злачынства ад іншых правапарушэнняў

Злачынства складае асобны від правапарушэння. Яно адрозніваецца ад адміністрацыйных, дысцыплінарных і

іншых правапарушэнняў спецыфічнымі, уласцівымі толькі яму прыкметамі.

Усе правапарушэнні -- грамадска небяспечныя. Таму яны і прызнаюцца законам правапарушэннямі і за іх учыненне прадугледжаны адпаведныя меры ўздзеяння. Аднак ступень грамадскай небяспечнасці злачынства і іншых правапарушэнняў адрозніваецца. Злачынству ўласціва большая грамадская небяспечнасць, чым любому іншаму правапарушэнню. Большая грамадская небяспечнасць злачынства ў параўнанні з іншымі правапарушэннямі абумоўліваецца шэрагам аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў.

На ступень грамадскай небяспечнасці правапарушэння значны ўплыў аказвае прычыненая шкода. Для злачынства ўласціва прычыненне істотнай шкоды. Так, напр., самаўпраўства, якое не прычыніла істотнай шкоды грамадзянам або прадпрыемствам, установам ці арганізацыям, складае адміністрацыйнае правапарушэнне (арт.167 КаАП). Гэтыя ж дзеянні, якія прычынілі істотную шкоду грамадзянам, прадпрыемствам, установам ці арганізацыям, з'яўляюцца злачынствам (арт.196 КК).

Правапарушэнне часам прызнаецца злачынствам толькі тады, калі нанесена вялікая шкода. Наўмысная патрава пасеваў, а таксама наўмыснае пашкоджанне полеахоўных лесанасаджэнняў, пладова–ягадных і іншых насаджэнняў, якое нанесла вялікую шкоду, разглядаецца як злачынства (арт.164 КК), а тыя ж дзеянні, якія не выклікалі ўказаных вынікаў, уяўляюць сабой адміністрацыйнае правапарушэнне (арт.97 КаАП).

Ступень грамадскай небяспечнасці залежыць у многіх выпадках ад спосабу, месца, часу і абставін учынення дзеяння (бяздзейнасці). Напр., незаконнае заняцце рыбным або іншым водным здабываючым промыслам прызнаецца злачынствам, калі яно ўчыняецца без належнага на тое дазволу або ў забаронены час, або ў недазволеных месцах, або недазволенымі прыладамі, спосабамі і прыёмамі (арт.161 КК). Пры адсутнасці гэтых прыкмет дадзенае дзеянне з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем і цягне за сабою адміністрацыйную адказнасць (арт.87 КаАП).

Ступень грамадскай небяспечнасці дзеяння значна павялічваецца, калі яно ўчыняецца паўторна, неаднаразова, сістэматычна. Таму некаторыя дзеянні, учыненыя ў першы раз, уяўляюць сабой адміністрацыйнае ці іншае правапарушэнне, а калі яны ўчынены паўторна (неаднаразова, сістэматычна), то заканадаўца разглядае іх як злачынства. Так, напр., дробнае раскраданне маёмасці, якое было ўчынена ў першы раз, з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем (арт.51 КаАП). У выпадку ўчынення яго паўторна на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, яно прызнаецца злачынствам і цягне крымінальную адказнасць па арт.94 КК.

Значны ўплыў на ступень грамадскай небяспечнасці дзеяння (бяздзейнасці) маюць і суб'ектыўныя прыкметы. У некаторых выпадках дзеянне злачынна, калі яно ўчынена наўмысна. Учыненне такога дзеяння па неасцярожнасці складае іншае правапарушэнне. Так, нанясенне лёгкага цялеснага пашкоджання, якое выклікала кароткачасовае расстройства здароўя або нязначную стойкую страту працаздольнасці з'яўляецца злачынствам, калі яно ўчынена наўмысна (арт.110 КК). Прычыненне такіх жа цялесных пашкоджанняў па неасцярожнасці не з'яўляецца злачынствам.

Часам значна павышае ступень грамадскай небяспечнасці наяўнасць такіх суб'ектыўных прыкмет, як матыў і мэта. Злоўжыванне ўладай або службовым становішчам, прычыніўшае істотную шкоду правам і законным інтарэсам грамадзян або дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам, прызнаецца злачынствам тады, калі яно ўчынена з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці (ч.1 арт.166 КК). Пры адсутнасці ўказаных матываў здзейсненае ўяўляе сабою службовы праступак. Злачынства, як ужо адзначалася раней, ва ўсіх выпадках без выключэння – гэта вінаватае дзеянне. Без віны няма злачынства. Абсалютная большасць іншых правапарушэнняў таксама з'яўляецца правапарушэннямі, калі яны ўчынены вінавата. Аднак у некаторых выпадках за дзеянні, учыненыя і без віны, наступае адпаведная адказнасць. Напр., за шкоду, якая нанесена крыніцай павышанай небяспечнасці, наступае

грамадзянска-прававая адказнасць і тады, калі гэтая шкода была прычынена і без віны (арт.451 ГК).

Злачынства адрозніваецца ад іншых правапарушэнняў і тым, што за ўчыненне злачынства крымінальны закон прадугледжвае крымінальнае пакаранне, а за правапарушэнні ўжываюцца зусім іншыя меры ўздзеяння, якія прадугледжаны ў адміністрацыйным, працоўным, грамадзянскім і другіх заканадаўствах.

Злачынства і іншыя правапарушэнні адрозніваюцца і па сваіх юрыдычных выніках. Асуджэнне асобы за ўчыненае злачынства з назначэннем пакарання цягне за сабою судзімасць, якая звязана з рознымі абмежаваннямі. Такіх вынікаў для асобы, учыніўшай іншае правапарушэнне, не настае.

## §3. Класіфікацыя злачынстваў

Класіфікацыя злачынстваў на групы магчыма на аснове розных крытэрыяў. Такімі крытэрыямі, у прыватнасці, могуць быць аб'ект замаху, ступень грамадскай небяспечнасці і форма віны.

Па родаваму аб'екту замаху ўсе злачынствы ў КК Беларусі падраздзяляюцца: на дзяржаўныя (арт.арт.61–86[1] КК), супраць уласнасці (арт.арт. 87–98 КК), супраць жыцця, здароўя, свабоды і годнасці асобы (арт. арт.100–129 КК), супраць палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых правоў грамадзян (арт.арт.130–140 КК), супраць прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай дзейнасці (арт.арт.149–165 КК), супраць нармальнай дзейнасці апарата кіравання (службовыя, арт.арт.166–171[1] КК); супраць парадку кіравання (арт.арт.186[2]–2200 КК), супраць правасуддзя (арт.арт.172–186 КК), супраць грамадскай бяспекі, грамадскага парадку і здароўя насельніцтва (арт.арт.201–225[1] КК) і злачынствы супраць установленага парадку нясення воінскай службы (воінскія злачынствы, арт.арт.226–258 КК). Усе раздзелы Асаблівай часткі КК маюць свой родавы аб'ект. Службовыя злачынствы вылучаны ў самастойны раздзел, выходзячы гаксама з асаблівасцей суб'екта злачын-

ства (службовая асоба). Усваю чаргу злачынствы, змешчаныя ў тым ці іншым раздзеле, можна падраздзяліць на самастойныя групы ў залежнасці ад непасрэднага аб'екта замаху. Так, злачынствы, прадугледжаныя ў раздзеле 8 (арт.арт.100–129 КК), можна падраздзяліць на злачынствы супраць жыцця, супраць здароўя, супраць палавой свабоды і г.д.

Па ступені грамадскай небяспечнасці (па ступені іх цяжкасці) КК Беларусі, судовая практыка і навука крымінальнага права падраздзяляюць усе злачынствы на асабліва цяжкія, цяжкія, менш цяжкія і злачынствы, якія не прадстаўляюць вялікай грамадскай небяспечнасці. Трэба адзначыць, што выразнай і поўнай класіфікацыі па гэтаму крытэрыю ў КК няма.

Пералік цяжкіх злачынстваў дадзены ў арт.$7^1$ КК. Да іх закон, у прыватнасці, адносіць такія, як асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы (арт.арт.61–69), бандытызм (арт.74), масавыя беспарадкі (арт.76), выраб або збыт фальшывых грошай ці каштоўных папер (арт.85), наўмыснае забойства (арт.арт.100 і 101), наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне (арт.106), згвалтаванне (арт.115), захоп заложнікаў (арт.$124^1$), атрыманне хабару (арт.169), злоснае ці асабліва злоснае хуліганства (ч.ч.2 і 3 арт.201) і многія іншыя. Цяжкія злачынствы – гэта такія наўмысныя злачынствы, якія прадстаўляюць павышаную грамадскую небяспечнасць.

Тыя з цяжкіх злачынстваў, за ўчыненне якіх можа быць назначана пакаранне смерцю або пазбаўленне волі на тэрмін звыш 10 гадоў, у законе называюцца асабліва цяжкімі (ч.1 арт.22 і ч.1 арт.23 КК).

Менш цяжкія злачынствы – гэта такія наўмысныя або неасцярожныя злачынствы, грамадская небяспечнасць якіх меншая, чым цяжкіх, аднак значна большая, чым у злачынстваў, якія не прадстаўляюць вялікай грамадскай небяспечнасці. Азначэння менш цяжкіх злачынстваў і іх пераліку ў КК няма. Да менш цяжкіх злачынстваў адносяцца, напр., парушэнне правілаў руху і эксплуатацыі транс-

парту (арт.82 КК), уцягненне непаўналетніх у злачынную дзейнасць (арт.205 КК), утрыманне прытонаў распусты і зводніцтва з карыслівай мэтай (ч.1 арт.221 КК) і іншыя.

Злачынствы, якія не яўляюць вялікай грамадскай небяспечнасці, – гэта такія наўмысныя або неасцярожныя злачынствы, за ўчыненне якіх магчыма вызваленне ад крымінальнай адказнасці або пакарання з прымяненнем мер грамадскага ўздзеяння (арт.49 КК) або прымусовых мер выхаваўчага характару да непаўналетніх (ч.3 арт.10 КК). Да такіх злачынстваў можна аднесці, напр., недобрасумленныя адносіны да аховы маёмасці (арт.98 КК), злоснае ўхіленне ад аказання дапамогі хвораму пры адсутнасці акалічнасцей, якія абцяжарваюць адказнасць (ч.1 арт.126 КК).

Паняцця злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспечнасці, у КК Беларусі не дадзена, няма ў ім і пераліку гэтых злачынстваў. Вырашаючы пытанне аб наяўнасці злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, органы дазнання, следства і суд павінны ўлічваць характар здзейсненага, ступень небяспечнасці вынікаў злачынства, а таксама нормы артыкулаў 36–38, 48, 49 КК. Судовая практыка, як правіла, адносіць да такіх злачынстваў тыя, якія караюцца не больш цяжкім пакараннем, чым пазбаўленне волі на тэрмін тры гады.

У залежнасці ад формы віны ўсе злачынствы ў КК падраздзяляюцца на наўмысныя, неасцярожныя і злачынствы, якія могуць быць учынены як наўмысна, так і неасцярожна. Абсалютная большасць злачынстваў учыняецца толькі наўмысна. Да іх, напр., адносяцца ўсе асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы (арт.арт.61–69), раскраданне маёмасці (арт.арт.87–91, 93 КК). Некаторыя са злачынстваў могуць быць учынены толькі па неасцярожнасці (страта дакументаў, якія маюць дзяржаўную тайну, – арт.73 КК, нядбайнасць– арт.168 КК).

У КК змяшчаецца і пэўная колькасць злачынстваў, якія могуць учыняцца як наўмысна, так і па неасцярожнасці. Так, разглашэнне дзяржаўнай тайны (арт.72 КК) у адных выпадках здзяйсняецца наўмысна, а ў іншых – па неасцярожнасці.

## *Літаратура:*

Карпец И.И. Преступность: иллюзии и реальность. М., 1992; Кривоченко Л.Н. Классификация преступлений. Харьков, 1979; Кузнецова Н.Ф. Преступление и преступность. М., 1969; Основания уголовно–правового запрета. Криминализация и декриминализация. М., 1982; Пионтковский А.А. Учение о преступлении. М., 1961; Прохоров В.С. Преступление и ответственность. Л., 1981; Фефелов П.А. Общественная опасность преступного деяния и основание уголовной ответственности. Основные методологические проблемы. М., 1972.

# Глава 4

# СКЛАД ЗЛАЧЫНСТВА

## §1. Паняцце складу злачынства

Вучэнне аб складзе злачынства займае адно з цэнтральных месцаў у тэорыі крымінальнага права. Яно таксама мае вялікае значэнне для судова-следчай практыкі. Аднак у крымінальным законе не змяшчаецца агульнага паняцця складу злачынства. Яно даецца навукай крымінальнага права, зыходзячы з заканадаўчага азначэння падстаў крымінальнай адказнасці (арт.3 КК), паняцця злачынства (арт.7 КК) і тэарэтычнага абагульнення прыкмет складаў канкрэтных злачынстваў, прадугледжаных нормамі Асаблівай часткі крымінальнага права.

Адзначыўшы галоўную функцыю складу злачынства – быць падставай крымінальнай адказнасці, закон аб складзе злачынства гаворыць толькі прымяняльна да адказнасці асобы, якая добраахвотна адмовілася ад злачынства. Такая адказнасць надыходзіць у тым выпадку, "калі фактычна ўчыненае ёю дзеянне мае склад іншага злачынства" (арт.16 КК). У адпаведнасці з арт.3 Мадэльнага КК для дзяржаў-удзельніц СНД адзінай падставай крымінальнай адказнасці з'яўляецца здзяйсненне злачынства, гэта значыць учынку, які змяшчае ўсе прыкметы складу злачынства, прадугледжанага крымінальным законам. Аналагічны сэнс укладае ў паняцце складу злачынства крымінальна-працэсуальнае заканадаўства, напр., у нормах аб спыненні крымінальнай справы з-за адсутнасці ў дзеянні складу злачынства, аб прыгаворы і інш. (гл., напр., п.2 арт.5; п.2 ч.3 арт.311 КПК Беларусі).

Паняццем і тэрмінам "склад злачынства" часта карыстаецца правапрымяняльная практыка, якая прызнае падставай крымінальнай адказнасці наяўнасць у дзеяннях асобы складу злачынства. Гэта палажэнне – адно з праяўленняў прынцыпу законнасці, яно адлюстроўваецца ў шматлікіх кіруючых

пастановах Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і яго пастановах па канкрэтных справах.

Праблема падстаў крымінальнай адказнасці і складу злачынства – адна з найбольш складаных у навуцы крымінальнага права. Склад злачынства выступае ў ролі своеасаблівага крытэрыю наяўнасці ці адсутнасці ў дзеянні асобы таго ўзроўню грамадскай небяспекі, які неабходны і дастатковы для прызнання яго злачынствам. Гэта з'яўляецца гарантыяй аховы правоў і законных інтарэсаў грамадзян, аднастайнага правядзення крымінальнай палітыкі. Адзінай падставай крымінальнай адказнасці з'яўляюцца толькі канкрэтныя грамадска небяспечныя дзеянні, якія вінавата парушаюць прамую забарону крымінальнага закону, а не "небяспечны стан" асобы, "склад думак" асобы і інш.

**Склад злачынства** ўяўляе сабой сістэму прадугледжаных законам элементаў і іх прыкмет, якія характарызуюць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя падставы і ўмовы крымінальнай адказнасці.

Як ужо гаварылася, падставай крымінальнай адказнасці з'яўляецца злачынства, якое, будучы актам чалавечых паводзін, уяўляе сабой грамадска небяспечны вінаваты і крымінальна проціпраўны ўчынак (дзеянне ці бяздзейнасць). Умовамі ж крымінальнай адказнасці з'яўляюцца такія прыкметы складу злачынства, як наяўнасць свядомасці ў суб'екта, дасягненне ім акрэсленага ў законе ўзросту і некаторыя іншыя.

У навуцы крымінальнага права для надання большай дакладнасці тэрміналогіі, якой карыстаюцца пры разглядзе складу злачынства, прынята адрозніваць паняцці "элемент" і "прыкмета", кожнае з якіх мае спецыфічны змест. Склад злачынства ўяўляе сабой сістэму вызначаных у законе інтэграваных, узаемапранікальных прыкмет, не існуючых незалежна ад элементаў – састаўных частак складу злачынства.

Прыкметы, якія прадугледжаны законам і ў сукупнасці ўтвараюць склад злачынства, падчас называюць сукупнасцю прыкмет. Аднак правільней называць іх не проста сукупнасцю, а сістэмай, бо склад злачынства валодае ўсімі важнейшымі

ўласцівасцямі, якія мае сістэма як цэласнасць. Падобна ўласцівасцям усякай сістэмы, адсутнасць любога элемента ў дзеянні асобы вядзе да адсутнасці складу злачынства, ці практычна да прызнання, што асоба не падлягае крымінальнай адказнасці.

Апісанне заканадаўцам элементаў і прыкмет складу канкрэтнага злачынства ўключае толькі найбольш характэрныя, істотныя і тыповыя прыкметы грамадска небяспечнага дзеяння, якія характарызуюць яго як злачынства таго ці іншага віду. Канкрэтны склад злачынства змяшчае прыкметы, уласцівыя пэўнаму віду злачынства, якія адмяжоўваюць яго ад іншых злачынстваў (напр., грабёж ад разбою, забойства ад цялеснага пашкоджання, паклёп ад знявагі). Разам з тым ім уласцівы і прыкметы, агульныя для ўсіх складаў злачынстваў. Іх сістэма ўтварае агульнае паняцце складу злачынства. З'яўляючыся навуковай абстракцыяй, агульнае паняцце складу злачынства абагульняе і раскрывае змест агульных прыкмет, якія характарызуюць аб'ект, аб'ектыўны бок, суб'ект і суб'ектыўны бок як неабходныя элементы складу кожнага злачынства. Гэта паняцце выпрацавана навукай крымінальнага права, зыходзячы з палажэнняў норм Агульнай часткі КК і абагульнення прыкмет канкрэтных складаў злачынстваў.

У тэорыі крымінальнага права вызначана таксама і паняцце складаў асобных груп злачынстваў, аб'яднаных родавым аб'ектам пасягнення (напр., паняцце складу злачынстваў супраць асобы, уласнасці, складу службовых злачынстваў і г.д.). Гэтыя азначэнні разглядаюцца ў Асаблівай частцы крымінальнага права.

Склады канкрэтных злачынстваў ахопліваюць не толькі скончанае злачынства, але і падрыхтаванне да злачынства, замах на злачынства, а таксама дзеянні яго саўдзельнікаў – арганізатара, падбухторшчыка і памагатага. Склады злачынстваў у гэтых выпадках акрэсліваюцца нормамі як Агульнай (арт.15 і 17 КК), так і Асаблівай частак крымінальнага заканадаўства. Нормы Агульнай часткі змяшчаюць характарыстыку аб'ектыўных і суб'ектыўных прыкмет адзначаных форм злачыннай дзейнасці, якая ў спалучэнні з

прыкметамі складаў канкрэтных злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі Асаблівай часткі КК, утварае склад падрыхтавання або замаху ці саўдзелу ў кожным асобным выпадку.

Значэнне складу злачынства – адна з найбольш важных катэгорый крымінальнага права – вызначаецца яго сацыяльна–палітычным і прававым зместам і той роляй, якая адводзіцца яму ва ўмацаванні законнасці і барацьбе са злачыннасцю. Яго значэнне заключаецца перш за ўсё ў тым, што наяўнасць ва ўчынку прыкмет канкрэтнага складу злачынства – адзіная падстава крымінальнай адказнасці. Склад злачынства з'яўляецца законнай, неабходнай і дастатковай падставай крымінальнай адказнасці, інакш кажучы, яе падмуркам. Склад злачынства выконвае і працэсуальную функцыю: ён устанаўлівае галоўныя межы расследавання. Прыкметы складу злачынства, калі яны ўстаноўлены, даюць магчымасць правільна кваліфікаваць злачынства, прадрашаюць правільную юрыдычную ацэнку зробленага, гарантуюць ад беспадстаўнага прыцягнення грамадзян да крымінальнай адказнасці, размяжоўваюць злачыннае ад незлачыннага, адно злачынства ад іншага (напр., крадзёж ад грабяжу). Са складам злачынства заканадаўца звязвае межы пакаральнасці злачынных дзеянняў дадзенага віду. Санкцыі артыкулаў Асаблівай часткі КК, як правіла, з'яўляюцца адносна вызначанымі і змяшчаюць указанні на тое, якія віды пакарання і ў якіх межах могуць быць прыменены судом за дадзенае злачынства пры індывідуалізацыі пакарання вінаватых.

Такім чынам, агульнае паняцце складу злачынства мае вялікае навукова–пазнавальнае значэнне, складае тэарэтычную базу для больш глыбокага і поўнага раскрыцця зместу прыкмет асобных злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі Асаблівай часткі КК. Правільнае ўсведамленне зместу элементаў і прыкмет складу канкрэтнага злачынства – неабходная ўмова выканання законнасці і ажыццяўлення справядлівага правасуддзя.

У навуцы крымінальнага права адрозніваюцца такія паняцці, як злачынства і агульнае паняцце злачынства, склад

злачынства і агульнае паняцце складу злачынства. Гэтыя паняцці блізкія, узаемазвязаныя, аднак яны не тоесныя: кожнае з іх выконвае пэўную сацыяльна–прававую функцыю. Паняцце злачынства, дадзенае ў крымінальным законе (арт.7 КК), і агульнае паняцце складу злачынства, распрацаванае навукай крымінальнага права, адлюстроўваюць у рознай форме істотныя бакі адной і той жа грамадскай з'явы – грамадска небяспечнага ўчынку (дзеяння ці бяздзейнасці), прадугледжанага ў КК у якасці злачынства. Злачынства– гэта з'ява рэальнай сапраўднасці, маючая індывідуальныя прыкметы: яно ўчынена канкрэтнай асобай у пэўным месцы, пры пэўных умовах і характарызуецца шматлікімі індывідуальнымі рысамі, якія ўласцівы толькі гэтаму дзеянню. Склад жа злачынства – гэта сістэма прадугледжаных законам толькі найбольш істотных і тыповых прыкмет, неабходных для прызнання дадзенага дзеяння ў якасці злачынства. Па аб'ёму прыкмет склад злачынства вужэй злачынства, бо канкрэтнае злачынства характарызуецца не толькі мінімальнай сукупнасцю прыкмет, прадугледжаных у КК (як склад злачынства), але і іншымі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прыкметамі, якія не заўсёды ахопліваюцца складам (месца, час, спосаб, абставіны ўчынення злачынства і інш.).

Такім чынам, злачыннае дзеянне ўяўляе сабой з'яву грамадскага жыцця, а склад злачынства – юрыдычнае паняцце аб гэтай з'яве, якое адлюстроўвае ў сабе толькі яго найбольш істотныя прыкметы. Паняцце злачынства канкрэтызуецца ў КК у форме асобных складаў злачынстваў, у якіх закон прадугледжвае неабходныя і спецыфічныя прыкметы таго ці іншага канкрэтнага грамадска небяспечнага ўчынку. Такім чынам, паняцце злачынства служыць асновай прававой канструкцыі складу любога канкрэтнага злачынства і раскрыцця зместу яго неабходных прыкмет.

У тэорыі крымінальнага права вылучаюць, як указвалася раней, разам з канкрэтным складам злачынства як прававым паняццем аб злачынстве пэўнага віду, агульнае паняцце складу злачынства – навуковую абстракцыю, навуковы інструмент пазнання шматлікіх складаў. Уключаючы ў сябе

асноўныя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прыкметы, уласцівыя кожнаму складу злачынства, яно раскрывае агульныя рысы прававой структуры канкрэтных складаў злачынстваў, змяшчае характарыстыку іх агульных прыкмет. Агульнае паняцце злачынства ўказвае на прыкметы, уласцівыя ўсім відам злачынстваў, характарызуючы іх сутнасць як грамадска небяспечных, вінаватых і крымінальна–процiпраўных дзеянняў.

## §2. Элементы і прыкметы складу злачынства

Грамадская небяспека злачынства як яго сацыяльная ўласцівасць з'яўляецца следствам узаемадзеяння яго састаўных элементаў – аб'екта, аб'ектыўнага боку, суб'екта і суб'ектыўнага боку. Першыя два элементы называюцца аб'ектыўнымі, а апошнія два – суб'ектыўнымі элементамі складу злачынства. Кожны з гэтых элементаў уяўляе сабой сукупнасць пэўных прыкмет, фактычных абставін і працэсаў аб'ектыўнай сапраўднасці і павінен быць не толькі ў наяўнасці, але і адказваць пэўным патрабаванням, мець пэўную ўласцівасць, якая ў сукупнасці і ўзаемасувязі з іншымі элементамі і вызначае грамадскую небяспеку дзеяння, уласцівую злачынству.

Аб'ект, аб'ектыўны бок, суб'ект і суб'ектыўны бок – неабходныя элементы кожнага канкрэтнага складу злачынства. Кожны з элементаў складу злачынства ўключае толькі яму прыналежныя прыкметы, якія адрозніваюць яго ад астатніх. Пры гэтым тэрміны "элемент" і "прыкмета" выкарыстоўваюцца для характарыстыкі як злачынства, так і складу злачынства.

**Аб'ектам** злачынства з'яўляюцца тыя ахоўваемыя крымінальным законам грамадскія адносіны, сацыяльныя інтарэсы, якім пры здзяйсненні злачынства прычыняецца ці можа быць прычынена шкода. Іх прыкладны пералік даецца ў арт.1 КК, дзе сфармуляваны яго задачы, у назвах глаў Асаблівай часткі КК. Гэта – інтарэсы асобы, палітычныя і эканамічныя інтарэсы дзяржавы і грамадства, правапарадак у цэлым. Аб'ект злачынства мае важнае значэнне для вызначэння характару і ступені грамадскай небяспекі ўчыненага, для кваліфікацыі злачынства. У тэорыі крымінальнага права адрозніваюць агульны, радавы

(спецыяльны) і непасрэдны аб'ект злачынства.

**Аб'ектыўны бок** злачынства ствараюць прыкметы, якія характарызуюць знешнія (аб'ектыўныя) праявы злачыннага пасягнення Злачынства як акт знешніх паводзін чалавека выяўляецца ва ўчынку – дзеянні ці бяздзейнасці. Грамадска небяспечнае дзеянне цягне пэўныя вынікі, якія ў многіх выпадках уключаюцца ў лік прыкмет складу злачынства. Гэтыя вынікі павінны знаходзіцца ў прычыннай сувязі з учынкам злачынца. У некаторых выпадках у аб'ектыўны бок законам уключаюцца месца, час, абставіны і спосаб учынення злачынства.

**Суб'ектам** злачынства з'яўляецца асоба, якая ўчыняла злачынства. Ёю можа быць прызнана фізічная асоба, якая ў выніку дасягнення вызначанага ў законе ўзросту і наяўнасці свядомасці валодае здольнасцю правільна ацэньваць сацыяльны сэнс і значэнне сваіх дзеянняў. Многія склады злачынстваў прадугледжваюць наяўнасць спецыяльнага суб'екта, г.зн. асобы, якая разам з агульнымі прыкметамі суб'екта злачынства валодае яшчэ і спецыяльнымі прыкметамі (напр., службовая асоба, работнік транспарту, ваеннаслужачы і г.д.).

Склад злачынства заўсёды ўключае прыкметы, якія характарызуюць яго чатыры элементы: аб'ект, аб'ектыўны бок, суб'ект і суб'ектыўны бок злачынства. Яны апісаны ў законе ў дыспазіцыі крымінальна–прававой нормы. Ступень канкрэтнасці прыкмет складаў, а таксама прыёмы іх апісання заканадаўцам бываюць вельмі разнастайнымі. У межах агульнага паняцця складу злачынства ўсе прыкметы, якія характарызуюць элементы складу, падзяляюцца на абавязковыя і факультатыўныя.

**Абавязковыя прыкметы** – гэта прыкметы, якія належаць усім складам злачынства. Да іх адносяцца аб'ект, грамадска небяспечнае дзеянне ці бяздзейнасць, віна, наяўнасць свядомасці асобы і дасягненне ёю вызначанага ў законе ўзросту, з якога настае крымінальная адказнасць. Адсутнасць якой–небудзь неабходнай прыкметы (напр., наяўнасці свядомасці асобы) выключае склад злачынства.

**Факультатыўнымі** называюцца прыкметы, якія належаць не ўсім, а толькі асобным складам ці групе складаў злачынстваў. Да факультатыўных прыкмет адносяцца вынікі злачынства,

прычынная сувязь паміж дзеяннем і вынікамі, месца, час, абставіны, спосаб і сродкі ўчынення злачынства, матыў, мэта, прыкметы спецыяльнага суб'екта.

Гэта размежаванне ў вядомай меры ўмоўнае. Падзяленне прыкмет складу злачынства на абавязковыя і факультатыўныя робіцца толькі пры аналізе агульнага паняцця складу злачынства. У канкрэтным складзе злачынства ўсе прыкметы, прадугледжаныя законам, з'яўляюцца абавязковымі.

Элементы і прыкметы складаў злачынстваў апісваюцца ў нормах як Агульнай, так і Асаблівай частак КК. Агульнай часткай рэгламентуюцца элементы і прыкметы ўсіх складаў злачынстваў без іх канкрэтызацыі. Гэта – абавязковыя прыкметы складу. Дэталізацыя іх у прымяненні да адпаведных складаў злачынства праводзіцца ў нормах Асаблівай часткі. Сэнс падраздзялення Крымінальнага кодэкса на Агульную і Асаблівую часткі заключаецца ў тым, каб у адпаведнасці з дыялектыкай узаемасувязі агульнага і асаблівага адзіныя для ўсіх складаў прыкметы апісаць у Агульнай частцы, а спецыфічныя – у Асаблівай.

Складанасць устанаўлення прыкмет складу абумоўлена тым, што толькі нямногія з іх прама ўказаны ў дыспазіцыях артыкулаў Асаблівай часткі КК. Часцей за ўсё заканадаўца ўказвае на прыкметы аб'ектыўнага боку, спецыфічныя для дадзенага віду злачынства. Значная ж частка разглядаемых прыкмет змяшчаецца ці ў Агульнай частцы КК, ці ў назвах глаў і артыкулаў Асаблівай часткі (напр., прыкметы аб'екта). Нярэдка такія прыкметы апісваюцца нават у нарматыўных актах некрымінальна–прававога характару (напр., арт.106, 206 КК). Падобныя склады звязаны з бланкетнымі дыспазыцыямі норм Асаблівай часткі КК.

## §3. Віды складаў злачынства

Канкрэтныя склады злачынстваў у залежнасці ад характару і ступені грамадскай небяспекі дзеянняў, прыёмаў і спосабаў апісання іх прыкмет у законе і асаблівасцей канструкцый падзяляюцца на пэўныя групы. Класіфікацыя складаў злачынстваў садзейнічае больш глыбокаму асэнсаванню іх зместу, выяўленню заканамернасцей іх пабудовы.

Па характары і ступені грамадскай небяспекі злачынстваў іх склады падзяляюцца на **асноўныя, склады з абцяжарваючымі прыкметамі** (кваліфікаваныя склады), **склады са змякчаючымі прыкметамі** (прывілеяваныя склады). У асноўным складзе дыспазіцыя крымінальнага закону апісвае элементы складу тыповай, сярэдняй грамадскай небяспекі. У забеспячэнне прынцыпаў справядлівасці, асабістай і вінаватай адказнасці склады злачынстваў у Асаблівай частцы КК падзяляюцца на два, тры, нават чатыры і больш відаў. Неабходнасць такога падзелу абумоўлена мэтамі большай заканадаўчай дыферэнцыяцыі крымінальнай адказнасці і пакарання. Злачынствы аднаго і таго ж віду могуць адрознівацца не толькі па ступені, але і па характару (якаснаму ўзроўню) грамадскай небяспекі.

Улічваючы гэта, заканадаўца і вылучае ў шэрагу выпадкаў па аднаму і таму ж віду злачынства некалькі складаў, звязваючы іх з рознай пакаральнасцю ўчыненага, што забяспечвае адзінства каральнай палітыкі і стварае перадумовы для індывідуалізацыі пакарання. Наўмыснае забойства, напр., мае чатыры склады: кваліфікаваны (арт.100), асноўны (арт. 101) і прывілеяваны (два склады арт.102 і 103). Ступень іх грамадскай небяспекі настолькі розная, што за кваліфікаванае забойства ўстаноўлены максімальны памер пазбаўлення волі да пятнаццаці гадоў (і альтэрнатыўна выключная мера пакарання– пакаранне смерцю). А за наўмыснае забойства са змякчаючымі акалічнасцямі (напр., пры перавышэнні межаў неабходнай абароны) магчыма пакаранне ў выглядзе папраўчых работ без пазбаўлення волі. Сярод кваліфікаваных прыкмет часцей за іншыя заканадаўца называе нанясенне вялікай шкоды, паўторнасць, групавое ўчыненне злачынства. Розныя віды складаў аднаго і таго ж злачынства, як правіла, прадугледжваюцца ў адным артыкуле, але ў розных яго частках ці пунктах, а ў некаторых выпадках – у розных артыкулах.

Па спосабу апісання прыкмет у законе, г.зн. па характару структуры, склады злачынстваў падзяляюць на простыя і складаныя. Просты склад уключае апісанне прыкмет аднаго дзеяння, якое пасягае на адзін аб'ект пры наяўнасці адной

формы віны. Напр., склад паклёпу ў арт.128 КК вызначаны як "распаўсюджванне заведама ілжывых, ганьбячых іншую асобу выдумак ..."

**Складаны** склад характарызуецца наяўнасцю двух ці больш непасрэдных аб'ектаў пасягнення або двух форм віны ці некалькіх альтэрнатыўных прыкмет аб'ектыўнага боку дзеяння, або шэрагу простых складаў, якія ахопліваюцца адзіным састаўным складам злачынства. Напр., пры парушэнні правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту (ч.1 арт. 82 КК) прадугледжваецца наступленне некалькіх вынікаў: няшчасных выпадкаў з людзьмі, аварый, крушэнняў ці іншых цяжкіх вынікаў. Наступленне аднаго з іх дастаткова для крымінальнай адказнасці. Склады некаторых злачынстваў прадугледжваюць наяўнасць складанай (двайной) формы віны, г.зн. рознага спалучэння псіхічных адносін асобы да ўчыняемага ім дзеяння і да наступіўшага выніку ці да двух разнародных і неаднолькавых па цяжкасці вынікаў, якія ўзніклі ад аднаго грамадска небяспечнага дзеяння. Напр., пры наўмысным цяжкім цялесным пашкоджанні, якое выклікала смерць пацярпеўшага (ч.2 арт.106 КК), трэба размяжоўваць псіхічныя адносіны да прычыненага цяжкага цялеснага пашкоджання (намер) і да наступіўшай у выніку гэтага пашкоджання смерці (віна ў форме неасцярожнасці). Магчымы таксама такія варыянты ўскладнення складу, як аб'яднанне ў адным складзе некалькіх простых складаў (бандытызм, хуліганства). Хуліганства, напр., можа аб'ядноваць знішчэнне маёмасці, цялесныя пашкоджанні, знявагу.

Па асаблівасцях канструкцыі аб'ектыўнага боку склады злачынстваў падзяляюцца на матэрыяльныя і фармальныя. **Матэрыяльнымі** лічацца склады, у якіх грамадска небяспечныя вынікі прадугледжваюцца заканадаўцам у якасці неабходнай прыкметы скончанага злачынства. Да іх адносяцца, напр., склады забойства, крадзяжу, грабяжу, прычыненне цялесных пашкоджанняў. **Фармальнымі** прынята называць такія склады злачынстваў, у якіх аб'ектыўны бок утрымлівае толькі сам факт учынення дзеяння незалежна ад далейшых вынікаў, якія могуць быць выкліканы гэтым дзеяннем. Надыход грамадска небяспечных вынікаў з'яўляецца не абавязковай, а факультатыўнай прыкметай фар-

мальных складаў злачынстваў. Да такіх складаў злачынстваў адносяцца, напр., атрыманне хабару, заведама ілжывы данос, дэзерцірства.

У залежнасці ад кола ахопліваемых складамі грамадска небяспечных дзеянняў адрозніваюць родавыя і спецыяльныя (відавыя) склады. **Родавым** з'яўляецца такі склад, які ўтрымлівае найбольш агульныя прыкметы злачыннага дзеяння, **спецыяльным (відавым)** – склад, які ўказвае на злачынныя дзеянні, якія ўкладваюцца ў межы адпаведнага родавога складу, але мае дадатковую спецыяльную прыкмету (ці прыкметы). Асноўная прычына стварэння родавых і відавых складаў – імкненне заканадаўца ахапіць крымінальна-прававым уздзеяннем усе грамадска небяспечныя праявы аднолькавай прыроды (родавы склад) і адначасова дыферэнцыраваць іх па ступені небяспечнасці (відавыя склады). Прыкметы родавога складу апісаны, напр., у арт.166 КК, а ў арт.169 КК – прыкметы спецыяльнага складу.

## §4. Склад злачынства і кваліфікацыя злачынстваў

У тэорыі і на практыцы пад кваліфікацыяй злачынства разумеецца ўстанаўленне поўнай адпаведнасці прыкмет учыненага грамадска небяспечнага дзеяння прыкметам канкрэтнага складу злачынства, прадугледжанага ў крымінальным законе.

Кваліфікацыя злачынстваў – адно з важнейшых дзеянняў (працэс, дынаміка), звязаных з практычным прымяненнем работнікамі дазнання, следства і суда норм крымінальнага закону да канкрэтных выпадкаў учынення злачынства. У кваліфікацыі злачынстваў знаходзіць сваё адлюстраванне юрыдычная і сацыяльная ацэнка ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння і асобы, вінаватай у яго ўчыненні. Правільная кваліфікацыя злачынстваў – неабходная ўмова падтрымання законнасці, забеспячэння гарантыі правоў і інтарэсаў грамадзян і ажыццяўлення справядлівага правасуддзя па крымінальных справах.

Неабходнымі ўмовамі правільнай кваліфікацыі злачынст-

ваў з'яўляецца поўнае і дакладнае ўстанаўленне ўсіх фактычных акалічнасцей учыненага грамадска небяспечнага дзеяння і правільнае разуменне зместу закону, які замацоўвае прыкметы канкрэтнага складу злачынства.

Працэс кваліфікацыі злачынстваў заключаецца ва ўстанаўленні адпаведнасці аб'ектыўных і суб'ектыўных прыкмет учыненага дзеяння аналагічным прыкметам складу дадзенага віду злачынства, прадугледжанага нормай крымінальнага закону. Супастаўленне фактычных дадзеных грамадска небяспечнага ўчынку з крымінальна–прававой нормай ажыццяўляецца па ўсіх элементах складу злачынства. Пры гэтым злачынства толькі тады можа быць прызнана кваліфікаваным правільна, калі ўсе яго акалічнасці адпавядаюць прыкметам пэўнага складу злачынства, прадугледжанага Крымінальным кодэксам.

Вывад аб тым, што дадзены ўчынак утрымлівае прыкметы складу злачынства, прадугледжанага ў адпаведнай крымінальна–прававой норме, адлюстроўваецца ў важнейшых крымінальна–працэсуальных дакументах – абвінаваўчым заключэнні і судовым прыгаворы. У іх кваліфікацыя злачынства фіксуецца шляхам дакладнай назвы ўсіх пунктаў (частак) артыкулаў як Агульнай, так і Асаблівай частак КК, у якіх так ці інакш сфармуляваны прыкметы ўстаноўленага складу злачынства. Недаказанасць абавязковых элементаў складу злачынства выключае наяўнасць складу і цягне спыненне ўзбуджанай крымінальнай справы альбо вынясенне апраўдальнага прыгавору. Памылковая кваліфікацыя злачынства можа пацягнуць няправільнае прызначэнне пакарання і іншыя неспрыяльныя вынікі для асуджанага. У судова–следчай практыцы сустракаюцца выпадкі памылковага прыцягнення да крымінальнай адказнасці з прычыны недакладнасці вызначэння матыву і інш.

Правільная кваліфікацыя – гэта не толькі прававая, але і маральная ацэнка ўчынку, важнейшая ўмова забеспячэння законнасці. Яна мае і крыміналагічнае значэнне, бо на яе аснове выяўляецца якасная структура злачыннасці і распрацоўваюцца меры па папярэджванню злачынстваў.

Такім чынам, кваліфікацыя злачынстваў выступае права-

вым абгрунтаваннем прыцягнення асобы да крымінальнай адказнасці, ужывання мераў працэсуальнага прымушэння, прад'яўлення абвінавачання, аддання пад суд і прызначэння пакарання.

## *Літаратура:*

Бурчак Ф.Г. Квалификация преступлений. Киев, 1985; Карпушин М.Н., Курляндский В.И. Уголовная ответственность и состав преступления. М., 1974; Куринов Б.А. Научные основы квалификации преступлений. М., 1984; Трайнин А.Н. Общее учение о составе преступления. М., 1957; Уголовный закон. Опыт теоретического моделирования. М., 1987.

# Глава 5

# АБ'ЕКТ ЗЛАЧЫНСТВА

## §1. Паняцце аб'екта злачынства

Аб'ект злачынства – гэта тое, на што замахваецца злачыннае дзеянне, чаму яно нясе ці можа прынесці шкоду. Кожнае грамадска небяспечнае дзеянне робіць замах на пэўны аб'ект і прычыняе яму шкоду рэальна або ставіць яго ва ўмовы непасрэднай магчымасці прычынення шкоды. Не існуе злачынстваў, якія б не цягнулі за сабой ніякай шкоды аб'екту.

У дактрыне айчыннага крымінальнага права аб'ектам злачынства прызнаюцца грамадскія адносіны. Кожнае злачыннае дзеянне з'яўляецца грамадска небяспечным таму, што замахваецца на грамадскія адносіны, нясе ці можа прынесці ім істотную шкоду і менавіта ў сілу гэтага прызнаецца злачынствам. Ступень грамадскай небяспечнасці злачынства знаходзіць сваё выяўленне ў тым, якая шкода прычыняецца існуючым у грамадстве адносінам і якую сацыяльную каштоўнасць маюць гэтыя адносіны. Парушэнне злачынствам грамадскіх адносін выражаецца ў іх знішчэнні або змене, а ў некаторых выпадках – у пагрозе прычынення ім істотнай шкоды. Напр., крадзёж прычыняе шкоду грамадскім адносінам уласнасці; цялеснае пашкоджанне – грамадскім адносінам, якія забяспечваюць грамадзянам іх здароўе; хабар– грамадскім адносінам у сферы дакладнага функцыянавання дзяржаўнага і грамадскага апарату.

Аб'ектам злачынства з'яўляюцца менавіта грамадскія адносіны, а не нейкія матэрыяльныя рэчы ці фізічныя асобы. Так, пры раскраданні маёмасці дзеянні злачынца накіраваны супраць існуючых у грамадстве адносін уласнасці, а не супраць канкрэтнай рэчы, якой ён завалодае. Самой рэчы шкода можа і не прычыняцца, наадварот, злачынец у большасці выпадкаў зацікаўлены ў захаванні і нават паляпшэнні яе спажывецкіх якасцей. Пры раскраданні рэч выходзіць са

сферы прававога валодання ўласніка і менавіта ў парушэнні адносін уласнасці праяўляецца шкода: уласнік не мае магчымасці карыстацца рэччу. Наогул, рэч сама па сабе не цікавіць права. Толькі пасля таго, як людзі ўступяць у грамадскія адносіны наконт пэўнай рэчы, апошняя становіцца прадметам увагі з боку права. Таму не рэч сама па сабе, а рэч як элемент грамадскіх адносін ахоўваецца правам, і замах на гэту рэч ёсць замах на грамадскія адносіны, якія з ёю звязаны. Адсюль, пры замаху на матэрыяльную рэч аб'ектам злачынства з'яўляюцца грамадскія адносіны, якія склаліся адносна гэтай рэчы ў грамадстве. Апошняя акалічнасць дае магчымасць растлумачыць, чаму не з'яўляецца злачынствам пашкоджанне ці знішчэнне ўласнай маёмасці.

Таксама нельга сцвярджаць, што аб'ектам пры ўчыненні злачынных замахаў на жыццё, здароўе, свабоду, гонар і годнасць асобы з'яўляецца чалавек, а не грамадскія адносіны. Злачыннае дзеянне тут накіравана менавіта супраць грамадскіх адносін, якія забяспечваюць жыццё, здароўе, свабоду, гонар і годнасць грамадзян. Там, дзе гэтыя адносіны не парушаюцца, няма і злачынства супраць асобы. Напр., прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання з мэтай абароны сябе ці іншых асоб не толькі не з'яўляецца злачынствам, а наадварот, ёсць дзеянне, карыснае для грамадства. Таксама не з'яўляецца грамадска небяспечным дзеяннем рэалізацыя ў адносінах да злачынца прызначанага судом пакарання смерцю, або дзеянне, у выніку якога асоба знішчае свае ўласныя прававыя каштоўнасці (самагубства, самакалечанне).

Не можа выступаць у якасці аб'екта злачынства і тое, што наогул не з'яўляецца прадметам прававога рэгулявання – Бог, перакананні і г.д.

Уплыў злачыннага дзеяння на грамадскія адносіны мае два накірункі: 1) шкодныя для грамадства змена ці знішчэнне існуючых адносін; 2) утварэнне злачынцам новых антыграмадскіх адносін (калі злачынец замахваецца на неіснуючы аб'ект альбо калі ён непасрэдна не ўздзейнічае на яго, напр., пры замаху на злачынства, няўдалым саўдзеле і г.д.).

Такім чынам, аб'ектам злачынства з'яўляюцца грамадскія

адносіны, якія ахоўваюцца нормамі крымінальнага права ад злачынных замахаў. На аб'ект замахваецца не само злачынства, у склад якога ў якасці абавязковага элементу ўваходзіць аб'ект, а асоба, якая ўчыніла злачынства.

Аб'ект злачынства нельга атаясамліваць з аб'ектам крымінальна–прававой аховы (абароны). Калі гаворка ідзе аб аб'екце крымінальна–прававой аховы, маецца на ўвазе ўсё тое, што абараняецца крымінальным законам ад злачынных замахаў. Гэта прыкмета — крымінальна–прававая забароненасць – з'яўляецца абавязковай і для другога паняцця – аб'екта злачынства. Аднак апошні адрозніваецца ад першага тым, што прадугледжвае наяўнасць канкрэтнага замаху. Пакуль замаху няма, аб'ект злачынства не існуе. Аб'ект жа крымінальна–прававой аховы ўзнікае ў момант уступлення крымінальнага закону ў сілу.

Прызнанне аб'ектам злачынства грамадскіх адносін патрабуе ўдакладнення зместу гэтага паняцця. Вядома, што не ўсе грамадскія адносіны ўрэгуляваны правам. Частка з іх урэгулявана традыцыямі, нормамі маралі, рэлігіі і г.д. Таму далей мы будзем мець на ўвазе толькі праваадносіны, ці, інакш кажучы, грамадскія адносіны як такія сувязі паміж суб'ектамі, якія ўрэгуляваны правам.

Грамадскія адносіны ўяўляюць сабой пэўную сацыяльную сувязь людзей адносна матэрыяльных, ідэалагічных ці іншых сацыяльных каштоўнасцей. Грамадства як сукупнасць асобных людзей можа існаваць і вырабляць толькі тады, калі ў ім існуе ўрэгуляваная правам сістэма грамадскіх адносін. Крымінальнае права і мае мэтай ахову зладжанага функцыянавання гэтай вышэйшай каштоўнасці грамадства.

Вызначэнне зместу паняцця "грамадскія адносіны" мае пэўныя цяжкасці. У тэорыі крымінальнага права наконт гэтага існуе некалькі поглядаў. Згодна з першай, шырокай трактоўкай, грамадскія адносіны ў найбольш простай форме ўяўляюць сабой сістэму ўзаемазвязаных элементаў, у лік якіх уваходзяць: 1) суб'екты (носьбіты) адносін; 2) аб'ектыўная сувязь (узаемасувязь) паміж суб'ектамі, якая выражаецца ў грамадска–значнай дзейнасці суб'ектаў; 3) сацыяльныя

каштоўнасці ці сацыяльныя інтарэсы, па якіх узнікаюць адносіны. Адначасова кожны элемент можа ўваходзіць у мноства іншых (часам з розным зместам) грамадскіх адносін.

Згодна з другой, больш вузкай трактоўкай, грамадскія адносіны – гэта толькі пэўныя сацыяльныя сувязі, якія апасродкаваны нейкімі сацыяльнымі каштоўнасцямі. Тут лічыцца, што ні ўдзельнікі, ні матэрыяльныя рэчы не з'яўляюцца іх структурнымі элементамі.

Метадалагічна правільным пры даследаванні праблемы аб'екта з'яўляецца першы падыход. Раскрыць гэту праблему можна толькі праз структурныя элементы грамадскіх адносін. Кожнае канкрэтнае злачынства ўздзейнічае на пэўны элемент ці ў цэлым на іх сукупнасці і праз гэта замах ці наогул знішчае ўсе сацыяльныя сувязі, якія дзейнічалі ў рамках дадзеных грамадскіх адносін. Відавочнымі прадметамі ўздзеяння выступаюць суб'екты, пэўныя рэчы ці дзейнасць людзей. Злачынства – гэта пасягненне на аб'ектыўна існуючы аб'ект. Нельга прычыняць шкоду таму, што яшчэ не існуе ў аб'ектыўнай рэальнасці.

Першым элементам грамадскіх адносін з'яўляюцца іх носьбіты (суб'екты). Удзельнікамі грамадскіх адносін з'яўляюцца фізічныя і юрыдычныя асобы, грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы, дзяржава ці ўпаўнаважаныя ёю органы. Суб'ектны склад удзельнікаў праваадносін мае юрыдычнае значэнне ў двух выпадках. Па–першае, калі трэба канкрэтызаваць кола адносін, якія ахоўваюцца крымінальным законам. Так, жыццё чалавека ахоўваецца нормамі крымінальнага права не ў залежнасці ад полу, узросту, фізічнага стану здароўя асобы, а з пункту гледжання на чалавека як на носьбіта грамадскіх адносін. Зыходзячы з гэтага, да дзяржаўных злачынстваў адносіцца забойства чалавека пры тэрарыстычным акце, бандытызме ці дыверсіі, да злачынстваў супраць парадку кіравання – забойства міліцыянера, і да воінскіх злачынстваў – забойства военачальніка, які выконвае абавязкі ваеннай службы. Па–другое, суб'ектны склад мае значэнне і ў выпадках, калі неабходна высветліць змест адносін, паколькі сацыяльны статус асобы

адлюстроўвае характар і кола рэальных ці магчымых сувязей. Напр., у залежнасці ад зместу паняцця "службовая асоба" вырашаюцца многія пытанні крымінальнай адказнасці за службовыя злачынствы.

Па агульнаму правілу, злачыннае ўздзеянне на асобу з'яўляецца і ўздзеяннем на суб'ект пэўных грамадскіх адносін, які з'яўляецца іх носьбітам. Выключэннем з'яўляюцца выпадкі, калі адносна дадзенай асобы існуюць такія грамадскія адносіны, у якіх яна выступае ў якасці іх прадмета, напр., дзіця пры выкраданні ці падмене (арт.124 КК). Наогул, пытанне аб носьбітах грамадскіх адносін, якія ахоўваюцца крымінальным правам, мае выключна важнае значэнне. З гэтай прычыны як пры пабудове норм крымінальнага права, так і пры кваліфікацыі злачынстваў неабходна дакладна вызначыць сацыяльныя прыкметы суб'екта.

Другім элементам грамадскіх адносін з'яўляецца сацыяльная ўзаемасувязь паміж іх носьбітамі. Сацыяльная сувязь з'яўляецца абавязковым элементам любых грамадскіх адносін і, больш таго, яна адлюстроўвае змест саміх адносін. Аднак яе нельга атаясамліваць з грамадскімі адносінамі наогул, паколькі змест сацыяльнай сувязі можна высветліць толькі шляхам аналізу пэўнага ўзаемадзеяння суб'ектаў адносна канкрэтных сацыяльных каштоўнасцей, а гэта значыць толькі ў непарыўным адзінстве з суб'ектамі і прадметамі адносін. Сацыяльная сувязь, як і грамадскія адносіны наогул, носіць аб'ектыўны характар і існуе ў выглядзе прадмета крымінальна–прававой аховы да моманту здзяйснення злачынства. Сацыяльная сувязь часта выступае ў якасці прадмета ўздзеяння пры здзяйсненні наступных злачынстваў: пры нанясенні маёмаснай шкоды шляхам падману ці злоўжывання даверам (арт.92 КК), пры перашкоджаннях у ажыццяўленні рэлігійных абрадаў (арт.140 КК), пры ўкрывальніцтве (арт.185 КК) і інш. У прыведзеных выпадках шкода аб'екту прычыняецца як знішчэннем сацыяльнай сувязі, так і яе зменамі.

Трэцім элементам грамадскіх адносін з'яўляецца прадмет ці тыя сацыяльныя каштоўнасці, адносна якіх яны ўзнікаюць.

Неабходна мець на ўвазе, што беспрадметных грамадскіх адносін у аб'ектыўнай рэальнасці не існуе. У структуры пэўных грамадскіх адносін прадмет праяўляе сябе пэўным чынам і накладвае свой адбітак на самі адносіны. Той жа самы прадмет у структуры грамадскіх адносін другога роду будзе мець іншае прававое значэнне (зброя як прадмет пры раскраданні (арт.213[1] КК) і зброя як сродак ажыццяўлення наўмыснага забойства).

Прадметам грамадскіх адносін з'яўляецца ўсё тое, адносна чаго ці ў сувязі з чым яны існуюць. Разам з іншымі элементамі прадмет вызначае сутнасць адносін і становішча суб'ектаў у іх. Прадметамі могуць быць матэрыяльныя рэчы, сацыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Зыходзячы з гэтага, усе грамадскія адносіны ў залежнасці ад іх прадметнага зместу можна падзяліць на рэчыўныя і нярэчыўныя (нематэрыяльныя). У матэрыяльных грамадскіх адносінах прадметам выступае тая ці іншая матэрыяльная рэч. Напр., пры незаконнай парубцы лесу (арт.165 КК) у якасці аб'екта выступаюць грамадскія адносіны ў галіне аховы прыроды, а ў якасці прадметаў гэтых адносін – дрэвы або хмызняк у лесе. Прыкладам нематэрыяльных грамадскіх адносін з'яўляюцца адносіны, якія забяспечваюць гонар і годнасць асобы і парушэнне якіх караецца згодна з арт.128 і 129 КК, паколькі гэта паклёп ці знявага.

У межах тэорыі крымінальнага права існавалі раней і існуюць цяпер іншыя напрамкі вызначэння таго, на што замахваецца злачынства і чаму яно прычыняе шкоду. Калі зрабіць гістарычны экскурс, то першапачаткова лічылася, што злачынства накіравана альбо супраць інтарэсаў грамадства, альбо супраць інтарэсаў пэўнай асобы, якія і з'яўляліся аб'ектам злачынства. Грунтуючыся на гэтым, злачынствы падзяляліся на дзве адпаведныя групы.

З цягам часу атрымала распаўсюджанне нарматыўная тэорыя аб'екта. Яе асноўны сэнс у тым, што злачынства разумеецца як парушэнне нормы права і існуючага правапарадку. Гэты напрамак мае шмат варыянтаў. Згодна з дастаткова фармальным і павярхоўным варыянтам гэтай тэорыі, аб'ектам

злачынства з'яўляецца крымінальны закон. Адсюль аб'ект злачынства вызначаны ў кожным артыкуле Асаблівай часткі КК. Забойства ажыццяўляе пасягненне на артыкул КК, які пагражае пакараннем за супрацьпраўнае пазбаўленне жыцця, злодзей замахваецца на артыкул, які пагражае пакараннем за крадзёж чужой маёмасці і г.д. Не згаджаючыся з гэтым падыходам, адзначым наступнае. Канстатуючы, што злачынства парушае закон, трэба мець на ўвазе толькі тое, што яно з'яўляецца дзеяннем крымінальна супрацьпраўным. Апошняя прыкмета ўласціва любому злачынству. Яна дае адказ на пытанне, чаму дзеянне цягне крымінальную адказнасць. Відавочна, што сам крымінальны закон не нясе тут ніякай страты.

У найбольш завершаным выглядзе нарматыўная тэорыя аб'екта злачынства была прадстаўлена ў працах вядомага рускага вучонага ў галіне крымінальнага права М.С.Таганцава, які лічыў, што аб'ектам злачыннага дзеяння з'яўляецца норма права ў яе рэальным жыцці. На яго думку, аб'ектам злачыннага замаху выступае запаведзь ці норма права, якая ўжо рэалізавана ў суб'ектыўных правах і знайшла сваё выражэнне ў канкрэтным сацыяльным інтарэсе, што і ахоўваецца гэтай нормай. Такім чынам, тут аб'ектам злачынства з фармальнага боку лічацца прававыя каштоўнасці. У залежнасці ад характару і значэння прававых каштоўнасцей дзеянне, якое замахваецца на іх, можа быць злачынным ці незлачынным. Тут многія пытанні вырашаюцца ў залежнасці ад меркавання суда. Чым большае значэнне маюць прававыя каштоўнасці, тым больш важнымі яны з'яўляюцца і тым інтэнсіўней робіцца іх прававая ахова. У межах гэтага напрамку нямецкі крыміналіст Ф.Ліст вызначаў аб'ект злачынства як абаронены правам пэўны жыццёвы інтарэс.

У крымінальным праве даволі часта аб'ектам злачынства называецца інтарэс. Наогул, у юрыдычнай літаратуры апошняга часу "інтарэс" вельмі часта ўжываецца як сінонім паняцця "грамадскія адносіны". Аднак рабіць такую падмену і аб'яўляць аб'ектам злачынства інтарэс не зусім дакладна. "Інтарэс" – гэта паняцце больш шырокае, чым "грамадскія

адносіны". Ён заўсёды схаваны і яго адкрыццё магчыма праз грамадскія адносіны. Інтарэс як адзінства аб'ектыўнага (яго носьбіт, крыніца яго ўзнікнення) і суб'ектыўнага (усведамленне патрэбнасці, пастаноўка мэты, рашэнне аб пэўным характары паводзін асобы) яшчэ не ёсць грамадскія адносіны. Але ён з'яўляецца стымулам для сувязей суб'ектаў, іх дзейнасці. Аднак сваё ўвасабленне інтарэс знаходзіць праз грамадскія (антыграмадскія) адносіны. Такім чынам, пры даследаванні інтарэсу на практыцы мы будзем вымушаны перайсці да аналізу яго аб'ектыўнай асновы – асобы як носьбіта грамадскіх адносін, яе дзеянняў і сацыяльных сувязей, — што, зноў такі, з'яўляецца элементамі грамадскіх адносін.

Не згаджаецца з прызнаннем аб'ектам злачынства грамадскіх адносін і Г.П.Навасёлаў, які лічыць, што разуменне аб'екта як грамадскіх адносін цягне за сабой фактычнае расшырэнне зместу паняцця аб'екта, прычым такое, што амаль усе прыкметы складу злачынства выступаюць у якасці ўнутраных прыкмет аб'екта. На яго думку, адносіны паміж людзьмі ўяўляюць інтарэс для крымінальна–прававой навукі не ў якасці аб'екта злачынства, а ў якасці формы праяўлення любых сацыяльна–значных паводзін, у тым ліку злачынных. Адсюль ён прызнае, што пры здзяйсненні злачынства няма падставы для таго, каб весці гаворку аб замаху на якія–небудзь грамадскія адносіны.Тут можна сцвярджаць, лічыць ён, што асоба ўступае ў адносіны з іншымі асобамі (асобай). На яго думку, апошні пункт з'яўляецца зыходным як для распрацоўкі самога паняцця злачынства, так і для вызначэння яго аб'екта. У якасці выніку такога рашэння Г.П.Навасёлаў выводзіць, што толькі чалавек, людзі супрацьстаяць вінаватаму ў працэсе замаху і менавіта супраць людзей накіраваны грамадска небяспечныя дзеянні, і з гэтай прычыны само дзеянне становіцца грамадска небяспечным. Далей ён сцвярджае, што, паколькі грамадскія адносіны – гэта адносіны паміж людзьмі, то толькі людзі могуць быць прызнаны іх удзельнікамі, іх суб'ектамі (паколькі ад іх зыходзіць сацыяльная актыўнасць) і аб'ектамі (тымі, хто супрацьстаіць суб'екту).

Гэты падыход прываблівае сваім ярка выражаным прыяры-

тэтам агульначалавечых каштоўнасцей. Аднак прызнаць яго паслядоўным і дакладным цяжка. Напр., калі асоба зрабіла падробку паштовых марак ці праязных білетаў (арт.157 КК), то цяжка ўявіць сабе, што аб'ектам гэтага злачынства з'яўляецца іншы чалавек, які супрацьстаіць вінаватаму, а не грамадскія адносіны.

Значэнне аб'екта злачынства выяўляецца ў тым, што ён з'яўляецца неабходным элементам кожнага складу злачынства. У крымінальным праве няма "безаб'ектных" злачынстваў. Калі адсутнічае аб'ект злачынства — гэта азначае, што ў дзеяннях асобы няма складу злачынства. Адсутнасць аб'екта можа абумоўлівацца дзвюма акалічнасцямі. Па–першае, гэта можа азначаць, што дзеянні наогул не парушаюць грамадскія адносіны, а, па–другое, што дзеянне парушае пэўныя грамадскія адносіны, але такія, якія крымінальным правам не ахоўваюцца.

Значэнне аб'екта злачынства праяўляецца і ў тым, што ён дае магчымасць раскрыць сацыяльнапалітычны змест злачынства, устанавіць характар яго грамадскай небяспечнасці, а таксама служыць неабходнай перадумовай правільнай кваліфікацыі злачынства і прызначэння вінаватаму справядлівага пакарання.

## §2. Віды аб'ектаў злачынства

У тэорыі крымінальнага права вылучаюць агульны, родавы (групавы) і непасрэдны аб'екты злачынства.

**Агульным аб'ектам** злачынства з'яўляецца ўся сукупнасць тых грамадскіх адносін, якія ахоўваюцца крымінальным законам. Агульны аб'ект з'яўляецца адзіным для ўсіх злачынстваў. У арт.1 КК даецца прыкладны пералік найбольш важных для грамадства каштоўнасцей, якія ахоўваюцца нормамі крымінальнага права. Гэта жыццё і здароўе чалавека, яго правы і свабоды, канстытуцыйны лад, дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы, уласнасць, прыроднае асяроддзе, устаноўлены правапарадак. Гістарычны аналіз грамадскіх адносін, якія ахоўваюцца крымінальным правам, паказвае, што іх кола не застаецца нязменным. Адны грамадскія адносіны ўключаюцца

ў лік тых, што ахоўваюцца крымінальным законам, другія ж, наадварот, выключаюцца. Гэты працэс адбываецца пад уплывам змен у спосабе вытворчасці, развіцця культуры грамадства, пераацэнкі прыярытэтаў палітыкі дзяржавы. Напр., пераход да пабудовы рыначнай мадэлі гаспадарання абумовіў з'яўленне ў ліку гаспадарчых злачынстваў вялікай колькасці новых злачынстваў: ілжэпрадпрымальніцтва (арт.$150^1$ КК), злоснае банкруцтва (арт.$150^4$ КК), недобрасумленная канкурэнцыя (арт.$151^5$ КК) і інш.

**Родавы аб'ект** – гэта адпаведная частка роднасных грамадскіх адносін, якія ахоўваюцца крымінальным законам ад злачынных замахаў. Ён з'яўляецца адзіным для пэўнай групы злачынстваў. Так, крадзёж, грабёж, махлярства, знішчэнне маёмасці замахваюцца на адзін і той жа родавы аб'ект – грамадскія адносіны ўласнасці.

Усе адносіны, якія замахваюцца на адзін і той жа родавы аб'ект, абагульняюцца ў адзінай главе Асаблівай часткі КК. Родавы аб'ект групы злачынстваў звычайна раскрываецца ў назве адпаведнай главы кодэкса. Напр., у главе КК "Злачынствы супраць уласнасці" абагульнены злачынныя дзеянні супраць маёмасці фізічных і юрыдычных асоб, а таксама дзяржавы; у главе "Службовыя злачынствы"– злачынствы, якія парушаюць грамадскія адносіны ў сферы ажыццяўлення службовых паўнамоцтваў. У некаторых выпадках родавы аб'ект проста ўказваецца ў законе. Напр., у арт.226 КК, які ўтрымлівае азначэнне агульнага паняцця воінскага злачынства, у якасці родавага аб'екта гэтых злачынстваў называецца ўстаноўлены парадак нясення воінскай службы. Такім чынам, родавы аб'ект з'яўляецца тым крытэрыем, на падставе якога пабудавана сістэма Асаблівай часткі КК. Менавіта родавы аб'ект дазваляе правесці заканадаўчую і навуковую класіфікацыю злачынстваў і крымінальна–прававых нормаў. Каштоўнасць той ці іншай групы грамадскіх адносін, па агульнаму правілу, і вызначае месца знаходжання главы ў сістэме Асаблівай часткі.

Родавы аб'ект уплывае таксама на вызначэнне характару грамадскай небяспечнасці злачынстваў і на іх класіфікацыю.

Значэнне родавага аб'екта праяўляецца і ў тым, што ён дазваляе адмежаваць падобныя паміж сабой групы злачынстваў, напр., службовыя ад гаспадарчых. Правільнае вызначэнне родавага аб'екта дазваляе адмежаваць і падобныя склады злачынстваў, напр., забойства ў сувязі з выкананнем пацярпеўшым службовага або грамадскага абавязку (п."в" арт.100 КК) ад замаху на жыццё работніка міліцыі, народнага дружынніка або ваеннаслужачага (арт.189[1] КК).

Калі родавы аб'ект дазваляе вызначыць родавую прыналежнасць злачынства, то яго індывідуальныя прыкметы ўстанаўліваюцца непасрэдным аб'ектам злачынства. У якасці непасрэднага аб'екта злачынства выступаюць тыя грамадскія адносіны, на якія замахваецца канкрэтнае злачыннае дзеянне ці бяздзейнасць.

Дакладнае вызначэнне непасрэднага аб'екта не заўсёды з'яўляецца простай справай. Цяжкасцей тут не ўзнікае толькі тады, калі гэты аб'ект непасрэдна названы ў артыкуле Асаблівай часткі. Напр., у арт.61 КК у якасці непасрэднага аб'екта злачынства называюцца грамадскія адносіны, якія забяспечваюць знешнюю бяспеку Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэт, тэрытарыяльную недатыкальнасць і абароназдольнасць. Аднак часцей непасрэдны аб'ект пэўнага злачынства ўстанаўліваецца шляхам тлумачэння закону. Напр., на асобу замахваюцца і забойства, і цялесныя пашкоджанні, і згвалтаванне, і супрацьпраўнае пазбаўленне волі, і паклёп. Усе гэтыя злачынствы ўздзейнічаюць на адзіны родавы аб'ект – грамадскія адносіны, якія забяспечваюць асобе нармальнае існаванне. У той жа час кожнае з іх мае і свой непасрэдны аб'ект – адпаведна, жыццё, здароўе, палавую свабоду, асабістую свабоду і недатыкальнасць, гонар і годнасць. Такім чынам, тут непасрэдны аб'ект выступае ў якасці часткі родавага. У другіх выпадках суадносіны родавага і непасрэднага аб'екта могуць быць іншымі. Напр., яны супадаюць у злачынствах супраць уласнасці. Другімі, чым у злачынствах супраць асобы, могуць быць і ўзаемасувязі на ўзроўні непасрэднага аб'екта. Так, калі амаль кожнае злачынства супраць асобы мае свой непасрэдны аб'ект, то ўсе

злачынствы супраць уласнасці замахваюцца на адзін і той жа непасрэдны аб'ект (адносіны ўласнасці).

Дастаткова часта злачыннае дзеянне парушае не адну, а некалькі грамадскіх адносін. Аднак не ўсе грамадскія адносіны, на якія ўздзейнічае злачынства, з'яўляюцца тут аб'ектам злачынства. Непасрэдным аб'ектам выступаюць толькі тыя адносіны, якія ахоўваюцца крымінальна–прававой нормай.

Пры ўчыненні большасці злачынстваў асоба замахваецца на адзін непасрэдны аб'ект. Аднак некаторыя злачынствы здольны цягнуць за сабой шкоду двум ці больш непасрэдным аб'ектам. У такім выпадку адзін аб'ект з'яўляецца асноўным, а другі - дадатковым. Напр., пры разбойным нападзе асноўны аб'ект - адносіны ўласнасці, дадатковы – здароўе асобы.

Дадатковы аб'ект бывае абавязковым ці факультатыўным. Дадатковы аб'ект з'яўляецца абавязковым пры разбойным нападзе. Тут замах на дадатковы аб'ект заўсёды здзяйсняецца паралельна з замахам на асноўны аб'ект. Дадатковы аб'ект лічыцца факультатыўным, калі дзеянне толькі ў некаторых выпадках прычыняе яму шкоду. Напр., пры падробцы фальшывых грошай (асноўны аб'ект – грашовая і крэдытная сістэмы) у некаторых выпадках прычыняецца шкода і дадатковаму аб'екту – маёмасным правам грамадзян.

## §3. Прадмет злачынства

Пры ўчыненні некаторых грамадска небяспечных дзеянняў злачынец уздзейнічае на прадметы знешняга асяроддзя. Напр., службовы падлог заўсёды звязаны з вырабам дакументаў, якія ўтрымліваюць заведама ілжывыя звесткі; крадзёж – з завалоданнем чужой маёмасцю, а зняважанне дзяржаўных сімвалаў – з Дзяржаўным гербам Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь. Вось такія рэчы матэрыяльнага асяроддзя, праз уздзеянне на якія асоба парушае ці можа парушыць пэўныя грамадскія адносіны, і называюцца прадметам злачынства.

Прадмет злачынства з'яўляецца не абавязковай, а факультатыўнай прыкметай агульнага паняцця складу злачынства. Гэта тлумачыцца тым, што многія злачынствы не звязаны з фізічным уздзеяннем на пэўныя матэрыяльныя рэчы,

напр., пагроза забойствам (арт.202 КК), заведама ілжывы данос (арт.176 КК), неданясенне аб злачынстве (арт.186 КК) і іншыя. Прадмет злачынства выступае ў якасці абавязковай прыкметы складу злачынства толькі ў тых выпадках, калі гэта спецыяльна прадугледжвае канкрэтны артыкул КК.

У крымінальным праве прадмет злачынства звычайна не выдзяляецца ў злачынствах супраць асобы. У адносінах да асобы, якой злачынствам нанесены фізічны, маёмасны, маральны ці іншы урон, Крымінальна–працэсуальны кодэкс карыстаецца тэрмінам "пацярпеўшы". Таму пры замаху на асобу замест паняцця "прадмет злачынства" правільней ўжываць тэрмін "пацярпеўшы".

Значэнне прадмета злачынства, у выпадках калі ён з'яўляецца абавязковай прыкметай складу, праяўляецца ў трох наступных момантах. Па–першае, ён уплывае на кваліфікацыю злачынства, напр., крадзёж радыёактыўных рэчываў цягне за сабой адказнасць на падставе арт.$211^2$ КК, а лекавых сродкаў – па арт.87 КК. Па–другое, прадмет злачынства можа выступаць і ў якасці ўмовы рэалізацыі крымінальнай адказнасці. Так, хаванне агнястрэльнай наразной зброі цягне за сабой крымінальную адказнасць, а захоўванне паляўнічай гладкаствольнай зброі – не цягне. Па–трэцяе, у некаторых выпадках прадмет злачынства ўлічваецца заканадаўцам у якасці акалічнасці, якая абцяжарвае адказнасць. Так, паляванне на звяроў і птушак, паляваць на якіх поўнасцю забаронена, цягне за сабой больш суровую адказнасць на падставе ч.2 арт.163 КК.

Прадмет злачынства трэба адрозніваць ад аб'екта злачынства. Калі злачынства супраць аб'ект – гэта грамадскія адносіны, то прадмет – гэта матэрыяльная рэч. Калі злачынства супраць аб'екта – гэта заўсёды нанясенне яму ўрону, то прадмету злачынства шкода можа і не прычыняцца. Аб'ект з'яўляецца абавязковым элементам складу злачынства, прадмет жа прысутнічае толькі ў некаторых складах.

Прадмет злачынства неабходна адмяжоўваць ад прылад і сродкаў, якія выкарыстоўваюцца злачынцам для дасягнення сваёй злачыннай мэты. Прычым, пэўная рэч у адным вы-

падку выступае ў якасці прадмета злачынства, а ў другім – у якасці прылады ці сродку яго здзяйснення. Так, зброя з'яўляецца прадметам раскрадання (арт.213[1] КК) і сродкам здзяйснення злачынства пры наўмысным забойстве (арт.100–103 КК), бандытызме (арт.74 КК) або разбойным нападзе (арт.89 КК). Каб правесці адрозненне прадмета і сродку (прылады) злачынства, неабходна высветліць, у якой якасці выкарыстоўваюцца гэтыя рэчы ў працэсе ўчынення злачынства. Калі грамадска небяспечнае дзеянне здзяйсняецца ў сувязі ці адносна пэўнай рэчы (напр., каб завалодаць ёю), то яна павінна разглядацца як прадмет злачынства. Калі рэч выкарыстоўваецца ў якасці інструмента, з дапамогай якога можна парушыць пэўныя грамадскія адносіны і дасягнуць сваіх мэт, то гэта – сродак ці прылада здзяйснення злачынства (напр., ядавітыя рэчывы пры забойстве, бензін як сродак падпалу ў мэтах знішчэння чужой маёмасці і г.д.). Калі прадмет злачынства прама звязаны з тымі грамадскімі адносінамі, на якія ажыццяўляецца замах, то прылады і сродкі ніякага дачынення да гэтых адносін не маюць. Згодна з арт.81 КПК, прылады і сродкі заўсёды падлягаюць канфіскацыі. Прадмет злачынства, па агульнаму правілу, вяртаецца пацярпеўшаму.

## *Літаратура:*

Глистин В.К. Проблема уголовно–правовой охраны общественных отношений. Л., 1979; Коржанский Н.И. Объект преступления и квалификация преступлений. Волгоград, 1976; Коржанский Н.И. Предмет преступления. Волгоград, 1976; Коржанский Н.И. Объект и предмет уголовно–правовой охраны. М., 1980; Никифоров Б.С. Объект преступления. М., 1960; Таций В.Я. Объект и предмет преступления по советскому уголовному праву. Харьков, 1982.

# Глава 6

# АБ'ЕКТЫЎНЫ БОК ЗЛАЧЫНСТВА

## §1. Паняцце аб'ектыўнага боку злачынства

Любое канкрэтнае злачынства мае строга індывідуальныя прыкметы. Прыкметы, якія характарызуюць аб'ектыўны бок, выяўляюць асаблівасці злачынства як знешняга акта грамадска небяспечных паводзін вінаватага, а таксама месца, спосаб і абставіны, з якімі звязаны злачынныя паводзіны. Прыкметы, якія характарызуюць аб'ектыўны бок злачынства, называюцца "знешнімі" толькі ў адносінах да псіхалагічнага "ўнутранага" зместу замаху. У рэальным жыцці аб'ектыўны і суб'ектыўны бакі непарыўна звязаны.

Аб'ектыўны бок складу злачынства – гэта сукупнасць прадугледжаных законам прыкмет, якія характарызуюць знешні бок грамадска небяспечных паводзін, што робяць замах на аб'екты крымінальна–прававой аховы, а таксама аб'ектыўныя ўмовы, звязаныя з гэтымі паводзінамі.

Прыкметы аб'ектыўнага боку канкрэтнага складу злачынства апісваюцца ў дыспазіцыі адпаведнага артыкула Асаблівай часткі крымінальнага закону. Прыкметы, характарызуючыя аб'ектыўны бок канкрэтнага складу злачынства, параўнальна з іншымі элементамі складу злачынства (аб'ектам, суб'ектам, суб'ектыўным бокам) у крымінальна–прававой норме вызначаюцца больш поўна. Аб'ектыўны бок канкрэтнага складу злачынства ўтрымлівае характэрныя і тыповыя прыкметы, дастатковыя для апісання дзеяння ў якасці строга індывідуальнай з'явы, што дазваляе адмежаваць яго ад іншых складаў злачынстваў. У сувязі з гэтым шматлікія склады злачынстваў, прадугледжаныя крымінальным законам, розняцца паміж сабой часцей за ўсё па прыкметах, якія характарызуюць аб'ектыўны бок.

Прыкметы аб'ектыўнага боку канкрэтнага складу злачынства, вызначаючы яго змест, у той жа час удакладняюць межы

пасягнення. У гэтых межах вызначаецца адказнасць за здзейсненае злачынства. Аб'ектыўны бок пэўных злачынстваў вывучаецца ў Асаблівай частцы курса крымінальнага права.

Аб'ектыўны бок злачынства ўключае ў сябе: а) грамадска небяспечнае дзеянне; б) грамадска небяспечныя вынікі; в) прычынную сувязь паміж дзеяннем і вынікамі; г) час, месца, спосаб і абставіны ўчынення злачынства.

Аб'ектыўны бок складу злачынства ў якасці абавязковай прыкметы заўсёды ўключае ў сябе характарыстыку грамадска небяспечнага дзеяння. Грамадска небяспечныя вынікі гэтага дзеяння, прычынная сувязь, характарыстыка месца, часу, спосабу і абставін учынення злачынства з'яўляюцца факультатыўнымі прыкметамі, паколькі могуць выкарыстоўвацца або не выкарыстоўвацца пры апісанні ў законе прыкмет аб'ектыўнага боку складаў злачынстваў.

## §2. Грамадска небяспечнае дзеянне

Грамадска небяспечнае дзеянне з'яўляецца галоўнай прыкметай злачынства. Яно ўяўляе сабой пачатковы момант знешняга боку паводзін, якія ўтвараюць аб'ектыўны бок злачынства. Грамадска небяспечнае дзеянне параджае далейшыя звёны аб'ектыўнага боку злачынства: прычынную сувязь і грамадска небяспечныя вынікі. Погляды, перакананні, намеры асобы, якімі б заганнымі яны ні былі, не цягнуць крымінальнай адказнасці. Крымінальна-прававыя дзеянні – гэта заўсёды вызначаныя ў аб'ектыўнай рэальнасці паводзіны асобы. Без злачыннага ўчынку не можа ўзнікнуць пытанне аб крымінальнай адказнасці канкрэтнай асобы. Дзеянне – неабходная, абавязковая прыкмета кожнага злачынства. Яно здзяйсняецца асобай у канкрэтным месцы і часе, у вызначаных умовах і ўвасабляецца ў асаблівым відзе паводзін. Крымінальна-прававое паняцце дзеяння вызначае два магчымыя віды злачынных паводзін асобы: актыўныя (дзеянне) і пасіўныя (бяздзейнасць).

Злачыннае дзеянне ўвасабляе ўсе прыкметы, уласцівыя паводзінам чалавека ў псіхалагічным і фізіялагічным сэнсе і, акрамя гэтага, мае дадатковыя сацыяльныя якасці.

Сацыяльная якасць крымінальна–прававога дзеяння змяшчаецца ў яго грамадскай небяспецы. Кожны крымінальны ўчынак робіць замах на ахоўваемыя законам грамадскія адносіны, прычыняе ім шкоду і таму прызнаецца злачынствам. Грамадская небяспека і крымінальная супрацьпраўнасць, якая з яе выцякае, з'яўляюцца важнейшымі ўласцівасцямі злачынства, якія яго адрозніваюць ад іншых чалавечых учынкаў.

**Крымінальна-прававое дезянне** – гэта асэнсаваныя валявыя актыўныя і пасіўныя паводзіны суб'екта, якія выяўляюцца ў здзяйсненні грамадска небяспечнага ўчынку, прадугледжанага крымінальным законам.

Здзяйсненне злачынства, як і ўсякая дзейнасць чалавека, – гэта асэнсаваныя паводзіны чалавека. Знешні (фізічны) бок учынку і ўнутраны (псіхалагічны) бок утвараюць непарыўнае адзінства.

Паводзіны, грамадска небяспечны характар якіх не ўсведамляўся, не павінен быў і не мог усведамляцца ў момант іх знешняга праяўлення, не ўтвараюць крымінальна–прававога ўчынку.

Асэнсаваныя паводзіны чалавека набываюць характар крымінальна–прававога ўчынку толькі ў тым выпадку, калі яны адлюстроўваюць яго волю. Таму не з'яўляецца крымінальна–прававым учынкам рэфлекторны рух цела.

Калі, напр., у час моцнага галалёду грамадзянін П. для захавання раўнавагі рэфлекторна ўзмахнуў рукой і, падаючы, пацягнуў за сабой другога прахожага, які ў выніку падзення атрымаў калецтва, адказнасць П. выключаецца з–за адсутнасці крымінальна–прававога дзеяння.

Нельга разглядаць у якасці крымінальна–прававога дзеяння асэнсаваныя ўчынкі чалавека, здзейсненыя ім пад уздзеяннем неадольнай сілы або неадольнага фізічнага прымусу.

Неадольная сіла – гэта надзвычайная і немінучая пры пэўных умовах перашкода, непадуладная волі і дзейнасці чалавека прыродная з'ява (ураган, затапленне, удар маланкі і г.д.), некаторыя надзвычайныя з'явы грамадскага характару (ваенныя дзеянні, масавыя беспарадкі і інш.), падзеі, звязаныя з аварыямі машын і механізмаў.

Для таго, каб фізічны прымус выключыў крымінальную адказнасць, патрэбна, каб ён поўнасцю падаўляў волю асобы, якая дзейнічае пад уплывам такога прымусу.

Напр., нельга гаварыць аб крымінальна–прававым характары бяздзейнасці супрацоўніка міліцыі, які, цяжкапаранены, адстрэльваўся ад злачынцаў, таму не змог вызваць дапамогу, не папярэдзіў аб нападзе на ашчадны банк, не змог затрымаць небяспечных злачынцаў.

Здзяйсненне асобай грамадска небяспечнага дзеяння пад уплывам псіхічнага прымусу (пагрозы забойствам, нанясеннем шкоды здароўю, знішчэннем маёмасці і г.д.) не выключае крымінальна–прававы характар яго паводзін, паколькі ў такіх выпадках у асобы маецца магчымасць дзейнічаць па сваёй волі. Такія дзеянні могуць страціць крымінальны характар толькі тады, калі па абставінах справы іх можна разглядаць як здзейсненыя ў стане крайняй неабходнасці. Напр., не можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці кіраўнік дзяржаўнага прадпрыемства, які аддаў значную частку дзяржаўных грошай злачынцам, каб прадухіліць знішчэнне маёмасці, паколькі вымагальнікі ў выпадку невыканання іх патрабаванняў пагражалі ўзарваць вытворчыя цэхі і складавыя памяшканні прадпрыемства.

Учыненне асобай пад уздзеяннем псіхічнага прымусу цяжкага злачынства (напр.,забойства, тэрарыстычнага акта) не выключае крымінальнай адказнасці. У падобных абставінах у сілу асаблівай важнасці аб'екта пасягнення спасылкі на стан крайняй неабходнасці з'яўляюцца недапушчальнымі. Аднак прымяненне пагроз у гэтых выпадках можа быць улічана судом як змякчаючая віну акалічнасць пры вызначэнні пакарання.

Любое актыўнае дзеянне знешне выглядае як рух. Крымінальнае дзеянне можа ўвасабляцца ў выглядзе жэсту (напр., пры пагрозе), ў выглядзе вымаўлення слоў (пры абразе) або ў выглядзе фізічнага ўздзеяння на іншых асоб ці на розныя рэчы знешняга свету. Нярэдка крымінальна–прававыя дзеянні маюць складаны характар. Складаны характар дзеяння зводзіцца да таго, што ён ахоплівае не толькі рухі цела, якія накіроўваюцца ўсведамленнем і воляй асобы, але і тыя знеш-

нія сілы і заканамернасці, якія свядома накіроўваюцца суб'ектам злачынства ў працэсе яго дзейнасці. У такім разе выкарыстанне асобай аб'ектыўных прыродных працэсаў і сіл, прылад і тэхнічных сродкаў, паводзін жывёл, дзеянняў іншых асоб складае састаўную частку яго дзеяння.

У крымінальна-прававой літаратуры сітуацыі, калі асоба выкарыстоўвае ў злачыннай дзейнасці ўчынкі асобы ў стане бессвядомасці або непаўналетняга, які не дасягнуў узросту, з якога настае крымінальная адказнасць, або неасцярожныя дзеянні іншай асобы, называюцца пасрэдным прычыненнем.

Крымінальна-прававая бяздзейнасць – гэта грамадска небяспечныя і супрацьпраўныя, свядомыя, валявыя, пасіўныя паводзіны асобы, якія выяўляюцца ў невыкананні дзеянняў, якія асоба абавязана была і магла выканаць у дадзеных умовах, праз што прынесена шкода грамадскім адносінам, якія ахоўваюцца крымінальным законам.

Крымінальна-прававая бяздзейнасць, таксама як і дзеянне, павінна быць па свайму характару грамадска небяспечнай і крымінальна супрацьпраўнай.

Злачынная бяздзейнасць – гэта свядомыя і валявыя паводзіны асобы. Адказнасць за бяздзейнасць настае ў тым выпадку, калі на асобу ўскладзены абавязак дзейнічаць, і ў дадзеных канкрэтных абставінах яна магла здзейсніць патрабуемыя ўчынкі. Абавязак асобы дзейнічаць можа быць абумоўлены прамым указаннем закону, нарматыўнага акта або вынікае са службовага становішча асобы ці іншых падстаў. Пры вызначэнні, ці магла асоба дзейнічаць, улічваюцца наяўныя магчымасці той ці іншай асобы выканаць неабходныя дзеянні ў дадзеных умовах месца, часу і абставін.

Пасіўныя паводзіны, грамадска небяспечны характар якіх не ўсведамляўся, не павінен быў або не мог усведамляцца асобай у момант іх знешняга выяўлення, не стварае крымінальна-прававой бяздзейнасці.

Разам з тым, асэнсаваныя паводзіны асобы набываюць крымінальна-прававы характар, калі яны былі абумоўлены яе воляй. У сувязі з гэтым пасіўныя паводзіны нельга разглядаць у якасці крымінальна-прававой бяздзейнасці, калі

яны былі выкліканы неадольнай сілай або неадольным фізічным прымусам. З гэтай нагоды не ўтварае, напр., крымінальна-прававой бяздзейнасці неаказанне дапамогі хвораму, калі ўрач не здолеў прыйсці своечасова з-за разліцця ракі з прычыны паводкі.

Таксама не будзе крымінальнай адказнасці за пасіўныя паводзіны вартаўніка, калі ён быў звязаны злачынцамі.

У тых выпадках, калі да асобы прымяняецца фізічны прымус, і яна ўсё ж не страчвае магчымасці дзейнічаць па сваёй волі, пасіўныя паводзіны ацэньваюцца як крымінальна-прававая бяздзейнасць.

Бяздзейнасць асобы, зробленая пад уплывам псіхічнага прымусу, не ўтварае крымінальна-прававой бяздзейнасці ў выпадку, калі яна мела месца ў стане крайняй неабходнасці.

Пры пасіўных паводзінах, у адрозненне ад дзеяння, як правіла, адсутнічаюць рухі цела асобы. Пры злачыннай бяздзейнасці асоба неабавязкова паводзіць сябе пасіўна ва ўсіх адносінах. Яна можа разгортваць актыўную дзейнасць у пэўных напрамках (бегства з воінскай часці пры дэзерцірстве).

Падставай для крымінальнай адказнасці асобы за бяздзейнасць з'яўляецца невыкананне ёю ў пэўны момант, у пэўных умовах такіх дзеянняў, якія яна абавязана была і магла зрабіць. Такога роду паводзіны выклікаюць небяспечныя змяненні ў аб'ектыўнай рэальнасці. У складаных сацыяльных і эканамічных адносінах прымае ўдзел вялікая колькасць людзей, імі часта выкарыстоўваюцца складаныя механізмы, тэхналогіі, розныя дасягненні навукі і тэхнікі. У такіх умовах невыкананне асобнымі ўдзельнікамі грамадскіх адносін ускладзеных абавязкаў прыносіць шкоду аб'ектам, якія ахоўвае крымінальны закон.

Напр., невыкананне дыспетчарам атамнай электрастанцыі сваіх службовых абавязкаў можа прывесці да аварыі, звязанай з экалагічнай катастрофай, вялікімі матэрыяльнымі стратамі і чалавечымі ахвярамі; невыкананне машыністам электрапоезда правілаў руху можа прывесці да крушэння цягніка і выклікаць гібель мноства пасажыраў.

У крымінальна–прававой літаратуры адрозніваюць бяздзейнасць, якая стварае канкрэтную небяспеку, і бяздзейнасць – неўмяшанне. Бяздзейнасць стварае канкрэтную небяспеку і прыраўніваецца да актыўнай дзейнасці, калі яна адпавядае тром умовам: да моманту ўзнікнення абавязку дзейнічаць небяспечнай сітуацыі яшчэ няма; на асобу, якая бяздзейнічае, у сілу яе непасрэдных службовых функцый законам або дагаворам ускладзены абавязак дзейнічаць, каб прадухіліць узнікненне такой сітуацыі; з прычыны бяздзейнасці гэтай асобы падзеі разгортваліся да ступені ўзнікнення небяспечнай сітуацыі. Такой, напр., з'яўляецца бяздзейнасць дыспетчара чыгункі, які не ўключыў ва ўстаноўлены час неабходны сігнал светлафора, з прычыны чаго адбылося сутыкненне цягнікоў.

Пры бяздзейнасці – неўмяшанні асоба, нягледзячы на абавязак і магчымасць, не дзейнічае, каб устараніць узнікшую небяспеку, якая выклікана не бяздзейнасцю гэтай асобы, а іншымі прычынамі. Напр., такі від бяздзейнасці будзе мець месца ў выпадку, калі работнік выратавальнай станцыі не аказвае дапамогі чалавеку, які тоне.

Крымінальная адказнасць за бяздзейнасць настае, калі асоба не выконвае ўскладзеныя на яе абавязкі дзейнічаць. Абавязак асобы дзейнічаць пэўным чынам можа вызначацца прамым указаннем закону або падзаконнага акта.

Крымінальны закон часам непасрэдна ўскладае на асоб пэўныя абавязкі, невыкананне якіх утварае крымінальна-прававую бяздзейнасць (напр., арт.166[1] вызначае пры пэўных абставінах адказнасць за бяздзейнасць улады; арт.арт.86 і 186 прадугледжваюць адказнасць за неданясенне аб рыхтуемых або ўчыненых злачынствах).

Абавязак здзейсніць пэўныя дзеянні можа вынікаць з прафесійных ці службовых функцый або з дагаворных адносін. Напр., урач абавязаны аказваць дапамогу хвораму, невыкананне гэтага абавязку цягне адказнасць па арт.126 КК; асоба, якая ў адпаведнасці з дагаворам узяла на сябе абавязак даглядаць састарэлага і бездапаможнага чалавека, можа несці крымінальную адказнасць за бяздзейнасць, калі сваімі паводзінамі ставіць пацяр-

пеўшага ў небяспечны для жыцця стан (ч.2 арт.125 КК).

Абавязак здзейсніць пэўныя дзеянні можа быць абумоўлены ранейшымі паводзінамі асобы, якая стварыла пагрозу прычынення шкоды ахоўваемым законам інтарэсам. Напр., вадзіцелі транспартных сродкаў абавязаны аказваць дапамогу асобам, якія знаходзяцца ў небяспечным для жыцця стане, калі вадзіцелі самі паставілі пацярпеўшых у небяспечны для жыцця стан. Невыкананне такіх абавязкаў цягне адказнасць па ч.2 арт.125 КК.

Аб'ектыўны бок большасці злачынстваў можа выконвацца толькі шляхам актыўных дзеянняў. Такі аб'ектыўны бок раскрадання (арт.арт. 879[1] КК), хуліганства (арт.201 КК).

Асобныя злачынствы па сваіх аб'ектыўных асаблівасцях характарызуюцца толькі бяздзейнасцю. Напр., такімі злачынствамі з'яўляюцца ухіленне ад уплаты аліментаў на ўтрыманне дзяцей (арт.120 КК), злоснае ўхіленне ад аказання дапамогі бацькам (арт.121 КК), неданясенне аб злачынстве (арт.86 і 186 КК).

Аб'ектыўны бок шэрагу злачынстваў можа выконвацца як шляхам дзеяння, так і ў выглядзе бяздзейнасці. Да ліку такіх злачынстваў належаць: разглашэнне дзяржаўнай тайны (арт.72 КК); забойства (арт.100, 101, 104 КК); парушэнне правілаў аховы працы (арт.137 КК); парушэнне правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі транспартных сродкаў асобамі, якія кіруюць транспартнымі сродкамі (арт.206 КК).

Крымінальным законам аб'ектыўны бок канкрэтнага злачынства характарызуецца строга індывідуальнай формай паводзін. Гэтыя характарыстыкі з'яўляюцца неабходнымі прыкметамі пэўнага злачынства. Калі зробленае не адпавядае строга індывідуальнай характарыстыцы дзеяння, апісанага ў законе, гэта будзе сведчыць аб адсутнасці прыкмет пэўнага злачынства ў здзейсненым асобай учынку.

Напр., разбой (арт.89 КК) характарызуецца актыўным дзеяннем: нападам з мэтай завалодаць чужой маёмасцю, звязаным з насіллем, небяспечным для жыцця і здароўя асобы, на якую быў зроблены напад, або з пагрозай ужывання такога насілля. Адсутнасць такіх прыкмет у дзеяннях канкрэтнай

асобы ўказвае на адсутнасць дадзенага злачынства.

У канкрэтных крымінальна–прававых нормах даецца падрабязная характарыстыка дзеяння, што разглядаецца як адзінае злачынства, якое прычыняе, як правіла, шкоду аднаму аб'екту і мае пэўную суб'ектыўную накіраванасць.

Разам з тым, у асобных артыкулах Крымінальнага кодэкса заканадаўца так вызначае прыкметы складу злачынства, што крымінальна–прававыя дзеянні прыносяць шкоду двум або больш аб'ектам злачынства, грамадска небяспечныя паводзіны ўяўляюць сабой спалучэнне двух або больш дзеянняў, прычым разрыў паміж асобнымі актамі паводзін магчымы ў часе і прасторы. Падобнае ўказвае на наяўнасць так званых складаных (састаўных) злачынстваў.

## §3. Грамадска небяспечныя вынікі злачынства

Кожнае крымінальна–прававое дзеянне прычыняе шкоду грамадскім адносінам, якія ахоўвае крымінальны закон. Шкода, прычыненая грамадскім адносінам, утварае грамадска небяспечныя вынікі. Іх характар і памеры вызначаюцца дзвюма акалічнасцямі: асаблівасцямі аб'екта, на які быў зроблены замах, а таксама ўмовамі, пры якіх было ўчынена дзеянне. Грамадска небяспечныя вынікі могуць мець матэрыяльны і нематэрыяльны характар.

Раскраданне, знішчэнне і пашкоджанне маёмасці, асобныя злачынствы ў сферы прадпрымальніцтва і іншай гаспадарчай дзейнасці і інш. прычыняюць значную матэрыяльную шкоду маёмаснага характару.

Забойства, прычыненне цялесных пашкоджанняў, парушэнне правілаў аховы працы, правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі транспартных сродкаў і інш. прычыняюць матэрыяльныя вынікі фізічнага характару.

Паклёп, знявага, асобныя злачынствы супраць палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых правоў грамадзян прычыняюць нематэрыяльныя вынікі ў выглядзе духоўнай і маральнай шкоды чалавеку.

Асобныя злачынствы ў галіне прадпрымальніцтва і іншай гаспадарчай дзейнасці, некаторыя службовыя злачынствы і

інш. могуць прычыняць нематэрыяльныя вынікі ў выглядзе шкоды правам і законным інтарэсам грамадзян, дзяржаўным або грамадскім інтарэсам.

У судовай прыктыцы і крымінальна–прававой літаратуры адрозніваюць вынікі злачынства ў шырокім і вузкім крымінальна–прававым сэнсе. Вынікі злачынства ў шырокім сэнсе – гэта аб'ектыўная шкода, якая прычынена дзеяннем асобы грамадскім адносінам. Вынікі злачынства ў вузкім сэнсе гэта змяненні ў аб'екце, якія прадугледжаны законам у якасці прыкметы канкрэтнага складу злачынства.

Грамадска небяспечнае дзеянне можа выклікаць розныя шкодныя і небяспечныя вынікі. Разам з тым, асоба будзе несці адказнасць толькі за тыя вынікі, якія прадугледжаны законам у якасці прыкметы аб'ектыўнага боку канкрэтнага злачынства. Напр., махляр, які завалодаў чужой маёмасцю, можа прычыніць уласніку не толькі маёмасную шкоду. У пацярпеўшага ад моцных перажыванняў можа ўзнікнуць цяжкая хвароба. Аб'ектыўны бок махлярства прадугледжвае ў якасці выніку толькі маёмасную шкоду. Іншая шкода, якая можа наступіць, не з'яўляецца абавязковай прыкметай аб'ектыўнага боку махлярства. Падобныя вынікі ўлічваюцца судом у якасці абцяжарваючых акалічнасцей (п.4 арт.38 КК).

Заканадаўца карыстаецца рознымі спосабамі апісання грамадска небяспечных вынікаў. Матэрыяльныя вынікі фізічнага характару ў законе, як правіла, вызначаюцца выразна. Так, напр., у арт.арт.100–105 КК вынік вызначаны ў выглядзе смерці пацярпеўшага; у арт.арт.106, 107, 110 КК гаворыцца аб цяжкім, менш цяжкім або лёгкім цялесным пашкоджанні; у арт. 206 КК у гэтай якасці названы менш цяжкія цялесныя пашкоджанні (ч.1), смерць пацярпеўшага або прычыненне яму цяжкага цялеснага пашкоджання (ч.2), гібель некалькіх асоб (ч.3) і г.д.

Матэрыяльныя вынікі маёмаснага характару ў дзеючым КК вызначаюцца тэрмінамі: дробны памер, буйны памер (буйны ўрон), асабліва буйны памер або асабліва буйны ўрон. Гэтыя крытэрыі канкрэтызуюцца ў вартасным выяўленні ў арт.72 КК.

Нематэрыяльныя вынікі ў выглядзе шкоды ахоўваемым правам і законным інтарэсам асобы, дзяржаўным або грамадскім інтарэсам вызначаны ў законе ў выглядзе ацэначных паняццяў: істотная шкода, цяжкія вынікі і інш. У дзеючым КК Рэспублікі Беларусь змест дадзеных ацэначных крытэрыяў не раскрыты. У асобных выпадках Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь дае афіцыйнае тлумачэнне гэтых паняццяў у прымяненні да канкрэтнага злачынства, устанаўлівае крытэрыі вызначэння таго ці іншага выніку. Напр., у пастанове N 4 Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 1993 г. "Аб судовай практыцы па справах аб злоўжыванні ўладай або службовым становішчам, перавышэнні ўлады або службовых паўнамоцтваў, халатнасці і службовым падлозе" адзначаецца, што пад істотнай шкодай належыць разумець парушэнне канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, падрыў аўтарытэту органаў улады, дзяржаўных, грамадскіх і іншых арганізацый, парушэнне грамадскага парадку, утойванне цяжкіх злачынстваў і г.д.

У пастанове N 8 Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 27 верасня 1991 г."Аб судовай практыцы па справах аб вымаганні", у прыватнасці, гаворыцца, што да іншых цяжкіх вынікаў, адзначаных у ч.3 арт.93 КК, могуць адносіцца вымушанае спыненне дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацый, кааператываў або прафесійнай дзейнасці пацярпеўшага, а таксама іншыя вынікі, якія суд з улікам канкрэтных абставін справы можа прызнаць цяжкімі.

У крымінальным заканадаўстве аб'ектыўны бок складу злачынства апісваецца па-рознаму. У адных выпадках крымінальны закон прызнае наяўнасць юрыдычна закончанага злачынства з моманту надыходу вызначанага ў законе канкрэтнага выніку. Канструкцыі складаў такіх злачынстваў прынята называць матэрыяльнымі. Да іх, напр., адносяцца склады забойстваў, прычыненне цялесных пашкоджанняў, раскраданняў. Так, забойства лічыцца юрыдычна закончаным злачынствам з моманту надыходу смерці пацярпеўшага, крадзёж – з моманту, калі асоба супрацьпраўна, з карыслівай мэтай завалодае чужой маёмасцю і мае рэаль-

ную магчымасць распараджацца ёю па свайму меркаванню.

У іншых выпадках крымінальны закон адносіць да аб'ектыўнага боку юрыдычна скончанага злачынства сам факт учынення грамадска небяспечнага дзеяння незалежна ад вынікаў, якія вызваны гэтымі паводзінамі. Падобныя канструкцыі складаў злачынстваў умоўна імянуюць фармальнымі. Да такіх канструкцый складаў злачынстваў адносяцца, напр., здрада дзяржаве, змова з мэтай захопу дзяржаўнай улады, паклёп, знявага і інш.

Да фармальных складаў злачынстваў належаць і тыя склады, якія ў адпаведнасці з законам лічацца юрыдычна выкананымі, калі ўчыненае дзеянне ўтрымлівае ў сабе рэальную магчымасць надыходу шкодных вынікаў. Так, напр., адпаведна з ч.2 арт.82 КК парушэнне работнікам чыгуначнага, воднага або паветранага транспарту правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту ацэньваецца ў якасці юрыдычна закончанага злачынства, калі яно не выклікала, але заведама стварала пагрозу наступлення вынікаў, прадугледжаных у ч.1 гэтага артыкула.

Выдзяленне заканадаўцам фармальных складаў злачынства заснавана на тым, што ў асобных выпадках ужо сам факт учынення дзеяння сведчыць аб значнай грамадскай небяспецы зробленага асобай. У такой сітуацыі было б няправільна канструяваць аб'ектыўны бок гэтых злачынстваў такім чынам, каб яны лічыліся юрыдычна закончанымі з моманту надыходу пэўных вынікаў. Заканадаўца выкарыстоўвае фармальныя канструкцыі складаў злачынстваў яшчэ і таму, што ў шэрагу выпадкаў вынікі не паддаюцца дакладнаму ўліку і вымярэнню, напр., пры паклёпе.

У асобных выпадках пры апісанні аб'ектыўнага боку канкрэтнага злачынства выкарыстоўваецца дзве канструкцыі складу злачынства.

Такое спалучэнне можа прымяняцца як у рамках адзінай дыспазіцыі (гл.: арт.217 КК), так і ў розных частках аднаго артыкула Асаблівай часткі КК.

Пры гэтым у апошняй сітуацыі фармальная канструкцыя выкарыстоўваецца пры апісанні простага складу злачын-

ства, а матэрыяльная – пры апісанні кваліфікаванага складу злачынства. Так, напр., аналагічным чынам сканструяваны арт.137 КК. У ч.1 гэтага артыкула прадугледжана адказнасць за парушэнне службовай асобай правілаў па тэхніцы бяспекі, прамысловай санітарыі або іншых правілаў аховы працы, калі гэтае парушэнне магло выклікаць няшчасныя выпадкі з людзьмі або іншыя цяжкія вынікі. У ч.2 арт.137 прадугледжваецца адказнасць за тыя ж парушэнні, якія выклікалі прычыненне цялесных пашкоджанняў ці страту працаздольнасці. У ч.3 устанаўліваецца адказнасць за парушэнні, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, якія выклікалі смерць чалавека або прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў некалькім асобам.

## §4. Прычынная сувязь

Абавязковай прыкметай матэрыяльных складаў злачынстваў з'яўляецца прычынная сувязь. Грамадска небяспечны вынік пры ўчыненні злачынства можа быць пастаўлены ў віну, калі ён знаходзіцца ў прычыннай сувязі з грамадска небяспечным дзеяннем асобы. Пры ўчыненні злачынстваў з фармальным складам такое пытанне не ўзнікае, бо само грамадска небяспечнае дзеянне ўтварае склад юрыдычна скончанага злачынства.

Пытанне аб прычыннай сувязі – гэта адно з найбольш складаных пытанняў тэорыі крымінальнага права. У асобных выпадках не ўзнікае цяжкасцей вызначэння наяўнасці або адсутнасці прычыннай сувязі паміж дзеяннем асобы і вынікамі, якія надышлі. Аднак падобная ўпэўненасць рассейваецца і ўзнікаюць сур'ёзныя сумненні, калі ланцуг прычыннасці паміж дзеяннем суб'екта і грамадска небяспечным вынікам ускладняецца сіламі і абставінамі, да якіх паводзіны суб'екта недатычныя.

Крымінальнае заканадаўства не ўтрымлівае азначэння прычыны злачыннага выніку. Няма таксама ніякіх спецыяльных пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па праблеме прычыннай сувязі.

Пытанне аб прычыннай сувязі паміж грамадска небяс-

печным дзеяннем і шкоднымі вынікамі вырашаецца не Крымінальным кодэксам, а судовай практыкай і тэорыяй крымінальнага права. Рашэнне праблемы аб прычыннай сувязі ў айчынным крымінальным праве засноўваецца на палажэннях дыялектычнага матэрыялізму.

З пазіцыі матэрыялізму прычыннасць – гэта аб'ектыўная, існуючая па–за намі сувязь паміж з'явамі навакольнага свету. Паняцце аб прычыннасці адлюстроўвае рэальную сувязь паміж з'явамі аб'ектыўнай рэчаіснасці толькі прыблізна і спрошчана.

Прычына і вынік – гэта ізаляваныя моманты ў агульным складаным ланцугу ўзаемаабумоўленых і пераплеценых сувязей знешняга свету.

У гэтай сувязі прычына і вынік – гэта паняцці адносныя, маючыя значэнне толькі ў прымяненні да строга акрэсленай сітуацыі, тое, што ў дадзеным ланцугу лічыцца вынікам вызначанай з'явы, само з'яўляецца прычынай іншай з'явы і г.д.

У сферы крымінальнага права суд даследуе пытанне аб наяўнасці прычыннай сувязі паміж грамадска небяспечным дзеяннем асобы і злачынным вынікам.

Усе з'явы навакольнага свету ўзаемазвязаны і прычынна абумоўлены. Беспрычынных з'яў не існуе. Аднак сярод прычынна абумоўленых з'яў трэба адрозніваць з'явы неабходныя і выпадковыя.

Неабходныя вынікі ўнутрана ўласцівыя дадзеным пэўным папярэднім з'явам.

Пытанне аб крымінальнай адказнасці можа ставіцца толькі ў адносінах неабходных вынікаў пэўнага дзеяння чалавека. Размова ідзе аб такіх выніках, якія былі рэальна магчымыя пры ўчыненні гэтага дзеяння ў дадзены час, у дадзеных месцы і ўмовах. Гэта вынік, які заканамерна вынікае са здзейсненага. Усе выпадковыя вынікі пэўнага дзеяння асобы застаюцца па–за сферай дзеяння крымінальнага закону. За гэтыя вынікі, якімі б цяжкімі яны ні былі, ні пры якіх умовах асоба не можа несці крымінальнай адказнасці.

Прычынная сувязь мае наступныя асаблівасці: а) грамад-

ска небяспечнае дзеянне папярэднічае ў часе злачыннаму выніку; б) дзеянне ўтрымлівае ў сабе непазбежнасць або рэальную магчымасць надыходу грамадска небяспечнага выніку; в) у пэўнай сітуацыі, канкрэтным месцы і часе гэта непазбежнасць або магчымасць рэалізуецца і заканамерна цягне грамадска небяспечны вынік; г) злачынны вынік – гэта заканамерны рэзультат здзейсненага, а не паводзін трэціх асоб або ўздзеяння іншых заканамернасцей і сіл прыроды.

Разглядаючы пытанне аб прычыннай сувязі па кожнай канкрэтнай справе, неабходна перш за ўсё вырашыць, ці маецца ўвогуле аб'ектыўная сувязь паміж канкрэтным дзеяннем асобы і грамадска небяспечным вынікам, які ставяць у адказнасць гэтай асобе. Пры выяўленні падобнай сувязі паміж грамадска небяспечным дзеяннем і шкодным вынікам трэба вырашыць пытанне аб тым, ці з'яўляецца рэзультат неабходным або выпадковым вынікам учыненага асобай дзеяння. Наступіўшая шкода з'яўляецца неабходным вынікам здзейсненага, калі ў канкрэтных умовах месца, часу і іншых абставін мелася аб'ектыўная магчымасць надыходу грамадска небяспечнага рэзультату, калі гэты вынік быў заканамерным. Так, напр., грамадска небяспечны вынік будзе неабходным рэзультатам здзейсненага, калі ад стрэла ў галаву і цяжкай раны наступае смерць пацярпеўшага. У падобнай сітуацыі смерць пацярпеўшага – гэта ўнутрана ўласцівы грамадска небяспечнаму дзеянню і заканамерна з яго выцякаючы грамадска небяспечны вынік.

Прычынная сувязь можа быць непасрэднай (прамой) або ўключаць у сябе прамежкавыя звёны. Таму магчымы пяць варыянтаў прычынна–выніковых ланцугоў:

а) дзеянне непасрэдна параджае вынік (наступленне смерці ад удару нажом у сэрца пацярпеўшага);

б) дзеянне заканамерна выклікае іншую з'яву, якая ў сілу сваёй унутранай логікі заканамерна параджае злачынны вынік (асоба на некалькі дзён пакідае свайго паралізаванага састарэлага бацьку без дапамогі і пацярпеўшы без вады і ежы памірае);

в) дзеянне асобы заканамерна выклікае іншае дзеянне і апошняе заканамерна параджае вынік (падбухторшчык схіляе

іншую асобу здзейсніць крадзёж каштоўнасцей у пацярпеўшага);

г) два або болей дзеянні паралельна параджаюць агульны вынік (дзеяннямі некалькіх асоб прычыняюцца цяжкія, несумяшчальныя з жыццём пашкоджанні, якія выклікалі смерць пацярпеўшага);

д) два і болей дзеянні з'яўляюцца неабходнымі ўмовамі, без якіх не наступіў бы грамадска небяспечны вынік (парушэнне капітанамі двух суднаў правілаў руху, што выклікала аварыю аднаго з суднаў).

Грамадска небяспечны вынік з'яўляецца выпадковым рэзультатам учыненага дзеяння, калі ў канкрэтных абставінах месца і часу не ўтрымлівалася рэальнай магчымасці яго надыходу, калі наступіўшы вынік не з'яўляецца заканамерным рэзультатам.

Эвалюцыя выпадковай прычыннай сувязі можа быць наступнай:

а) заканамернае развіццё дзеяння сустракаецца з дзеяннем трэціх асоб, і гэта больш моцная заканамернасць параджае неўласцівыя для першага дзеяння вынікі (вынікі будуць выпадковымі, калі, напр., асобе нанесена лёгкае цялеснае пашкоджанне, але яна гіне ад заражэння крыві, якое здарылася ад нядбайнасці ўрача; у такой сітуацыі смерць пацярпеўшага не вынікае заканамерна з учыненага асобай дзеяння, вынік, які наступіў, выкліканы дзеяннем іншай асобы);

б) заканамернае развіццё дзеяння перасякаецца з уздзеяннем пэўных знешніх сіл, і гэта больш моцная заканамернасць параджае неўласцівыя першаму дзеянню вынікі (напр., вынікі будуць выпадковымі, калі асоба прычыняе пацярпеўшаму лёгкія цялесныя пашкоджанні, але апошні, знаходзячыся ў бальніцы, гіне ад пажару).

У крымінальна-прававой літаратуры спрэчным з'яўляецца пытанне аб прычыннай сувязі паміж бяздзейнасцю і грамадска небяспечнымі вынікамі. Па меркаванню адных аўтараў, бяздзейнасць, таксама як і дзеянне, можа параджаць грамадска небяспечныя вынікі. Пры бяздзейнасці, лічаць іншыя, прычынная сувязь адсутнічае ўвогуле. Па меркаванню трэціх, пры-

чынная сувязь пры бяздзейнасці магчымая, але мае пэўныя асаблівасці. Апошняя пазіцыя з'яўляецца больш пераканаўчай.

Пры бяздзейнасці, якая стварае небяспеку, паколькі яна не адрозніваецца ад актыўнага дзеяння, пытанне аб прычыннай сувязі вырашаецца такім жа чынам, як і пры ўчыненні дзеяння.

Пры бяздзейнасці – неўмяшанні небяспека не ствараецца пасіўнымі паводзінамі асобы. Яна ўзнікае і развіваецца пад уплывам дзеяння іншай асобы або іншых знешніх сіл. Асоба, якая бяздзейнічае, мае абавязак і рэальную магчымасць умяшацца ў ход развіцця грамадска небяспечнага працэсу, аднак не робіць гэтага. У гэтай сувязі бяздзейнасць – неўмяшанне з'яўляецца неабходнай умовай надыходу грамадска небяспечнага выніку.

## §5. Спосаб, месца, час і абставіны ўчынення злачынства

Адной з факультатыўных прыкмет аб'ектыўнага боку з'яўляецца спосаб учынення злачынства. Пад спосабам учынення злачынства разумеюць сукупнасць прыёмаў і метадаў, з дапамогай якіх асоба дасягае выніку сваіх грамадска небяспечных паводзін. Спосаб учынення злачынства, з'яўляючыся важным элементам дзеяння, аказвае значны ўплыў на характар і ступень грамадскай небяспекі здзейсненага. У многіх складах злачынстваў ён выступае ў якасці абавязковай прыкметы аб'ектыўнага боку. Напр., давядзенне да самагубства будзе з'яўляцца злачынствам, калі яно здзейснена шляхам жорсткага абыходжання з пацярпеўшым або сістэматычнага прыніжэння яго асабістай годнасці (арт.105 КК). У асобных выпадках спосаб выступае ў якасці прыкметы, якая дазваляе размежаваць падобныя злачынствы. Так, напр., віды раскрадання адрозніваюцца паміж сабой у залежнасці ад спосабу заўладання чужой маёмасцю (арт.арт.87, 88, 89, 90, 91, 93 КК).

У некаторых выпадках спосаб учынення злачынства з'яўляецца прыкметай кваліфікаванага віду складу злачынства. Напр., наўмыснае забойства, учыненае з асаблівай жорсткасцю або спосабам, небяспечным для жыцця многіх людзей (п. "е", арт.100 КК); прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання

спосабам, які меў характар мучэння ці катавання (ч.2 арт.106 КК); наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці, учыненае шляхам падпалу або іншым агульнанебяспечным спосабам (ч.2 арт.96 КК).

Месца ўчынення злачынства – гэта вызначаная тэрыторыя, дзе зроблены грамадска небяспечны замах. Гэта акалічнасць у асобных выпадках пры апісанні аб'ектыўнага боку складу злачынства выкарыстоўваецца ў якасці асноўнай або кваліфікуючай прыкметы злачынства. Так, напр., дзеянні, якія дэзарганізуюць работу папраўча–працоўнай установы, ацэньваюцца як злачынства, калі яны ўчынены ў месцах пазбаўлення волі (арт.74[1] КК).

Крадзёж рэчаў, якія знаходзяцца пры забітых і параненых, разглядаецца як марадзёрства (арт.255 КК), калі ён учыняецца на полі бітвы. У якасці кваліфікуючай прыкметы месца злачынства вызначаецца ў ч.2 арт. 163 КК, дзе гаворыцца аб незаконным паляванні, якое ўчынена на тэрыторыі дзяржаўнага запаведніка.

Час учынення злачынства – гэта вызначаны ў законе прамежак часу, у перыяд якога ўчыняецца грамадска небяспечны замах. Спасылка на час учынення злачынства прымяняецца ў законе вельмі рэдка ў якасці асноўнай або кваліфікуючай прыкметы складу злачынства. Час у якасці асноўнай прыкметы ўказаны, напр., у арт.161 КК, дзе гаворыцца аб незаконным заняцці рыбным або іншым водным здабываючым промыслам у забаронены час; у арт.163 КК, дзе ідзе размова аб незаконным паляванні ў забароненыя тэрміны.

Такая акалічнасць, як ваенны час, у якасці кваліфікуючай прыкметы вызначана ў шэрагу злачынстваў: непадпарадкаванне (п."в" арт.227 КК); невыкананне загаду (п."в" арт.228 КК); супраціўленне начальніку або прымушэнне яго да парушэння службовых абавязкаў (п."в" арт.226 КК); пагроза начальніку (п."в" арт.230 КК) і інш.

Абставіны ўчынення злачынства – гэта апісаныя ў законе пэўныя знешнія ўмовы, пры якіх здзяйсняецца грамадска небяспечны замах. У асобных выпадках пэўныя абставіны з'яўляюцца абавязковай прыкметай асноўнага складу

злачынства. Так, напр., заклікі да звяржэння або змянення канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь або да ўчынення асабліва небяспечных дзяржаўных злачынстваў будуць разглядацца як злачынства, калі падобныя дзеянні здзяйсняюцца публічна. У асобных воінскіх злачынствах кваліфікуючай прыкметай з'яўляецца ўчыненне злачынства ў баявой абстаноўцы, напр., непадпарадкаванне (п."в" арт.227 КК); невыкананне загаду (п."в" арт.228 КК); пагроза начальніку (п."в" арт.230 КК).

## Літаратура:

Акоев К.Л., Кауфман М.А. и др. Объективная сторона преступления (факультативные признаки). М., 1995; Землюков С.В. Уголовно–правовые проблемы преступного вреда. Новосибирск, 1991; Ковалев М.И. Проблемы учения об объективной стороне состава преступления. Красноярск, 1991; Кудрявцев В.Н. Объективная сторона преступления. М.,1960; Мальцев В.В. Проблема уголовно–правовой оценки общественно–опасных последствий. Саратов, 1989; Михлин А.С. Последствия преступления. М., 1969; Панов Н.И. Уголовно–правовое значение способа совершения преступления. Харьков, 1984; Пионтковский А.А. Учение о преступлении по советскому уголовному праву. М., 1961; Тер–Акопов А.А. Бездействие как форма преступного поведения. М., 1980; Тимейко Г.В. Общее учение об объективной стороне преступления. Ростов, 1977; Церетели Т.В. Причинная связь в уголовном праве. М., 1963.

# Глава 7

# СУБ'ЕКТЫЎНЫ БОК ЗЛАЧЫНСТВА

## §1. Паняцце суб'ектыўнага боку злачынства

Усякі ўчынак чалавека праходзіць праз яго розум, з'яўляецца ўвасабленнем яго волевыяўлення, мае як бы два бакі: знешні (актыўныя або пасіўныя паводзіны, якія выклікаюць змяненні ў навакольнай рэчаіснасці) і ўнутраны (асэнсаванне ўчынку, яго ацэнка, выбар формы паводзін, прыманне рашэння). Учыненне злачынства не з'яўляецца выключэннем з гэтага правіла.

Асоба можа быць прыцягнута да крымінальнай адказнасці, калі грамадска небяспечнае дзеянне было не толькі "справай яе рук", але і прадуктам яе свядомасці, волі, эмацыянальных перажыванняў.

Прынцыпам крымінальнага права з'яўляецца суб'ектыўнае стаўленне ў віну – прынцып віны. Крымінальная адказнасць магчыма толькі тады, калі асоба ўсведамляла або ў канкрэтных умовах павінна была і магла ўсведамляць характар свайго ўчынку, прадбачыла або павінна была і магла прадбачыць яго вынікі і выявіла або магла выявіць свае валявыя адносіны да грамадска небяспечнага дзеяння ці бяздзейнасці. Нельга будаваць крымінальную адказнасць на прынцыпе аб'ектыўнага стаўлення ў віну, калі да ўвагі прымаецца толькі небяспечнасць учынку чалавека і шкодныя вынікі гэтых паводзін, а псіхічныя адносіны асобы да дзеяння застаюцца без ацэнкі.

Паняццем суб'ектыўнага боку злачынства ахопліваюцца псіхічныя адносіны суб'екта да ўчыняемага ім грамадска небяспечнага дзеяння і грамадска небяспечных вынікаў гэтага дзеяння. Да суб'ектыўнага боку злачынства крымінальнае права адносіць толькі тыя элементы псіхічных адносін, якія маюць значэнне для вырашэння пытання аб падставах крымінальнай адказнасці і для вызначэння яе межаў.

Грамадска небяспечнае дзеянне ці бяздзейнасць толькі ў тым выпадку прызнаюцца злачынствам, а асоба прыцягваецца да крымінальнай адказнасці за ўчыненае, калі яе псіхічныя адносіны да ўчынку адпавядалі прадугледжаным у законе формам: намеру або неасцярожнасці. Намер і неасцярожнасць – гэта формы важнейшай прыкметы суб'ектыўнага боку злачынства: віны. Акрамя віны суб'ектыўны бок злачынства ўключае такія псіхалагічныя характарыстыкі дзеяння, як матыў і мэта. Гэтыя прыкметы паказваюць валявую накіраванасць дзеяння, унутранае заахвочванне, якое выклікала ўчыненне злачынства.

Такім чынам, суб'ектыўны бок злачынства – гэта элемент складу злачынства, які характарызуе ўнутраныя, псіхічныя адносіны злачынца да свайго грамадска небяспечнага дзеяння або бяздзейнасці, да грамадска небяспечных вынікаў учынку наяўнасцю віны (намеру ці неасцярожнасці), матыву і мэты злачынства.

Суб'ектыўны бок у цэлым, як і кожная з яго прыкмет, выяўляе сябе не абстрактна, а канкрэтна, праз аб'ектыўны бок учыненага злачынства. Таму вывучэнне суб'ектыўнага боку і даследаванне наяўнасці або адсутнасці той або іншай яго прыкметы павінны ісці ў сувязі з аналізам прыкмет аб'ектыўнага боку злачынства.

Асобнае месца ў суб'ектыўным боку злачынства займаюць эмоцыі (пачуцці), якія адчувае асоба ў час учынення злачынства. Гэта эмоцыі, якія суправаджаюць падрыхтаванне да злачынства і працэс яго здзяйснення. Яны звязаны з матывамі грамадска небяспечнага дзеяння і ў некаторых выпадках уваходзяць у суб'ектыўны бок складу канкрэтнага злачынства, напр., наўмыснага забойства, учыненага ў стане моцнага душэўнага хвалявання (арт.102 КК).

Суб'ектыўны бок злачынства мае істотнае значэнне для вырашэння пытанняў крымінальнай адказнасці.

Па–першае, з яго дапамогай адмяжоўваюць злачыннае ад незлачыннага. Напр., не з'яўляецца злачынствам прычыненне нават асабліва цяжкіх вынікаў пры адсутнасці віны: намеру ці неасцярожнасці. Не будзе злачынства пры

неасцярожным учыненні дзеяння, якое пакаральна толькі пры наўмысным учыненні. Не будзе таксама злачынства, калі ўчынак здзейснены пры адсутнасці матыву або мэты, якія прадугледжаны законам.

Па–другое, з дапамогай суб'ектыўнага боку злачынства адмяжоўваюць адзін ад другога склады злачынстваў, якія маюць аднолькавыя прыкметы аб'ектыўнага боку злачынства. У гэтых выпадках даследаванні суб'ектыўнага боку злачынства з'яўляюцца ўмовай дакладнай кваліфікацыі.

Па–трэцяе, змест суб'ектыўнага боку злачынства ўказвае на ступень грамадскай небяспекі злачынства і асобы, якая яго ўчыніла. Гэта ўлічваецца пры індывідуалізацыі адказнасці, выбранні віду і памеру пакарання.

Судовая практыка зыходзіць з неабходнасці стараннага даследавання зместу і накіраванасці намеру, высвятлення сапраўдных матываў і мэты злачынства, выразнага адмежавання наўмысных злачынстваў ад тых, якія ўчынены па неасцярожнасці.

## §2. Паняцце віны

Крымінальная адказнасць чалавека за яго ўчынак грунтуецца не толькі на тым, што ён выклікаў сваімі дзеяннямі грамадска небяспечны вынік, але і на тым, што гэтыя дзеянні прайшлі праз яго розум і волю, супастаўлены ім з навакольнай рэчаіснасцю і аказаліся выяўленнем яго імкненняў, жаданняў, інтарэсаў.

Метадалагічнай асновай прынцыпу суб'ектыўнага стаўлення ў віну (прынцыпу віны) з'яўляюцца дэтэрміністычныя ўяўленні аб прыродзе чалавечых учынкаў, якія зыходзяць не толькі з абумоўленасці, але і з адноснай самастойнасці чалавечай свядомасці ў выбары мэтаў і спосабаў сваіх паводзін, у прыняцці і здзяйсненні рашэнняў.

Да грамадска небяспечных, злачынных паводзін вядуць тры лініі прычынных сувязей: па–першае, якасці асобы суб'екта; па–другое, канкрэтныя жыццёвыя абставіны, у якіх асоба знаходзіцца; па–трэцяе, улік самім чалавекам вынікаў сваіх уласных учынкаў – не толькі ў форме жыццёвага вопыту,

але і ў форме прадбачання вынікаў свайго ўчынку ў будучыні. Паводзіны чалавека нельга бачыць як простую рэакцыю на знешнія абставіны. У здзяйсненні кожнага грамадска небяспечнага дзеяння адлюстроўваецца пэўная накіраванасць волі асобы. Але волю нельга разглядаць як псіхічную здольнасць, адарваную ад мыслення. Усякае валявое дзеянне звязана з той або іншай ступенню асэнсавання ўмоў, у якіх дзейнічае асоба. Гэта датычыцца як правамерных учынкаў, так і правапарушэнняў.

**Віна** – гэта псіхічныя адносіны асобы да свайго грамадска небяспечнага дзеяння ці бяздзейнасці, да грамадска небяспечных вынікаў свайго ўчынку ў форме намеру або неасцярожнасці.

Віна – гэта не толькі псіхалагічнае, але і прававое паняцце. Паняццямі намеру і неасцярожнасці карыстаюцца і іншыя галіны права, напр., адміністрацыйнае, грамадзянскае (цывільнае) у дачыненні да правапарушэнняў. Нельга ўжываць паняцце віны ў адносінах да правамерных паводзін. Віна гэта стаўленне асобы менавіта да грамадска шкодных учынкаў. У крымінальным праве – да злачыннага дзеяння.

Суб'ектыўнай падставай прыцягнення асобы да крымінальнай адказнасці за ўчыненне наўмыснага грамадска небяспечнага дзеяння прызнаецца тое, што гэта асоба ўсведамляла грамадска небяспечны характар свайго дзеяння, прадбачыла яго грамадска небяспечныя вынікі і замахвалася на чалавека, яго правы, на чужую ўласнасць, на грамадскі парадак і іншыя аб'екты, якія ахоўвае крымінальны закон. Так, асоба, якая выкрадае чужую маёмасць, разумее шкоднасць гэтага ўчынку для ўласніка і для грамадства ў цэлым, але накіроўвае сваю волю і свае дзеянні на прычыненне страты пацярпеўшаму.

Пры неасцярожным учыненні грамадска небяспечнага дзеяння грамадзянін прызнаецца вінаватым таму, што ён дапусціў недаравальную легкадумнасць, няўважлівасць ці грубую нядбайнасць у сваіх паводзінах. Напр., асоба, якая кіравала аўтамашынай, здзейсніла аварыю з чалавечымі ахвярамі таму, што перавышала хуткасць, не сачыла за абставінамі на дарозе, груба парушала правілы дарожнага руху. Вадзіцель, які праявіў

недапушчальныя адносіны да правілаў бяспекі, учыніў неасцярожнае злачынства і падлягае крымінальнай адказнасці.

Такія псіхічныя адносіны сурова асуджаюцца не толькі законам, але і мараллю. Віна – такое стаўленне асобы да сваіх паводзін, якое заслугоўвае ганьбавання з боку закону, маралі, правасвядомасці.

Віна існуе аб'ектыўна. Яна павінна быць устаноўлена судом і зафіксавана ў прыгаворы. Першапачаткова вінаватасць асобы ва ўчыненні злачынства ўстанаўліваецца следчым на стадыі папярэдняга следства, але прызнаць асобу вінаватай у здзяйсненні злачынства і прызначыць пакаранне можа толькі суд. Гэта канстытуцыйны прынцып правасуддзя (арт. 26 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).

У здзяйсненні кожнага грамадска небяспечнага дзеяння знаходзіць сваё адлюстраванне пэўная накіраванасць волі асобы. Валявы акт злачынца ляжыць у аснове вырашэння ўсіх пытанняў крымінальнай адказнасці і ўжывання пакарання. Але волю асобы нельга разглядаць як псіхічную здольнасць, якая адарвана ад мыслення. Усякі валявы ўчынак звязаны з той або іншай ступенню асэнсавання ўмоў, у якіх дзейнічае асоба. Гэта датычыцца і злачынства. Таму па свайму псіхалагічнаму зместу паняцце віны ўключае не толькі валявы, але і інтэлектуальны момант.

Інтэлектуальны момант заключаецца ва ўсведамленні вінаватым грамадска небяспечнага характару здзяйсняемага дзеяння і ў прадбачанні яго грамадска небяспечных вынікаў або магчымасці прадбачання такіх вынікаў.

Валявы момант выяўляецца ў жаданні вінаватым надыходу грамадска небяспечных вынікаў, у свядомым дапушчэнні гэтых вынікаў або ў легкадумных ці нядбайных адносінах да магчымасці наступлення грамадска небяспечных вынікаў, якіх асоба не жадае.

Розныя суадносіны інтэлектуальнага і валявога момантаў у час здзяйснення злачынства даюць падставу для вылучэння дзвюх форм віны: віна ў форме намеру і віна ў форме неасцярожнасці. У сваю чаргу формы віны падраздзяляюцца на віды: намер можа быць прамы або ўскосны (эвентуальны),

а неасцярожнасць можа выяўляцца ў легкадумнасці або ў нядбайнасці.

Практычны сэнс дзялення віны на формы і віды заключаецца ў тым, што пры іх дапамозе заканадаўца і правасуддзе могуць дыферэнцыяваць усе злачынствы на больш цяжкія ці менш цяжкія, а таксама адмяжоўваць правапарушэнні ад невінаватых дзеянняў. Формы віны адлюстроўваюць розныя псіхічныя адносіны суб'екта да ўчынення злачынства, што важна для вырашэння пытання аб індывідуалізацыі адказнасці.

## §3. Наўмысная віна

Злачынства прызнаецца ўчыненым наўмысна, калі асоба, якая яго ўчыніла, усведамляла грамадска небяспечны характар свайго дзеяння або сваёй бяздзейнасці, прадбачыла яго грамадска небяспечныя вынікі і жадала іх або свядома дапускала наступленне гэтых вынікаў. На гэта ўказвае заканадаўца ў арт.8 КК.

Інтэлектуальны момант намеру аднолькавы для абодвух яго відаў (прамога і ўскоснага намеру), ён уключае: усведамленне грамадска небяспечнага характару дзеяння або бяздзейнасці і прадбачанне грамадска небяспечных вынікаў.

Валявы момант пры прамым намеры ўключае жаданне наступлення грамадска небяспечных вынікаў, а пры ўскосным намеры – адсутнасць жадання, але свядомае дапушчэнне гэтых вынікаў.

Такім чынам, **пры прамым намеры** асоба ўсведамляе грамадска небяспечны характар свайго дзеяння або сваёй бяздзейнасці, прадбачыць наступленне грамадска небяспечных вынікаў, не жадае, але свядома дапускае наступленне гэтых вынікаў.

Характарызуючы інтэлектуальны момант намеру, мы карыстаемся двума паказчыкамі: **усведамленне** грамадскай небяспечнасці дзеяння і **прадбачанне** грамадска небяспечных вынікаў. Усведамленне грамадска небяспечнага характару свайго дзеяння ўласціва ўсім без выключэння наўмысным злачынствам і датычыцца моманту здзяйснення самога дзеяння. Прадбачанне грамадска небяспечных вынікаў уключае разу-

менне вінаватым магчымасці, верагоднасці або непазбежнасці іх наступлення. Прадбачанне датычыцца сферы будучыні, таго, што грамадска небяспечныя вынікі наступяць як рэзультат учынення дзеяння. Прадбачанне ўласціва толькі тым наўмысным злачынствам, у складзе якіх у якасці абавязковай прыкметы аб'ектыўнага боку прадугледжваецца прычыненне ці магчымасць прычынення пэўных грамадска небяспечных вынікаў.

Поўнае і дакладнае раскрыццё зместу ўсведамлення і прадбачання пры намеры аднолькава важнае для разумення як прамога, так і ўскоснага намеру. Ведаючы прыкметы, якія характарызуюць аб'ектыўны бок таго або іншага злачынства, можна вызначыць і змест суб'ектыўнага боку канкрэтнага злачынства і, у прыватнасці, змест намеру пры гэтым дзеянні. У змест намеру ўключаецца ўсведамленне і прадбачанне ўсіх тых фактычных абставін здзейсненага, якія адпавядаюць аб'ектыўным прыкметам складу дадзенага канкрэтнага злачынства так, як яны акрэслены ў крымінальным законе.

Напр., пры ўчыненні крадзяжу асоба ўсведамляе, што завалодвае чужой маёмасцю наперакор волі ўладальніка і непрыкметна ад яго (тайна), што ўзбагачаецца сама і ўчыняе маёмасную шкоду пацярпеўшаму. Пры здзяйсненні грабяжу, наадварот, асоба разумее, што робіць тое ж самае, але адкрыта для ўладальніка і іншых людзей без маскіроўкі свайго ўчынку.

Пры здзяйсненні такіх наўмысных злачынстваў, неабходнымі прыкметамі складу якіх з'яўляецца час, месца або спосаб учынення грамадска небяспечнага дзеяння, у змест намеру ўваходзіць і ўсведамленне гэтых абставін. Намер напаўняецца зместам у залежнасці ад ўсёй сукупнасці аб'ектыўных прыкмет таго або іншага злачынства. Таму, калі склад злачынства ўключае якія–небудзь акалічнасці, што абцяжарваюць адказнасць, у змест намеру ўключаецца і ўсведамленне гэтых акалічнасцей. Напр., асоба будзе адказваць за наўмыснае забойства спосабам, які небяспечны для жыцця многіх людзей, тады, калі ёсць падставы сцвярджаць, што вінаваты ўсведамляў небяспечнасць спосабу забойства

(выбух ці падпал) для многіх людзей.

Пры ўчыненні злачынстваў, у склад якіх не ўключаны ў якасці абавязковай прыкметы грамадска небяспечныя вынікі, дастаткова толькі ўсведамлення фактычных абставін і грамадскай небяспечнасці дзеяння ці бяздзейнасці. Так, паклёпнік разумее, што распаўсюджвае ілжывыя выдумкі, якія ганьбяць канкрэтную асобу.

Па–іншаму вырашаецца пытанне аб змесце намеру пры здзяйсненні злачынстваў, у складзе якіх, акрамя дзеяння, прадугледжана наступленне ці магчымасць наступлення грамадска небяспечных вынікаў. У гэтых выпадках у намер уключаецца прадбачанне тых вынікаў, якія з'яўляюцца прыкметамі аб'ектыўнага боку асноўнага ці кваліфікаванага складу пэўнага злачынства. Вінаваты ў дыверсіі прадбачыць, што вынікамі яго дзеянняў (выбуху, падпалу, затаплення, атручвання ці іншага спосабу) будзе разбурэнне або пашкоджанне прадпрыемстваў, збудаванняў, шляхоў і сродкаў зносін, сродкаў сувязі ці іншай маёмасці, гібель людзей, распаўсюджванне эпідэмій і эпізаотый.

У змест намеру ўключаецца прадбачанне толькі тых грамадска небяспечных вынікаў, якія належаць да неабходных прыкмет складу канкрэтнага злачынства. Прадбачанне шкодных вынікаў, якія не ўключаны ў лік прыкмет аб'ектыўнага боку злачынства, не з'яўляецца абавязковым.

Пры ўчыненні злачынстваў, у склад якіх уваходзяць грамадска небяспечнае дзеянне ці бяздзейнасць і іх грамадска небяспечныя вынікі, у змест намеру ўключаецца таксама прадбачанне развіцця прычыннай сувязі паміж дзеяннем і яго вынікамі. Для наяўнасці намеру дастаткова прадбачання развіцця прычыннай сувязі хоць бы ў агульных рысах. Вінаваты можа і не ведаць, якім чынам дзейнічае яд на ўнутраныя органы чалавека, дастаткова, што ён ведае аб якасцях ядавітага рэчыва і прадбачыць, што яго ўжыванне выклікае смерць.

Пры наўмысным злачынстве вінаваты можа прадбачыць як непазбежнасць, так і толькі верагоднасць наступлення шкодных вынікаў. Калі ён стрэліў у галаву ахвяры ва ўпор, то прадбачыць непазбежнасць смерці, калі стрэліў з вялікай

адлегласці, прадбачыць толькі верагоднасць надыходу смерці.

Намер мае месца тады, калі асоба ў момант учынення дзеяння прадбачыць рэальную магчымасць наступлення злачынных вынікаў. Гэтым намер адрозніваецца ад простага пажадання, надзеі. Напр., калі нехта купляе ворагу білет на самалёт і разлічвае, што ў выніку якой–небудзь аварыі непрыяцель загіне, – намеру няма. Але намер ёсць, калі асоба ведае, што менавіта гэты самалёт будзе ўзарваны тэрарыстамі.

У змест намеру ўваходзіць не толькі ўсведамленне фактычных абставін, якія датычацца аб'ектыўнага боку злачынства, але і фактычных абставін, якія ў складзе злачынства спецыяльна агавораны ў адносінах да аб'екта або суб'екта грамадска небяспечнага дзеяння. Напр., асоба, якая здзяйсняе тэрарыстычны акт, усведамляе, што ўчыняе замах на жыццё дзяржаўнага або грамадскага дзеяча ў сувязі з яго дзяржаўнай або грамадскай дзейнасцю. А асоба, якая не аказвае дапамогу хвораму, усведамляе, што належыць да медыцынскага персаналу, які абавязаны, згодна з устаноўленымі правіламі, аказваць такую дапамогу.

Для намеру неабходна не толькі ўсведамленне фактычных абставін, але і ўсведамленне грамадска небяспечнага характару дзеяння або бяздзейнасці.

У значнай большасці выпадкаў асоба, якая ўсведамляе фактычныя абставіны свайго дзеяння, разам з тым усведамляе і яго грамадска небяспечны характар. Усім грамадзянам відавочная грамадская небяспека забойства, раскрадання, згвалтавання, шпіянажу, дыверсіі, хуліганства і г.д. Аднак магчымы выпадкі, калі асоба ўсведамляла фактычныя абставіны свайго ўчынку, але не ўсведамляла яго грамадска небяспечнага характару. Напр., грамадзянін усведамляе, што ён перадае ад пэўнай асобы грошы службовай асобе, але не ведае, што гэта хабар, і таму не лічыць свае дзеянні грамадска небяспечнымі. Паколькі ўсведамленне грамадска небяспечнага характару здзяйсняемага дзеяння з'яўляецца неабходнай прыкметай намеру, пастолькі адсутнасць такога ўсведамлення выключае вінаватасць у форме намеру.

Усведамленне супрацьпраўнасці і пакаральнасці дзеяння не з'яўляецца абавязковай прыкметай намеру. Яно можа мець месца, а можа і адсутнічаць. Для наяўнасці намеру не патрабуецца, каб асоба, усведамляючы грамадска небяспечны характар свайго дзеяння, разам з тым усведамляла, што гэта дзеянне прадугледжана крымінальным законам у якасці злачынства і што за яго здзяйсненне пагражае пэўнае пакаранне. Патрабаванне для намеру ўсведамлення крымінальнай супрацьпраўнасці азначала б па сутнасці магчымасць пакарання толькі тых асоб, якія дасканала ведаюць крымінальнае заканадаўства. Выкананне на практыцы такога патрабавання выклікала б беспадстаўнае вызваленне ад крымінальнай адказнасці асоб, якія свядома ўчынілі грамадска небяспечныя дзеянні, але спасылаюцца на няведанне закону.

Як ужо адзначалася, пры прамым намеры асоба прадбачыць грамадска небяспечныя вынікі і жадае іх надыходу.

**Ускосны намер** характарызуецца тым, што асоба прадбачыць грамадска небяспечныя вынікі свайго дзеяння або бяздзейнасці, не жадае, але свядома дапускае надыход гэтых вынікаў. Такім чынам, адрозненне паміж прамым і ўскосным намерам праводзіцца па валявым моманце: пры прамым намеры асоба **жадае вынікаў**, а пры ўскосным – **не жадае, але свядома дапускае іх надыход.**

Свядомае дапушчэнне надыходу грамадска небяспечных вынікаў пры ўскосным намеры можа быць спалучана з абыякавымі адносінамі асобы да наступлення вынікаў або з нежаданнем такіх вынікаў. Судовая практыка часцей сутыкаецца з выпадкамі, калі ўскосны намер характарызуецца "поўнай абыякавасцю" вінаватага. Гэта з'яўляецца паказчыкам асаблівага эгаізму і поўнай раўнадушнасці асобы да тых ці іншых інтарэсаў, якія ахоўвае крымінальны закон. Менавіта таму грамадская небяспечнасць дзеяння, учыненага з ускосным намерам, можа быць не меншай, чым пры здзяйсненні злачынства з прамым намерам.

Пры адмежаванні прамога намеру ад ускоснага трэба ўлічваць яшчэ адну асабліваць. Дасягнуты пры прамым наме-

ры вынік або з'яўляецца адзінай мэтай, да якой імкнуўся вінаваты, або неабходным сродкам дасягнення якой–небудзь іншай мэты. Напр., у адным выпадку мэтай забойства з'яўляецца смерць пацярпеўшага, якая задавальняе пачуццё помсты, у іншым выпадку, мэтай забойства з'яўляецца атрыманне спадчыны. Пры ўскосным намеры надыход грамадска небяспечных вынікаў не з'яўляецца ні прамой мэтай злачыннага ўчынку, ні неабходным сродкам для дасягнення якіх–небудзь іншых мэтаў. Грамадска небяспечныя вынікі пры ўскосным намеры ўспрымаюцца вінаватым як "пабочны прадукт" яго дзейнасці, якая накіравана на дасягненне якіх–небудзь злачынных або незлачынных вынікаў. Адсюль і назва віду намеру – ускосны.

Прамы намер пры здзяйсненні пэўнага злачынства можа быць спалучаны з наяўнасцю ў асобы адначасова ўскоснага намеру на ўчыненне іншага злачынства, напр., у выпадку, калі злачынец распранае бездапаможнага п'янага пацярпеўшага (прамы намер, грабёж) і пакідае яго ўначы на марозе без вопраткі, у выніку чаго пацярпеўшы гіне (усносны намер, забойства).

У юрыдычнай літаратуры (таксама і ў падручніках) выказваецца думка, што прамы і ўскосны намеры адрозніваюцца па зместу інтэлектуальнага моманту. Гэтыя аўтары лічаць, што пры прамым намеры магчыма прадбачанне як непазбежнасці, так і імавернасці надыходу грамадска небяспечных вынікаў, а пры ўскосным намеры не можа быць прадбачання непазбежнасці наступлення такіх вынікаў. На іх погляд, усведамленне непазбежнасці надыходу злачынных вынікаў несумяшчальнае са свядомым дапушчэннем іх наступлення, таму ўскосны намер мае сваёй перадумовай толькі прадбачанне магчымасці, імавернасці надыходу шкодных вынікаў.

З такім падыходам цяжка пагадзіцца. Прызнанне, што вінаваты жадае вынікаў толькі таму, што ён прадбачыць іх непазбежнасць, супярэчыць рэчаіснасці, якая ведае выпадкі, калі вінаваты, хоць і прадбачыць вынікі як непазбежныя, але, безумоўна, іх не жадае. Нельга, каб тэарэтычная пабудова замяніла неабходнасць выяўлення сапраўдных валявых адносін

асобы да надыходу грамадска небяспечных вынікаў.

Разгледжанае намі падраздзяленне намеру на прамы і ўскосны праводзілася па зместу намеру, па рознаму спалучэнню інтэлектуальнага і валявога момантаў. У навуцы крымінальнага права выдзяляюць і іншыя віды намеру. Па часе фарміравання намер падзяляецца на: а) загадзя абдуманы; б) раптоўна ўзнікшы і спакойна рэалізаваны; в) раптоўна ўзнікшы афектаваны.

**Загадзя абдуманы** – гэта намер на ўчыненне злачынства, які рэалізаваны праз значны прамежак часу пасля яго ўзнікнення. Часцей за ўсё ён сведчыць аб настойлівасці суб'екта ў дасягненні злачыннай мэты і, такім чынам, аб большай грамадскай небяспецы злачынца. Але ў шэрагу выпадкаў ён можа сведчыць аб нерашучасці вінаватага, аб няўпэўненасці злачынца, аб меншай ступені грамадскай небяспекі гэтай асобы.

**Раптоўна ўзнікшы** – гэта намер, які сфарміраваўся пад уплывам жыццёвай сітуацыі і рэалізаваны неадкладна або праз нязначны прамежак часу пасля ўзнікнення.

Разнавіднасцю раптоўна ўзнікшага намеру з'яўляецца афектаваны намер. Ён адрозніваецца па псіхалагічнаму механізму фарміравання: гэта намер, які з'яўляецца на фоне раптоўна ўзнікшага моцнага душэўнага хвалявання, выкліканага насіллем або цяжкай знявагай з боку пацярпеўшага, а таксама выкліканага іншымі супрацьзаконнымі дзеяннямі пацярпеўшага, калі гэтыя дзеянні выклікалі або маглі выклікаць цяжкія вынікі для вінаватага ці яго блізкіх (гл. арт.102 КК). Моцнае душэўнае хваляванне ўскладняе, але не выключае свядомы кантроль чалавека над сваімі ўчынкамі.

Па дакладнасці прадбачання вынікаў прамы і ўскосны намеры падзяляцца на: а) вызначаны (канкрэтызаваны); б) нявызначаны (неканкрэтызаваны).

**Вызначаны** намер характарызуецца наяўнасцю ў асобы канкрэтнага ўяўлення аб якасных і колькасных паказчыках, якія датычацца будучых вынікаў злачынства (вінаваты прадбачыць, што стрэл у галаву выклікае смерць пацярпеўшага).

Пры **нявызначаным** намеры ў суб'екта маецца агульнае ўяўленне аб аб'ектыўных уласцівасцях вынікаў свайго дзеяння.

Напр., вінаваты, наносячы пацярпеўшаму ўдары кулаком па галаве, грудзях, жывату, прадбачыць, што ў выніку будзе прычынена шкода здароўю пацярпеўшага, але дакладна не ўсведамляе памеры гэтай шкоды (лёгкае, менш цяжкае або цяжкае цялеснае пашкоджанне).

Вызначаны намер, у сваю чаргу, падзяляецца на просты і альтэрнатыўны. Пры **простым** вызначаным намеры асоба прадбачыць адзін канкрэтны вынік (напр., смерць пацярпеўшага). Пры **альтэрнатыўным** намеры вінаваты прадбачыць прыкладна аднолькавую магчымасць надыходу двух дакладна вызначаных вынікаў (напр., смерць пацярпеўшага або прычыненне яму цяжкага цялеснага пашкоджання).

Дзеянні вінаватага, якія ўчынены з нявызначаным ці альтэрнатыўным намерам, павінны кваліфікавацца ў залежнасці ад вынікаў, якія фактычна надышлі.

У законе існуе некалькі спосабаў апісання прыкмет складу злачынства, якія ўказваюць на неабходнасць наўмыснай віны. З іх найбольш тыповымі з'яўляюцца наступныя: 1) непасрэдна ў законе ўказваецца наўмысная форма віны (напр., арт. 96 КК); 2) у дыспазіцыі артыкула прадугледжаны спецыяльная мэта ці спецыяльны матыў злачынства (арт.64); 3) у артыкуле ўказваецца на заведамасць або злоснасць дзеяння (арт.174); 4) заканадаўца ўказвае на незаконны або самавольны характар дзеяння (арт. 196); 5) дзеянне характарызуецца як ухіленне ад выканання асобай сваіх абавязкаў (арт.77). У астатніх выпадках для вызначэння формы віны, у тым ліку наўмыснай, трэба зыходзіць з аналізу складу злачынства цалкам.

## §4. Неасцярожная віна

Злачынствам, учыненым па неасцярожнасці, прызнаецца злачыннае дзеянняе, здзейсненае **па легкадумнасці** або нядбайнасці.

Злачынства прызнаецца ўчыненым **па легкадумнасці**, калі асоба, яго ўчыніўшая, прадбачыла магчымасць надыходу грамадска небяспечных вынікаў свайго дзеяння або бяздзейнасці, але легкадумна разлічвала на іх прадухіленне.

Злачынства прызнаецца ўчыненым па нядбайнасці, калі асоба, яго ўчыніўшая, не прадбачыла магчымасці надыходу грамадска небяспечных вынікаў свайго дзеяння або бяздзейнасці, хоць павінна была і магла іх прадбачыць.

Да інтэлектуальнага моманту легкадумнасці адносіцца прадбачанне асобай магчымасці надыходу грамадска небяспечных вынікаў дзеяння. Да валявога моманту належыць легкадумны разлік на прадухіленне гэтых вынікаў.

Часцей пры легкадумнасці вінаваты ўсведамляе грамадскую небяспечнасць сваіх паводзін. Суб'ект разумее, што яго ўчынак з'яўляецца рызыкоўным, што ён забаронены пэўнымі правіламі ці супярэчыць агульнапрынятым нормам паводзін і г.д. Але магчымы выпадкі, калі вінаваты не лічыць свой учынак небяспечным, таму што ўпэўнены ў магчымасці прадухілення вынікаў. Па гэтай прычыне заканадаўца (арт.9 КК) не адносіць усведамленне грамадскай небяспекі дзеяння да абавязковых прыкмет інтэлектуальнага моманту легкадумнасці.

Інтэлектуальны момант легкадумнасці ўключае: усведамленне і прадбачанне фактычных прыкмет здзейсненага асобай дзеяння; прадбачанне магчымасці надыходу грамадска небяспечных вынікаў; прадбачанне развіцця прычыннай сувязі паміж дзеяннем і магчымымі вынікамі.

Калі пры намеры вінаваты прадбачыць непазбежнасць або магчымасць надыходу злачынных вынікаў, то пры легкадумнасці ён прадбачыць толькі магчымасць надыходу вынікаў. Прадбачанне непазбежнасці надыходу злачыннага выніку выключае які–небудзь разлік на яго прадухіленне. Іншая асабліваць прадбачання пры легкадумнасці ў тым, што вынікі пры гэтай разнавіднасці віны прадбачацца як абстрактныя. Абстрактнасць прадбачання азначае, што асоба, якая дзейнічае пэўным чынам, разумее, што ад аналагічных дзеянняў іншых асоб у іншых абставінах грамадска небяспечныя вынікі настануць, але менавіта ў яго, у дадзеным канкрэтным выпадку, гэтых вынікаў не будзе. Асоба дзейнічае з упэўненасцю, што грамадска небяспечныя вынікі будуць прадухілены.

Пры легкадумнасці валявы момант характарызуецца актыўным нежаданнем надыходу грамадска небяспечных вынікаў, і ў гэтым яго істотнае адрозненне ад валявога моманту прамога ці ўскоснага намеру. Разлік вінаватага на прадухіленне надыходу злачынных вынікаў пры легкадумнасці– гэта заўсёды разлік на пэўныя абставіны, якія павінны, па меркаванню асобы, прадухіліць надыход шкодных вынікаў. Абставіны, на якія разлічвае суб'ект, бываюць самыя розныя. Ён можа разлічваць на самога сябе (жыццёвы або прафесіянальны вопыт, кваліфікацыю, веды, навыкі, уменне абыходзіцца з тэхнікай, спартыўную падрыхтаванасць і г.д.), на іншых людзей і іншыя фактары (разумныя паводзіны магчымага пацярпеўшага, дапамогу іншых асоб, добрыя ўмовы надвор'я, надзейную работу механізму і г.д.).

Галоўнай асаблівасцю разліку на прадухіленне надыходу грамадска небяспечных вынікаў пры легкадумнасці з'яўляецца яго легкадумны характар. Вінаваты лічыць, што тыя ці іншыя абставіны могуць прадухіліць наступленне злачынных вынікаў, аднак ён памылкова ацэньвае гэтыя абставіны, не бачыць іх няздольнасці прадухіліць шкодныя вынікі. Калі ж асоба, якая прадбачыць магчымасць наступлення небяспечных вынікаў, прымае ўсе неабходныя і дастатковыя ў дадзеным выпадку захады для іх прадухілення, а шкодныя вынікі ўсё ж такі надыходзяць па прычынах, якія не залежаць ад волі асобы, гэты чалавек не падлягае крымінальнай адказнасці, бо няма легкадумнасці, няма віны.

Па зместу легкадумнасць мае значнае падабенства з ускосным намерам: і ў тым і ў іншым выпадку асоба прадбачыць магчымасць наступлення грамадска небяспечных вынікаў і не жадае гэтага. Аднак паміж гэтымі відамі віны ёсць істотныя адрозненні.

Пры ўскосным намеры асоба заўсёды ўсведамляе грамадска небяспечны характар свайго дзеяння, а пры легкадумнасці такое ўсведамленне можа быць, а можа і не быць. Пры ўскосным намеры вінаваты прадбачыць як непазбежнасць, так і магчымасць надыходу грамадска небяспечных вынікаў, а пры легкадумнасці асоба прадбачыць толькі

магчымасць іх надыходу. Пры ўскосным намеры магчымасць надыходу шкодных вынікаў прадбачыцца як канкрэтны рэзультат здзейсненага асобай дзеяння, а пры легкадумнасці вінаваты прадбачыць абстрактную (тэарэтычную) магчымасць надыходу вынікаў у аналагічных выпадках і ў іншых асоб, але не ад здзяйсняемага ім дзеяння. Пры ўскосным намеры суб'ект не разлічвае на прадухіленне надыходу грамадска небяспечных вынікаў альбо разлічвае, але ж на выпадковыя фактары, дзейнічае на ўдачу, "нашармака"; пры легкадумнасці заўсёды маецца разлік на прадухіленне наступлення шкодных вынікаў, гэты разлік будуецца на рэальных, маючых месца абставінах, якія здольны прадухіліць вынікі, але аказваюцца недастатковымі, непрадуманымі, неэфектыўнымі.

Заканадаўца вызначае нядбайнасць як такі від неасцярожнасці, пры якім асоба не прадбачыла магчымасці надыходу грамадска небяспечных вынікаў свайго дзеяння або бяздзейнасці, хоць павінна была і магла іх прадбачыць. У судовай практыцы нядбайнасць сустракаецца часцей за легкадумнасць.

Інтэлектуальны момант нядбайнасці характарызуецца адсутнасцю прадбачання магчымасці надыходу шкодных вынікаў. Адсутнічае любое прадбачанне, як канкрэтнае, так і абстрактнае, таму што асоба дзейнічае без належнай уважлівасці, прадбачлівасці, акуратнасці.

Асоба можа свядома парушаць правілы засцярогі або несвядома ці недастаткова свядома. Галоўнае, ва ўсіх сітуацыях адсутнічае прадбачанне надыходу грамадска небяспечных вынікаў.

Правілы, якія парушаюцца, могуць быць розныя. Часцей за ўсё гэта пісаныя правілы, якія прадугледжаны ў нарматыўных актах (правілы бяспекі працы, правілы дарожнага руху, правілы выканання палётаў і г.д.). Магчыма парушэнне няпісаных правілаў жыццёвай, штодзённай засцярогі. Напр., пакіданне моцнадзеючых лекаў у месцы, якое даступна малалетнім, што выклікала атручэнне дзіцяці.

Валявы момант нядбайнасці таксама выражаны ў зако-

не своеасабліва: асоба не напружвае сваёй волі, не канцэнтруе ўвагі на здзяйсняемым учынку. Адсутнічаюць паводзіны, накіраваныя на кантроль уласных дзеянняў. Вінаваты заслугоўвае папроку, бо ён павінен быў і мог прадбачыць магчымасць надыходу шкодных вынікаў, калі б дзейнічаў з большай уважлівасцю, абачлівасцю, засцярогай.

Асоба **павінна была і магла прадбачыць** вынікі свайго дзеяння– у гэтых словах закону змяшчаюцца крытэрыі нядбайнасці. Гэтых крытэрыяў два: аб'ектыўны і суб'ектыўны.

Аб'ектыўны крытэрый выражаны ў законе словамі – асоба **павінна была прадбачыць** магчымыя шкодныя вынікі свайго дзеяння. Аб'ектыўны крытэрый нядбайнасці – гэта сума патрабаванняў прадбачлівасці, якія мы можам прад'явіць да кожнай асобы, якая займае пэўную пасаду, займаецца пэўнай прафесійнай дзейнасцю, мае пэўны жыццёвы вопыт. Гэта сума патрабаванняў, якія мы маем права прад'явіць да так званага "сярэдняга чалавека" без уліку яго канкрэтных асобасных асаблівасцей. Гэта абагульненыя патрабаванні: кожны хірург павінен.., кожны пілот павінен.., кожная няня павінна... Напр., кожнаму вадзіцелю аўтатранспарту мы маем права прад'явіць тыя патрабаванні, якія вынікаюць з правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту.

Суб'ектыўны крытэрый нядбайнасці ўключае ў сябе тыя патрабаванні прадбачлівасці, якія мы можам прад'явіць менавіта да дадзенага пэўнага чалавека, зыходзячы з яго асобасных якасцей, здольнасцей, прафесійных ведаў і навыкаў, умоў дзейнасці і г.д. Суб'ектыўны крытэрый у законе выражаны словамі – асоба **магла прадбачыць** магчымасць надыходу шкодных вынікаў.

Аб'ектыўны і суб'ектыўны крытэрыі павінны спалучацца. Калі ў канкрэтнай сітуацыі маецца толькі аб'ектыўны крытэрый, а суб'ектыўны адсутнічае – няма нядбайнасці, няма віны. Напр., урач – малады спецыяліст не мог дакладна вызначыць дыягназ, таму што не меў дастатковага прафесійнага вопыту і спецыялізаванай падрыхтоўкі. Ён не заслугоўвае папроку, бо адсутнічае суб'ектыўны крытэрый нядбайнасці.

Шкодныя вынікі, незалежна ад іх цяжару, могуць быць пастаўлены ў віну асобе пры ўмове, што яна дзейнічала ў

адносінах іх наўмысна або дапусціла іх па неасцярожнасці. Нядбайнасць як від неасцярожнасці трэба адрозніваць ад казусу (выпадку) – невінаватага прычынення шкоды.

**Пры казусе** асоба не ўсведамляе грамадска небяспечнага характару свайго дзеяння, не прадбачыць магчымасці надыходу грамадска небяспечных вынікаў, не павінна была або не магла іх прадбачыць.

Вадзіцелі Б. і Н. сумесна з загадчыкам склада К. здзейснілі раскраданне "сланечнікавага алею". Аднак замест алею быў выкрадзены знешне ідэнтычны раствор вітаміну Д3, які вельмі шкодны для здароўя. Загадчык склада К. не папярэдзіў аб гэтым Б. і Н. Раскрадальнікі прадавалі "алей" грамадзянам, з якіх звыш ста цяжка захварэлі (пашкоджанне нырак, апорна–рухальнага апарату). Вадзіцелі Б. і Н. завезлі "алей" свайкам, у выніку адзінаццаць з іх захварэлі. У дадзенай сітуацыі ў адносінах да факту прычынення цялесных пашкоджанняў з боку Б. і Н. маецца казус. Яны не ведалі аб сапраўдных якасцях "алею", не прадбачылі магчымасці прычынення шкоды здароўю і не маглі гэта прадбачыць.

Такім чынам, пры казусе адсутнічаюць або аб'ектыўны, або суб'ектыўны крытэрый, або абодва крытэрыі нядбайнасці. Напр., аб'ектыўны крытэрый нядбайнасці адсутнічае, калі асоба не парушала правілаў бяспекі і таму **не павінна была прадбачыць** шкодныя вынікі; суб'ектыўнага крытэрыю няма, калі дзеяннямі асобы створана пагроза надыходу шкодных вынікаў, але асоба **не магла іх прадбачыць.**

## §5. Віна ў злачынствах з фармальным складам

Як вядома, па канструкцыі склады злачынстваў падзяляюцца на матэрыяльныя і фармальныя. Калі аб'ектыўны бок злачынства апісаны ў законе з указаннем не толькі на дзеянне, але і на грамадска небяспечныя вынікі – склад злачынства матэрыяльны, а калі ў якасці прыкметы аб'ектыўнага боку названа толькі дзеянне – склад злачынства фармальны. Раней мы аналізавалі змест намеру і неасцярожнасці толькі ў дачыненні да злачынстваў з матэрыяльным складам.

Форма, від і змест віны ў злачынствах з фармальным складам, прыкметай якога з'яўляецца магчымасць надыходу грамадска небяспечных вынікаў, вызначаюцца так як і ў злачынствах з матэрыяльным складам.

У злачынствах, для прызнання якіх закончанымі не патрабуецца надыходу грамадска небяспечных вынікаў, форма і від віны вызначаюцца адносна грамадска небяспечнага дзеяння. Змест віны істотна мяняецца.

Злачынства прызнаецца ўчыненым наўмысна, калі асоба, яго ўчыніўшая, усведамляла грамадска небяспечны характар дадзенага дзеяння і жадала яго ўчыніць.

Злачынства прызнаецца ўчыненым па неасцярожнасці, калі асоба, яго ўчыніўшая, не ўсведамляла грамадска небяспечнага характару дадзенага дзеяння, хоць павінна была і магла гэта ўсведамляць.

Такім чынам, наўмысная віна ў дачыненні да фармальных складаў злачынства мае від прамога намеру. Ускосны намер пры такіх злачынствах немагчымы, бо не можа быць гаворкі аб свядомым дапушчэнні ўчынення пэўнага дзеяння пры адсутнасці жадання яго здзейсніць. Немагчыма, напр., уявіць, што асоба, якая незаконна носіць агнястрэльную зброю, не жадае яе насіць, але свядома дапускае нашэнне зброі.

Неасцярожная віна ў злачынствах з фармальным складам мае від нядбайнасці. Легкадумнасць выключаецца, бо немагчыма псіхалагічная сітуацыя, калі асоба свядома ўчыняе пэўнае дзеянне і адначасова разлічвае яго не ўчыніць.

## §6. Складаная віна

Складаная віна – гэта спалучэнне намеру і неасцярожнасці пры ўчыненні злачынства. Складаная віна – гэта розныя псіхічныя адносіны асобы да асноўнага складу злачынства (наўмысная віна) і кваліфікуючых вынікаў (неасцярожнасць). Складаная віна характарызуецца наўмысным учыненнем злачынства і неасцярожнасцю ў адносінах да наступіўшых з прычыны гэтага злачынства вынікаў, з якімі закон звязвае павышаную крымінальную адказнасць (кваліфікуючая прыкмета). У цэлым такое злачынства прызнаецца ўчыненым наўмысна.

Суб'ектыўны бок злачынства характарызуецца складанай віной, калі гэтага патрабуе канструкцыя складу злачынства. Напр., ч.2 арт.106 КК прадугледжвае адказнасць за наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне, калі яно выклікала смерць пацярпеўшага. Па ч.2 арт.106 КК былі кваліфікаваны дзеянні Р., які ў час сваркі з жонкай ударыў яе кухонным нажом у бядро. Жонка схавалася ў ваннай і праз нейкі час памерла ад страты крыві. Па справе ўстаноўлена, што Р. нанёс нажом цяжкае цялеснае пашкоджанне з прамым нявызначаным намерам, але смерць пацярпеўшай не прадбачыў, хоць павінен быў і мог яе прадбачыць (нядбайнасць).

Складаная віна магчыма ў дзвюх сітуацыях: 1) пры розных псіхічных адносінах да грамадска небяспечнага дзеяння (намер) і кваліфікуючых вынікаў гэтага дзеяння (неасцярожнасць), напр., незаконнае правядзенне аборту, якое выклікала смерць пацярпеўшай (ч.3 арт.114 КК); 2) пры розных псіхічных адносінах да вызначаных у законе, але маючых рознае юрыдычнае значэнне вынікаў, калі адзін вынік з'яўляецца прыкметай асноўнага складу злачынства, а другі з'яўляецца кваліфікуючай прыкметай. Напр., згодна з раней названай ч.2 арт.106 КК адносіны да цяжкіх цялесных пашкоджанняў выяўляюцца ў прамым або ўскосным намеры, а да смерці – у выглядзе нядбайнасці або легкадумнасці.

Паколькі ў гэтых сітуацыях мы маем справу не з якой–небудзь новай, трэцяй формай віны, а са спалучэннем дзвюх прадугледжаных законам форм намеру і неасцярожнасці, пастолькі гэтае спалучэнне мы называем складанай віной.

У юрыдычнай літаратуры сустракаюцца іншыя назвы: двайная віна або змешаная віна. Прадстаўляецца, што назва "двайная віна" не зусім адпавядае сутнасці з'явы, бо віна ў злачынца адна, але яна характарызуецца складанымі псіхічнымі адносінамі да дзеяння і яго вынікаў. Што датычыцца тэрміна "змешаная віна", то гэта тэрміналогія непрымальная, паколькі ў грамадзянскім (цывільным) праве існуе падобнае паняцце "змешаная віна старон", якое мае зусім іншы змест.

Нельга разглядаць як складаную віну рознае спалучэнне

відаў наўмыснай віны (прамога і ўскоснага намеру) або відаў неасцярожнасці (легкадумнасці і нядбайнасці). Нельга гаварыць аб складанай віне пры ўчыненні адначасова двух злачынстваў: наўмыснага і неасцярожнага. Напр., калі наўмыснае забойства спосабам, небяспечным для жыцця многіх людзей, адбылося з неасцярожным знішчэннем маёмасці. У дадзенай сітуацыі прысутнічаюць два розныя склады злачынстваў, а складаная віна ўласцівая аднаму складу злачынства са складанай карцінай аб'ектыўнага боку.

Нельга аднесці да складанай віны розныя псіхічныя адносіны асобы да такіх прыкмет злачынства, як спосаб, узрост пацярпеўшага і г.д.

У юрыдычнай літаратуры мелі месца спробы распаўсюдзіць паняцце складанай віны не толькі на кваліфікаваныя, але і на асноўныя склады злачынства. Для гэтага штучна разрываецца аб'ектыўны бок злачынства. Напр., аналізуючы ч.1 арт.166 КК, сцвярджаюць, што адносіны да факту злоўжывання службовым становішчам могуць быць толькі наўмысныя, а адносіны да вынікаў, якія з'яўляюцца абавязковай прыкметай аб'ектыўнага боку злачынства, і наўмыснымі, і неасцярожнымі; аналізуючы ч.1 арт.206, сцвярджаюць, што адносіны да факту парушэння правілаў бяспекі руху або эксплуатацыі аўтамотатранспарту могуць быць і наўмысныя, і неасцярожныя, а адносіны да вынікаў толькі неасцярожныя. На падставе гэтага прыходзяць да высновы, што мае месца факультатыўная складаная віна, якая можа быць, а можа і не быць.

Падобны падыход уяўляецца спрэчным, таму што ў названых выпадках дзеянне, узятае асобна ад вынікаў, з'яўляецца не злачынствам, а службовай ці адміністрацыйнай правіннасцю, такім чынам, форму віны ў дачыненні да дзеяння вызначаць асобна не трэба.

## §7. Матыў і мэта злачынства

Як адзначалася раней, у суб'ектыўны бок пэўнага злачынства ўключаецца не толькі віна ў форме намеру ці неасцярожнасці, але і асобны матыў, які схіляе вінаватага да ўчынення злачынства,

або спецыяльная мэта, да якой імкнецца злачынец. Матыў і мэта – факультатыўныя прыкметы складу злачынства.

**Матыў** злачынства – гэта імкненне, якім кіруецца асоба, здзяйсняючы злачынства, гэта свядомае імкненне, абумоўленае жаданнем дасягнення пэўнай мэты. Матыў прысутнічае пры здзяйсненні любога злачынства, але роля і месца яго залежаць ад зместу віны. Матыў злачынства як стымул да жадаемых грамадска небяспечных вынікаў з'яўляецца неабходным спадарожнікам прамога намеру. Пры ўчыненні злачынства з ускосным намерам, па легкадумнасці ці нядбайнасці матыў датычыцца толькі дзеяння, паколькі вінаваты не жадае надыходу грамадска небяспечных вынікаў.

У мэтах класіфікацыі матывы можна падзяліць на тры групы: 1) антыграмадскія матывы – гэта антыдзяржаўныя матывы, нізкія асабістыя намеры (карыслівыя, хуліганскія намеры, помста, каварства, хітрасць і г.д.); 2) грамадска нейтральныя матывы (крыўда, рэўнасць); 3) грамадска карысныя матывы (жаданне дапамагчы людзям, спачуванне, жаль, няправільна зразумелыя інтарэсы справы і г.д.). Часцей за ўсё сустракаюцца такія матывы здзяйснення злачынства, як карыслівасць, хуліганскія намеры, помста, рэўнасць. У сваіх паводзінах чалавек можа кіравацца адразу некалькімі матывамі. Напр., пры забойстве з помсты можа прысутнічаць і жаданне скарыстаць маёмасць забітага (карыслівасць).

Матыў з'яўляецца самастойнай прыкметай суб'ектыўнага боку злачынства. Ён уплывае на свядомасць чалавека, фарміруе накіраванасць волі, абумоўлівае характар дзеянняў суб'екта і тым самым істотна вызначае змест віны, але не страчвае сваёй самастойнасці.

Мэта – гэта ўяўленне аб жадаемым выніку, да якога імкнецца асоба. У адрозненне ад матыву, мэта злачынства характарызуе той непасрэдны вынік, на дасягненне якога вінаваты накіроўвае свае грамадска небяспечныя дзеянні. Напр., мэтай спекуляцыі з'яляецца атрыманне нажывы, узбагачэнне, а мэтай падробкі фальшывых дакументаў – выкарыстанне такога дакумента самім падробнікам ці іншай асобай або збыт такога дакумента.

Розніца паміж мэтай і матывам у тым, што яны па-рознаму характарызуюць валявы працэс: матыў адказвае на пытанне, чым кіравалася асоба, учыняючы злачынства, а мэта вызначае накіраванасць дзеяння, вынік, да якога асоба імкнецца. Напр., матывам здзяйснення наўмыснага забойства, прадугледжанага п."ж" арт.100 КК, можа быць пачуццё страху ў сувязі з раскрыццём іншага злачынства, учыненага раней (вымагання), мэтай жа здзяйснення забойства з'яўляецца пазбаўленне ад сведкі, які здольны абвінаваціць забойцу ў здзяйсненні іншага злачынства. Або, напр., матывам выраву фальшывых грошай з'яўляецца карыслівасць, мэтай жа іх выраву – збыт. Матывам ілжывага даносу можа быць помста, нянавісць, а мэтай – прыцягненне да крымінальнай адказнасці невінаватай асобы.

Матыў і мэта як факультатыўныя прыкметы суб'ектыўнага боку злачынства выконваюць у крымінальным праве тры функцыі:

1) Яны могуць быць абавязковымі, канстытуцыйнымі прыкметамі складу злачынства, калі ўказаны ў дыспазіцыі артыкула Асаблівай часткі КК ў асноўным складзе злачынства. Напр., абавязковай прыкметай дыверсіі з'яўляецца мэта дэстабілізацыі грамадскага парадку або дзейнасці дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь, а канстытуцыйнай прыкметай злоўжывання ўладай з'яўляецца карыслівая або іншая асабістая зацікаўленасць службовай асобы.

2) Яны могуць быть кваліфікуючымі прыкметамі, калі прадугледжаны ў артыкулах Асаблівай часткі КК не ў асноўных, а ў кваліфікаваных складах злачынстваў. Напр., п.п. "а", "б", "в", "ж" арт.100 КК – наўмыснае забойства з карыслівай мэтай; з хуліганскіх намераў; у сувязі з выкананнем пацярпеўшым службовага або грамадскага абавязку; з мэтай утаіць іншае злачынства або аблегчыць яго ўчыненне.

3) Матыў і мэта, калі яны не прадугледжаны спецыяльна ў артыкуле Асаблівай часткі КК, могуць выступаць у якасці акалічнасцей, якія змякчаюць або абцяжарваюць крымінальную адказнасць. Як акалічнасці, змякчаючыя адказнасць, матыў і мэта прадугледжаны ў п.п.2, 3, 5 арт.37 КК. Па-

колькі пералік гэтых акалічнасцей у законе з'яўляецца прыкладным, суд можа аднесці да іх і іншыя матывы і мэты, напр., матыў спачування пры забойстве цяжка хворага па яго просьбе. Як акалічнасці, якія абцяжарваюць адказнасць, адпаведна з п.п.3 і $3^1$ арт.38 КК прызнаюцца выпадкі ўчынення злачынства з карыслівых ці іншых нізкіх намераў або ўчыненне злачынства на глебе нацыянальнай або расавай варожасці, розніцы або пагарды.

Калі матыў і мэта прадугледжаны ў артыкулах Асаблівай часткі КК у якасці асноўных ці кваліфікуючых прыкмет злачынства, то іх нельга паўторна ўлічваць яшчэ і як змякчаючыя або абцяжарваючыя адказнасць акалічнасці.

Выяўленне матыву і мэты грамадска небяспечнага дзеяння ў час папярэдняга следства ці пры разглядзе справы ў судзе забяспечвае раскрыццё сапраўдных прычын і ўмоў учынення дзеяння, дазваляе дакладна вызначыць, дзейнічала асоба ў стане свядомасці ці бессвядомасці.

## §8. Юрыдычная і фактычная памылкі

Памылка – гэта няправільная ацэнка асобай, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, сваіх паводзін, іх вынікаў, іншых фактычных абставін; гэта няправільнае ўяўленне асобы аб характары і ступені грамадскай небяспекі здзейсненага дзеяння і яго супрацьпраўнасці.

У юрыдычнай літаратуры існуе некалькі класіфікацый памылак па розных крытэрыях. Па прычынах узнікнення іх дзеляць на даравальныя (яны выключаюць вінаватасць) і недаравальныя (не выключаюць вінаватасці). Па ўплыву на кваліфікацыю іх дзеляць на істотныя, якія змяняюць кваліфікацыю здзейсненага, і неістотныя, якія ніяк на кваліфікацыі не адбіваюцца.

Але асноўная класіфікацыя памылак праводзіцца па прадмету. Па гэтаму крытэрыю ўсе памылкі падзяляюцца на юрыдычныя (памылкі ў законапалажэннях) і фактычныя (памылкі ў фактычных абставінах справы).

**Юрыдычная памылка** – гэта няправільнае ўяўленне асобы аб злачыннасці і пакаральнасці дзеяння, яго кваліфікацыі і межах крымінальнай адказнасці. Гэтае азначэнне дазваляе

выдзеліць тры разнавіднасці юрыдычнай памылкі: памылка ў злачыннасці дзеяння; памылка ў кваліфікацыі дзеяння; памылка ў пакаральнасці дзеяння.

Пры памылцы ў злачыннасці дзеяння магчымы наступныя варыянты:

1) Асоба лічыць сваё дзеянне грамадска небяспечным і крымінальна супрацьпраўным, а яно такім не з'яўляецца, гэта так званае "ўяўнае злачынства". Прыкладам можа быць выпадак, калі грамадзянін хавае ў сябе дома фінскі нож і лічыць, што здзяйсняе злачынства. Пры "ўяўным злачынстве" асоба не падлягае крымінальнай адказнасці, бо адсутнічае крымінальная супрацьпраўнасць.

2) Асоба не ўсведамляе крымінальнай супрацьпраўнасці дзеяння, але ўсведамляе яго грамадскую небяспечнасць. Напр., крэдытор самавольна з мэтай пагашэння доўгу забірае ў суседа–даўжніка карову і прадае яе. Паколькі для намеру дастаткова, каб асоба ўсведамляла грамадскую небяспечнасць дзеяння, пастолькі ў дадзеным выпадку наступае крымінальная адказнасць за наўмыснае злачынства – самаўпраўства (арт.196 КК).

3) Асоба не ўсведамляе грамадскай небяспечнасці дзеяння, але ўсведамляе яго крымінальную супрацьпраўнасць. Напр., сялянка працягвае сяўбу і вырошчванне алейнага маку пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія парушэнні, бо лічыць, што вырошчванне маку для кандытарскіх вырабаў не нясе шкоды. Таму што крымінальная супрацьпраўнасць з'яўляецца юрыдычным выражэннем грамадскай небяспечнасці дзеяння, яе ўсведамлення дастаткова для канстатацыі наўмыснай віны і крымінальнай адказнасці (арт.$220^1$ КК).

4) Асоба не ўсведамляе ні грамадскай небяспечнасці дзеяння, ні крымінальнай супрацьпраўнасці. Такая сітуацыя магчымая, калі заканадаўца раптоўна далучае да ліку злачынстваў дзеянне, якое раней ніколі не каралася і нават лічылася грамадска карысным. Гэтая памылка можа быць даравальнай і выключаць крымінальную адказнасць, калі асоба не ўсведамляла крымінальнай супрацьпраўнасці дзеяння і не магла яе ўсведамляць па ўважлівых прычынах (парушаны

правілы абнародавання закону, асоба знаходзілася ў абставінах, якія не дазвалялі азнаёміцца з законам і г.д.). Памылка можа быць і недаравальнай, калі асоба не ўсведамляла крымінальную супрацьпраўнасць дзеяння, хоць павінна была і магла яе ўсведамляць (была магчымасць азнаёміцца з законам). Пры такіх абставінах выключаецца намер, але не выключаецца неасцярожнасць (прававая неасцярожнасць).

Памылка ў кваліфікацыі можа праяўляцца ў розных памылковых уяўленнях асобы адносна прававой ацэнкі здзейсненага ёю: асоба лічыць, што дзеянне прадугледжана пэўнай нормай КК, а яно прадугледжана іншай нормай; асоба лічыць, што парушае адну норму КК, а парушае некалькі норм; ці наадварот, лічыць, што парушае некалькі артыкулаў КК, а парушае адзін. Усе гэтыя разнавіднасці памылак ніяк не ўплываюць на вырашэнне пытання аб крымінальнай адказнасці. Асоба будзе прыцягнута да крымінальнай адказнасці за тыя злачынствы, якія яна фактычна здзейсніла.

Аналагічна вырашаецца пытанне і пры памылцы ў пакаральнасці дзеяння, калі асоба памыляецца адносна віду і памеру пакарання, прадугледжанага ў законе за ўчыненае ёю злачынства. Від і памер пакарання вызначае суд адпаведна з законам.

**Фактычная памылка** – гэта няправільнае ўяўленне асобы аб фактычных абставінах дзеяння і яго вынікаў. Яна мае чатыры разнавіднасці: памылка ў аб'екце пасягнення; памылка ў прадмеце злачынства; памылка ў асобе пацярпеўшага; памылка ў прыкметах аб'ектыўнага боку злачынства.

Пры памылцы ў аб'екце суб'ект мяркуе, што сваімі дзеяннямі прычыняе шкоду аднаму аб'екту крымінальна–прававой аховы, а фактычна наносіць шкоду іншаму аб'екту. Існуе некалькі разнавіднасцей памылкі ў аб'екце:

1) Памылка, якая праявілася ў пасягненні на аднародны аб'ект. Напр., асоба мела намер выкрасці дзяржаўную маёмасць, а здзейсніла крадзёж прыватнай маёмасці. Дадзены від памылкі ніяк не адбіваецца на кваліфікацыі злачынства.

2) Памылка, пры якой асоба нанесла шкоду не таму аб'екту, у адносінах да якога збіралася ўчыніць злачынства. Напр., суб'ект меў намер здзейсніць пасягненне на жыццё дзяр-

жаўнага дзеяча з мэтай перашкоджання яго палітычнай дзейнасці, але памылкова пазбавіў жыцця радавога грамадзяніна. Пры дадзенага роду памылцы здзейсненае павінна быць кваліфікавана з улікам накіраванасці намеру як замах на тое злачынства, якое вінаваты жадаў учыніць, бо прычыніць шкоду намечанаму аб'екту не ўдалося па прычынах, якія не залежаць ад волі вінаватага.

3) Памылка, якая праявілася ў тым, што пры пасягненні на адзін аб'ект вінаваты прычыніў шкоду некалькім аб'ектам. Напр., асоба, якая жадае забіць работніка міліцыі ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў па ахове грамадскага парадку, атручвае яму ежу, але ў выніку гіне не толькі работнік міліцыі, але і яго прыяцель, які абедаў разам. Пры падобных памылках адказнасць настае за наўмыснае злачынства адпаведна з накіраванасцю намеру і за неасцярожнае прычыненне шкоды. У нашым прыкладзе – па арт.189[1] і арт.104 КК.

4) Памылка, пры якой суб'ект меў намер здзейсніць злачынствы ў дачыненні некалькіх аб'ектаў, але па прычынах, якія не залежаць ад яго волі, прычыніў шкоду толькі аднаму аб'екту. Напр., вінаваты меў намер шляхам падпалу знішчыць маёмасць і дакументы дзяржаўнай установы, але ў выніку пажару загінулі толькі дакументы. Крымінальная адказнасць наступае з улікам накіраванасці намеру за скончанае злачынства ў адносінах да таго аб'екта, які пацярпеў (арт.191 КК), і як замах на тое злачынства, якое не было завершана (ч.2 арт.15, арт.96).

Памылка ў прадмеце пасягнення мае некалькі відаў: памылка ў прадмеце ў межах асноўнага складу злачынства; памылка ў памеры прадмета; замах на прадмет, які адсутнічае.

1) Памылка ў прадмеце ў межах асноўнага складу злачынства не адбіваецца на кваліфікацыі злачынства. Напр., вінаваты, маючы намер выкрасці са сховішча тэлевізар, у цемры пераблытаў каробкі і выкраў электрапеч.

2) Памылка ў памеры прадмета можа быць дваякага роду: а) колькасныя характарыстыкі прадмета аказаліся большыя, чым уяўляў вінаваты; б) гэтыя характарыстыкі прадмета ака-

заліся меншыя, чым лічыў злачынец. Дадзеныя памылкі часцей за ўсё сустракаюцца пры раскраданні. У першым выпадку, калі асоба мела жаданне ўзяць меншую колькасць маёмасці (вызначаны намер), а ўзяла больш намечанага і выявіла гэта пасля заканчэння злачынства, адказнасць наступае за наўмыснае злачынства ў межах тых памераў, якія ахопліваліся намерам вінаватага. У другім выпадку, калі вінаваты жадаў выкрасці большую колькасць маёмасці, але па прычынах, якія не залежаць ад яго волі, завалодаў меншай колькасцю, адказнасць настае за замах на злачынства з улікам накіраванасці намеру.

3) Пасягненне на прадмет, які адсутнічае – памылка, якая ў юрыдычнай літаратуры мае спрэчную назву "замах на непрыгодны аб'ект". Прыкладам можа быць сітуацыя, калі асоба ўчыняе крадзёж з узломам сейфа і выяўляе, што ён пусты. Вінаваты прыцягваецца да крымінальнай адказнасці за замах на злачынства з улікам накіраванасці намеру: калі суб'ект жадаў выкрасці маёмасць – ч.2 арт.15, арт.87, калі жадаў выкрасці дакументы – ч.2 арт.15, арт.191 КК.

Памылка ў асобе пацярпеўшага можа выяўляцца ў трох сітуацыях:

1) Асоба лічыць, што спецыяльныя прыкметы пацярпеўшага, якія прадугледжаны законам у якасці кваліфікуючых, маюцца, а фактычна іх няма. Напр., вінаваты лічыў, што здзяйсняе забойства жанчыны, якая знаходзіцца ў стане цяжарнасці, а яна ў такім стане не была. Здзейсненае кваліфікуецца як замах на злачынства з улікам накіраванасці намеру. У дадзеным выпадку – па ч.2 арт.15, п."д" арт.100 КК.

2) Суб'ект пераканаы ў тым, што кваліфікуючыя прыкметы, якія характарызуюць асобу пацярпеўшага, адсутнічаюць, а на самой справе яны ёсць. Напр., вінаваты схіляе пацярпеўшага да спажывання наркатычных сродкаў і ўпэўнены, што пацярпеўшы дарослы, а ў сапраўднасці ён непаўналетні. Адказнасць настае за скончанае злачынства ў межах, якія ахопліваліся свядомасцю вінаватага.

3) Злачынец замахваецца на пацярпеўшага, які адсутнічае. Напр., суб'ект стрэліў у спячага чалавека з мэтай яго забіць,

але выявілася, што куля трапіла ў труп, бо смерць настала раней ад сардэчнай недастатковасці. Кваліфікацыя здзейсненага ў гэтым выпадку ідэнтычная кваліфікацыі пры пасягненні на прадмет, які адсутнічае, як замах на злачынства з улікам накіраванасці намеру.

Памылкі ў прыкметах аб'ектыўнага боку злачынства ўключаюць наступныя віды памылак: адхіленне дзеяння; памылка ў сродках; памылка ў развіцці прычыннай сувязі; памылка ў факультатыўных прыкметах аб'ектыўнага боку.

1) Адхіленне дзеяння крыху нагадвае памылку ў асобе пацярпеўшага. Напр., грамадзянін з мэтай абароны ад нападу злачынца стрэліў у яго з ружжа, зарад не трапіў у нападаючага, які ўхіліўся, але цяжка параніў жанчыну, якая раптоўна выйшла з–за дома. Адхіленне дзеяння выключае адказнасць за наўмыснае прычыненне шкоды.

2) Памылка ў сродках мае некалькі відаў:

а) Калі памылкова выкарыстоўваецца іншы, але не менш прыгодны сродак, чым задуманы суб'ектам. Напр., асобай з мэтай знявечання твару пацярпеўшай замест сернай кіслаты выкарыстоўваецца саляная. Гэтая памылка не адбіваецца на кваліфікацыі здзейсненага.

б) Калі выкарыстоўваецца сродак, сіла якога памылкова заніжана. Вінаваты стрэліў у чалавека, упэўнены, што стрэльба зараджана соллю, а яна была зараджана карцеччу. Дадзеная памылка выключае адказнасць за наўмыснае прычыненне больш цяжкіх вынікаў.

в) Калі вінаваты ўпэўнены, што выкарыстоўвае прыгодны сродак, а ён у даным канкрэтным выпадку не выклікаў грамадска небяспечных вынікаў. Напр., асоба з мэтай забойства мае намер даць ахвяры яд, але памыляецца і дадае ў ежу бясшкодны парашок. Крымінальная адказнасць настае за замах на злачынства з улікам накіраванасці намеру.

г) Калі суб'ект з прычыны невуцтва выкарыстоўвае відавочна непрыгодны сродак, які аб'ектыўна няздольны выклікаць шкодныя вынікі (напр., варажба з мэтай сурочыць пэўнага чалавека), крымінальная адказнасць выключаецца.

3) Пры памылцы ў развіцці прычыннай сувязі асоба правіль-

на ўсведамляе характар дзеянняў і той вынік, які павінен надысці, але няправільна ацэньвае прамежкавыя звёны працэсу, які спалучае дзеянне і грамадска небяспечны вынік. Існуе некалькі відаў гэтай памылкі:

а) Асоба ўсведамляла грамадска небяспечны характар вынікаў свайго дзеяння і прадбачыла іх надыход, але памылялася адносна працякання прычыннай сувязі, якая, па меркаванню вінаватага, павінна была прывесці да жаданага выніку. Напр., злачынец нанёс пацярпеўшаму два ўдары малатком па галаве, што выклікала смерць, але вінаваты, які не здагадваецца аб гэтым, павесіў пацярпеўшага. Паколькі пры дадзенай памылцы вінаваты правільна ўсведамляў характар сваіх дзеянняў і прадбачыў злачынны вынік, пастолькі памылка не ўплывае на кваліфікацыю. Мае месца так званы **агульны намер.**

б) Памылка ў развіцці прычыннай сувязі можа быць і істотнай, калі вынік, які прадбачыць асоба, не супадае з вынікам, які фактычна настае. Магчымы два варыянты.

Пры першым фактычны вынік больш цяжкі, чым прадбачаны. Гэтая памылка выключае намер. Адказнасць настае за неасцярожнасць, калі асоба павінна была і магла прадбачыць гэты вынік, або зусім не настае, калі суб'ект не меў магчымасці прадбачыць вынікі.

Пры другім варыянце вынік зусім не настае або фактычны рэзультат менш цяжкі, чым прадбачаны. Напр., асоба стрэліла ў левую палову грудзей пацярпеўшага, але куля не прабіла бронекамізэльку, і цяжкія вынікі не насталі. Дзеянне вінаватага трэба кваліфікаваць як замах на злачынства з улікам накіраванасці намеру.

4) Памылка ў факультатыўных прыкметах аб'ектыўнага боку злачынства (месца, час, спосаб, абставіны) мае два віды:

а) Калі асоба памыляецца ў факультатыўных прыкметах, якія ў дадзеным канкрэтным складзе злачынства з'яўляюцца абавязковымі (канстытуцыйнымі), здзейсненае кваліфікуецца як закончанае злачынства з улікам зместу намеру. Напр., вінаваты лічыць, што выкрадае маёмасць тайна, а на самой справе яго дзеянні назіраюць сведкі. Адказнасць настае за тайнае выкраданне маёмасці (крадзёж).

б) Асоба памыляецца ў кваліфікуючых прыкметах злачынства. Магчымы два варыянты.

Пры першым асоба памылкова лічыць, што дадзеныя прыкметы маюцца, а ў рэчаіснасці іх няма. Напр., злачынец лічыць, што здзяйсняе забойства з асаблівай жорсткасцю, даючы ахвяры пакутліва дзеючы яд, а ў сапраўднасці пацярпеўшы не пакутаваў ад болю, бо смерць надышла адразу. Здзейсненае трэба кваліфікаваць як замах на злачынства пры кваліфікуючых абставінах (з улікам накіраванасці намеру).

Пры другім варыянце, наадварот, асоба ўпэўнена, што кваліфікуючыя прыкметы адсутнічаюць, хоць яны фактычна маюць месца. Адказнасць настае за скончанае злачынства без кваліфікуючых абставін з улікам зместу намеру.

Абагульняючы правілы юрыдычнай ацэнкі памылак адносна фактычных прыкмет аб'ектыўнага боку злачынства, можна выдзеліць дзве тыповыя сітуацыі:

а) памылковае ўяўленне аб адсутнасці юрыдычна значных прыкмет выключае адказнасць за наўмыснае злачынства;

б) памылковае перакананне ў наяўнасці такіх прыкмет патрабуе кваліфікацыі здзейсненага з улікам зместу і накіраванасці намеру.

## *Літаратура:*

Волков Б.С. Проблема воли и уголовная ответственность. Казань, 1965; Волков Б.С. Мотивы преступлений. Казань, 1982; Дагель П.С., Котов Д.П. Субъективная сторона преступления и ее установление. Воронеж, 1974; Дагель П.С. Неосторожность: уголовно–правовые и криминологические проблемы. М., 1977; Злобин Г.А., Никифоров Б.С. Умысел и его формы. М., 1972; Лунеев В.В. Мотивация преступного поведения. М., 1991; Рарог А.И. Вина в советском уголовном праве. Саратов, 1987; Угрехелидзе М.Г. Проблема неосторожной вины в уголовном праве. Тбилиси, 1976; Якушин В.А. Ошибка и ее уголовно–правовое значение. Казань, 1988.

# Глава 8

# СУБ'ЕКТ ЗЛАЧЫНСТВА

## §1. Паняцце суб'екта злачынства

Сярод элементаў складу злачынства важнае месца займае суб'ект злачынства. Без суб'екта не можа здзейсніцца злачынства. Сапраўды, менавіта чалавек учыняе грамадска небяспечныя дзеянні, якія накіроўваюцца ім на пэўны аб'ект. Акрамя таго, у свядомасці асобы маюцца пэўныя псіхалагічныя адносіны да сваіх грамадска небяспечных дзеянняў і вынікаў гэтых дзеянняў. Інакш кажучы, без суб'екта не можа быць ні аб'екта, ні аб'ектыўнага боку, ні суб'ектыўнага боку злачынства.

Злачынствы ўчыняюць людзі, у якіх у той або іншай ступені ўжо сфарміравана антыграмадская свядомасць. Антыграмадская свядомасць – гэта погляды, меркаванні, перакананні асобы, якія не адпавядаюць маральным і прававым нормам у пэўным грамадстве і супярэчаць ім. Вось такія асобы і ўчыняюць злачынствы, і з'яўляюцца іх суб'ектамі.

**Суб'ектам злачынства** адпаведна з крымінальным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца фізічная асоба, якая дасягнула неабходнага ўзросту, знаходзілася ў стане свядомасці і ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам. У арт.4 і 5 КК вызначаецца, што крымінальную адказнасць могуць несці фізічныя асобы: грамадзяне Рэспублікі Беларусь, асобы без грамадзянства і замежныя грамадзяне, якія не карыстаюцца дыпламатычным імунітэтам. Не можа быць суб'ектам злачынства жывёліна. У тых выпадках, калі чалавек выкарыстоўвае жывёліну для прычынення грамадска небяспечнай шкоды альбо калі такая шкода прычынена ў выніку недагляду за жывёлінай, да крымінальнай адказнасці прыцягваецца чалавек, які і з'яўляецца суб'ектам злачынства.

Юрыдычная асоба таксама не можа быць суб'ектам злачын-

ства. Калі грамадска небяспечныя дзеянні ўчыняюць прадстаўнікі юрыдычнай асобы, то яны і нясуць крымінальную адказнасць. Напр., за забруджванне вадаёма і паветра (арт.218 КК) адказваюць асобы, якія сваімі дзеяннямі нанеслі шкоду прыроднаму асяроддзю.

Паводле заканадаўства некаторых замежных краін да крымінальнай адказнасці могуць прыцягвацца і юрыдычныя асобы.

Па заканадаўству Рэспублікі Беларусь суб'ектам злачынства прызнаецца не ўсякая фізічная асоба, а толькі такая, якая знаходзіцца ў стане свядомасці ў момант учынення злачынства і дасягнула пэўнага ўзросту. Наяўнасць свядомасці і дасягненне пэўнага ўзросту, устаноўленага законам, з'яўляюцца абавязковымі прыкметамі кожнага складу злачынства. Адсутнасць хоць бы аднаго з іх азначае, што асоба ні пры якіх абставінах не можа быць прызнана суб'ектам злачынства і прыцягнута да крымінальнай адказнасці.

Для прыцягнення да крымінальнай адказнасці за ўчыненне некаторых злачынстваў неабходны, акрамя наяўнасці свядомасці і дасягнення пэўнага ўзросту, яшчэ іншыя (дадатковыя) прыкметы. Так, напр., суб'ектамі службовых злачынстваў могуць быць толькі службовыя асобы.

Акрамя такіх юрыдычна значных прыкмет суб'екта злачынства, як наяўнасць свядомасці, дасягненне пэўнага ўзросту і дадатковых прыкмет, істотнае значэнне мае ўстанаўленне іншых звестак, характарызуючых асобу злачынца (узрост, адукацыя, сямейнае становішча, маральны воблік і г.д.). Акалічнасці, якія характарызуць асобу злачынца, але не з'яўляюцца прыкметамі складу злачынства, у значнай меры вызначаюць ступень грамадскай небяспекі асобы, а таму маюць значэнне пры індывідуалізацыі пакарання. Некаторыя з іх, паводле закону, з'яўляюцца змякчаючымі адказнасць акалічнасцямі (напр., учыненне злачынства непаўналетнім або жанчынай у стане цяжарнасці арт.37 КК), іншыя ж абцяжарваючымі акалічнасцямі (напр., учыненне злачынства асобай, якая раней здзейсніла якое–небудзь злачынства арт.38 КК).

Такім чынам, наяўнасць або адсутнасць тых ці іншых прыкмет суб'екта злачынства мае вялікае значэнне для адмежавання злачынных дзеянняў ад незлачынных і правільнай кваліфікацыі грамадска небяспечных дзеянняў вінаватага. Наяўнасць акалічнасцей, якія характарызуюць асобу злачынца, улічваецца пры назначэнні пакарання.

## §2. Наяўнасць свядомасці і стан бессвядомасці

Паводзіны чалавека, любыя яго дзеянні, уключаючы і злачынныя, вызначаюцца яго свядомасцю і воляй. Апошнія – прадукт знешніх умоў, у якіх жыве чалавек, таму што свядомасць і воля фарміруюцца сацыяльнымі ўмовамі жыцця чалавека. Гэта аднак не азначае, што знешнія ўмовы фаталістычна вызначаюць яго дзеянні. Кожны чалавек з нармальнай псіхікай валодае свабодай волі, што азначае здольнасць прымаць рашэнне з веданнем справы. Усведамляючы характар сваіх дзеянняў, ён можа імі кіраваць. Гэта і абумоўлівае абавязак чалавека несці крымінальную адказнасць за ўчыненыя ім грамадска небяспечныя дзеянні. Такім чынам, **наяўнасць свядомасці** — гэта здольнасць чалавека ўсведамляць свае дзеянні і кіраваць імі. Паняцця наяўнасці свядомасці ў крымінальным законе няма. Паколькі стан свядомасці чалавека – гэта агульнае правіла, заканадаўца дае азначэнне стану бессвядомасці.

**Паняцце стану бессвядомасці** прадугледжана ў арт.11 КК, паводле якога асоба прызнаецца бессвядомай, калі яна не магла ўсведамляць сваіх дзеянняў або кіраваць імі з прычыны хранічнай псіхічнай хваробы, часовага расстройства псіхічнай дзейнасці, прыдуркаватасці або іншага хваравітага стану. Адсюль вынікае, што для прызнання асобы бессвядомай неабходна наяўнасць двух крытэрыяў: медыцынскага і юрыдычнага.

Да медыцынскага крытэрыю бессвядомасці адносяцца: а) хранічная псіхічная хвароба; б) часовае расстройства псіхічнай дзейнасці; в) прыдуркаватасць; г) іншы хваравіты стан.

Хранічнымі псіхічнымі хваробамі з'яўляюцца такія псіхічныя захворванні, якія носяць устойлівы характар і могуць прагрэсіраваць. Да іх адносяцца: прагрэсіўны параліч, эпілепсія, шызафрэнія і іншыя псіхічныя захворванні, якія носяць працяглы характар. Да часовага расстройства псіхічнай дзейнасці адносяцца такія псіхічныя захворванні, якія працякаюць адносна невялікі час. Такімі расстройствамі псіхічнай дзейнасці з'яўляюцца: рэактыўны стан, белая горачка, паталагічнае ап'яненне, паталагічны афект і іншыя. Прыдуркаватасць – гэта прыроджаная недаразвітасць разумовых здольнасцей, якія могуць быць выкліканы пашкоджаннямі або захворваннямі самога плода ці хваробай бацькоў. Прыдуркаватасць з'яўляецца пастаянным станам і па сваёй глыбіні падраздзяляецца на тры ступені: глыбокая ступень недаразвітасці разумовых здольнасцей (ідыятыя), менш глыбокая (імбецыльнасць), лёгкая (дэбільнасць). Пад іншым хваравітым станам разумеецца агульнае захворванне, якое можа выклікаць расстройства псіхічнай дзейнасці. Такое расстройства псіхічнай дзейнасці можа быць выкліканa інфекцыйнымі хваробамі (напр., брушным ці сыпным тыфам), цяжкімі формамі псіхапатыі і інш. У такіх выпадках хворы чалавек можа быць пазбаўлены магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі.

Для прызнання асобы бессвядомай прысутнасці аднаго медыцынскага крытэрыю недастаткова, паколькі ў многіх выпадках, нягледзячы на хваробу, чалавек можа ўсведамляць характар сваіх дзеянняў і кіраваць імі. Таму для прызнання асобы бессвядомай трэба вызначыць прысутнасць юрыдычнага крытэрыю. Юрыдычны крытэрый бессвядомасці паводле арт.11 КК заключаецца ў тым, што асоба не можа ўсведамляць сваіх дзеянняў або кіраваць імі. Гэты крытэрый характарызуецца дзвюма прыкметамі: інтэлектуальнай і валявой.

Інтэлектуальная прыкмета выражаецца ў тым, што асоба ў час учынення злачынства не можа ўсведамляць сваіх дзеянняў. У такіх выпадках асоба не ўсведамляе фактычнага боку ўчыняемых ёю дзеянняў і іх вынікаў або, усведамляючы іх, няздольная ўсведамляць грамадскую небяспечнасць сваіх дзеянняў.

Валявая прыкмета азначае няздольнасць асобы кіраваць сваімі дзеяннямі. Свядомасць і воля чалавека непарыўна звязаны паміж сабой. У тых выпадках, калі парушаецца інтэлект, натуральна, парушаецца і эмацыянальна–валявая сфера, асоба губляе здольнасць кіраваць сваімі дзеяннямі. Аднак сустракаюцца выпадкі, калі ў псіхічна хворага захоўваецца інтэлект, але парушаецца валявая дзейнасць. Псіхічна хворы ўсведамляе характар сваіх дзеянняў, у тым ліку і грамадскую небяспечнасць іх, але не можа ўтрымацца ад іх учынення. Так, напр., у некаторых асоб, хворых эпілепсіяй, узнікае неадольнае жаданне да падпалу (піраманія), хаця яны і ўсведамляюць грамадска небяспечны характар свайго дзеяння. Для прызнання псіхічна хворага бессвядомым дастаткова прысутнасці любой з дзвюх прыкмет юрыдычнага крытэрыю бессвядомасці.

Рашэнне пытання аб наяўнасці свядомасці або аб стане бессвядомасці асобы адносіцца да кампетэнцыі суда, паколькі гэтыя паняцці не медыцынскія, а юрыдычныя. Аднак неабходна заключэнне судова–псіхіятрычнай экспертызы, якая паводле арт.75 КПК праводзіцца ў выпадках сумнення ў наяўнасці свядомасці асобы, якая здзейсніла грамадска небяспечныя дзеянні. Гэта тлумачыцца тым, што для вырашэння пытання аб псіхічных здольнасцях асобы патрабуюцца спецыяльныя веды. Парушэнне патрабаванняў арт.75 КПК цягне за сабой адмену прыгавору.

Асоба, якая знаходзілася ў стане бессвядомасці ў момант учынення грамадска небяспечнага дзеяння, не можа быць прыцягнута да крымінальнай адказнасці. Да такой асобы вызначэннем суда могуць быць ужыты прымусовыя меры медыцынскага характару, прадугледжаныя арт.55 КК.

Частка 2 арт.11 КК называе выпадкі, калі асоба ўчыніла злачынства пры наяўнасці свядомасці, а потым да вынясення судом прыгавору захварэла псіхічнай хваробай, якая пазбавіла яе магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі. У такіх выпадках асоба не вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, паколькі яна была ў стане свядомасці ў момант учынення злачынства. Аднак, паколькі крымінальная адказ-

насць мае мэтай выпраўленне і перавыхаванне асуджаных, пакаранне да вылечвання такой асобы не прымяняецца. Паводле ч.2 арт.11 КК да такой асобы суд можа ўжыць прымусовыя меры медыцынскага характару, а пасля папраўкі асоба падлягае пакаранню, калі не прайшлі тэрміны даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці (арт.46 КК).

Паняцце абмежаванай наяўнасці свядомасці, г.зн. магчымасці асобы толькі часткова ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі крымінальны закон Рэспублікі Беларусь не прадугледжвае, але ў судовай практыцы сустракаюцца выпадкі, калі ў асобы ў момант учынення злачынства ў некаторай ступені была парушана псіхічная дзейнасць. Такія парушэнні сустракаюцца ў псіхапатаў, у асоб, якія знаходзяцца ў стане фізіялагічнага афекту, і г.д. Аднак пры такім стане псіхікі асоба ўсведамляе, хоць і не ў поўным аб'ёме, грамадска небяспечны характар сваіх дзеянняў і можа імі кіраваць. Такая асоба падлягае крымінальнай адказнасці, бо маецца наяўнасць свядомасці. У некаторых выпадках учынення злачынства ў стане абмежаванай наяўнасці свядомасці закон разглядае гэты стан як змякчаючую адказнасць акалічнасць (арт.102 і 108 КК). Адпаведна з арт.12 КК асоба, якая ўчыніла злачынства ў стане фізіялагічнага алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення, не вызваляецца ад крымінальнай адказнасці. Такая асоба не нясе крымінальнай адказнасці толькі тады, калі яна на агульных падставах, прадугледжаных арт.11 КК, будзе прызнана судом бессвядомай.

## §3. Узрост, з якога настае крымінальная адказнасць

Паводле закону суб'ектам злачынства можа быць не ўсякая асоба, а толькі асоба, дасягнуўшая вызначанага ўзросту.

Фарміраванне свядомасці чалавека, яго характару, навыкаў і прывычак пачынаецца з яго нараджэння. Гэты працэс працяглы і ў асноўным заканчваецца да моманту надыходу паўналецця. У тых выпадках, калі фарміраванне асобы праходзіць у неспрыяльных умовах, ёй прывіваюцца антыграмадскія погляды, навыкі і прывычкі, пад уздзеяннем якіх яна ўчыняе

правапарушэнні і злачынствы.

Здольнасць усведамляць характар сваіх дзеянняў, у тым ліку і іх грамадскую небяспечнасць, з'яўляецца перадумовай крымінальнай адказнасці. Зыходзячы з гэтага, ч.1 арт.10 КК устанаўлівае, што крымінальнай адказнасці падлягаюць асобы, якім да ўчынення злачынства споўнілася 16 гадоў. Аднак некаторыя злачынствы па свайму характару такія, што непаўналетнія ўсведамляюць іх грамадска небяспечны і супрацьпраўны характар і ў больш раннім узросце. Таму ч.2 арт.10 КК устанаўлівае крымінальную адказнасць з 14–гадовага ўзросту за наступныя злачынствы: за забойства (арт.100–104), замах на жыццё работніка міліцыі, народнага дружынніка, ваеннаслужачага або іншай асобы, а таксама замах на жыццё іх блізкіх сваякоў (арт.189[1]), наўмыснае нанясенне цялесных пашкоджанняў, якія прычынілі шкоду здароўю (арт.106–109, 110), згвалтаванне (арт.115), разбойны напад (арт.89), грабёж (арт.88), вымаганне (арт.93), крадзёж (арт. 87), злоснае або асабліва злоснае хуліганства (ч.2 і 3 арт.201), наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці, якое выклікала цяжкія вынікі (ч.2 арт.96), расраданне агнястрэльнай зброі, баявых прыпасаў або выбуховых рэчываў (арт.213[1]), раскраданне наркатычных сродкаў (арт.219[2]), наўмыснае ўчыненне дзеянняў, якія могуць выклікаць крушэнне поезда (арт.83).

За ўчыненне іншых злачынстваў непаўналетнія ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў не могуць несці крымінальнай адказнасці. Аднак, калі непаўналетні, дасягнуўшы 14–гадовага ўзросту, учыніць злачынства, адказнасць за якое настае з 16 гадоў, але ў яго дзеяннях маюцца ўсе прыкметы іншага злачынства, прадугледжанага ч.2 арт.10 КК, ён падлягае крымінальнай адказнасці. У такім выпадку яго дзеянні кваліфікуюцца па артыкулу КК, які прадугледжаны ч.2 арт.10 КК. Напр., за катаванне (арт.111), якое выклікала кароткачасовае расстройства здароўя, непаўналетнія ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў адказваюць як за наўмыснае лёгкае цялеснае пашкоджанне, выклікаўшае кароткачасовае расстройства здароўя, па арт.110 КК.

Пры ўчыненні злачынства непаўналетнім заўсёды павінен быць дакладна вызначаны яго ўзрост. Лічыцца, што асоба дасягнула пэўнага ўзросту не ў дзень нараджэння, а пачынаючы з наступных сутак. У тых выпадках, калі ўзрост непаўналетняга вызначаецца судова-медыцынскай экспертызай толькі яго годам нараджэння, днём нараджэння належыць лічыць апошні дзень таго года, які названы экспертам, а пры вызначэнні ўзросту мінімальнай і максімальнай колькасцю гадоў неабходна зыходзіць з мінімальнага ўзросту такой асобы.

Хоць закон прадугледжвае крымінальную адказнасць за большасць злачынстваў з 16 гадоў, фактычна непаўналетнія, якія дасягнулі гэтага ўзросту, не могуць быць суб'ектамі шэрагу злачынстваў, паколькі для суб'ектаў гэтых злачынстваў неабходны дадатковыя прыкметы, якіх не маюць падлеткі. Напр., непаўналетнія не могуць быць суддзямі, таму адказнасць па арт.173 КК нясуць толькі дарослыя асобы.

У некаторых выпадках учынення злачынства непаўналетні можа не ўсведамляць сутнасці сваіх дзеянняў і іх грамадска небяспечнага характару. Таму арт.151 КПК прадугледжвае, што пры наяўнасці дадзеных аб разумовай адсталасці непаўналетняга, не звязанай з псіхічным захворваннем, неабходна выявіць, ці меў ён магчымасць усведамляць поўнасцю значэнне сваіх дзеянняў. Для гэтага ў неабходных выпадках павінна быць праведзена экспертыза спецыялістамі ў галіне дзіцячай і юнацкай псіхалогіі (псіхолаг, педагог), або гэтыя пытанні могуць быць пастаўлены на вырашэнне эксперта-псіхіятра. З улікам ступені разумовай адсталасці непаўналетняга, а таксама ступені і характару грамадскай небяспекі ўчыненага ім злачынства суд у адпаведнасці з ч.3 арт.10 КК можа замест крымінальнага пакарання ўжыць да такой асобы прымусовыя меры выхаваўчага характару (арт.60 КК).

Паколькі непаўналецце прызнаецца акалічнасцю, якая змякчае адказнасць (п.6 арт.37 КК), прымусовыя меры выхаваўчага характару могуць быць прызначаны і ў іншых выпадках. Частка 3 арт.10 КК устанаўлівае: "Калі суд палічыць, што выпраўленне асобы, якая ўчыніла ва ўзросце да васемнаццаці гадоў злачынства, не выклікаючае вялікай грамадскай небяспекі, магчымае без ужывання крымінальнага

пакарання, ён можа прымяніць да такой асобы прымусовыя меры выхаваўчага характару, якія не з'яўляюцца крымінальным пакараннем" (арт.60 КК).

## §4. Спецыяльны суб'ект злачынства

**Спецыяльны суб'ект злачынства** – гэта асоба, якая побач з агульнымі прыкметамі (наяўнасць свядомасці і дасягненне вызначанага ўзросту) валодае яшчэ дадатковымі прыкметамі, якія прадугледжаны адпаведнымі артыкуламі Асаблівай часткі КК.

Прыкметы многіх складаў злачынстваў апісаны ў законе такім чынам, што злачынствы могуць быць здзейснены толькі спецыяльным суб'ектам. У большасці выпадкаў дадатковыя прыкметы суб'екта непасрэдна пералічаны ў самой норме КК, у іншых – яны падразумяваюцца. Так, з сэнсу арт.136 КК, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за адмову ў прыёме на работу або звальненне цяжарнай жанчыны ці кормячай маці, выцякае, што адказваць па гэтаму артыкулу могуць толькі службовыя асобы, маючыя права прыёму на работу ці звальнення.

У якасці дадатковых у шэрагу выпадкаў вызначаны прыкметы, якія характарызуюць службовае становішча вінаватага. Так, суб'ектамі воінскіх злачынстваў (арт.227–258 КК) могуць быць толькі ваеннаслужачыя, ваеннаабавязаныя ў час праходжання імі збораў і асобы, якія прыроўнены да іх (арт.226 КК). Суб'ектамі службовых (арт.166–$171^1$ КК) і многіх іншых злачынстваў (арт.131, 134, 154, 172, 173, 174, 175 і г.д.) могуць быць толькі службовыя асобы. Акрамя таго, за многія з гэтых злачынстваў крымінальную адказнасць нясуць не ўсе, а толькі такія службовыя асобы, якія валодаюць вызначанымі паўнамоцтвамі і на якіх ускладзены спецыяльныя абавязкі. Так, адказнасць за выпуск у продаж недабраякасных, нестандартных і некамплектных тавараў (арт.154 КК) нясуць загадчык магазіна, базы, склада, секцыі, а таксама таваразнаўца ці бракёр.

Асобныя склады злачынстваў апісаны такім чынам, што суб'ектамі могуць быць толькі асобы, выконваючыя пэўны род работы або маючыя пэўныя прафесіі. Так, адказнасць за

недобрасумленныя адносіны да аховы маёмасці (арт.98 КК) могуць несці толькі асобы, якім даручана ахова маёмасці. Суб'ектамі падману пакупнікоў і заказчыкаў (арт.153 КК) могуць быць толькі работнікі гандлю, прадпрыемстваў грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання і камунальнай гаспадаркі. Крымінальная адказнасць за неаказанне дапамогі хвораму без уважлівых прычын (арт. 126 КК) вызначана для асоб медыцынскага персаналу.

У якасці дадатковых прыкмет суб'екта злачынства іншы раз называюцца акалічнасці, якія характарызуюць узаемаадносіны (сваяцкія і інш.) паміж вінаватым і пацярпеўшым. Так, напр., суб'ектамі злоснага ўхілення ад уплаты аліментаў або ад утрымання дзяцей (арт.120 КК) і злоснага ўхілення ад аказання дапамогі бацькам (арт.121 КК) з'яўляюцца ў першым выпадку бацькі, у другім – дарослыя дзеці. Суб'ектам такога злачынства, як заведамае пакіданне без дапамогі асобы, якая знаходзіцца ў небяспечным для жыцця стане (ч.2 арт.125 КК), з'яўляецца асоба, якая абавязана была клапаціцца аб пацярпеўшым або сама паставіла яго ў небяспечны для жыцця стан.

Спецыяльнай прыкметай суб'екта можа быць грамадзянства асобы. Такое злачынства як шпіянаж (арт.62 КК) учыняецца іншаземцам або асобай без грамадзянства, а здрада дзяржаве (арт.61 КК) – толькі грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

Паняцце спецыяльнага суб'екта мае значэнне пры вырашэнні пытання аб крымінальнай адказнасці, а таксама пры кваліфікацыі дзеянняў вінаватага. Адсутнасць у асобы спецыяльных (дадатковых) прыкмет, прадугледжаных у артыкуле Асаблівай часткі КК, азначае, што гэта асоба або зусім не падлягае крымінальнай адказнасці, або дзеянні асобы павінны быць кваліфікаваны па іншаму артыкулу КК. Напр., за разглашэнне дзяржаўнай тайны ваеннаслужачы будзе адказваць па арт.248 КК, цывільная асоба, якой дзяржаўная тайна была даверана або стала вядома па службе ці рабоце, – па арт.72 КК, а іншыя асобы наогул не могуць быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці.

Пад спецыяльным суб'ектам злачынства разумеецца толькі выканаўца злачынства. Таму саўдзельнікамі злачынства са спецыяльным суб'ектам могуць быць і асобы, якія не маюць дадатковых (спецыяльных) прыкмет. Напр., прыватная асоба схіляе службовую асобу да злоўжывання ўладай або службовым становішчам (арт.166 КК). Адказнасць за ўчыненае злачынства ў гэтым выпадку будзе несці па арт.166 КК не толькі службовая асоба, але і падбухторшчык да гэтага злачынства (арт.17 і 166 КК).

## *Літаратура:*

Пастанова N 11 Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 1991 г. "Аб судовай практыцы па справах аб злачынствах непаўналетніх і аб уцягненні іх у злачынную і іншую антыграмадскую дзейнасць" // Судовы веснік. 1992. N 2. С.8; Антонян Ю.М., Бородин С.В. Преступность и психические аномалии. М., 1987; Голик Ю.В. Случайный преступник. Томск, 1984; Дагель П.С. Учение о личности преступника в советском уголовном праве. Владивосток, 1970; Лазарев А.М. Субъект преступления. М., 1981; Лейкина Н.С. Личность преступника и уголовная ответственность. Л., 1968; Михеев Р.И. Проблемы вменяемости и невменяемости в советском уголовном праве. Владивосток, 1983; Михеев Р.И. Уголовная ответственность лиц с психофизиологическими особенностями и психогенетическими аномалиями. Хабаровск, 1989; Орымбаев Р. Специальный субъект преступления. Алма–Ата, 1977; Трахтеров В.С. Вменяемость и невменяемость в уголовном праве (исторический очерк). Харьков, 1992; Устименко В.В. Специальный субъект преступления. Харьков, 1989.

# Глава9

# АБСТАВІНЫ, ЯКІЯ ВЫКЛЮЧАЮЦЬ ЗЛАЧЫІННАСЦЬ ДЗЕЯННЯ

## §1. Паняцце абставін, якія выключаюць злачыннасць дзеяння

У жыцці сустракаюцца выпадкі, калі дзеянне ці бяздзейнасць чалавека, якія па знешняму выгляду маюць падабенства да злачынства і звычайна цягнуць за сабой крымінальную адказнасць, у канкрэтных абставінах набываюць іншы змест і становяцца грамадска карыснымі, у сувязі з чым не прызнаюцца злачынствам. Адносна гэтых сітуацый у навуцы крымінальнага права і заканадаўстве прынята гаварыць аб абставінах, якія выключаюць грамадскую небяспечнасць і супрацьпраўнасць дзеяння. Да такіх абставін адносяцца: неабходная абарона, затрыманне злачынца, крайняя неабходнасць, апраўданая прафесійная або гаспадарчая рызыка, выкананне абавязковага загаду, выкананне прафесійных функцый, калі асоба прытрымліваецца ўстаноўленых для гэтага правілаў, ажыццяўленне свайго права ў дазволеных межах і адпаведным чынам, згода пацярпеўшага або іншай асобы, якая правамоцная распарадзіцца парушаным інтарэсам. У пералічаных выпадках, калі асоба прытрымліваецца адпаведных правілаў, дзеянне прызнаецца грамадска карысным (напр., пры неабходнай абароне, затрыманні злачынца) ці дапушчальным у адпаведных акалічнасцях. У некаторых з пералічаных абставін дзеянне асобы становіцца выкананнем маральнага ці нават службовага абавязку і таму заахвочваецца дзяржавай (напр., за процідзеянне небяспечнаму злачынцу ці яго затрыманне асоба атрымлівае ўзнагароду, прэмію ці падзяку).

У названых выпадках, калі і ўзбуджаецца крымінальная

справа, то гэта робіцца ў сувязі з тым, што з вонкавага выгляду дзеянне асобы (да ўстанаўлення абставін, пры якіх яно ўчынена) мае падабенства са злачынствам і трэба высветліць, ці дзейнічала асоба згодна з законам, у адпаведнасці з тымі правіламі, якія ўстаноўлены крымінальным правам ці іншымі галінамі права (дзяржаўнага, адміністрацыйнага, грамадзянскага).

## §2. Неабходная абарона

**Неабходнай абаронай** называецца правамерная абарона ад грамадска небяспечнага замаху шляхам нанясення робячаму замах шкоды (напр., цялеснага пашкоджання ці пры адпаведных акалічнасцях нават смерці). Згодна з крымінальным законам, не з'яўляецца злачынствам дзеянне, якое хоць і падпадае пад прыкметы дзеяння, прадугледжанага Крымінальным кодэксам, але ўчынена ў стане неабходнай абароны, гэта значыць пры абароне інтарэсаў дзяржавы, грамадскіх інтарэсаў, жыцця, здароўя або правоў абараняючайся ці іншай асобы ад грамадска небяспечнага замаху шляхам нанясення робячаму замах шкоды, калі пры гэтым не было дапушчана перавышэння межаў неабходнай абароны. Перавышэннем жа межаў неабходнай абароны прызнаецца толькі яўная неадпаведнасць абароны характару і небяспецы замаху (гл. арт.13 КК).

Заканадаўства аб неабходнай абароне і яго правільнае прымяненне следчымі органамі і судамі з'яўляецца адной з важных гарантый рэалізацыі канстытуцыйных правоў і абавязкаў грамадзян па абароне ад грамадска небяспечных замахаў на інтарэсы дзяржавы і грамадства, жыццё і здароўе, гонар і годнасць грамадзян, прыватную, дзяржаўную ці калектыўную ўласнасць.

Прадастаўляючы ўсім людзям права на неабходную абарону ад грамадска небяспечных замахаў, якія ў большасці выпадкаў маюць характар злачынства, заканадаўца лічыць барацьбу са злачыннасцю не толькі функцыяй дзяржаўных устаноў, але і ўсенароднай справай. Прызнанне права на неабходную абарону за кожным чалавекам, на якога зрабілі гра-

мадска небяспечны замах, а таксама за ўсякім грамадзянінам, які стаў сведкам, відавочцам такога замаху, непасрэдна выцякае с ажыццяўляемага нашай дзяржавай прынцыпу актыўнага далучэння грамадскасці да справы па забеспячэнню грамадскай бяспекі і грамадскага парадку. Дзяржава не толькі дазваляе, але і ўсяляк заахвочвае грамадзян да актыўнага ўдзелу ў барацьбе са злачыннасцю. Яна зацікаўлена ў тым, каб кожны чалавек рашуча спыняў грамадска небяспечны замах, незалежна ад таго, ці маецца ў яго магчымасць звярнуцца па дапамогу да прадстаўнікоў улады, якія ахоўваюць грамадскі парадак.

Абвяшчэнне ў законе права на неабходную абарону і ажыццяўленне гэтага права грамадзянамі маюць важнае значэнне для забеспячэння эфектыўнай барацьбы са злачыннасцю.

Службовая роля інстытута неабходнай абароны ва ўмацаванні законнасці і правапарадку выяўляецца ў тым, што актыўна абараняючы інтарэсы асобных грамадзян і грамадства ад замахаў антыграмадскіх элементаў, людзі, якія аказваюць процідзеянне злачынцам, садзейнічаюць прадухіленню злачынстваў, нанясенню шкоды інтарэсам грамадзян, грамадства ці дзяржавы. Ужо само абвяшчэнне ў законе права на неабходную абарону і магчымасць выкарыстання гэтага права грамадзянамі садзейнічаюць прадухіленню злачынстваў. Боязь сустрэць супраціўленне асобы, супраць якой задуманы замах, ці іншых грамадзян часта прымушае злачынца адмовіцца ад учынення задуманага ім грамадска небяспечнага дзеяння. Уяўленне аб магчымасці рашучага процідзеяння з боку пацярпеўшага ці відавочнікаў замаху аказвае на яго моцнае стрымліваючае ўздзеянне, часам нават большае, чым пагражаючае пакаранне, паколькі апошняе звычайна ўспрымаецца толькі як абстрактна магчымае. Злачынец імкнецца дзейнічаць употай і не пакінуць слядоў на месцы ўчынення злачынства і таму разлічвае на тое, што пазбегне затрымання прадстаўнікамі дзяржаўных органаў і не будзе выкрыты. Надзея на беспакаранасць значна змяншаецца, калі ёсць боязь сустрэць рашучае супраціўленне

з боку асобы, супраць якой скіраваны грамадска небяспечны замах, ці іншых грамадзян. Вялікае значэнне для прадухілення злачынстваў мае і тая акалічнасць, што вынік выкарыстання грамадзянамі права на неабходную абарону можа быць для правапарушальніка больш цяжкім, чым магчымае пакаранне. У выніку неабходнай абароны яму могуць быць нанесены цялесныя і нават смяротныя пашкоджанні. Пры гэтым нанясенне злачынцу шкоды для здароўя не вызваляе яго ад пакарання, не замяняе яго, у тым ліку і пры цяжкіх цялесных пашкоджаннях.

Неабходная абарона з'яўляецца маральным абавязкам грамадзяніна, калі яна можа быць ажыццёўлена без сур'ёзнай небяспекі для яго. Для грамадзян, якія абавязаны, згодна з іх службовымі функцыямі, прадухіляць злачынствы, неабходная абарона становіцца і службовым абавязкам. Напр., супрацоўнікі міністэрства ўнутраных спраў абавязаны прымаць рашучыя меры для абароны інтарэсаў грамадзян, грамадства і дзяржавы ад замахаў злачынных элементаў.

Абарона ад грамадска небяспечнага замаху шляхам нанясення шкоды асобе, якая робіць замах, прызнаецца правамернай, калі асоба, што абараняецца, прытрымліваецца адпаведных правілаў. Гэтыя правілы ўстаноўлены законадаўствам аб неабходнай абароне, практыкай яго прымянення і тэорыяй крымінальнага права.

Умовы, пры наяўнасці якіх абарона лічыцца грамадска карысным дзеяннем, падраздзяляюцца на дзве групы: 1) умовы, якія характарызуюць замах; 2) умовы, якія характарызуюць абарону ад яго.

Умовы першай групы зводзяцца да таго, што замах павінен быць: а) грамадска небяспечным; б) наяўным і в) сапраўдным.

**Неабходная абарона дазваляецца толькі ад грамадска небяспечнага замаху.** Таму асоба не мае права абараняцца ад прычыняючых ёй шкоду, але адпавядаючых закону дзеянняў другога чалавека (напр., ад законных дзеянняў прадстаўніка ўлады).

Абарона дазваляецца не толькі ад злачынных замахаў, але

і ад такіх замахаў, якія з'яўляюцца грамадска небяспечнымі, хоць не маюць прыкмет злачынства. Замах, ад якога магчымая неабходная абарона, – гэта дзеянне, прадугледжанае Асаблівай часткай Крымінальнага кодэкса, незалежна ад таго, прыцягнута прычыніўшая яго асоба да крымінальнай адказнасці ці вызвалена ад яе ў сувязі з бессвядомасцю або з тым, што яна не дасягнула адпаведнага ўзросту, або на іншых падставах. Не можа прызнавацца знаходзіўшайся ў стане неабходнай абароны асоба, якая нанесла шкоду іншай асобе ў сувязі з учыненнем апошняй дзеяння, якое хоць фармальна і змяшчае прыкметы якога–небудзь дзеяння, прадугледжанага крымінальным заканадаўствам, але заведама для прычыніўшага шкоду не складае з выпадку яго малазначнасці грамадскай небяспекі. Нанясенне шкоды пры гэтых абставінах падлягае адказнасці на агульных падставах.

Неабходная абарона дазваляецца ад такіх грамадска небяспечных замахаў, якія мэтазгодна спыняць шляхам нанясення шкоды асобе, якая ўчыняе замах. Калі ж замах па свайму характару не выклікае такой неабходнасці, права на актыўную абарону не ўзнікае. Напр., яно не з'яўляецца ў выпадках незаконнага звальнення з працы па асабістых матывах, падробкі дакументаў і г.д.

Абараняцца можна толькі ад **наяўнага** грамадска небяспечнага замаху, гэта значыць ад такога, які прадстаўляе непасрэдную небяспеку для ахоўваемых правам інтарэсаў. Стан неабходнай абароны ўзнікае не толькі ў самы момант грамадска небяспечнага замаху, але і тады, калі ўзнікла рэальная пагроза ўчынення замаху. Такая пагроза маецца ў наяўнасці, калі замах яшчэ не пачаўся, але ўжо ўзнікла рэальная небяспека для інтарэсаў грамадзяніна, яго жыцця ці здароўя, прыватнай, калектыўнай ці дзяржаўнай уласнасці, іншых інтарэсаў грамадства або дзяржавы. Прамаруджванне ў падобных выпадках можа зрабіць абарону немагчымай. Калі ўзнікла непасрэдная пагроза замаху, гэта значыць ён вось–вось пачнецца, не трэба чакаць яго пачатку. У такім становішчы апынуўся, напр., ляснік В., калі прыбыўшы на ахоўваемую ім дзялянку з мэтай крадзяжу лесу А., пагражаючы

расправай, стаў набліжацца да яго з паднятай уверх сякерай і не падпарадкаваўся яго патрабаванню спыніцца. Для прадухілення магчымасці нападу В. з адлегласці 8 метраў выстраліў у А. і нанёс яму цялеснае пашкоджанне. Узбуджаная супраць В. крымінальная справа была спынена следчым пракуратуры Гомельскага раёна, паколькі В., абараняючы дзяржаўную ўласнасць і сваё жыццё, меў права нанесці шкоду асобе, якая рэальна пагражала яму забойствам.

Супраць замаху, які чакаецца ў будучым, пры адсутнасці непасрэднай пагрозы яго ўчынення, неабходная абароне не дазваляецца. Аднак гэта не выключае магчымасці падрыхтоўкі да ўчынення акта неабходнай абароны ў выпадках, калі замах адбудзецца. Пры гэтым, па агульнаму правілу, не рэкамендуецца ўстаноўка агульнанебяспечных прыстасаванняў, якія дзейнічаюць аўтаматычна і могуць нанесці шкоду любой асобе, якая выпадкова да іх дакранецца. Але калі ўстаноўлена такое прыстасаванне, якое нанесла шкоду асобе ў момант учынення ёю грамадска небяспечнага замаху, то маецца неабходная абарона або перавышэнне яе межаў. У выпадку нанясення абарончым прыстасаваннем шкоды асобе, якая выпадкова аказалася ў раёне яго дзеяння, наступае адказнасць за наўмыснае ці неасцярожнае злачынства, не звязанае са станам неабходнай абароны. Так, напр., за неасцярожнае забойства быў асуджаны судовай калегіяй па крымінальных справах Гродзенскага абласнога суда Т., які для прадухілення крадзяжу кветак з агарода сваёй знаёмай нацягнуў вакол кветак аголены дрот і далучаў яго нанач да электрасеткі з напружаннем 220 вольт. Ноччу ад дотыку да гэтага дроту атрымаў смяротную траўму сын гаспадыні агарода. Т. лічыў сігналізацыю бяспечнай для навакольных, але ён павінен быў і мог прадбачыць магчымасць паражэння каго–небудзь электратокам.

Абараняцца ад грамадска небяспечнага замаху можна да таго часу, пакуль не мінула небяспека для ахоўваемых правам інтарэсаў. Права на абарону не знікае, калі замах часова прыпынены, але маецца рэальная пагроза паўторнага нападу. Стан неабходнай абароны можа мець месца і тады, калі

абарона прадоўжана хоць і ў адносінах да закончанага пасягнення, але па абставінах справы для абараняючагася не быў ясным момант яго заканчэння. Пераход зброі, якая выкарыстоўваецца пры нападзе, у рукі абараняючагася яшчэ сам па сабе не сведчыць аб заканчэнні замаху.

Дзеянні абараняючагася, які нанёс шкоду асобе, рабіўшай замах, не могуць лічыцца здзейсненымі ў стане неабходнай абароны, калі шкода нанесена пасля таго, як замах быў прадухілены ці закончаны і таму ў прымяненні сродкаў абароны відавочна не было неабходнасці. У гэтых выпадках адказнасць наступае на агульных падставах. З мэтай правільнай юрыдычнай ацэнкі такіх дзеянняў трэба з улікам усіх абставін здарэння высветліць, ці не былі дзеянні абараняючагася здзейснены ў стане раптоўна ўзнікшага моцнага душэўнага хвалявання, якое было выклікана грамадска небяспечным замахам (гэты стан прызнаецца акалічнасцю, якая змякчае адказнасць).

Неабходная абарона дазваляецца толькі ад такога грамадска небяспечнага замаху, які быў **сапраўдным**, а не ўяўным.

Выпадкі абароны ад неіснуючага замаху, калі толькі здаецца, што ён ёсць, называюцца ў тэорыі крымінальнага права і судовай практыцы **ўяўнай абаронай.** Яна адрозніваецца ад неабходнай абароны тым, што дзеянні чалавека, які памылкова лічыць, што замах існуе, заўсёды з'яўляюцца аб'ектыўна грамадска небяспечнымі, паколькі яны накіраваны на прадухіленне замаху, які не існуе ў рэчаіснасці, ці дзеянняў, якія з'яўляюцца правамернымі, але памылкова прымаюцца за грамадска небяспечны замах. Падабенства паміж уяўнай і неабходнай абаронай выяўляецца толькі ў тым, што і пры ўяўнай абароне чалавек кіруецца імкненнем абараніць ахоўваемыя правам інтарэсы.

Уяўная абарона звязана з існаваннем сітуацыі, якая памылкова прынята за грамадска небяспечны замах: дзеянні чалавека, якому нанесена шкода, знешне былі падобны да такога замаху і таму далі падставу для абароны (напр., жартаўнік, жадаючы напалохаць сябра, інсцэніруе напад разбойніка). Калі такіх дзеянняў, па знешняму выгляду па-

добных да грамадска небяспечнага замаху, няма, аб уяўнай абароне не можа быць размовы. Напр., вартаўнік Барысаўскага шклозавода П., сустрэўшы на ахоўваемай ім тэрыторыі Ш. і палічыўшы яго за злодзея, забіў таго стрэлам з ружжа. Следствам было ўстаноўлена, што Ш., з'яўляючыся рабочым таго ж завода, ішоў па тэрыторыі прадпрыемства па сваіх справах, на П. не нападаў і якіх-небудзь дзеянняў, падобных на грамадска небяспечны замах, не здзяйсняў. Па прыгавору народнага суда г.Барысава П. быў прызнаны вінаватым у наўмысным злачынстве.

Няма ўяўнай абароны, а маецца процідзеянне рэальна існуючаму грамадска небяспечнаму замаху, калі злачынец прымяняе сродкі нападу, якія імітуюць зброю (цацачны пісталет і г.д.) і выкарыстоўваюцца для застрашэння пацярпеўшага. Апошні не ведае аб адсутнасці рэальнай пагрозы, таму знаходзіцца ў стане неабходнай абароны.

Уяўнай абароне даецца розная ацэнка ў залежнасці ад таго, ці мог той, хто абараняецца, пазбегнуць памылкі. Яго дзеянне разглядаецца як неабходная абарона ці перавышэнне яе межаў, калі ён не ўсведамляў і па абставінах здарэння не мог усвядоміць, што на самой справе замах не меў месца. Калі ж асоба наносіць шкоду, лічачы, што замах існуе, але з улікам канкрэтных акалічнасцей справы павінна была і магла ведаць, што замаху не было, яна павінна несці адказнасць за адпаведнае неасцярожнае злачынства супраць жыцця ці здароўя пацярпеўшага.

Прыкладам добрасумленнай памылкі пры ўяўнай абароне можа служыць дзеянне С. У яго дом каля 12 гадзін ночы лез праз акно Д., які ў нецвярозым стане прыняў дом С. за дом сваёй знаёмай. С. палічыў Д. за злодзея і нанёс яму некалькі ўдараў драўлянай падстаўкай для кветак. Ад атрыманых пашкоджанняў Д. памёр. Зыходзячы з канкрэтных абставін, С. меў усе падставы лічыць, што да яго ў дом забраўся злачынец. Аднак ён стаў наносіць удары па галаве Д. у той момант, калі пацярпеўшы ўпаў на падлогу і ўжо фактычна не прадстаўляў пагрозы. Суд прызнаў дзеянне С. забойствам пры перавышэнні межаў неабходнай абароны.

Умовы, якія адносяцца да характарыстыкі абароны,

заключаюцца ў наступным: а) абараняюцца інтарэсы, якія ахоўваюцца крымінальным правам; б) шкода наносіцца нападаючаму; в) той, хто абараняецца, не перавышае межаў неабходнай абароны.

Шляхам неабходнай абароны можна забяспечваць ахову ад грамадска небяспечных замахаў на жыццё, здароўе і іншыя інтарэсы абараняючагася ці другой асобы, інтарэсы грамадства альбо дзяржавы, гэта значыць **любыя інтарэсы, якія знаходзяцца пад аховай крымінальнага права.**

Неабходная абарона носіць актыўны характар і выражаецца ў нанясенні той ці іншай шкоды асобе, якая робіць замах. Гэта могуць быць і цялесныя пашкоджанні, і нават смерць нападаючага. Грамадзянін можа прымяніць такую актыўную абарону таксама і ў выпадках, калі ў яго маецца магчымасць уратавацца шляхам уцёкаў або заклікаць на дапамогу прадстаўнікоў улады ці іншых грамадзян, альбо скарыстаць іншыя захады, якія не звязаны з нанясеннем шкоды асобе, што робіць замах. **Шкода наносіцца менавіта гэтай асобе,** а не іншаму чалавеку. Нанясенне шкоды не нападаючаму, а іншай асобе, разглядаецца па правілах крайняй неабходнасці (гл.§4 гэтай главы). Напр., завалоданне ружжом суседа шляхам узлому яго кватэры для процідзеяння крадзяжу маёмасці са знаходзячайся непадалёку крамы прадстаўляе сабой крайнюю неабходнасць у адносінах да нанясення шкоды суседу і неабходную абарону, калі з гэтага ружжа прычынены цялесныя пашкоджанні злодзеям для прадухілення замаху на маёмасць, якой яны хацелі завалодаць.

Пры неабходнай абароне шкода наносіцца для прадухілення замаху, а не для ўчынення над злачынцам акта помсты– самаўпраўнай расправы. Не ажыццяўляе неабходнай абароны асоба, якая наўмысна выклікала замах, каб выкарыстаць яго для развязвання бойкі, учынення акта помсты. У гэтым выпадку адказнасць настае па агульных правілах, як за наўмыснае злачынства.

Нанясенне шкоды асобе, якая ўчыняе грамадска небяспечны замах, прызнаецца правамерным, калі яно было патрэбным для прадухілення замаху і **не было перавышэння межаў неаб-**

ходнай абароны. Толькі ў выпадку перавышэння гэтых межаў асоба, якая абаранялася, падлягае крымінальнай адказнасці. Пры гэтым перавышэнне межаў неабходнай абароны разглядаецца як акалічнасць, якая змякчае пакаранне, прытым вельмі значна. Максімальны тэрмін пазбаўлення волі, які можа быць прызначаны за забойства з перавышэннем межаў неабходнай абароны, два гады (арт.103 КК), а за нанясенне пры гэтых жа абставінах цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання– адзін год (арт.109 КК). У якасці альтэрнатыўнай меры пакарання за абодва злачынствы могуць быць выкарыстаны папраўчыя работы без пазбаўлення волі на тэрмін да аднаго года.

Перавышэннем межаў неабходнай абароны прызнаецца толькі яўная неадпаведнасць абароны характару і небяспецы замаху (ч.2 арт.13 КК). Напр., асобе, якая ўчыніла замах на маёмасць, нанесена смяротнае пашкоджанне, хоць была магчымасць спыніць замах шляхам нанясення іншых цялесных пашкоджанняў, якія не выклікалі б наступленне смерці. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што перавышэнне межаў неабходнай абароны з'яўляецца наўмысным злачынствам. Нанясенне асобе, якая робіць замах, шкоды па неасцярожнасці не ўтрымлівае ў сабе складу злачынства.

Пры вырашэнні пытання аб тым, ці мела месца перавышэнне межаў неабходнай абароны, трэба ўлічваць не толькі адпаведнасць ці неадпаведнасць сродкаў абароны замаху, але і характар небяспекі, якая пагражала асобе, што абаранялася, існуючыя ў яе магчымасці для прадухілення гэтай небяспекі, а таксама ўсе іншыя акалічнасці, якія маглі аказаць уплыў на рэальныя суадносіны паміж сіламі таго, хто робіць замах, і сіламі чалавека, які абараняецца (іх узрост, фізічнае развіццё, наяўнасць зброі, месца і час замаху і г.д.). Пры ўчыненні замаху групай асоб абараняючыйся мае права прымяніць да любой з нападаючых асоб такія меры абароны, якія выклікаліся небяспекай і характарам дзеянняў усёй групы.

Неабходна мець на ўвазе, што ў стане душэўнага хвалявання, выкліканага замахам, асоба, якая абараняецца, не заўсёды можа дакладна ўзважыць характар небяспекі і выбраць

адпаведныя сродкі абароны.

Дзеянні асобы, якая абараняецца, нельга лічыць здзейсненымі з перавышэннем межаў неабходнай абароны і ў тым выпадку, калі нанесеная ёй шкода аказалася большай, чым тая, якая прадухілена і тая, якая была дастатковай для прадухілення замаху, пры ўмове, што пры гэтым не было відавочнай неадпаведнасці абароны характару і небяспецы замаху.

Прыцягненне абараняючагася да адказнасці не за кожную, а толькі за яўную, відавочную, значную неадпаведнасць абароны характару і небяспецы замаху, з'яўляецца важнай гарантыяй інтарэсаў грамадзян, якія актыўна змагаюцца са злачыннасцю. Нельга не ўлічваць той акалічнасці, што ў адзінаборстве з асобай, якая робіць замах, грамадзянін знаходзіцца ў горшым становішчы. Першы, як правіла, загадзя рыхтуецца да ўчынення замаху, выбірае для яго здзяйснення найбольш спрыяльны момант, імкнецца застаць пацярпеўшага знянацку, неспадзявана. Для асобы ж, якая абараняецца, у большасці выпадкаў замах з'яўляецца нечаканым, раптоўным. Таму ёй няма калі рыхтавацца да абароны і ўсебакова абдумваць спосабы і метады адбіцця замаху. Рашэнне абараняцца і ажыццяўленне гэтага рашэння ў выпадках неспадзяванага замаху павінны ажыццяўляцца імгненна. Прамаруджванне з прыняццем рашэння абараняцца і нерашучасць у момант абароны могуць зрабіць апошнюю неэфектыўнай, што можа выкарыстаць асоба, якая нападае, для завяршэння распачатага ім грамадска небяспечнага замаху. Апынуўшыся ў сітуацыі, у якой узнікае права на абарону, пацярпеўшы ці відавочца замаху мае права абараняцца ад неспадзяванага нападу, выкарыстоўваючы для гэтага, у выпадку неабходнасці, тыя прадметы, якія трапілі пад руку (палку, камень, сякеру і г.д.). Патрабаваць пры такіх умовах ад асобы, якая абараняецца, вытрымкі і прадуманых ва ўсіх дэталях дзеянняў было б няправільным.

Падсумоўваючы, можна выдзеліць тры групы акалічнасцей, якія належыць улічваць пры вырашэнні пытання аб тым, ці была абарона ад грамадска небяспечнага замаху правамернай, ці, наадварот, празмернай:

а) Характар і ступень небяспечнасці замаху (значнасць аб'екта, на нанясенне шкоды якому скіраваны дзеянні нападаючага; цяжкасць шкоды, якую асоба, што робіць замах, мела намер прычыніць гэтаму аб'екту; характар сродкаў, якімі яна карысталася; спосаб іх прымянення; колькасць асоб, што робяць замах; іх пол, узрост, фізічная сіла; характарыстыка асобы нападаючага, яго мінулая злачынная дзейнасць, упартасць і настойлівасць у дасягненні злачыннай мэты; інтэнсіўнасць нападу і г.д.).

б) Канкрэтныя ўмовы здзяйснення абароны і душэўны стан асобы, якая абараняецца (абставіны, час і месца здзяйснення абарончых дзеянняў; спалох, разгубленасць асобы, якая абараняецца, выкліканыя раптоўнасцю замаху, і г.д.).

в) Наяўныя ў гэтай асобы магчымасці для адбіцця замаху (пол, узрост, фізічная сіла асобы, якая абаранялася; наяўнасць у яе спецыяльных навыкаў адбіцця нападу, якія набыты ў сувязі з выкананнем службовых абавязкаў; колькасць асоб, якія абараняюцца; наяўнасць у іх зброі ці іншых сродкаў абароны, спосаб іх выкарыстання і г.д.).

Усе гэтыя акалічнасці павінны ацэньвацца не паасобку, а ў іх сукупнасці. Наданне рашаючага значэння якой–небудзь адной з іх без уліку астатніх, фармальны, механічны падыход да ацэнкі дзеянняў асобы, якая абаранялася, могуць прывесці да памылак пры ацэнцы гэтых дзеянняў, да асуджэння асоб, здзейсніўшых правамерныя абарончыя дзеянні.

## §3. Затрыманне злачынца

Нанясенне якой–небудзь шкоды злачынцу ў мэтах яго затрымання, калі гэта робіцца ў момант замаху або непасрэдна пасля яго, можа ўтрымліваць у сабе прыкметы неабходнай абароны ці перавышэння яе межаў (напр., затрымліваецца хуліган для спынення яго хуліганскіх учынкаў ці шкода наносіцца асобе, якая толькі што завалодала чужой маёмасцю, для таго, каб адабраць яе ў вінаватага). У гэтых і падобных выпадках прымяняюцца правілы, установленыя для неабходнай абароны. Але і ў астатніх выпадках затрыманне асобы, якая ўчыніла злачынства значнай цяжкасці,

шляхам нанясення ёй адпаведнай шкоды становіцца карысным для грамадства, калі пры гэтым не было перавышэння межаў неабходнасці і нанясенне цялесных пашкоджанняў у мэтах затрымання злачынца было вымушаным, г.зн. інакш затрымаць яго было немагчыма.

Нанясенне той ці іншай шкоды асобе, якая ўчыніла злачынства і таму затрымліваецца для перадачы органам улады, прызнаецца правамерным пры захаванні наступных умоў:

а) **Затрымліваецца асоба, якая ўчыніла злачынства:** маюцца дастатковыя падставы для такога меркавання (напр., грамадзянін быў відавочцам злачынства; фотаздымак злачынца змешчаны на дошцы аб'яў "Іх адшуквае міліцыя");

б)**Злачынства,** у якім абвінавачваецца дадзеная асоба, **з'яўляецца настолькі сур'ёзным, што ўзнікае неабходнасць затрымання злачынца.** Калі ж учынена злачынства, якое не мае значнай небяспекі, і маецца магчымасць прыцягнуць вінаватага да крымінальнай адказнасці без яго затрымання, нельга лічыць мэтазгодным такое затрыманне (напр., дадзеная асоба мае пастаяннае месца жыхарства і можа быць выклікана ў следчыя органы і суд для дачы тлумачэнняў);

в) **Маюцца падставы меркаваць, што злачынец можа аказаць супраціўленне, зрабіць спробу ўцячы, каб пазбегнуць затрымання.** Калі асоба, якую затрымліваюць, не аказвае супраціўлення і не спрабуе ўцячы, няма неабходнасці ў нанясенні ёй шкоды. Але і ў гэтым выпадку вельмі небяспечны злачынец можа быць звязаны, на яго могуць быць надзеты наручнікі, каб выключыць магчымасць уцёкаў.

г) **Шкода наносіцца ў мэтах затрымання злачынца,** а не для таго, каб учыніць над ім самасуд, адпомсціць яму.

д) Пры нанясенні шкоды асобе, якая ўчыніла злачынства, **не перавышаны межы неабходнасці,** не нанесены цялесныя пашкоджанні, без якіх пры затрыманні можна было абысціся.

Перавышэнне межаў неабходнасці пры затрыманні злачынца – гэта відавочная неадпаведнасць мер затрымання характару і ступені грамадскай небяспекі злачынства, у сувязі з якім праводзіцца затрыманне, а таксама тым акалічнасцям, пры якіх яно ажыццяўлялася.

У выпадках перавышэння межаў неабходнасці нанясенне смяротных пашкоджанняў, цяжкае ці менш цяжкае цялеснае пашкоджанне разглядаюцца як забойства ці нанясенне названых цялесных пашкоджанняў пры змякчаючых абставінах. Учыненне акта помсты – самасуд лічыцца звычайным наўмысным забойствам ці нанясеннем цялеснага пашкоджання, паколькі ў гэтых выпадках няма мэты затрымання злачынца.

## §4. Крайняя неабходнасць

Згодна з законам, не з'яўляецца злачынствам дзеянне, якое па знешняму выгляду нагадвае злачынства, але здзейснена ў стане крайняй неабходнасці, гэта значыць для ліквідацыі небяспекі, што пагражае дадзенай асобе ці іншым грамадзянам, інтарэсам грамадства ці дзяржавы, калі гэта небяспека пры дадзеных акалічнасцях не магла быць ліквідавана іншымі сродкамі і калі нанесеная шкода з'яўляецца менш значнай, чым папярэджаная (арт.14 КК). Напр., на людзей, якія знаходзіліся на аўтобусным прыпынку, на вялікай хуткасці па крутой вуліцы імчаўся некіруемы аўтамабіль, які быў пакінуты на вуліцы бестурботным шафёрам і зышоў з тормаза. Вадзіцель Н., які ехаў міма на грузавіку, для таго, каб выратаваць людзей ад пагражаючай ім небяспекі, якая непазбежна прывяла б да цяжкіх вынікаў, рэзка вывернуў руль і загарадзіў людзей сваёй машынай. Некіруемы аўтамабіль ўрэзаўся ў кузаў грузавіка і спыніўся. Шляхам нанясення матэрыяльнай шкоды арганізацыі, у якой працаваў Н., ён выратаваў людзей ад пагрозы смерці ці цялесных пашкоджанняў. Ён дзейнічаў у стане крайняй неабходнасці.

Дзеянні чалавека, які знаходзіцца ў стане крайняй неабходнасці, карысныя для грамадства. Хоць пры гэтым наносіцца шкода таму ці іншаму інтарэсу, які знаходзіцца пад аховай права, але такім шляхам прадухіляецца небяспека нанясення больш цяжкай шкоды для іншых інтарэсаў. Імкненне засцерагчы гэтыя больш важныя інтарэсы ад пагражаючай ім небяспекі з'яўляецца тым матывам, якім асоба кіруецца пры здзяйсненні дзеянняў, па вонкаваму выгляду падобных да злачынства, але карысных у канкрэтным выпадку. Таму

здзяйсненне гэтых дзеянняў у пераважнай большасці выпадкаў з'яўляецца нават маральным абавязкам грамадзяніна, а ў некаторых выпадках таксама юрыдычным, службовым абавязкам (напр., калі знішчаюцца баявая тэхніка і іншыя сродкі вядзення вайны, каб яны не дасталіся ворагу).

Умовамі правамернасці дзеянняў, якія здзяйсняюцца ў стане крайняй неабходнасці, з'яўляюцца:

а) наяўнасць сапраўднай, а не ўяўнай небяспекі для інтарэсаў, якія знаходзяцца пад аховай права;

б) немагчымасць прадухілення яе без нанясення шкоды іншым інтарэсам;

в) нанясенне шкоды, якая з'яўляецца менш значнай, чым прадухіленая шкода.

Небяспека пры крайняй неабходнасці можа зыходзіць: а) ад грамадска небяспечных дзеянняў чалавека, б) ад хваравітага стану здароўя асобы; в) ад дзеянняў жывёліны і стыхійных сіл прыроды; г) ад немагчымасці выканаць два абавязкі, калі прыходзіцца ахвяраваць адным з іх.

У выпадках, калі небяспека зыходзіць ад дзеянняў чалавека, шкода прычыняецца не яму, як пры неабходнай абароне, а іншай асобе, не маючай дачынення да стварэння небяспекі. Напр., Д., кіруючы аўтамашынай, у якой ехала група адпачываючых, быў вымушаны рэзка павярнуць машыну ўлева (з правага боку была скала), каб пазбегнуць сутыкнення з сустрэчнай машынай, якая раптоўна без гудкоў з'явілася з–за павароту і з парушэннем правілаў дарожнага руху рухалася па леваму боку дарогі. У выніку рэзкага павароту машына, якой кіраваў Д., перакулілася і частка сядзеўшых у ёй людзей атрымала калецтвы. Сваімі правамернымі дзеяннямі Д. прадухіліў больш цяжкую шкоду, якая магла быць нанесена грамадска небяспечнымі дзеяннямі шафёра сустрэчнай машыны.

Хваравіты стан здароўя чалавека, які здзяйсняе акт крайняй неабходнасці, можа выразіцца ў тым, што ў сувязі з экстрэмальнай сітуацыяй ён быў вымушаны доўга цярпець голад ці холад, што штурхае яго на супрацьпраўнае завалоданне ежай ці палівам.

Калі небяспека зыходзіць ад жывёліны, якая (напр., сабака)

нацкоўваецца іншай асобай, узнікае стан неабходнай абароны супраць гэтай асобы, якая такім чынам, шляхам выкарыстання жывёліны, робіць грамадска небяспечны замах на жыццё ці здароўе чалавека.

Пры прадухіленні небяспекі, зыходзячай ад стыхійных сіл прыроды, у стане крайняй неабходнасці аказваюцца, напр., людзі, якія ў ветранае надвор'е, каб не даць пажару распаўсюдзіцца на суседнія пабудовы, вымушаны разбіраць некаторыя з іх.

Стан крайняй неабходнасці маецца толькі ў тых выпадках, калі трэба прадухіліць відавочную небяспеку, гэта значыць такую, якая ўжо існуе ці вось–вось узнікне. Небяспека павінна быць сапраўднай, а не ўяўнай. У апошнім выпадку прымяняюцца правілы, аналагічныя тым, якімі трэба кіравацца пры ацэнцы ўяўнай абароны.

Пры крайняй неабходнасці сутыкаюцца два інтарэсы, якія аднолькава знаходзяцца пад аховай права. Таму карысным для грамадства можа быць толькі такое выратаванне адных інтарэсаў шляхам нанясення шкоды другім, калі нельга было пазбегнуць небяспекі іншымі сродкамі, і выратаваныя інтарэсы з'яўляюцца больш каштоўнымі, чым тыя, якія прынесены ў ахвяру. Калі хоць адна з гэтых умоў адсутнічае, няма стану крайняй неабходнасці. У прыватнасці, лічыцца злачынствам выратаванне свайго жыцця шляхам прычынення смерці іншай асобе, хоць гэта і было крайнім сродкам.

Пытанне аб тым, якія інтарэсы з'яўляюцца больш каштоўнымі, вырашаецца з улікам пагражаючай небяспекі, значэння для асобы, грамадства ці дзяржавы сутыкнуўшыхся інтарэсаў, а таксама суадносін паміж прычыненай і папярэджанай шкодай. Напр., для выратавання больш каштоўных дзяржаўных ці грамадскіх інтарэсаў можна прынесці ў ахвяру менш каштоўныя асабістыя інтарэсы. І, наадварот, дазваляецца прычыненне шкоды дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам для выратавання больш важных асабістых інтарэсаў. Так, напр., было прызнана правамерным выкарыстанне Л. калгаснага сена са знаходзячагася на лузе стога для падтрымання кастра ў зімні час дзеля выратавання такім шляхам свайго жыцця і жыцця сваіх трох таварышаў, якім пагражаў мароз.

Аднак жаданне выратаваць асабістыя інтарэсы не можа выключаць крымінальнай адказнасці за прычыненне грамадству вялікай і непапраўнай шкоды. Так, калі хто–небудзь пад пагрозай смерці выдае ворагу дзяржаўную ці ваенную тайну, то ён павінен адказваць за здраду дзяржаве. Асобы, на якіх ускладзены спецыяльны абавязак прадухіліць небяспеку (ваеннаслужачыя, работнікі пажарнай аховы і г.д.), не маюць права ўхіліцца ад выканання сваіх службовых абавязкаў па тых матывах, што пры выкананні будуць пастаўлены пад пагрозу іх жыццё ці здароўе.

Разгляд умоў, якім павінна адпавядаць крайняя неабходнасць, паказвае, што станы крайняй неабходнасці і неабходнай абароны маюць шмат агульнага, але паміж імі маюцца таксама істотныя адрозненні. Яны заключаюцца ў наступным:

а) Стан неабходнай абароны ўзнікае ў выпадках учынення грамадска небяспечнага замаху. Пры крайняй жа неабходнасці небяспека можа зыходзіць не толькі ад грамадска небяспечных дзеянняў другой асобы, але і ад хваравітых працэсаў у арганізме чалавека, стыхійных сіл прыроды, нападу жывёліны і г.д.;

б) Пры неабходнй абароне шкода наносіцца нападаючаму, гэта значыць асобе, якая стварыла небяспеку. Пры крайняй жа неабходнасці шкода наносіцца трэцяй асобе, не маючай дачынення да стварэння ўзнікшай небяспекі;

в) Пры крайняй неабходнасці прычыненая шкода павінна быць меншай у параўнанні з папярэджанай, а пры неабходнай абароне гэта не абавязкова;

г) Для наяўнасці крайняй неабходнасці патрабуецца, каб небяспеку нельга было ўстараніць іншымі сродкамі, не звязанымі з нанясеннем шкоды; пры неабходнай абароне такая ўмова не выстаўляецца;

д) Згодна з грамадзянскім заканадаўствам, шкода, нанесеная ў стане неабходнай абароны, калі не перавышаны яе межы, не падлягае пакрыццю. Наадварот, шкода, прычыненая ў стане крайняй неабходнасці, павінна быць пакрыта асобай, якая яе нанесла. Улічваючы акалічнасці, пры якіх была прычынена такая шкода, суд можа ўскласці абавязак яе пакрыцця на трэцюю асобу, у інтарэсах якой дзейнічаў той, хто нанёс шкоду,

## §5. Апраўданая прафесійная і гаспадарчая рызыка

Апраўданая прафесійная і гаспадарчая рызыка маецца тады, калі пры ўкараненні ў вытворчасць новай тэхнікі, выпрабаванні даследчых узораў новых машын і механізмаў, асваенні новых тэхналагічных працэсаў ці прадухіленні небяспекі, узнікшай пры выкананні даручанай работы, асоба ў грамадска карысных мэтах правамерна рызыкуе некаторымі ахоўваемымі правам інтарэсамі. Дапушчэнне ў адпаведных выпадках прафесійнай і гаспадарчай рызыкі садзейнічае паскарэнню навуковатэхнічнага прагрэсу, тэхнічнаму пераўзбраенню гаспадаркі; насупраць, прыцягненне да адказнасці за апраўдануюрызыку скоўвала б ініцыятыву вынаходцаў, наватараў вытворчасці, суб'ектаў гаспадарання, тармазіла б развіццё навукі, тэхнікі, эканомікі.

Рызыка прызнаецца апраўданай, нягледзячы на магчымыя ці наступіўшыя шкодныя вынікі, пры наяўнасці наступных умоў:

а) рызыка, звязаная з дасягненнем грамадска карыснай мэты;

б) яе дасягненне без учынення адпаведных рызыкоўных дзеянняў немагчыма;

в) ступень рызыкі адпавядае важнасці чакаемага грамадска–карыснага выніку (чым важнейшая мэта, тым большай можа быць рызыка);

г) учыненае дзеянне адпавядае сучасным навукова–тэхнічным ведам і вопыту;

д) асоба, якая рызыкуе, прыняла ўсе магчымыя захады для прадухілення нанясення шкоды ахоўваемым правам інтарэсам.

Рызыка не прызнаецца апраўданай, калі яна заведама была спалучана з надыходам экалагічнай катасрофы, грамадскага бедства, або з прычыненнем шкоды здароўю ці жыццю людзей, якія не далі згоды на пастаноўку іх у небяспечны для здароўя і жыцця стан.

## §6. Прычыненне шкоды пры выкананні загаду

Не з'яўляецца злачынствам дзеянне, якое хоць і падпадае пад прыкметы дзеяння, прадугледжанага Крымінальным кодэк-

сам, але ўчынена для выканання загаду кіраўніка, аддадзенага па службе, калі ён падлягае абавязковаму выкананню. Абавязковым для выканання з'яўляецца загад, які: а) аддадзены ў адпаведнай форме; б) не выходзіць за межы службовай кампетэнцыі асобы, якая аддала загад; в) не патрабуе ад выканаўцы ўчынення дзеянняў, якія супярэчаць закону, службоваму ці грамадзянскаму абавязку. Адказнасць за шкодныя вынікі выканання загаду нясе адпаведны кіраўнік.

За наўмыснае ўчыненне злачынства па заведама злачыннаму загаду кіраўніка падначалены падлягае адказнасці на агульных падставах. Пры гэтым выкананне загаду можа быць прызнана судом акалічнасцю, якая змякчае адказнасць. Напр., не вызваляецца ад адказнасці асоба, якая дала хабар па распараджэнню кіраўніка якой-небудзь службовай асобе ў інтарэсах установы, прадпрыемства ці арганізацыі, у якіх яны працуюць. У гэтым выпадку за хабарніцтва адказваюць абедзве асобы – і кіраўнік, які аддаў незаконнае распараджэнне, і яго выканаўца. Адказнасць выключаецца, калі асоба, якая дзейнічала па загаду, не ўсведамляла яго злачыннага характару.

Ваенныя злачынцы не могуць быць звольнены ад адказнасці, хоць бы яны і дзейнічалі па загаду ўрада ці начальніка. У арт.8 Статута міжнароднага ваеннага трыбунала адзначана, што "той факт, што падсудны дзейнічаў па распараджэнню ўрада ці загаду начальства, не вызваляе яго ад адказнасці, але можа разглядацца як падстава для змякчэння пакаранняў, калі трыбунал палічыць, што гэтага патрабуюць інтарэсы правасуддзя". Жудасныя злачынствы гітлераўцаў у адносінах да насельніцтва акупаваных земляў ні пры якіх абставінах не могуць быць апраўданы спасылкай на выкананне загаду.

## §7. Іншыя абставіны, якія выключаюць злачыннасць учынку

**Выкананне прафесійных функцый** з захаваннем устаноўленых для гэтага правілаў з'яўляецца грамадска карыснай дзейнасцю і ў тых выпадках, калі знешне яно нагадвае дзеянне, прадугледжанае Асаблівай часткай Крымінальнага кодэкса (напр., ампутацыя нагі ў сувязі з гангрэнай з мэтай

выратавання жыцця хворага знешне падобна на нанясенне яму цяжкага цялеснага пашкоджання).

Займаючыся той ці іншай прафесійнай дзейнасцю, асоба павінна прытрымлівацца прадпісанняў законаў і іншых нарматыўных актаў, якімі яна рэгламентуецца. Напр., наступае крымінальная адказнасць за незаконнае правядзенне ўрачом аборту (ч.1 арт.114 КК). Калі пры выкананні прафесійных функцый урач ці фармацэўт дапускаюць памылку, якой яны павінны былі і маглі пазбегнуць, і ў выніку гэтага пацыент памірае або яго здароўю прычыняецца цяжкая шкода, вінаваты адказвае за неасцярожнае забойства або неасцярожнае цяжкае ці менш цяжкае цялеснае пашкоджанне.

**Ажыццяўленне свайго права** ў дазволеных межах і належным чынам, гэта значыць у адпаведнасці з дзеючымі законамі і іншымі нарматыўнымі актамі, не можа разглядацца як злачынства, нават калі пры гэтым ушчэмлены чые–небудзь інтарэсы.

Дзеючае заканадаўства, вызначаючы правы грамадзян, устанаўлівае канкрэтны змест гэтых правоў і формы, у якіх іх ажыццяўленне прызнаецца правамерным, дазволеным. Злоўжыванне правам, рэалізацыя апошняга спосабам, які забаронены законам, робяць дзеянне супрацьпраўным. Самаўпраўства, гэта значыць самавольнае, з парушэннем устаноўленага законам парадку ажыццяўленне свайго сапраўднага ці мяркуемага права, якое нанесла істотную шкоду грамадзянам або грамадскім ці дзяржаўным арганізацыям, можа пацягнуць за сабой крымінальную адказнасць.

**Згода пацярпеўшага** ці іншай асобы, якая правамоцная распарадзіцца парушаным інтарэсам, выключае грамадскую небяспеку і супрацьпраўнасць дзеяння толькі пры захаванні адпаведных умоў. Пры крымінальна–прававой ацэнцы згоды пацярпеўшага неабходна ўлічваць наступнае:

1) Замах на ахоўваемы крымінальным правам інтарэс не перастае быць злачынным, калі згода на авалоданне, знішчэнне ці пашкоджанне чужой маёмасці або на ўчыненне іншых падобных дзеянняў дадзена асобай, якой не належыць

гэты інтарэс, альбо якая, хоць і з'яўляецца ўласнікам або асобай, якой даверана маёмасць, але не мае права распарадзіцца прадметам замаху падобным чынам. (У гэтым выпадку крымінальную адказнасць нясе і асоба, якая незаконна распарадзілася парушаным інтарэсам). Напр., А., О. і Б. асуджаныя народным судом Высокаўскага раёна Брэсцкай вобласці за крадзёж 1 800 кілаграмаў калгаснай бульбы, хоць яны ўзялі яе з дазволу стоража.

Не выключае адказнасці за прычыненую шкоду згода пацярпеўшага, дадзеная ў адносінах такіх інтарэсаў, якія не знаходзяцца ў яго свабодным распараджэнні. Напр., ёсць склад злачынства – наўмыснага забойства ў выпадках прычынення смерці па просьбе пацярпеўшага. (Калі просьба выкліканa цяжкай, невылечнай хваробай, жаданнем пазбавіцца ад звязаных з ёю нясцерпных пакут, згода пацярпеўшага можа быць улічана як акалічнасць, якая змякчае адказнасць). Па агульнаму правілу не выключае крымінальнай адказнасці таксама згода пацярпеўшага на прычыненне шкоды яго здароўю. Напр., згода пацярпеўшага на пастаўленне яго ў небяспеку заражэння венерычнай хваробай не з'яўляецца падставай для вызвалення ад крымінальнай адказнасці асобы, якая ведала аб наяўнасці ў яе венерычнай хваробы і паставіла пацярпеўшага ў небяспеку заражэння ці заразіўшай яго венерычнай хваробай. У гэтым выпадку згода пацярпеўшага не выключае грамадскай небяспечнасці дзеянняў асобы, якая садзейнічала распаўсюджванню венерычных захворванняў, паколькі і сам пацярпеўшы можа стаць аб'ектам распаўсюджвання гэтых хвароб. Аналагічна ацэньваюцца і іншыя выпадкі прычынення шкоды здароўю чалавека з яго згоды. Выключэнне крымінальнай адказнасці за такія дзеянні, прадугледжаныя крымінальным законам, перашкаджала б эфектыўнай барацьбе з замахамі на асобу, знаходзілася б у супярэчнасці з канстытуцыйным прынцыпам усебаковай аховы здароўя грамадзян. Таму правільна за наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне, якое выклікала смерць пацярпеўшага, быў асуджаны К., які па просьбе свайго сябра Н. стрэліў у яго з самаробнага пісталета. Просьба была вы-

клікана жаданнем Н. трапіць у бальніцу і атрымаць акадэмічны водпуск у політэхнічным інстытуце, каб пазбегнуць выключэння з вучэбнай установы за нездавальняючыя адзнакі па шэрагу дысцыплін і пропускі заняткаў. Папярэдне Н. напісаў запіску, што К. будзе страляць у яго па яго жаданню. Раненне аказалася смяротным і Н. памёр.

2) Калі асоба, якая дала згоду на прычыненне ёй шкоды, і той, хто наносіць шкоду, дзейнічаюць у злачынных мэтах, крымінальная адказнасць за адпаведныя дзеянні настае на агульных падставах (напр., урач садзейнічае каму–небудзь шляхам хірургічнага ўмяшання ўхіліцца ад нясення абавязкаў ваеннай службы).

3) Калі згода на прычыненне шкоды не з'яўляецца свабодным волевыяўленнем пацярпеўшага, а атрымана ў выніку фізічнага ці псіхічнага насілля над ім з боку робячага замах, дзеянні апошняга прызнаюцца ўчыненымі супраць волі пацярпеўшага. Так; напр., маецца склад грабяжу, разбою ці вымагання, калі пацярпеўшы перадае маёмасць злачынцу ў выніку пагрозы насіллем з яго боку.

Згода псіхічна хворага ці малалетняга на прычыненне шкоды належачым ім інтарэсам не можа прызнавацца свабодным волевыяўленнем пацярпеўшага і таму не выключае адказнасці за адпаведныя супрацьпраўныя ўчынкі. Напр., лічыцца згвалтаваннем, учыненым з выкарыстаннем бездапаможнага стану пацярпеўшай сітуацыя, калі асоба, з якой уступілі ў палавую сувязь, з–за малалетняга ўзросту ці расстройства псіхічнай дзейнасці не магла ўсвядоміць характар і значэнне ўчыненых у адносінах да яе дзеянняў, а вінаваты ведаў, што пацярпеўшая знаходзіцца ў такім бездапаможным стане.

4) Нельга гаварыць аб згодзе пацярпеўшага як акалічнасці, якая выключае грамадскую небяспечнасць і супрацьпраўнасць дзеяння, у выпадках, калі шкода нанесена да таго, як "згода" была дадзена. Напр., згода пацярпеўшай на ўступленне ў шлюб з асобай, якая згвалціла яе, не вызваляе вінаватага ад крымінальнай адказнасці за гэтае злачынства. Тут маецца не згода на прычыненне шкоды, а прабачэнне

крыўдзіцелю, якое можа мець юрыдычнае значэнне толькі ў выпадках, агавораных у законе. Так, напр., справы аб наўмысным лёгкім цялесным пашкоджанні і знявазе ўзбуджаюцца не інакш, як па скарзе пацярпеўшага і падлягаюць скасаванню ў выпадку прымірэння яго з абвінавачаным.

## Літаратура:

Баулин Ю.В. Право граждан на задержание преступника. Харьков, 1986; Баулин Ю.В. Обстоятельства, исключающие преступность деяния. Харьков, 1991; Горелик И.И. Правовые аспекты пересадки органов и тканей. Минск, 1971; Гринберг М.С. Проблема производственного риска в уголовном праве. М., 1963; Домахин С.А. Крайняя необходимость по советскому уголовному праву. М., 1955; Кириченко В.Ф. Основные вопросы учения о необходимой обороне в советском уголовном праве. М.Л., 1948; Козак В.Н. Право граждан на необходимую оборону. Саратов, 1972; Козак В.Н. Вопросы теории и практики крайней необходимости. Саратов, 1981; Крисиков А.Н. Сущность и значение согласия потерпевшего в советском уголовном праве. Саратов, 1975; Паше–Озерский Н.Н. Необходимая оборона и крайняя необходимость по советскому уголовному праву. М., 1962; Слуцкий И.И. Обстоятельства, исключающие уголовную ответственность. Л., 1956; Тишкевич И.С. Условия и пределы необходимой обороны. М., 1969; Тишкевич И.С. Право граждан на задержание преступника. Минск, 1974; Ткаченко В.И. Необходимая оборона по уголовному праву. М., 1979; Шавгулидзе Т.Г. Необходимая оборона. Тбилиси, 1966; Якубович М.И. Учение о необходимой обороне в советском уголовном праве. М., 1967.

# Глава 10

# СТАДЫІ ЎЧЫНЕННЯ НАЎМЫСНАГА ЗЛАЧЫНСТВА

## §1. Паняцце стадый наўмыснага злачынства

Дадзенае ў Крымінальным кодэксе азначэнне паняцця злачынства канкрэтызуецца ў артыкулах Асаблівай часткі гэтага кодэкса, у якіх апісваюцца прыкметы складаў канкрэтных відаў злачынстваў. Адсутнасць хоць бы адной з гэтых прымет, па агульнаму правілу, выключае адказнасць па гэтаму артыкулу Крымінальнага кодэкса. Іншая справа ў адносінах да некаторых прыкмет аб'ектыўнага боку наўмыснага злачынства. Адказнасць за такое злачынства настае не толькі ў выпадку поўнага яго ажыццяўлення, але і тады, калі вінаватая асоба, пачаўшы падрыхтаванне да злачынства ці непасрэднае яго ўчыненне, не даводзіць яго да канца па прычынах, якія не залежаць ад яе волі.

У выпадку недавядзення да канца злачынства з матэрыяльным складам адсутнічаюць грамадска небяспечныя вынікі злачынства, прыкметы якіх акрэслены ў той ці іншай ступені ў адпаведным артыкуле Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса, а ў некаторых выпадках, акрамя таго, не выкананы таксама асобныя часткі апісанага ў ім крымінальнаправавога дзеяння. Напр., калі суб'ект стрэліў у іншую асобу з мэтай забойства, але прамахнуўся, маюцца ўсе прыкметы наўмыснага забойства за выключэннем уваходзячага ў яго аб'ектыўны бок грамадска небяспечнага выніку (смерці пацярпеўшага). Калі ж злачынец з той жа мэтай толькі спрабаваў выстраліць, але ў яго адабралі зброю, не толькі адсутнічае гэты вынік, але выканана толькі частка дзеяння, якое магло прычыніць смерць пацярпеўшаму. За спробу яго ўчынення вінаваты падлягае адказнасці. Не выключаецца таксама адказнасць за падрыхтаванне да ўчынення такога дзеяння, якое прадугледжана ў Крымінальным кодэксе ў якасці злачынства.

Злачынства ва ўсіх пералічаных выпадках з'яўляецца няскончаным, паколькі склад злачынства ажыццёўлены не поўнасцю, а часткова, або мела месца толькі падрыхтаванне да яго выканання.

У адносінах да злачынства з фармальным складам наступае крымінальная адказнасць за частковае ўчыненне грамадска небяспечнага дзеяння, якое ўтварае аб'ектыўны бок гэтага складу злачынства, а ў некаторых выпадках і за падрыхтоўку да ўчынення такога дзеяння (напр., дэзерцірства).

Такім чынам, пры няскончаным злачынстве адсутнічае неабходны для складу дадзенага злачынства грамадска небяспечны вынік, хоць вінаватым учынена дзеянне, накіраванае на прычыненне такога выніку або выканана толькі частка дзеяння, пры дапамозе якога злачынства магло быць здзейснена, або мела месца толькі падрыхтоўка да яго ўчынення. Наадварот, скончаным злачынствам называецца такое наўмыснае злачынства, аб'ектыўны бок якога выкананы поўнасцю і змяшчае ў сабе ўсе прыкметы, прадугледжаныя адпаведным артыкулам Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса (аб скончаным злачынстве падрабязней будзе гаворка ў §3).

Няскончанае злачынства цягне крымінальную адказнасць таму, што яно складае грамадскую небяспеку. Напр., злачынец, які стрэліў з мэтай забойства ў пацярпеўшага і не трапіў у яго, мог прычыніць смерць, калі б лепш цэліўся. Небяспечнасць няскончанага злачынства маецца ў наяўнасці і ў тых выпадках, калі яно выявілася ў такіх дзеяннях, накіраваных на ўчыненне злачынства, якія не маглі прычыніць шкоду ў дадзеным канкрэтным выпадку (напр., зброя аказалася зараджанай непрыдатным для стральбы патронам). Паколькі грамадска небяспечны вынік не наступіў па прычынах, не залежачых ад волі вінаватага, не можа быць выключана крымінальная адказнасць за тое дзеянне, якое было выканана з мэтай прычынення гэтага выніку.

У выпадках, калі злачынец толькі рыхтаваўся да ўчынення злачынства ці выканаў толькі частку дзеянняў, якія маглі выклікаць наступленне грамадска небяспечнага выніку, небяспека прычынення апошняга заключаецца ў магчымасці

прадаўжэння пачатай злачыннай дзейнасці. Суб'ект пачаў ажыццяўленне свайго злачыннага намеру. Але з прычыны выпадковых, не залежачых ад яго волі акалічнасцей ён перапыніў учыненне злачынства, выканаўшы толькі частку неабходных для гэтага дзеянняў. Напр., М. набыў з мэтай забойства чалавека, ад якога хацеў пазбавіцца, падыходзячую атруту, але не ажыццявіў свой злачынны намер да канца толькі таму, што своечасова быў затрыманы работнікамі міліцыі, якія даведаліся аб яго намеры. У гэтым выпадку падрыхтаванне атруты для забойства само па сабе яшчэ не магло прычыніць смерць пацярпеўшаму, паколькі М. не пачаў выконваць дзеянне, якое магло выклікаць наступленне гэтага грамадска небяспечнага выніку, ён толькі падрыхтаваўся да ўчынення такога дзеяння. Тым не менш М. быў асуджаны судом за падрыхтаванне наўмыснага забойства. Яго паводзіны былі грамадска небяспечнымі, бо ён намерваўся атруціць чалавека і ўжо пачаў ажыццяўленне свайго злачыннага плана. Ён мог давесці злачынства да канца, калі б гэтаму не перашкодзілі супрацоўнікі праваахоўных устаноў.

Характар і ступень грамадскай небяспекі няскончанага злачынства могуць быць устаноўлены толькі шляхам уліку мэты, да дасягнення якой імкнецца вінаваты, небяспекі таго злачынства, якое ён меў намер учыніць. Знешне падобныя дзеянні могуць быць пачатковымі стадыямі розных злачынстваў. Напр., набыццё зброі можа быць, у залежнасці ад злачыннай мэты, падрыхтаваннем да забойства, разбойнага нападу, тэрарыстычнага акту і г.д. Трэба, такім чынам, улічваць грамадскую небяспеку ўсяго пачатага злачынства ў цэлым. Хоць злачынец адказвае толькі за ўжо ўчыненыя дзеянні, апошнія ацэньваюцца не самі па сабе, а як частка злачынства, якое не даведзена да канца пры наяўнасці ў злачынца жадання яго скончыць. Наяўнасць у асобы волі, свядома накіраванай на ўчыненне пэўнага злачынства, і частковае ўвасабленне яе ва ўжо выкананых канкрэтных дзеяннях робіць гэтыя апошнія і ўчыніўшага іх суб'екта грамадска небяспечнымі.

Інстытут адказнасці за няскончанае злачынства служыць

мэтам спынення злачынных дзеянняў на ранніх стадыях іх ажыццяўлення. Непрыцягненне да крымінальнай адказнасці за няскончанае злачынства можа прывесці да таго, што суб'ект паўторыць спробу ўчынення злачынства і ў канчатковым выніку дасягне сваёй злачыннай мэты.

Няскончанае злачынства ўяўляе сабой частковае выкананне адпаведнага складу злачынства, за што вінаваты і нясе адказнасць (гл. §4).

Наўмыснаму злачынству як свядомаму валявому дзеянню папярэднічае рашэнне ўчыніць злачынства. Прыняцце такога рашэння з'яўляецца завяршаючым момантам больш ці менш працяглага псіхічнага працэсу, які выяўляецца ў абдумванні меркаванняў за і супраць учынення злачынства, у барацьбе жаданняў (матываў) і г.д. Узнікшае ў суб'екта жаданне ўчыніць злачынства ператвараецца ў рашэнне выканаць яго, калі няма супярэчных гэтаму матываў ці яны былі слабейшымі, чым жаданне ўчыніць крымінальна каральнае дзеянне. Псіхічны працэс, які папярэднічае прыняццю гэтага рашэння, можа ўключаць таксама абдумванне асобай таго, якімі сродкамі і шляхамі можна дасягнуць жаданай злачыннай мэты, як пераадолець цяжкасці, якія могуць узнікнуць пры ўчыненні злачынства, схаваць яго сляды і г.д. (калі абмеркаванне гэтых пытанняў робіцца сумесна некалькімі саўдзельнікамі, яно становіцца падрыхтаваннем да злачынства).

За прыняццем рашэння наступае пераход ад злачыннага намеру да дзеянняў, накіраваных на яго выкананне.

Закон лічыць стадыямі ўчынення наўмыснага злачынства толькі падрыхтаванне да такога злачынства, замах на яго ажыццяўленне і скончанае злачынства. У ліку стадый не названы ні злачынны намер, ні яго знешняе выяўленне. Сам па сабе злачынны намер не можа служыць падставай для прыцягнення яго носьбіта да крымінальнай адказнасці таму, што наяўнасць такога намеру без канкрэтнага ўвасаблення яго ў тых ці іншых дзеяннях яшчэ не стварае рэальнай небяспекі для грамадскіх адносін, ахоўваемых крымінальным правам. Пакуль асоба не ўчыніла ніякіх дзеянняў для ажыццяўлення

злачыннага намеру, яна па крымінальнаму праву Рэспублікі Беларусь не можа лічыцца злачынцам, якім бы цяжкім і небяспечным ні было задуманае ёю злачынства.

Да таго ж трэба мець на ўвазе, што знешняе выяўленне намеру не заўсёды сведчыць аб наяўнасці ў суб'екта сапраўднага намеру ўчыніць злачынства. Часта сустракаецца ў жыцці выяўленне намеру ў стане запальчывасці ці злосці асобай, якая на самой справе не збіраецца ўчыняць злачынства. Насупраць, вопытны злачынец, які сапраўды мае намер учыніць злачынства, стараецца не выяўляць свайго намеру да пачатку яго выканання.

Некаральнасць выяўлення злачыннага намеру, зразумела, не азначае, што выяўленне якім–небудзь чынам намеру ўчыніць злачынства не павінна цікавіць адпаведныя дзяржаўныя ўстановы і грамадскасць. Наяўнасць у асобы жадання ўчыніць злачынства сведчыць аб пэўнай небяспецы гэтай асобы для грамадства, паколькі пры адсутнасці перашкод злачынны намер можа быць ажыццёўлены. Таму ў адносінах да такой асобы павінны быць прыняты меры папераджальнага характару (назіранне за яго паводзінамі, папярэджанне аб адказнасці ў выпадку, калі асоба пачне рэалізаваць намер, узмацненне аховы адпаведнага аб'екта і г.д.).

Ад выяўлення злачыннага намеру трэба адрозніваць пагрозу, якая ў асобных выпадках прызнаецца злачынствам (такой з'яўляецца, напр., пагроза забойствам, нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэннем маёмасці агульнанебяспечным спосабам, калі была рэальная небяспека выканання пагрозы – арт.202 КК). У гэтых выпадках асоба адказвае не за намер учыніць тое злачынства, якім яна пагражае (такога намеру ў яе можа і не быць), а за ажыццяўленне іншага злачынства, якое выражаецца ў псіхічным насіллі з мэтай уздзейнічаць адпаведным чынам на пацярпеўшага.

У выпадках крымінальна каральнай пагрозы апошняя выступае ў выглядзе асобнай формы ўчынення другіх злачынстваў (разбою, грабяжу, вымагання, згвалтавання, супраціўлення прадстаўніку ўлады і іншых). Пагроза ў прадуг-

леджаных у Крымінальным кодэксе выпадках прызнаецца злачынствам таму, што яна ўжо з'яўляецца замахам на пэўныя грамадскія адносіны, стварае небяспеку прычынення ім шкоды і можа яе нанесці, калі не абараняць іх шляхам пакарання вінаватага.

## §2. Паняцце падрыхтавання да злачынства і замаху на злачынства

Называючы стадыямі нясканчанага злачынства падрыхтаванне да злачынства і замах на злачынства, Крымінальны кодэкс мае на ўвазе толькі наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўчыненне злачынства і ствараючыя значную небяспеку для грамадства. Практычна падрыхтаванне і замах цягнуць крымінальную адказнасць толькі ў адносінах да цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў. Неабходнай прыкметай нясканчанага злачынства з'яляецца таксама недавядзенне злачынства да канца па прычынах, не залежачых ад волі вінаватага. Толькі пры наяўнасці гэтых прыкмет падрыхтаванне і замах могуць быць прызнаны крымінальна каральнымі дзеяннямі.

**Падрыхтаванне да злачынства** – гэта пошук або прыстасаванне сродкаў ці прылад або іншае наўмыснае стварэнне ўмоў для ўчынення злачынства (ч.1 арт.15 КК).

Пад пошукам сродкаў ці прылад для ўчынення злачынства разумеецца здабыванне злачынцам тым або іншым спосабам (шляхам куплі, атрымання для часовага выкарыстання ад другіх асоб, крадзяжу, вырабу і г.д.) прадметаў, якія неабходны яму для выканання задуманага злачынства.

Прыстасаванне злачынцам маючыхся ў яго ці набытых сродкаў і прылад для ўчынення злачынства – гэта прывядзенне іх у стан, які зрабіў бы магчымым ці аблегчыў выкарыстанне ў працэсе выканання злачынства.

Іншым наўмысным стварэннем умоў для ўчынення злачынства могуць быць наступныя дзеянні: прыбыццё на месца, дзе мяркуецца ўчыніць злачынства; азнаямленне з ім; устараненне перашкод, якія могуць узнікнуць пры рэалізацыі злачыннага намеру; падгаворванне саўдзельнікаў злачынства; стварэнне злачыннай групы ці ўступленне ў яе; змова дзвюх

ці больш асоб аб сумесным учыненні злачынства, складанне і абмеркаванне ўдзельнікамі змовы плана выканання злачыннага дзеяння.

Такім чынам, падрыхтаванне можа выразіцца ва ўчыненні вінаватым розных наўмысных грамадска небяспечных дзеянняў, накіраваных на стварэнне ўмоў для ўчынення злачынства. Звычайна падрыхтаванне ўключае не адно, а некалькі дзеянняў з ліку пералічаных вышэй. Напр., падрыхтаванне да крадзяжу дзяржаўнай маёмасці былі дзеянні электрыка мантажнага ўпраўлення трэста "Белэнергамантаж" К., які, маючы звязку ключоў у колькасці 40 штук, схаваўся перад закрыццём крамы ў халадзільніку, але, дзякуючы пільнасці прыбіральшчыцы, быў затрыманы выкліканым ёю міліцыянерам. Падрыхтаваннем да наўмыснага забойства Мінскі абласны суд прызнаў дзеянні У., якая падгаварыла З., І. і К. да забойства непажаданых ёй асоб, частавала для гэтага ўсіх траіх спіртнымі напіткамі, давала ім грошы, уручыла моцна дзеючы яд — цыяністы натрый, аб чым З., І. і К. паведамілі ў міліцыю.

**Замах на злачынства** – гэта наўмыснае дзеянне, непасрэдна накіраванае на ўчыненне злачынства, калі пры гэтым яно не было даведзена да канца па прычынах, якія не залежаць ад волі вінаватага (ч.2 арт.15 КК). Напр., маецца замах, калі суб'ект з мэтай крадзяжу дзяржаўнай маёмасці ўзламаў сейф з грашыма, але ў гэты момант быў затрыманы вартай.

Дзеянне, утвараючае замах, непасрэдна скіравана на ўчыненне злачынства, паколькі па свайму характару яно здольнае прывесці да выканання складу скончанага злачынства. Гэтым замах адрозніваецца ад падрыхтавання. Апошняе таксама накіравана на ўчыненне злачынства, але само па сабе не можа выканаць склад скончанага злачынства, якім бы паспяховым для злачынца яно ні было. Падрыхтаванне – толькі папярэдняя стадыя, ствараючая ўмовы для выканання скончанага злачынства ў будучым. Дзеянні ж, утвараючыя замах, па сваіх знешніх рысах падобны да тых, пры дапамозе якіх ажыццяўляецца склад скончанага злачынства. Адрозненне заключаецца толькі ў тым, што пры замаху аб'ектыўны бок злачынства не атрымлівае поўнага развіцця. Хоць суб'ект

учыняе ці пачынае ўчыняць наўмыснае грамадска небяспечнае дзеянне, якое непасрэдна накіравана на выкананне складу скончанага злачынства, ён не дасягае гэтай мэты па прычынах, не залежачых ад яго волі.

Аднолькавыя або знешне падобныя дзеянні могуць быць у адным выпадку падрыхтаваннем, а ў другім – замахам, у залежнасці ад зместу і накіраванасці гэтых дзеянняў, канструкцыі складу адпаведнага злачынства. Напр., набыццё пісталета для ўчынення забойства, зараджанне яго задоўга да спробы выканання гэтага злачынства адрозніваюцца ад хапання зброі і прывядзення яе ў баявую гатоўнасць з мэтай тут жа выстраліць і забіць чалавека. Гэтыя дзеянні розныя як па сваіх аб'ектыўных уласцівасцях, так і па той мэце, якую ставіў перад сабой злачынец пры іх выкананні. У першым выпадку маецца падрыхтаванне да забойства, бо бліжэйшай мэтай вінаватага з'яўляецца падрыхтоўка да прымянення зброі супраць намечанай ахвяры ў будучым. Паміж пошукам прылад злачынства і іх прымяненнем маецца разрыў у часе, яно не мысліцца вінаватым як адзінае бесперапыннае дзеянне. У другім выпадку маецца ўжо замах на забойства, бо мэтай вінаватага з'яўляецца выстрал у пацярпеўшага; хапанне пісталета, прывядзенне яго ў баявую гатоўнасць і стрэл з'яўляюцца адзіным дзеяннем – прымяненнем зброі для ўчынення забойства – не толькі з прычыны адсутнасці паміж імі разрыву ў часе, але і таму, што маюцца асаблівыя суб'ектыўныя адносіны да іх асобы, якая іх учыняе. Яна пачынае ажыццяўляць свой намер шляхам раптоўнага прымянення зброі, якая знаходзіцца пад рукамі для ўчынення скончанага злачынства – забойства.

У некаторых выпадках падрыхтоўчыя дзеянні ўказаны ў якасці прыкмет, якія характарызуюць аб'ектыўны бок злачынства. Напр., папярэдняя змова асоб, аб'яднаўшыхся для сумеснага ўчынення крадзяжу маёмасці, з'яўляецца прыкметай кваліфікаванага складу крадзяжу, учыненага групай асоб; падробка дакументаў уключана ў якасці прыкметы складу такіх злачынстваў, як ухіленне ад чарговага прызыву на абавязковую ваенную службу і ўхіленне ад воінскай

службы шляхам членашкодніцтва або іншым спосабам. У гэтых выпадках падрыхтаванне ўяўляе сабой пачатак ажыццяўлення канкрэтнага складу злачынства, але ад гэтага не становіцца замахам, паколькі яшчэ не накіравана непасрэдна на ўчыненне адпаведнага крымінальна каральнага дзеяння, яшчэ не можа нанесці шкоду аб'екту названых злачынстваў.

Падрыхтаванне і замах могуць быць толькі наўмыснымі. Нельга неасцярожна рыхтавацца да ўчынення злачынства ці замахвацца на яго ўчыненне. Выкананне дзеянняў, утвараючых нясканчанае злачынства, магчымае толькі пры ўсведамленні дзеючай асобай таго, што пачатыя ім дзеянні накіраваны на падрыхтаванне ці непасрэднае выкананне складу пэўнага наўмыснага злачынства. Грамадская небяспечнасць падрыхтавання і замаху ў тым і заключаецца, што асоба, іх выканаўшая, свядома становіцца на шлях учынення злачыннага дзеяння, якое можа нанесці шкоду ахоўваемым крымінальным правам грамадскім адносінам.

Падрыхтаванне і замах не могуць мець месца да таго, як у асобы ўзнік намер учыніць злачынства. Калі тыя ці іншыя дзеянні суб'екта аб'ектыўна з'яўляліся падрыхтаваннем да пазней задуманага злачынства, яны могуць служыць падставай для прыцягнення да крымінальнай адказнасці толькі ў тым выпадку, калі імі выкананы склад самастойнага злачыннага дзеяння (незаконнага захавання агнястрэльнай зброі, моцнадзеючых, ядавітых ці наркатычных рэчываў без спецыяльнага на тое дазволу і г.д.).

Падрыхтаванне і замах немагчымыя таксама пры ўчыненні злачынстваў з ускосным намерам. Пры ўчыненні такіх злачынстваў суб'ект не жадае наступлення грамадска небяспечных вынікаў сваіх дзеянняў, таму не можа рыхтавацца да іх прычынення ці замахвацца на гэта.

Учыненне з ускосным намерам дзеянняў, якія ставяць у небяспеку якія-небудзь інтарэсы, ахоўваемыя крымінальным правам, не з'яўляецца падрыхтаваннем ці замахам, але можа заключаць у сабе прыкметы якога-небудзь наўмыснага пастаўлення ў стан небяспекі жыцця ці здароўя пацярпеўшага.

Падрыхтаванне і замах немагчымыя і пры ўчыненні нека-

торых злачынстваў з прамым намерам, што абумоўлена іх асаблівымі ўласцівасцямі. У прыватнасці, няскончанае злачынства немагчымае пры ўчыненні злачынстваў з фармальным складам, якія складаюць сабой злачыннае бяздзеянне. Пакуль у суб'екта ёсць час для выканання тых дзеянняў, якія ён абавязаны выканаць, яго дзейнасць не можа разглядацца ў якасці злачыннай; калі ж час для выканання абавязку мінуў, маецца склад скончанага злачынства. Напр., неданясенне аб дакладна вядомым рыхтуемым або ўчыненым злачынстве, непаведамленне аб якім органам улады крымінальна караецца, ужо з'яўляецца скончаным злачынствам. Падрыхтаванне і замах немагчымыя і пры ўчыненні злачынстваў з фармальным складам, выконваемых шляхам актыўных дзеянняў, якія з прычыны іх асаблівага характару прызнаюцца скончанымі злачынствамі з моманту, калі пачалося адпаведнае дзеянне (напр., слоўная знявага).

Пры ўчыненні іншых злачынстваў з фармальным складам магчымасць падрыхтавання ці замаху не выключана. Яны магчымыя, напр., у адносінах да такіх злачынстваў, як ухіленне ад чарговага прызыву на абавязковую ваенную службу, ухіленне ваеннаслужачага ад нясення абавязкаў ваеннай службы. Так, падробка дакументаў з мэтай іх наступнага выкарыстання для ўчынення названых злачынстваў павінна кваліфікавацца як падрыхтаванне да гэтых злачынстваў, а няўдалая спроба выкарыстання падробленых дакументаў, подкупу службовых асоб ці іншага падману для ўхілення ад прызыву або ад нясення абавязкаў ваеннай службы як замах. Не выключаецца магчымасць падрыхтаванне ці замаху і пры ўчыненні такога злачынства, як дэзерцірства (змова ўчыніць яго, падробка дакументаў з мэтай легалізацыі свайго знаходжання за межамі воінскай часці пасля дэзерцірства, няўдалая спроба непрыкметна пакінуць часць з мэтай ухілення ад ваеннай службы і г.д.).

Замах на ўчыненне злачынства з матэрыяльным складам у залежнасці ад аб'ёму выкананых злачынцам дзеянняў можа быць скончаным і няскончаным. Калі выкананы ўсе дзеянні, уключаныя заканадаўцам у апісанне аб'ектыўнага

боку злачынства, але не наступілі яго грамадска небяспечныя вынікі, якія неабходныя для наяўнасці складу гэтага злачынства, маецца скончаны замах. Пры гэтым відзе замаху грамадска небяспечныя вынікі злачынства маглі наступіць, калі б гэтаму не перашкодзілі якія–небудзь акалічнасці (асоба стрэліла з мэтай забойства, але прамахнулася; спускавы кручок націснуты, але здарылася асечка і стрэл не адбыўся). Пры нязкончаным жа замаху выканана толькі частка дзеяння, якое магло прычыніць грамадска небяспечныя вынікі, таму апошнія не толькі не наступілі, але і не маглі ўзнікнуць, бо вінаватым яшчэ не скончана дзеянне, неабходнае для гэтага (напр., суб'ект прыцэліўся з пісталета з мэтай забойства, але яшчэ не націснуў на спускавы кручок).

Скончаны замах больш небяспечны, чым нязкончаны, што ўлічваецца пры назначэнні пакарання (гл. § 4). Адрозненне паміж імі трэба мець на ўвазе таксама пры вырашэнні пытання аб наяўнасці або адсутнасці добраахвотнай адмовы ад учынення злачынства (гл. §5).

Дзяленне замаху на скончаны і нязкончаны немагчымае ў адносінах да злачынстваў з фармальным складам. Яно немагчымае таксама і пры ўчыненні такіх злачынстваў з матэрыяльным складам, у якіх дзеянне непарыўна звязана з наступленнем яго грамадска небяспечных вынікаў, уваходзячых у аб'ектыўны бок злачынства. Выкананне дзеяння поўнасцю ў такіх выпадках (напр., пры згвалтаванні) ужо ўтварае склад скончанага злачынства. Замах на ўчыненне такіх злачынстваў з матэрыяльным складам і ўсіх злачынстваў з фармальным складам нельга называць нязкончаным, бо паняцці нязкончанага і скончанага замаху суадносныя: аб нязкончаным замаху можа ісці гаворка толькі ў адносінах да тых злачынстваў, пры ўчыненні якіх магчымы таксама скончаны замах.

## §3. Паняцце скончанага злачынства і яго адрозненне ад скончанага замаху

У судовай практыцы важнае значэнне мае размежаванне нязкончанага і скончанага злачынстваў. Паняцці гэтыя

суадносныя: аб скончаным злачынстве можна весці гутарку толькі адносна тых крымінальна каральных дзеянняў, якія ў іншых выпадках пры пэўных акалічнасцях з'яўляюцца няскончаным злачынствам. Нельга, напр., гаварыць аб няскончаным неасцярожным забойстве таму, што замах на яго немагчымы. Як нельга таксама рыхтавацца да такога забойства, аб чым ужо вядома з §2. Таму судовая калегія па крымінальных справах Магілёўскага абласнога суда адмяніла прыгавор народнага суда г.Бабруйска, якім М. быў прызнаны вінаватым у тым, што спрабаваў па неасцярожнасці забіць Б. Пры гэтым яна адзначыла, што суд прызнаў М. вінаватым у тым, у чым па закону не можа быць прызнана вінаватай ніводная асоба, паколькі закон устанаўлівае, што пры замаху на злачынства суб'ект дзейнічае наўмысна, прычым толькі з прамым намерам. Рабіць замах на якое–небудзь злачынства па неасцярожнасці немагчыма. Замах – гэта пачатковая стадыя злачыннай дзейнасці, у якой суб'ект, паставіўшы перад сабой адпаведную мэту, накіроўвае свае дзеянні на яе дасягненне, імкнецца да злачыннага выніку.

Вельмі важна правільна адрозніваць скончаны замах ад скончанага злачынства. Менавіта ў гэтых выпадках могуць узнікнуць адпаведныя цяжкасці (няскончаны замах і скончанае злачынства не з'яўляюцца сумеснымі паняццямі і адрозніць іх адно ад аднаго лягчэй).

Скончаны замах адрозніваецца ад скончанага злачынства тым, што пры замаху адсутнічаюць грамадска небяспечныя вынікі, якія з'яўляюцца прыкметай аб'ектыўнага боку злачынства. Аднак гэта не азначае, што пры замаху ўвогуле няма шкодных вынікаў. Імі могуць быць, напр., цялесныя пашкоджанні пры замаху на забойства. Іх наступленне не ператварае замах у скончанае злачынства, паколькі для прызнання дзеяння скончаным злачынствам закон патрабуе наступлення не любых шкодных вынікаў, а толькі такіх, якія неабходныя для наяўнасці аб'ектыўнага боку дадзенага злачынства (у прыведзеным прыкладзе – смерці пацярпеўшага).

Пры размежаванні замаху і скончанага злачынства трэба кіравацца не толькі азначэннем замаху ў Агульнай частцы

Крымінальнага кодэкса, але ўлічваць таксама асаблівасці канструкцыі адпаведнага складу злачынства. Для наяўнасці скончанага складу шмат якіх злачынстваў наступленне пэўных грамадска небяспечных вынікаў або зусім не патрабуецца, або дастаткова адной толькі магчымасці іх наступлення. Напр., закон прызнае скончаным злачынствам наўмыснае разбурэнне або пашкоджанне шляхоў зносін, пабудоў на іх, рухомага саставу ці судна, сродкаў сувязі ці сігналізацыі, якое выклікала або магло выклікаць крушэнне поезда, аварыю карабля ці парушэнне нармальнай работы транспарту і сувязі (арт.83 КК). Для прызнання дадзенага злачынства скончаным (з юрыдычнага пункту гледжання) наступленне ўказаных вынікаў не абавязковае, дастаткова адной толькі магчымасці іх наступлення. Такая пабудова дыспазіцыі некаторых артыкулаў Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса выклікана або тым, што злачынства складае значную небяспеку ўжо з моманту ўчынення самога дзеяння ці бяздзейнасці, або тым, што дадзенае дзеянне ўжо стварыла рэальную магчымасць наступлення грамадска небяспечных вынікаў.

У некаторых складах злачынства гаворыцца аб пэўнай мэце злачынных дзеянняў вінаватага (напр., аб вырабе з мэтай збыту фальшывых грошай ці каштоўных папер). Дасягненне адпаведнай мэты не абавязковае для прызнання злачынства скончаным і дастаткова, каб вінаваты, які ўчыніў дзеянне, названае ў дыспазіцыі артыкула Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса, імкнуўся да дасягнення гэтай злачыннай мэты.

Магчымыя выпадкі, калі замах на ўчыненне аднаго злачынства па сваіх знешніх рысах падобны на іншае скончанае злачынства. Напр., замах на забойства можа выразіцца са знешняга боку ў нанясенні цялеснага пашкоджання. Таму кваліфікацыя злачынства ў такіх выпадках залежыць ад накіраванасці злачыннага намеру вінаватага. У прыведзеным прыкладзе будзе замах на забойства, калі мэтай злачынца было прычыненне смерці пацярпеўшаму, а пры яе адсутнасці (вінаваты меў намер нанесці шкоду здароўю пацярпеўшага)– склад адпаведнага наўмыснага цялеснага пашкоджання (або замаху на яго, калі нанесці шкоду пэўнай цяжкасці не ўдалося).

## §4. Кваліфікацыя падрыхтавання і замаху, назначэнне пакарання за іх

Як ужо адзначалася, падрыхтаванне і замах – гэта частковае выкананне якога-небудзь прадугледжанага ў Крымінальным кодэксе складу злачынства; таму яны кваліфікуюцца па таму артыкулу (ці яго частцы) кодэкса, якая прадугледжвае гэты склад злачынства. Апрача гэтага, робіцца спасылка на артыкул Агульнай часткі Крымінальнага кодэкса, у якім ідзе гаворка аб адказнасці за падрыхтаванне злачынства і за замах на злачынства (гэта сведчыць аб тым, што злачынства не даведзена да канца, з'яўляецца нясканчаным) – ч.1 арт.15 або ч.2 арт.15 КК.

Паколькі прыкметы падрыхтавання і замаху апісаны ў абагульненай форме ў Агульнай частцы Крымінальнага кодэкса, а ў іх кваліфікацыі ўказваецца таксама адпаведны артыкул Асаблівай часткі гэтага кодэкса, можна лічыць юрыдычнай падставай прыцягнення асобы да крымінальнай адказнасці за нясканчанае злачынства наяўнасць у яе дзеяннях складу падрыхтавання да адпаведнага злачынства або складу замаху на гэта злачынства. Прыкметы гэтых нясканчаных злачынстваў заканадаўца не палічыў неабходным апісваць кожны раз асобна ў Асаблівай частцы Крымінальнага кодэкса, таму даў іх абагульняючае азначэнне ў Агульнай частцы кодэкса, маючы на ўвазе, што канкрэтны змест складаў падрыхтавання і замаху павінен устанаўлівацца шляхам сумеснага прымянення артыкулаў Агульнай і Асаблівай часткі кодэкса. Такім чынам, і ў дадзеным выпадку застаецца непарушным палажэнне Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб тым, што крымінальная адказнасць магчыма толькі пры наяўнасці ў дзеяннях асобы складу злачынства.

Артыкул Агульнай часткі кодэкса, у якім гаворыцца аб крымінальнай адказнасці за падрыхтаванне да злачынства і за замах на злачынства падзелены на частак (у першай ідзе размова аб падрыхтаванні, у другой – аб замаху). Таму пры кваліфікацыі нясканчанага злачынства пажадана ўказваць, якая частка гэтага артыкула маецца на ўвазе. Тым самым будзе дакладна вызначана, якая стадыя нясканчанага злачынства – падрыхтаванне ці замах – мела месца ў дадзеным

канкрэтным выпадку.

Спасылка на артыкул Агульнай часткі Крымінальнага кодэкса аб падрыхтаванні і замаху не робіцца, калі заканадаўца акрэслівае прыкметы злачынства такім чынам, што момант его заканчэння пераносіцца на стадыю падрыхтавання ці замаху, гэта значыць, калі яны ўключаны ў паняцце скончанага злачынства. Напр., разбой прызнаецца скончаным злачынствам з моманту нападу з мэтай авалодання маёмасцю, незалежна ад таго, ці завалодаў ёю вінаваты (арт.89 КК), а бандытызм– ужо з моманту ўтварэння банды, нават калі яна яшчэ не ўчыніла ніводнага нападу (арт. 74 КК).

Склады злачынстваў, у якіх крымінальна каральнае дзеянне прызнаецца юрыдычна скончаным з моманту ўчынення дзеянняў, у іншых выпадках утвараючых падрыхтаванне ці замах, называюцца ўсечанымі. Такія склады злачынства заканадаўца стварае тады, калі пэўныя падрыхтаваннем дзеянні ці замах на ўчыненне злачынства настолькі небяспечныя для грамадскіх адносін, супраць якіх яны накіраваны, што становіцца мэтазгодным прыраўняць такія дзеянні па іх пакаральнасці да скончанага злачынства.

Утварэнне ўсечанага складу злачынства не азначае, што ім ахопліваецца ўся папярэдняя злачынная дзейнасць. І пры ўчыненні такіх злачынстваў магчымыя стадыі падрыхтавання і замаху. Напр., падрыхтаваннем да разбою з'яўляецца стварэнне групы разбойнікаў, набыццё зброі, неабходнай для ўчынення разбойнага нападу, збіранне патрэбных звестак аб асобах, валодаючых каштоўнай маёмасцю, устараненне перашкод, якія могуць замінаць учыненню нападу і г.д. Пры бандытызме падрыхтаваннем з'яўляецца набыццё зброі, а замахам – беспаспяховыя дзеянні, накіраваныя на ўтварэнне ўзброенай злачыннай групы.

Калі падрыхтаванне ці замах на якое–небудзь злачынства адначасова змяшчаюць ў сабе прыкметы іншага самастойнага (скончанага) злачынства, пры кваліфікацыі такіх дзеянняў і назначэнні пакарання трэба кіравацца правіламі аб сукупнасці злачынстваў. Напр., падрыхтаванне ці замах на наўмыснае забойства павінны дадаткова кваліфікавацца ў

адпаведных выпадках і як незаконнае нашэнне, захаванне ці выраб агнястрэльнай зброі (акрамя гладкаствольнай паляўнічай), баявых прыпасаў або выбуховых рэчываў без адпаведнага дазволу (ч.1 арт.15, арт.101; ч.1 арт. 213 КК).

У гэтых выпадках маецца так званая ідэальная сукупнасць: адным дзеяннем выконваюцца два склады злачынстваў. Сустракаецца, і даволі часта, таксама рэальная сукупнасць падрыхтавання ці замаху і іншага злачынства, што таксама абавязкова павінна знайсці адлюстраванне ў кваліфікацыі такіх злачынных дзеянняў. Так, напр., Л. і Г., адбываючы пакаранне за раней учыненыя злачынствы ў папраўча–працоўнай калоніі г.Горкі Магілёўскай вобласці, вырашылі здзейсніць уцёк з гэтага месца зняволення. Па папярэдне распрацаванаму плану яны ўзламалі агароджу, якая раздзяляе жылую зону ад вытворчай, і з мэтай уцёку праніклі ў вытворчую зону. Л. быў заўважаны кантралёрамі ў механічным цэху і ў суправаджэнні малодшага сержанта Р. накіраваны на кантрольна–прапускны пункт N 2, які знаходзіцца паміж вытворчай і жылой зонамі. Здзяйсняючы папярэдне распрацаваны план уцёку, уключаючы завалоданне форменным абмундзіраваннем службовых асоб калоніі для выхаду з апошняй, Л. напаў на Р., нанёс яму удар у грудзі, а схаваўшыйся да гэтага Г. накінуўся ззаду на Р., у барацьбе сарваў з яго бушлата пагон і спрабаваў нанесці яму ўдар металічным прутом. Аднак Р. удалося вырвацца і падняць трывогу. Дзякуючы прынятым мерам Л. і Г. былі затрыманы. Пры затрыманні вінаватыя нанеслі пабоі кантралёрам. Л. і Г. былі асуджаныя Магілёўскім абласным судом за замах на уцёк і ўчыненне насілля ў адносінах да кантралёраў.

Пры назначэнні пакарання за падрыхтаванне і замах суд павінен улічваць характар і ступень грамадскай небяспекі дзеянняў, учыненых вінаватым, ступень ажыццяўлення злачыннага намеру і прычыны, па якіх злачынства не было даведзена да канца. Кіруючыся межамі санкцыі адпаведнага артыкула Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса, суды пры вызначэнні пакарання за падрыхтаванне і замах павінны браць пад увагу наступныя акалічнасці:

а) стадыю, да якой даведзена ўчыняемае злачынства, (замах, як правіла, караецца больш строга, чым падрыхтаванне);

б) аб'ём ужо выкананых у межах дадзенай стадыі злачынных дзеянняў; ступень падрыхтаванасці злачынства пры падрыхтаванні; блізкасць наступлення грамадска небяспечных вынікаў злачынства пры замаху на яго. Так, устройванне засады з мэтай забойства, разбою, бандыцкага нападу павінна быць пакарана больш строга, чым набыццё для гэтай мэты зброі; скончаны замах больш небяспечны, чым нескончаны;

в) ступень грамадскай небяспекі тых дзеянняў, якія злачынец яшчэ не здзейсніў, але меў намер іх выканаць для дасягнення намечанай мэты;

г) прычыны, якія перашкодзілі злачынцу давесці пачатае ім злачынства да канца (што перашкодзіла злачынцу прадоўжыць свае злачынныя дзеянні: умяшанне прадстаўнікоў улады, супраціўленне пацярпеўшага ці іншых грамадзян, няўдалае састаўленне плана ўчынення злачынства, няўмеласць пры яго выкананні і г.д.);

д) грамадска небяспечныя вынікі нескончанага злачынства, калі яны наступілі (напр., замах на забойства караецца больш строга у выпадку нанясення пацярпеўшаму цялесных пашкоджанняў у параўнанні з замахам, не прычыніўшым шкоды).

З улікам названых акалічнасцей, звязаных з недавядзеннем злачынства да канца, суды, як правіла, павінны прызначаць за падрыхтаванне пакаранне значна зніжанае, набліжанае да ніжэйшай мяжы санкцыі.

Пры назначэнні пакарання за падрыхтаванне замах суды могуць у адпаведных выпадках знізіць пакаранне яшчэ больш і прызначыць вінаватаму пакаранне, ніжэйшае за самае нізкае, прадугледжанае законам за дадзенае злачынства, або перайсці да іншага, больш мяккага віду пакарання (арт.42 КК), або выкарыстаць умоўнае асуджэнне (арт.43 КК).

Магчымыя выпадкі, калі змякчэнне пакарання за нескончаную злачынную дзейнасць не павінна мець месца з улікам вялікай грамадскай небяспекі ўчыненых злачынных дзеянняў і самога вінаватага. Таму заканадаўца дапускае прызначэнне за нескончанае злачынства ў асобных выпадках такога ж

пакарання, як і за скончанае злачынства.

Улічваючы гэта, суды даволі часта прызначаюць за замах на злачынства пакаранне, блізкае па сваёй суровасці ці нават такое ж, як і за адпаведнае скончанае злачынства. Так, напр., за замах на забойства ў сувязі з выкананнем пацярпеўшым службовага абавязку судовая калегія па крымінальных справах Магілёўскага абласнога суда прыгаварыла К. да 12 гадоў пазбаўлення волі. Суд улічыў, што К. нанёс з мэтай забойства удар нажом у спіну старшыні калгаса за тое, што ён забараніў самавольнае распілаванне належачых К. калод на цыркулярнай піле калгаса; у выніку нажавой раны пацярпеўшаму было нанесена цяжкае цялеснае пашкоджанне, небяспечнае для жыцця ў момант нанясення.

У судовай практыцы рэспублікі сустракаліся выпадкі прызначэння за замах на забойства пакарання смерцю; пры гэтым улічваліся нанясенне пры замаху асабліва цяжкіх цялесных пашкоджанняў і вельмі адмоўная характарыстыка падсуднага (наяўнасць у мінулым некалькіх судзімасцей, вядзенне паразітычнага ладу жыцця і г.д.).

## §5. Добраахвотная адмова ад учынення злачынства і дзейнае раскаянне

**Добраахвотная адмова** ад давядзення злачынства да канца – гэта адмова асобы ад давядзення злачыннай дзейнасці да канца пры наяўнасці ў яе фактычнай магчымасці прадаўжэння ўчыненага злачынства. Згодна з законам, асоба, якая добраахвотна адмовілася ад давядзення злачынства да канца, нясе крымінальную адказнасць толькі ў тым выпадку, калі фактычна ўчыненае ёю дзеянне мае склад іншага злачынства. Значыць, пры добраахвотнай адмове крымінальная адказнасць за падрыхтаванне і замах выключаецца. Асоба не вызваляецца ад адказнасці толькі за тыя ўчыненыя ёю дзеянні, якія маюць прыкметы якога–небудзь іншага скончанага злачынства. Напр., судовай калегіяй па крымінальных справах Мінскага абласнога суда быў апраўданы Р., абвінавачаны ў замаху на згвалтаванне дзяўчынкі. Па матэрыялах справы відаць, што Р. меў магчымасць давесці злачынства да канца, паколькі ніхто

яму не перашкаджаў, але ў сувязі з тым, што пацярпеўшая стала плакаць і прасіла яе адпусціць, зжаліўся над ёю і ад палавога акту адмовіўся. Аднак паколькі да моманту добраахвотнай адмовы ад давядзення злачынства да канца Р. учыніў у адносінах да непаўналетняй распутныя дзеянні, суд прызнаў яго вінаватым ва ўчыненні гэтых дзеянняў.

Добраахвотная адмова ад злачынства з'яўляецца акалічнасцю, якая выключае крымінальную адказнасць за падрыхтаванне ці замах, таму што адпадае небяспека прадаўжэння пачатай злачыннай дзейнасці і нанясення шкоды аб'екту злачынства ў сувязі з тым, што перастае існаваць намер скончыць учыненне злачынства. Акрамя таго, заканадаўца прызнаннем магчымасці добраахвотнай адмовы ад злачынства як акалічнасці, якая выключае крымінальную адказнасць, стварае ў вінаватага стымул для спынення злачынства на яго ранніх стадыях.

Добраахвотнай прызнаецца такая адмова ад прадаўжэння пачатага злачынства, калі асоба мае фактычную магчымасць давесці злачынства да канца. Адмова не можа лічыцца добраахвотнай, калі яна выклікана немагчымасцю прадаўжэння злачынства. Для наяўнасці добраахвотнай адмовы не маюць значэння матывы, якімі суб'ект кіраваўся, спыняючы сваю злачынную дзейнасць. Важна толькі тое, што ён адмовіўся ад прадаўжэння злачынства, хоць меў магчымасць давесці яго да канца. Таму матывамі добраахвотнай адмовы ад злачынства могуць быць раскаянне суб'екта, літасць да намечанай ахвяры, страх перад пакараннем і г.д.

Аднак няма добраахвотнай адмовы, калі матывам спынення злачыннай дзейнасці з'яўляецца боязнь затрымання ці выкрыцця злачынства, узнікшыя не абстрактна (з–за боязі крымінальнай адказнасці наогул), а ў сувязі з канкрэтнымі акалічнасцямі, якія перашкаджаюць учыненню задуманага злачынства. Напр., у сувязі з набліжэннем вартаўніка (пры спробе ўчыніць крадзеж маёмасці).

Добраахвотная адмова ад злачынства магчымая і тады, калі прадаўжэнне злачынства яшчэ магчымае, хоць і стала цяжэйшым (напр., пачаўся золак і злодзея могуць убачыць;

у памяшканні, куды ён залез, аказаліся людзі, якія могуць разгадаць сутнасць яго намеру і перашкодзіць завалоданню вінаватым цікавячай яго маёмасцю; жанчына пры спробе згвалтавання аказвае супраціўленне, але яго можна пераадолець; дасягненне той мэты, якой хоча дабіцца вінаваты, стала менш прывабным, але яно магчымае (маёмасць у кватэры, у якую пранік злодзей, аказалася малацэннай, але ніхто не перашкаджаў яе забраць і вынесці). Таму, напр., Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь прызнаў, што добраахвотна адмовіўся ад прадаўжэння злачынства С., які праз акно залез у сярэднюю школу з мэтай крадзяжу дзяржаўнай маёмасці, але паколькі там знаходзіліся людзі, адмовіўся ад выканання свайго намеру і, будучы нікім не заўважаны, выйшаў са школы.

У падобных выпадках суды часам памылкова лічаць адмову ад злачынства вымушанай, а не добраахвотнай. Гэтыя памылкі неаднаразова даводзілася выпраўляць вышэйстаячым судовым інстанцыям. Таму ацэнка канкрэтнай сітуацыі ў кожным выпадку зводзіцца да выяснення пытання: ці мог абвінавачаны ці падсудны пры дадзеных акалічнасцях давесці злачынства да канца. Толькі тады, калі прадаўжэнне пачатага злачынства не толькі стала больш цяжкім, але і фактычна немагчымым, адмова ад яго павінна прызнавацца вымушанай, а не добраахвотнай. Для атрымання адказу на гэта галоўнае пытанне трэба ўсебакова ўлічваць характар пачатага злачынства, месца і час яго здзяйснення, суб'ектыўнае ўспрыманне гэтых акалічнасцей дзеючай асобай. Напр., узняты пацярпеўшай пры спробе яе згвалтавання ў бязлюдным месцы і ноччу крык аб дапамозе не пазбаўляе вінаватага, задумаўшага гэтае злачынства, магчымасці яго прадоўжыць, а тыя ж дзеянні пацярпеўшай днём, калі навокал знаходзяцца людзі, якія рэальна могуць пачуць крык і прыйсці жанчыне на дапамогу, ці ва ўсякім разе пазней даць следчым органам або суду праўдзівыя паказанні аб убачаным ці пачутым, успрымаюцца злачынцам як перашкода прадаўжэнню ім пачатага злачынства і, значыць, робяць адмову ад яго вымушанай.

Добраахвотная адмова магчымая да выканання складу скончанага злачынства, у тым ліку ўсечанага (напр., пры бандытызме добраахвотная адмова немагчымая ўжо з моманту стварэння банды, нават калі яна яшчэ і не ўчыніла ніводнага нападу). Існуе пункт гледжання (сярод тэарэтыкаў і юрыстаў-практыкаў), згодна з якім немагчымая добраахвотная адмова таксама пры скончаным замаху, паколькі злачынцам ужо выкананы дзеянні, якія маглі выклікаць наступленне грамадска небяспечных вынікаў. У гэтым выпадку прадухіленне наступлення гэтых вынікаў шляхам актыўных дзеянняў (дача працяддзя і г.д.) павінна разглядацца як дзейнае раскаянне.

Добраахвотная адмова – гэта адмова ад прадаўжэння пачатага злачынства. Яна выражаецца ў тым, што асоба спыняе далейшае ўчыненне злачыннага дзеяння. Гэта можа суправаджацца ўчыненнем тых ці іншых актыўных дзеянняў (напр., пасля набыцця ці прыстасавання адпаведных прылад для ўчынення злачынства асоба знішчае ці выкідвае іх). Звычайна ўчыненне пры добраахвотнай адмове такіх дзеянняў мае мэтай укрывальніцтва слядоў злачынства. Аднак і ў гэтым выпадку добраахвотная адмова выражаецца ва ўстрыманні ад учынення тых яшчэ не выкананых дзеянняў, якія неабходныя для завяршэння пачатага злачынства. Названыя вышэй актыўныя дзеянні суправаджаюць добраахвотную адмову, але яны не абавязковыя для вызвалення ад крымінальнай адказнасці за падрыхтаванне ці замах.

Магчымыя выпадкі, калі аднаўленне першапачатковага стану рэчаў з'яўляецца формай устрымання ад нанясення шкоды аб'екту, г.зн. ад прычынення жаданых раней грамадска небяспечных вынікаў. Гэта выпадкі, калі працэс прычынення гэтых вынікаў яшчэ не пачаўся, але ўжо створана магчымасць іх наступлення пры наяўнасці адпаведных умоў, якія не залежаць ад самога суб'екта. Пакуль гэтыя ўмовы не з'явіліся, асоба, пачаўшая ўчыненне злачынства, можа аднавіць першапачатковы стан рэчаў шляхам ліквідацыі зробленых ёю змяненняў у аб'ектыўным свеце. Напр., суб'ект, які паставіў атручаны напітак у такім месцы, адкуль яго магла забраць і выпіць намечаная ахвяра, адмаўляецца ад

свайго першапачатковага намеру атруціць гэтага чалавека і забірае атручанае пітво назад. У гэтым і ў падобных выпадках суб'ект устрымліваецца ад прадаўжэння пачатага злачынства і яго дзеянні трэба разглядаць як добраахвотную адмову ад учынення злачынства. На самой справе, для атручвання чалавека неабходна, каб атрута была ўведзена ў арганізм пацярпеўшага. Але калі гэта ўжо зроблена, маецца скончаны замах на забойства, а значыць добраахвотная адмова выключаецца, хоць бы вінаваты шляхам запрашэння ўрача ці дачы процідддзя садзейнічаў прадухіленню небяспечнага выніку яго дзеянняў.

Прыняцце злачынцам мер па прадухіленню грамадска небяспечных вынікаў яго дзеянняў называецца дзейным раскаяннем. Грамадская небяспечнасць дзеяння ў гэтых выпадках не перастае існаваць, паколькі вінаваты ўчыніў такое дзеянне, якое аб'ектыўна ўжо магло выклікаць наступленне грамадска небяспечных вынікаў. Дзеянні, накіраваныя на прадухіленне апошніх, маглі і не дасягнуць гэтай мэты (выкліканы пры атручэнні ўрач прыбыў са спазненнем ці аказаўся недастаткова вопытным для выратавання пацярпеўшага і г.д.).

У Асаблівай частцы Крымінальнага кодэкса прадугледжана некалькі выпадкаў абавязковага вызвалення ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з дзейным раскаяннем вінаватага пры ўчыненні некаторых злачынстваў. Напр., асоба, якая дала хабар, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі яна пасля дачы хабару добраахвотна заявіла органам улады аб тым, што здарылася (ч.3 арт.170 КК). У гэтым і іншых спецыяльна ўказаных у артыкулах Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса выпадках дзейнае раскаянне па сваіх прававых выніках прыраўноўваецца да добраахвотнай адмовы ад злачынства. У адносінах да астатніх злачынстваў дзейнае раскаянне з'яўляецца акалічнасцю, якая, па агульнаму правілу, толькі змякчае адказнасць (у асобных выпадках суд можа нават палічыць яго акалічнасцю, якая вызваляе ад пакарання). Прадугледжаная крымінальным законам магчымасць вызвалення ад пака-

рання ці яго змякчэння пры дзейным раскаянні стварае стымул для прадухілення вінаватым шкодных вынікаў злачынства пасля таго, як учынены дзеянні, якія маглі выклікаць іх наступленне, і ў сувязі з гэтым добраахвотная адмова ад злачынства ўжо стала немагчымай.

Дзейнае раскаянне магчымае не толькі ў выпадках скончанага замаху, але і тады, калі ў дзеяннях вінаватага маецца склад скончанага злачынства. Напр., зрабіўшы замах на жыццё работніка міліцыі, народнага дружынніка, ваеннаслужачага ці іншай асобы ў сувязі з выкананнем імі абавязкаў па ахове грамадскага парадку, вінаваты прымае меры па прадухіленню наступлення смерці пацярпеўшага (дастаўляе яго ў бальніцу, перавязвае рану і г.д.).

Да дзейнага раскаяння па сваіх прыкметах набліжаюцца адмова ад паўторнага замаху і прыняцце мер па ўстараненню нанесенай злачынствам шкоды для тых ці іншых інтарэсаў.

Адмова ад паўтарэння замаху маецца ў тых выпадках, калі асоба, учыніўшая скончаны замах і маючая магчымасць паўтарыць яго, не робіць гэтага (напр., асоба, якая стрэліла ў пацярпеўшага з пісталета, зараджанага некалькімі патронамі, і прамахнулася, добраахотна адмаўляецца ад паўтарэння стрэлаў, хоць мела такую магчымасць). Адмова ад паўтарэння замаху не можа разглядацца як добраахвотная адмова ад учынення злачынства, бо злачынец выкананымі дзеяннямі ўжо мог прычыніць грамадска небяспечныя вынікі. Непаўтарэнне новага замаху пры наяўнасці ў злачынца магчымасці яго паўтарыць можа быць улічана судом пры вызначэнні пакарання як акалічнасць, якая сведчыць аб меншай грамадскай небяспецы асобы, рабіўшай замах.

Добраахвотнае прыняцце мер для ўстаранення нанесенай шкоды (аднаўленне ранейшага стану рэчаў, напр., вяртанне ўкрадзенага прадмета, кампенсацыя нанесенай шкоды і г.д.), па агульнаму правілу, таксама не ўстараняе крымінальнай адказнасці за учыненне злачынства. Такія паводзіны суб'екта, якія не з'яўляюцца добраахвотнай адмовай ад злачынства, улічваюцца судом у якасці акалічнасцей, змякчаючых адказнасць (п. 1 ч.1 арт.37 КК).

## Літаратура:

Дурманов Н.Д. Стадии совершения преступления по советскому уголовному праву. М., 1955; Иванов В.Д. Ответственность за покушение на преступление. Караганда, 1974; Кузнецова Н.Ф. Ответственность за приготовление к преступлению и покушение на преступление по советскому уголовному праву. М., 1958; Панько К. А. Добровольный отказ от преступления по советскому уголовному праву. Воронеж, 1975; Тер–Акопов А.А. Добровольный отказ от совершения преступления. М., 1982; Тишкевич И.С. Приготовление и покушение по советскому уголовному праву (понятие и наказуемость). М., 1958.

# Глава 11

# САЎДЗЕЛ У ЗЛАЧЫНСТВЕ

## §1. Паняцце саўдзелу

Саўдзелам у злачынстве прызнаецца наўмысны сумесны ўдзел дзвюх або больш асоб ва ўчыненні наўмыснага злачынства. Пры сумеснай наўмыснай злачыннай дзейнасці адбываецца аб'яднанне намаганняў некалькіх асоб, што аблягчае ўчыненне злачынства і ўтойванне яго слядоў. Таму саўдзел у злачынстве, як правіла, павышае грамадскую небяспеку ўчыненага.

Аднак саўдзел у злачынстве вылучаецца ў самастойны інстытут не з мэтай узмацніць крымінальную адказнасць за больш грамадска небяспечную дзейнасць. Гэта мэта рэалізуецца ў Асаблівай частцы КК, у пэўных артыкулах якой устанаўліваецца павышаная адказнасць за злачынствы, учыненыя ў саўдзеле. Апрача таго, заканадаўства прызнавала і прызнае абцяжарваючай адказнасць акалічнасцю ўчыненне злачынства арганізаванай групай. Не стварае інстытут саўдзелу і якіх-небудзь асаблівых падстаў крымінальнай адказнасці. У чым бы ні выяўляўся саўдзел, неабходна ўстанавіць вінаватасць кожнага саўдзельніка ў здзяйсненні грамадска небяспечных дзеянняў, якія прызнаюцца злачыннымі. Спецыяльнае прызначэнне інстытута саўдзелу заключаецца ў тым, што, па-першае, праз яго вызначаецца кола асоб, якія не з'яўляюцца выканаўцамі злачынства, але якія нясуць адказнасць разам з імі за злачынства і, па-другое, устанаўліваюцца парадак і межы іх адказнасці і асаблівасці прызначэння пакарання такім асобам.

Саўдзел як своеасаблівая форма злачыннай дзейнасці характарызуецца наступнымі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прыкметамі: удзелам у злачынстве дзвюх ці больш асоб; сумесным здзяйсненнем імі злачынства; наўмысным характарам злачыннай дзейнасці.

Аб'ектыўнымі прыкметамі саўдзелу з'яўляюцца: удзел у злачынстве дзвюх і больш асоб і іх сумесная злачынная дзейнасць. Найменшая колькасць вінаватых пры саўдзеле– дзве асобы. Кожная з іх павінна дасягнуць устаноўленага законам узросту і быць у стане свядомасці.

Сумеснасць дзейнасці як прыкмета саўдзелу мае аб'ектыўны і суб'ектыўны бок: з аб'ектыўнага боку – сумесная дзейнасць дзвюх ці больш асоб пры саўдзеле выяўляецца ў тым, што дзеянні ўсіх удзельнікаў у злачынстве ўзаемна абумоўліваюць і дапаўняюць адзін аднаго. Гэта значыць, што дзеянні аднаго саўдзельніка ствараюць неабходныя ўмовы для дзеянняў другога саўдзельніка. Няма сумеснасці дзеянняў, а такім чынам і саўдзелу, пры выпадковым супадзенні злачынных замахаў некалькіх асоб, якія дзейнічаюць хоць адначасова, але самастойна.

Сумеснасць дзеянняў можа выявіцца ў тым, што ўсе саўдзельнікі сваімі дзеяннямі непасрэдна ўдзельнічаюць у здзяйсненні злачынства (савыканаўства), ці адны саўдзельнікі непасрэдна здзяйсняюць дзеянні, якія ўтрымліваюць склад злачынства, а другія – толькі ствараюць умовы або аблягчаюць здзяйсненне злачынства, ці ўдзельнічаюць у стварэнні арганізаванай групы або злачыннай арганізацыі.

У злачынствах з матэрыяльным складам сумеснасць дзеянняў пры саўдзеле выражаецца таксама ў наступленні агульнага для ўсіх злачыннага выніку, які дасягаецца агульнымі намаганнямі некалькіх асоб. Гэтыя намаганні могуць быць накіраваныя на непасрэднае здзяйсненне злачынства або на садзейнічанне яму. У абодвух выпадках злачынны вынік з'яўляецца агульным і адзіным вынікам сумеснай дзейнасці ўсіх удзельнікаў злачынства. Калі няма сумеснай дзейнасці, няма саўдзелу, а ў наяўнасці індывідуальная злачынная дзейнасць.

Прыкметай сумеснай злачыннай дзейнасці з'яўляецца наяўнасць прычыннай сувязі паміж дзеяннямі кожнага саўдзельніка і наступіўшым злачынным вынікам. Пры саўдзеле дзеянні кожнага паасобку не выклікаюць злачыннага выніку,

ён з'яўляецца рэзультатам агульных намаганняў усіх асоб, якія ўдзельнічаюць у злачынстве. Дзеянні асобных саўдзельнікаў з'яўляюцца, па сутнасці, складаемымі агульнай прычыны. Любая грамадска небяспечная дзейнасць, якая праводзіцца ў сувязі са здзяйсненнем якога–небудзь злачынства, але не знаходзіцца ў прычыннай сувязі з ім, не можа разглядацца як саўдзел.

Для саўдзелу патрабуецца не толькі знешняе адзінства сумесна дзеючых асоб, але і іх унутранае адзінства, наяўнасць пэўнай псіхічнай супольнасці, узгодненасць іх дзеянняў. Такім чынам, саўдзел як сумесная злачынная дзейнасць з суб'ектыўнага боку характарызуецца толькі наўмыснай віной. Інтэлектуальная прыкмета намеру пры саўдзеле ўключае ўсведамленне грамадска небяспечнага характару свайго дзеяння; усведамленне таго, што яно далучаецца да злачыннай дзейнасці іншай асобы; усведамленне значэння гэтых дзеянняў для дасягнення злачыннага выніку; прадбачанне наступлення гэтага выніку. Такім чынам, асаблівасцю інтэлектуальнай прыкметы намеру пры саўдзеле з'яўляецца ўсведамленне грамадскай небяспекі дзеянняў іншых асоб.

Валявая прыкмета намеру пры саўдзеле характарызуецца жаданнем удзельнічаць у здзяйсненні злачынства сумесна з іншымі асобамі і дабівацца агульнага злачыннага выніку ці дапускаць яго. Сумеснасць задумкі саўдзельнікаў не выключае іх індывідуальнай віны, якая вызначаецца ў залежнасці ад характару, аб'ёму і актыўнасці дзеяння саўдзельнікаў.

Саўдзел у злачынстве звычайна з'яўляецца вынікам змовы, калі ўсе саўдзельнікі ведаюць адзін аднаго. Змова можа быць папярэдняй, калі размяркоўваюцца ролі, узгадняюцца спосабы, метады, час здзяйснення злачынства. Яна можа ўзнікнуць па ходу здзяйснення злачынства. Пагадненне можа быць дасягнута пісьмова, вусна ці шляхам канклюдэнтных дзеянняў. Але змова паміж усімі саўдзельнікамі не з'яўляецца абавязковай прыкметай саўдзелу. Магчымы выпадкі, калі адзін з саўдзельнікаў, (напр., падбухторшчык) можа не ведаць аб дзейнасці іншых (напр., памагатага), але ва ўсіх выпадках ён

інфармаваны аб злачыннай дзейнасці выканаўцы; а выканаўца ведае, што яму садзейнічае хоць адна асоба.

Напр., А., знаходзячыся ў варожых адносінах з І., угаварыў свайго знаёмага С. за плату забіць І. Апошні, згадзіўшыся, у сваю чаргу без ведама А. звярнуўся да В. з просьбай даць яму пісталет для ўчынення забойства. У дадзеным выпадку змовы паміж усімі саўдзельнікамі не было, але А. і В. былі інфармаваны аб злачыннай дзейнасці С. (выканаўцы), а апошні ведаў аб падбухторшчыку А. і памагатым В. Калі няма такой інфармаванасці, то няма і саўдзелу, хоць дзеянні кожнага могуць знаходзіцца ў прычыннай сувязі са злачынным вынікам і аб'ектыўна садзейнічаць яго наступленню.

Наўмысны характар злачыннай дзейнасці саўдзельнікаў не азначае супадзення іх матываў. У большасці выпадкаў гэтыя матывы адзіныя для ўсіх саўдзельнікаў, але яны могуць быць і рознымі. Так, пры прычыненні цялесных пашкоджанняў стымулам да дзеянняў аднаго можа быць рэўнасць, другога – помста. У падобных выпадках пытанне вырашаецца такім чынам: калі матыў не ўваходзіць у заканадаўчую характарыстыку здзяйсняемага саўдзельнікамі злачынства (напр., прычыненне цялесных пашкоджанняў), іх адрозненне не ўплывае на кваліфікацыю дзеянняў саўдзельнікаў. Калі матыў злачынства ўваходзіць у заканадаўчую характарыстыку злачынства, то саўдзельнік павінен быць інфармаваны аб матывах, якімі кіраваўся выканаўца. У процілеглым выпадку ён нясе адказнасць у адпаведнасці з уласнымі матывамі.

Напр., калі Н. здзяйсняе забойства з карыслівых намераў, а К., ведаючы аб матывах Н., садзейнічае яму, К. прызнаецца саўдзельнікам забойства з карыслівай мэтай. Калі К. не інфармаваны аб матывах Н. і сам дзейнічае па матывах рэўнасці, то ён не можа несці крымінальную адказнасць за карыслівае забойства.

Саўдзел магчымы толькі пры здзяйсненні наўмысных злачынстваў. Гэта значыць, што ўсе саўдзельнікі дзейнічаюць наўмысна і сумесна здзяйсняюць наўмыснае злачынства. Адсутнасць намеру на садзейнічанне здзяйсненню злачынства выключае саўдзел.

Пры неасцярожнай злачыннай дзейнасці, якая характарызуецца іншымі псіхалагічнымі працэсамі (недапушчэнне выніку, у дадзеным канкрэтным выпадку, пры легкадумнасці і непрадбачанні яго пры нядбайнасці) саўдзел немагчымы. Калі агульны злачынны вынік прычынены сумеснымі неасцярожнымі дзеяннямі некалькіх асоб, то кожны з іх адказвае за неасцярожнае злачынства. Неасцярожны ўдзел у наўмысна здзейсненым выканаўцам злачынстве таксама не стварае саўдзел. Яно не цягне крымінальнай адказнасці, за выключэннем выпадкаў, калі створаны самастойны склад злачынства. Напр., як неасцярожнае злачынства караецца нядбайнае хаванне агнястрэльнай зброі, калі яго выкарыстала іншая асоба для здзяйснення наўмыснага злачынства. Няма саўдзелу і пры наўмысным удзеле ў злачынстве, здзейсненым па неасцярожнасці.

## §2. Віды саўдзельнікаў

У залежнасці ад таго, якую ролю саўдзельнікі выконваюць у ажыццяўленні адзінай злачыннай задумы і дасягненні адзінага злачыннага выніку, адрозніваюцца наступныя віды саўдзельнікаў: выканаўца, арганізатар, падбухторшчык і памагаты.

**Выканаўцам** прызнаецца асоба, якая непасрэдна ўчыніла злачынства. Ім з'яўляецца любая асоба, якая прымае непасрэдны ўдзел у выкананні тых дзеянняў, што ствараюць аб'ектыўны бок дадзенага злачынства, а таксама якая здзейсніла злачынства пры пасрэдніцтве іншых асоб, што не падлягаюць у адпаведнасці з законам крымінальнай адказнасці.

Выканаўца злачынства павінен быць у стане свядомасці і дасягнуць прадугледжанага ў законе ўзросту. У злачынствах, якія могуць быць здзейснены толькі спецыяльным суб'ектам, выканаўца павінен валодаць прыкметамі такога суб'екта. Так выканаўцам злоўжывання ўладай можа быць толькі службовая асоба.

Судовая практыка ведае выпадкі, калі аб'ектыўны бок злачынства выконваецца не непасрэдна самім выканаўцам, а пры дапамозе наўмыснага выкарыстання ім невінаватых

або неасцярожных дзеянняў іншай асобы (пасрэднае выкананне). Па знешніх прыкметах такое выкананне нагадвае саўдзел, але не з'яўляецца ім, таму што асоба, рукамі якой здзяйсняецца наўмыснае злачынства, не ўсведамляе грамадскай небяспекі сваіх паводзін, не хоча ці не дапускае злачыннага выніку. Пры непасрэдным выкананні да крымінальнай адказнасці як выканаўца прыцягваецца асоба, якая наўмысна выкарыстала ці неасцярожныя дзеянні асоб, ці дзеянні асоб, якія наогул не могуць несці крымінальную адказнасць.

Пасрэднае выкананне мае месца ў наступных выпадках:

а) калі грамадска небяспечныя дзеянні выконваюцца асобай, не валодаючай уласцівасцямі суб'екта злачынства (у стане бессвядомасці або асобай, якая не дасягнула ўказанага ў законе ўзросту). Тут прыцягваецца да крымінальнай адказнасці як выканаўца асоба, пад уплывам якой псіхічнахворы або малалетні здзяйсняў гэтыя дзеянні;

б) калі злачынныя дзеянні здзяйсняюцца ў выніку псіхічнага прымусу, які выклікаў стан крайняй неабходнасці. У такім выпадку як выканаўца злачынства да крымінальнай адказнасці прыцягваецца асоба, якая прымусіла іншую зрабіць злачыннае дзеянне. Так, вартаўнік, які пад пагрозай зброі адкрыў склад і нагрузіў машыну матэрыяльнымі каштоўнасцямі, не нясе крымінальнай адказнасці, таму што ён дзейнічаў у стане крайняй неабходнасці. Выканаўца ў дадзеным выпадку – асоба, якая прымусіла яго. Прымус, які не выклікаў стан крайняй неабходнасці, не выключае саўдзелу: асоба, якая прымусіла, нясе адказнасць як падбухторшчык, а прымушаны – як выканаўца злачынства;

в) калі асоба наўмысна выкарыстоўвае неасцярожныя ці невінаватыя паводзіны іншых асоб. У гэтым выпадку яна з'яўляецца выканаўцам злачынства, а асоба, якая прычыніла шкодныя вынікі, не нясе адказнасці пры ўмове, што ў яе дзеяннях няма віны, ці нясе адказнасць за неасцярожнае злачынства, калі гэтыя вынікі — рэзультат яе неасцярожнасці.

Дзеянні выканаўцы кваліфікуюцца артыкулам КК, які ўстанаўлівае адказнасць за здзейсненае ім злачынства.

Найбольш небяспечным пры саўдзеле з'яўляецца **арганізатар** –

асоба, якая арганізавала ўчыненне злачынства ці якая кіравала яго здзяйсненнем. З аб'ектыўнага боку дзеянні арганізатара характарызуюцца арганізацыяй здзяйснення злачынства ці кіраўніцтвам ім у ходзе здзяйснення. Арганізацыя ўчынення злачынства – гэта вярбоўка саўдзельнікаў, навучанне іх злачынным навыкам, выпрацоўка сувязі паміж саўдзельнікамі, забеспячэнне прыладамі і сродкамі здзяйснення злачынства, распрацоўка плана злачынства і г.д. Кіраўніцтва здзяйсненнем злачынства – гэта размеркаванне роляў паміж саўдзельнікамі, дача ім указанняў у ходзе здзяйснення злачынства і г.д. Для прызнання асобы арганізатарам злачынства не абавязкова здзяйсненне ім усіх вышэй названых дзеянняў, дастаткова аднаго з іх.

З суб'ектыўнага боку арганізацыйная дзейнасць заўсёды з'яўляецца наўмыснай, прычым намер можа быць толькі прамы: арганізатар усведамляе, што ён аб'ядноўвае і накіроўвае злачынную дзейнасць іншых саўдзельнікаў, разумее характар злачынстваў, якія здзейснены пад яго кіраўніцтвам, прадбачыць злачынны вынік сумесных злачынных дзеянняў і жадае гэтага.

Ініцыятарам злачынства з'яўляецца падбухторшчык. **Падбухторшчыкам** прызнаецца асоба, якая схіліла каго–небудзь да ўчынення злачынства. Небяспека падбухторвання заключаецца ў тым, што падбухторшчык аказвае згубны ўплыў на няўстойлівых асоб. Асабліва небяспечнае падбухторванне, калі гэтымі асобамі з'яўляюцца непаўналетнія.

З аб'ектыўнага боку падбухторванне заключаецца ў стымуляванні рашучасці іншай асобы здзейсніць канкрэтнае злачынства. Схіліць асобу ўчыніць злачынства можна толькі шляхам актыўных дзеянняў: просьбамі, перакананнем, подкупам, падманам, пагрозай і фізічным насіллем. Аднак пагроза або фізічнае насілле могуць разглядацца як падбухторванне толькі ў выпадку, калі падбухторваемы яшчэ можа выбіраць, як паводзіць сябе. У выпадку, калі воля асобы поўнасцю падаўлена, асоба аказваецца ў стане крайняй неабходнасці і таму дзейнічае супраць сваёй волі. У падобных выпадках падбухторшчык ператвараецца ў пасрэднага выканаўцу, а

падбухторваемы з'яўляецца прыладай выканання чужой волі, у выніку чаго апошні не можа несці крымінальную адказнасць.

Падбухторшчык заўсёды схіляе вызначаную асобу да здзяйснення канкрэтнага злачынства. Заклік да злачыннай дзейнасці наогул або звернуты да нявызначанага кола асоб не з'яўляецца падбухторваннем. Пры пэўных умовах такія дзеянні могуць стварыць самастойны склад злачынства (напр., арт.67 КК).

З суб'ектыўнага боку падбухторванне заўсёды з'яўляецца наўмыснай дзейнасцю: падбухторшчык разумее, што выклікае ў вызначанай асобы рашучасць здзейсніць канкрэтнае злачынства, усведамляе яго небяспечнасць, прадбачыць сумесны злачынны вынік і жадае гэтага. Для наяўнасці падбухторвання не маюць значэння матывы, якімі кіраваўся падбухторшчык. Таму ён нясе адказнасць і ў тым выпадку, калі схіляе іншую асобу здзейсніць злачынства з мэтай выкрыць яго (правакацыя злачынства). Пасрэдным выкананнем, а не падбухторваннем таксама з'яўляецца схіленне асобы да злачынства шляхам падману адносна характару і грамадскай небяспекі здзейсненых ім дзеянняў. Так, калі ад асобы, якая прыцягваецца да крадзяжу прыватнай маёмасці, утойваецца, што гэта маёмасць чужая, то той, хто ўцягнуў у гэты крадзёж, шляхам падману, разглядаецца як выканаўца крадзяжу чужой прыватнай маёмасці.

Дзеянні падбухторшчыка па знешніх прыкметах падобныя да дзеяння арганізатара, але арганізатар узначальвае саўдзельнікаў, аб'ядноўвае іх, ажыццяўляе кіраўніцтва здзяйсненнем злачынства; дзеянні ж падбухторшчыка абмяжоўваюцца толькі схіленнем канкрэтнай асобы да здзяйснення канкрэтнага злачынства.

**Памагаты** – гэта асоба, якая садзейнічае злачынству парадамі, указаннямі, прадастаўленнем сродкаў або ўстараненнем перашкод; таксама асоба, якая папярэдне абяцала схаваць злачынца, прылады і сродкі ўчыненага злачынства, сляды злачынства або прадметы, якія набыты злачынным шляхам; таксама асоба, якая абяцала папярэдне набыць або збыць такія прадметы.

Памагаты ў параўнанні з іншымі саўдзельнікамі – гэта асоба, якая выконвае дапаможную ролю. З аб'ектыўнага боку дапамаганне выяўляецца ў садзейнічанні выкананню злачынства або ўтойванні его. Дапамаганне звычайна – гэта актыўныя дзеянні, але яна можа быць і бяздзеяннем.

Прыкладны пералік спосабаў садзейнічання здзяйсненню злачынства ёсць у законе. Гэты пералік ахоплівае ўсе тыповыя спосабы дапамагання.

Дапамаганне можа быць фізічным і інтэлектуальным. Фізічнае дапамаганне выяўляецца ў прадастаўленні прылад і сродкаў для здзяйснення злачынства або ва ўстараненні перашкод, яно накіравана на аказанне дапамогі выканаўцу па ходу падрыхтавання або ў ходзе здзяйснення злачынства.

Інтэлектуальнае дапамаганне выяўляецца ў парадах, указаннях выканаўцы, якія садзейнічаюць здзяйсненню злачынства (напр., адносна месца, часу, спосабу здзяйснення злачынства, месца набыцця прылад для здзяйснення злачынства і г.д.).

Разнавіднасцю інтэлектуальнага дапамагання з'яўляецца папярэдне дадзенае абяцанне схаваць злачынца, прылады і сродкі здзяйснення злачынства, сляды злачынства або прадметы, набытыя злачынным шляхам. Укрывальніцтва мае месца пасля таго, як злачынства здзейснена, а злачынец, які папярэдне атрымаў абяцанне, дзейнічае ўпэўнена, і само абяцанне ператвараецца ў адну з умоў, якія садзейнічаюць наступленню злачыннага выніку.

Укрывальніцтва прызнаецца дапамаганнем і ў выпадках, калі яно да здзяйснення злачынства не было абяцана прама, але ў сілу яго сістэматычнага здзяйснення або па іншых прычынах давала выканаўцу злачынства падставу разлічваць на падобныя дзеянні і ўкрывальнік гэта ўсведамляе.

Інтэлектуальнае дапамаганне знешне можа быць падобным да падбухторвання, таму што ў абодвух выпадках выканаўцу даюцца парады і ўказанні. Але пры падбухторванні парада–прапанова мае мэту схіліць іншую асобу здзейсніць злачынства, а пры інтэлектуальным дапамаганні даецца парада–кансультацыя асобе, якая наважылася здзейсніць злачынства, і мае мэту

толькі садзейнічаць рэалізацыі гэтай задумкі.

З суб'ектыўнага боку дапамаганне можа быць толькі наўмысным: памагаты ўсведамляе, што ён сваімі дзеяннямі садзейнічае здзяйсненню канкрэтнага злачынства, прадбачыць злачынны вынік і жадае або дапускае яго. Неасцярожнае аказанне садзеяння выканаўцу не з'яўляецца дапамаганнем. Пры пэўных абставінах яно можа выклікаць крымінальную адказнасць як за самастойнае злачынства.

## §3. Формы саўдзелу

**Формы саўдзелу** – гэта структура сувязі паміж асобамі, якія сумесна ўдзельнічаюць у здзяйсненні злачынства, спосабы іх узаемадзеяння і аб'яднанне намаганняў для дасягнення агульнага злачыннага выніку.

Форма саўдзелу ў злачынстве ўплывае на кваліфікацыю дзеянняў саўдзельнікаў і межы іх адказнасці, для чаго ўстанаўленне яе ў кожным выпадку з'яўляецца абавязковым.

Адрозніваюць чатыры формы саўдзелу: савыканаўства (просты саўдзел); саўдзел з выкананнем розных роляў (складаны саўдзел); арганізаваная група і злачынная арганізацыя (злачыннае згуртаванне).

**Савыканаўства** – гэта такая форма сумеснай злачыннай дзейнасці, пры якой аб'ектыўны бок складу злачынства выконваецца сукупнымі намаганнямі асоб, якія ўдзельнічаюць у злачынстве. Аб'ём злачыннай дзейнасці кожнага ўдзельніка можа быць аднолькавым або розным. Паміж асобнымі ўдзельнікамі можа быць падзел злачынных дзеянняў, якія носяць чыста тэхнічны характар, але савыканаўца заўсёды выконвае хоць частку дзеянняў, што ўваходзяць у аб'ектыўны бок здзейсненага злачынства, якія разам ствараюць яго. Савыканаўства, як правіла, узнікае без папярэдняй змовы, сувязь паміж савыканаўцамі не носіць устойлівага характару. Савыканаўства характэрна для такіх відаў злачынстваў, як хуліганства, прычыненне цялесных пашкоджанняў і іншых злачынстваў, якія здзяйсняюцца, як правіла, з раптоўна ўзнікшым намерам. Заканадаўца ў адпаведных выпадках учыненне злачынства савыканаўцамі па папярэдняй змове

разглядае ў якасці кваліфікуючай прыкметы злачынства (гл., напр., ч.2 арт.87, ч.2 арт.90).

Пры савыканаўстве ўсе ўдзельнікі з'яўляюцца выканаўцамі, што вызначае і кваліфікацыю здзейсненага імі злачынства: дзеянні кожнага кваліфікуюцца артыкулам, які прадугледжвае адказнасць за дадзенае злачынства.

**Складаны саўдзел** характарызуецца тым, што вінаватыя выконваюць шматлікія ролі ў сумесна ўчыненым злачынстве, адны здзяйсняюць дзеянні шляхам, якім непасрэдна ажыццяўляецца склад злачынства; другія садзейнічаюць выканаўцу, прычым гэтае садзейнічанне можа быць розным; у сувязі з гэтым адрозніваюцца арганізатары, падбухторшчыкі і памагатыя.

Дзеянні выканаўцы кваліфікуюцца артыкулам, які прадугледжвае адказнасць за здзейсненае ім злачынства, дзеянні арганізатара, падбухторшчыка і памагатага – па гэтаму ж артыкулу са спасылкай на часткі 4,5 або 6 артыкула 17 КК, які рэгулюе адказнасць асобных відаў саўдзельнікаў. Калі арганізатар, падбухторшчык або памагаты, акрамя выканання сваёй ролі, непасрэдна ўдзельнічае ў здзяйсненні злачынства ў якасці выканаўцы, такой спасылкі не патрабуецца.

**Арганізаваная група** – гэта ўстойлівая, кіруемая група сумесна дзеючых асоб, якія арганізаваліся па папярэдняй змове для неаднаразовага сумеснага здзяйснення злачынстваў. Прычым кожны з саўдзельнікаў усведамляе, што ён дзейнічае ў групе. Такім чынам, арганізаваная група адрозніваецца ад простага савыканання больш моцнымі злачыннымі сувязямі ўдзельнікаў і ўзгодненасцю іх дзеянняў. Для арганізаванай групы характэрныя павышаная ступень узгодненасці злачынных дзеянняў, распрацоўка плана здзяйснення злачынства, кіраўніцтва сумеснымі дзеяннямі як па падрыхтоўцы здзяйснення злачынства, так і па яго ажыццяўленню.

Арганізатар і кіраўнік арганізаванай групы нясуць адказнасць за ўсе здзейсненыя групай злачынствы, калі яны ахоплівaліся іх намерам. Іншыя ўдзельнікі арганізаванай групы нясуць адказнасць толькі за злачынствы, у падрыхтоўцы ці здзяйсненні якіх яны ўдзельнічалі.

Самай небяспечнай формай саўдзелу з'яўляецца **злачынная арганізацыя** (злачыннае згуртаванне). Гэта такое аб'яднанне асоб або арганізаваных груп, якія згуртаваліся для заняткаў злачыннай дзейнасцю ва ўстойлівае структурыраванае аб'яднанне; дзейнасць якога заснавана на падзеле паміж членамі згуртавання і яго злачыннымі структурамі функцый кіраўніцтва, забеспячэння і выканання злачынных мэт арганізацыі.

Злачынства прызнаецца ўчыненым злачыннай арганізацыяй, калі яно здзейснена членам (членамі) гэтай арганізацыі ў мэтах выканання яе злачынных намераў, а таксама па заданню злачыннай арганізацыі асобай, якая не з'яўляецца членам гэтай арганізацыі.

Арганізатары і кіраўнікі злачыннай арганізацыі нясуць адказнасць за ўсе злачынствы, якія здзейснены для выканання злачынных мэт дадзенай арганізацыі і ахоплівaліся іх намерам. Іншыя члены злачыннай арганізацыі нясуць адказнасць толькі за злачынствы, у падрыхтоўцы ці здзяйсненні якіх яны ўдзельнічалі.

## §4. Адказнасць саўдзельнікаў

Крымінальнае права не ўстанаўлівае якіх–небудзь асаблівых падстаў крымінальнай адказнасці пры саўдзеле. Падставы для адказнасці аднолькавыя як за злачынства, якое здзейснена пры саўдзеле, так і за злачынства, якое здзейснена адной асобай. Кожны саўдзельнік нясе самастойную адказнасць у межах індывідуальнай віны.

Аднолькавая падстава адказнасці саўдзельнікаў і асоб, якія здзейснілі злачынства індывідуальна, азначае, што тыя і другія нясуць яе за грамадска небяспечныя віноўныя дзеянні, якія забаронены крымінальным законам. У сувязі з гэтым пры саўдзеле адказнасць кожнага саўдзельніка не знаходзіцца ў залежнасці ад адказнасці выканаўцы, а вызначаецца характарам і ступенню яго асабістага ўдзелу ў здзяйсненні злачынства. Кожны саўдзельнік адказвае за ўчыненае злачынства ў рамках сваёй асабістай віны.

Так, пры вызначэнні пакарання саўдзельніку павінны

быць залічаны ступень і характар удзелу кожнага саўдзельніка ў здзяйсненні злачынства. Ступень і характар удзелу ў сумеснай злачыннай дзейнасці – гэта асаблівасці, якія адрозніваюць саўдзельніка ад асобы, што здзейсніла злачынства індывідуальна, і якія павінны быць улічаны пры вызначэнні пакарання.

Характар удзелу ў сумесна здзейсненым злачынстве – гэта тая роля, якую выконвае саўдзельнік (выканаўца, арганізатар, падбухторшчык, памагаты). Арганізатар, па агульнаму правілу, караецца або больш строга, або аднолькава, як выканаўца, таму што ён арганізаваў злачынства або кіраваў яго здзяйсненнем. Падбухторшчык – гэта ініцыятар злачынства, з–за яго злачынства было задумана, таму ён больш небяспечны, чым памагаты. Памагатаму ў большасці выпадкаў вызначаюць пакаранне больш мяккае, чым іншым саўдзельнікам, паколькі яго ўдзел у злачынстве менш значны.

Ступень удзелу – гэта мера актыўнасці кожнага саўдзельніка ў выкананні сваіх функцый, фактычны ўплыў дадзенай асобы на іншых саўдзельнікаў, важнасць дзеянняў у дасягненні агульнага злачыннага выніку, падрыхтаванасці і інтэнсіўнасці дзеянняў. Так, пры вызначэнні пакарання арганізатару трэба ўлічваць, як ён выконваў свае арганізатарскія функцыі: колькасць саўдзельнікаў, якіх ён уцягнуў у злачынную дзейнасць, ступень яго ўплыву на іх, залежнасць саўдзельнікаў ад арганізатара і іншыя абставіны, якія сведчаць аб асаблівай небяспечнасці гэтай асобы.

Памагаты па фармальнай ролі ў злачынстве – гэта другарадная асоба, але іншы раз яна так энергічна бярэцца за справу, прадастаўляе сродкі, без якіх зусім нельга здзейсніць злачынства, што намнога павышае ступень сваёй грамадскай небяспекі.

Аб'ектыўныя акалічнасці, якія робяць злачынства больш небяспечным, ставяцца ў віну злачынцам, калі ахопліваюцца іх намерам. Так, наўмыснае знішчэнне маёмасці, якое здзейснена агульна небяспечным спосабам, ставіцца ў віну саўдзельнікам, калі такі спосаб знішчэння ахопліваўся іх задумай. Так вырашаецца пытанне аб кваліфікуючых абставінах, якія характарызуюць суб'ектыўны бок дзеянняў

выканаўцы. Напр., забойства жанчыны, якая заведама для вінаватага знаходзілася ў стане цяжарнасці, здзейсненае выканаўцам, ставіцца ў віну і падбухторшчыку і памагатаму, калі яны ведалі аб цяжарнасці пацярпеўшай. Кваліфікуючыя абставіны, якія адносяцца выключна да асоб канкрэтных саўдзельнікаў і характарызуюць ступень грамадскай небяспекі толькі аднаго канкрэтнага злачынца, не могуць уплываць на адказнасць іншых саўдзельнікаў.

Не могуць быць выканаўцамі і савыканаўцамі злачынства са спецыяльным суб'ектам асобы, якія не маюць прыкмет гэтага суб'екта. Але прыватныя асобы могуць быць саўдзельнікамі злачынстваў са спецыяльным суб'ектам. Гэта значыць, што прыватныя асобы могуць выконваць ролю арганізатара, падбухторшчыка і памагатага ў сумесна, напр., са службовай асобай, здзейсненым злачынстве. Гэтак жа вырашаецца пытанне аб магчымасці саўдзелу ў іншых злачынствах са спецыяльным суб'ектам.

**Эксцэс выканаўцы** – гэта ўчыненне злачынцам такіх злачынных дзеянняў, якія па спосабу здзяйснення або характару і аб'ёму не ахоплівaліся намерам іншых саўдзельнікаў. Здзяйсненне злачынства больш цяжкага, чым прадугледжвалася, выкарыстанне больш небяспечных прадметаў і сродкаў здзяйснення злачынства без узгодненасці з іншымі саўдзельнікамі не павінна ставіцца ім у віну. Калі арганізатар, падбухторшчык і памагаты не ўсведамляюць новых фактычных акалічнасцей здзяйснення злачынства выканаўцам, іх дзеянні ў гэтай частцы губляюць віноўную і прычынную сувязь са здзейсненым злачынствам. Адказнасць саўдзельнікаў у падобных выпадках абмяжоўваецца тым злачынствам, якому яны садзейнічалі або да якога падбухторвалі. У сувязі з гэтым, напр., падбухторшчык або памагаты нясуць адказнасць толькі за крадзёж, хоць пры гэтым выканаўца здзейсніў разбой.

Дзеянні арганізатара, падбухторшчыка, памагатага могуць аказацца няўдалымі. У такім выпадку ідзе размова аб няўдалым саўдзеле. **Няўдалы саўдзел** выяўляецца ў няўдалай арганізацыйнай дзейнасці, няўдалым падбухторванні,

няўдалым дапамаганні.

Няўдалая арганізацыйная дзейнасць – гэта спробы арганізатара аб'яднаць асоб для здзяйснення злачынства, якія аказаліся безвыніковымі ў сувязі з тым, што яны (асобы) зусім адмовіліся ад прапановы арганізатара або, згадзіўшыся, потым ухіліліся ад удзелу ў здзяйсненні злачынства.

Няўдалае падбухторванне – гэта спроба схіліць выканаўцу да злачынства, якая аказалася безвыніковай таму, што выканаўца не паспеў выканаць злачынныя дзеянні або застаўся непахісным, або добраахвотна адмовіўся працягваць пачатую злачынную дзейнасць.

Няўдалае дапамаганне ў наяўнасці ў выпадках, калі аказваецца садзейнічанне выканаўцу, які чамусьці не здзейсніў злачынства (напр., добраахвотна адмовіўся прадоўжыць пачатую дзейнасць); выканаўцу, які ўжо здзейсніў злачынства (запозненае дапамаганне); асобе, якая зусім не збіралася здзейсніць злачынства (памылка памагатага).

Пералічаныя выпадкі не ствараюць саўдзелу, таму што няма асноўнай прыкметы саўдзелу – сумеснай злачыннай дзейнасці. Але няўдалыя спробы арганізатара, падбухторшчыка і памагатага з'яўляюцца грамадска небяспечнымі дзеяннямі, якія здзейсніў вінаваты, і па сутнасці з'яўляюцца падрыхтаваннем да здзяйснення злачынства. Выключэннем з'яўляецца адказнасць за арганізацыйную дзейнасць, якая накіравана на падрыхтаванне або здзяйсненне асабліва небяспечных дзяржаўных злачынстваў ці бандытызму. З прычыны асаблівай небяспекі такіх злачынстваў сам факт арганізатарскай дзейнасці, незалежна ад таго, ці атрымалася яна, лічыцца закончаным злачынствам.

Пры сумеснай злачыннай дзейнасці магчымыя выпадкі, калі ўсе саўдзельнікі або некаторыя з іх добраахвотна адмовіліся ад пачатай злачыннай дзейнасці. Калі ад такой дзейнасці добраахвотна адмаўляюцца ўсе саўдзельнікі, з іх здымаецца адказнасць за плануемае злачынства, і яны нясуць адказнасць толькі за дзеянні, якія ўжо здзейснілі, калі апошнія ўтрымліваюць склад злачынства.

Пры добраахвотнай адмове ад пачатай злачыннай дзей-

насці аднаго з савыканаўцаў з яго таксама здымаецца адказнасць за злачынства, якое здзяйснялася, і ён адказвае толькі ў межах учыненага, калі гэта стварае склад якога–небудзь злачынства.

Больш складана вырашаецца пытанне аб адказнасці саўдзельнікаў з розным выкананнем роляў пры добраахвотнай адмове некаторых з іх. Гэта складанасць абумоўлена тым, што злачынны намер усіх саўдзельнікаў ажыццяўляецца адным з іх – выканаўцам, ад паводзін якога ў многім залежыць магчымасць добраахвотнай адмовы арганізатара, падбухторшчыка і памагатага.

Пры добраахвотнай адмове выканаўцы ён вызваляецца ад крымінальнай адказнасці. Але адказ выканаўцы ад працягу злачыннай дзейнасці не вызваляе ад адказнасці іншых саўдзельнікаў. Яны ў такіх выпадках нясуць адказнасць за падрыхтоўку злачынства.

**Добраахвотная адмова** арганізатара, падбухторшчыка і памагатага ад пачатай злачыннай дзейнасці вызваляе іх ад адказнасці пры вызначаных умовах. Так, добраахвотная адмова саўдзельнікаў магчыма да здзяйснення выканаўцам злачынства. Добраахвотная адмова арганізатара або падбухторшчыка заўсёды павінна выяўляцца ў актыўных дзеяннях, якія накіраваны на папярэджванне здзяйснення злачынства выканаўцам. Напр., падбухторшчык можа паспяхова адгаварыць выканаўцу не здзяйсняць злачынства або заявіць органам улады аб злачынстве, якое рыхтуецца, чым папярэдзіць яго здзяйсненне. Добраахвотная адмова памагатага павінна таксама выяўляцца ў актыўных паводзінах, якія нейтралізуюць яго садзейнічанне выканаўцу (напр., забраў зброю, якая была дадзена для здзяйснення забойства). Калі памагаты пакуль не аказаў фактычнай дапамогі выканаўцу, для добраахвотнай адмовы яму дастаткова бяздзейнасці (напр., не прадаставіў прылад для здзяйснення злачынства, без чаго выканаўца не можа здзейсніць яго).

Калі арганізатар, падбухторшчык або памагаты, якія спрабавалі ўстараніць вынікі сваёй дзейнасці, не змаглі прадухіліць злачынства, ад адказнасці яны не вызваляюцца, але арганізаваныя імі меры для прадухілення злачынства з'яўляюцца асновай для змякчэння пакарання.

## §5. Датычнасць да злачынства

**Датычнасць да злачынства** – гэта дзейнасць, якая звязана са злачынствам іншай асобы, але ў адрозненне ад саўдзелу не садзейнічала яму і не стаяла ў прычыннай сувязі са злачынным вынікам. Пры вызначаных умовах такая дзейнасць з'яўляецца грамадска небяспечнай, нягледзячы на тое, што ступень гэтай небяспекі значна меншая, чым пры саўдзеле. Значыць, у адрозненне ад саўдзелу, які караецца ва ўсіх выпадках, датычнасць да злачынства караецца толькі ў выпадках, якія ўказаны ў законе. Датычнасць да злачынства можа выявіцца ў загадзя не абяцаным укрывальніцтве, неданясенні і патуранні.

**Загадзя паабяцанае ўкрывальніцтва** як дзейнасць, якая садзейнічала здзяйсненню злачынства і стаяла ў прычыннай сувязі са злачынным вынікам, з'яўляецца саўдзелам (дапамаганнем). Загадзя не абяцанае ўкрывальніцтва як форма датычнасці да злачынства цягне крымінальную адказнасць толькі ў выпадках, якія ўказаны ў законе, калі яны ствараюць самастойны склад злачынства. Закон дае вычарпальны пералік злачынстваў, пры загадзя не абяцаным укрывальніцтве якіх настае крымінальная адказнасць. Да іх, як правіла, адносяцца найбольш цяжкія злачынствы (гл. арт.861 і 185 КК). У астатніх выпадках загадзя не абяцанае ўкрывальніцтва не з'яўляецца злачынствам.

Загадзя не абяцанае ўкрывальніцтва з аб'ектыўнага боку выяўляецца ў актыўных паводзінах асобы па ўтойванню злачынца, прадметаў і сродкаў здзяйснення злачынства, слядоў злачынства або прадметаў, якія здабыты злачынным шляхам. Такімі паводзінамі могуць быць: прадастаўленне злачынцу месца для ўтойвання, садзейнічанне злачынцу ў перамене яго знешняга выгляду, у знішчэнні плям крыві, у прадастаўленні злачынцу падложных дакументаў і сродкаў для ўцёку, закопванне трупа і іншыя падобныя дзеянні. Укрывальніцтва лічыцца закончаным з моманту здзяйснення ўказаных дзеянняў. Для крымінальнай адказнасці ўсё роўна, калі здзейснена ўкрывальніцтва – адразу пасля ўчынення злачынства або пасля таго, як прайшоў час.

З суб'ектыўнага боку ўкрывальніцтва – заўсёды наўмысная

дзейнасць: укрывальнік усведамляе, якое злачынства здзейснена; усведамляе грамадска небяспечны характар сваіх дзеянняў, якія накіраваны на ўтойванне; прадбачыць, што ў выніку яго дзеянняў вінаваты можа пазбегнуць адказнасці і жадае гэтага. Матывы дзеянняў укрывальніка могуць быць рознымі. Для кваліфікавання злачынства гэта ўсё роўна, і матывы ўлічваюцца толькі пры вызначэні пакарання. Асоба, якая не ўсведамляе, што садзейнічае злачынцу, не можа несці адказнасці за ўкрывальніцтва.

**Неданясенне** – гэта непаведамленне аб рыхтуемым або ўчыненым злачынстве, аб якім дакладна вядома. Неданясенне цягне крымінальную адказнасць толькі ў выпадках, якія вызначаны ў законе, дзе даецца пералік злачынстваў, пры неданясенні аб якіх яно караецца (арт.86 і 186 КК).

З аб'ектыўнага боку неданясенне заўсёды бяздзеянне, якое выяўляецца ў невыкананні ўскладзеных законам абавязкаў паведаміць органам улады аб падрыхтаванні або здзяйсненні злачынства, аб якім дакладна вядома. Абавязак грамадзяніна паведаміць аб злачынстве лічыцца выкананым, калі ён паведаміў аб ім органам правасуддзя або іншым дзяржаўным органам ці грамадскім арганізацыям, якія павінны перадаць гэтыя звесткі адпаведным органам.

Для прыцягнення асобы да крымінальнай адказнасці за неданясенне неабходна даказаць, што вінаваты не толькі не паведаміў, але меў рэальную магчымасць паведаміць аб падрыхтаванні або здзяйсненні злачынства, што ён не скарыстаў гэту магчымасць. Закон не ўстанаўлівае тэрміну, на працягу якога асоба павінна паведаміць аб злачынстве. Яна павінна гэта зрабіць да таго, пакуль органам улады стала вядома аб падрыхтаванні або ўчыненні злачынства.

З суб'ектыўнага боку неданясенне заўсёды здзяйсняецца наўмысна: вінаваты ведае, па–першае, аб характары злачынства, па–другое, аб тым, што гэта злачынства рыхтуецца, здзяйсняецца або ўжо здзейснена, па–трэцяе, прадбачыць, што ў выніку неданясення злачынства можа быць не раскрыта і жадае гэтага. Прычым вінаваты дасканала ведае аб злачынстве, ведае аб асноўных даных, якія не выклікаюць сумненняў (сам назіраў за зла-

чыннымдзеяннямі, ведае аб іх са слоў удзельніка злачынства).

**Патуранне** – гэта неперашкода здзяйсненню злачынства ў выпадку, калі ў асобы былі абавязак і магчымасць прыняць меры для яго прадухілення. Паколькі на грамадзянах не ляжыць прававы абавязак перашкаджаць здзяйсненню злачынства, неперашкода яму, па агульнаму правілу, не цягне за сабой крымінальнай адказнасці. Патуранне некаторых грамадзян здзяйсненню некаторых небяспечных злачынстваў можа цягнуць за сабой пры адпаведных умовах адказнасць за неданясенне. Неперашкода здзяйсненню злачынства з боку службовых асоб, на якіх ускладзены такі абавязак, стварае склад службовага злачынства (гл., напр., арт.166[1] КК).

З аб'ектыўнага боку крымінальна караемае патуранне характарызуецца бяздзеяннем, калі вінаваты не перашкаджае здзяйсненню злачынства, у той час калі быў абавязаны і меў магчымасць перашкаджаць.

З суб'ектыўнага боку патуранне, якое караецца ў крымінальным парадку, можа быць здзейснена толькі наўмысна. Патуранне, папярэдне абяцанае выканаўцу з боку асобы, якая абавязана была перашкаджаць здзяйсненню злачынства, з'яўляецца саўдзелам у злачынстве (дапамаганне), таму што ператвараецца ў адну з умоў здзяйснення злачынства выканаўцам і знаходзіцца ў прычыннай сувязі са злачынным вынікам.

## *Літаратура:*

Баймурзин Г.И. Ответственность за прикосновенность к преступлению. Алама–Ата, 1968; Барков А. Правовая оценка групповых преступлений// Судовы веснік. 1997. №1; Бурчак Ф.Г. Учение о соучастии по советскому уголовному праву. Киев, 1969; Бурчак Ф.Г. Соучастник: социальные, криминологические и правовые проблемы. Киев, 1986; Бушуев И.А. Ответственность за укрывательство преступлений и недоносительство. М., 1965; Джекебаев У.С., Вайсберг Л.М., Судакова Р.Н. Соучастие в преступлении (Криминологические и уголовно–правовые проблемы). Алма–Ата, 1981; Ковалев М.И. Соучастие в преступлении.

Ч.1. Понятие соучастия. Учен.тр. / СвЮИ, 1962, т.5; Организованная преступность. Проблемы, дискуссии, предложения. М., 1989; Организованная преступность – 2. Проблемы, дискуссии, предложения. М., 1993; Тельнов П.Ф. Ответственность за соучастие в преступлении. М., 1974; Ушаков А.В. Ответственность за групповые преступления (Общие вопросы). Калинин, 1975.

# Глава 12

# МНОЖНАСЦЬ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

## §1. Множнасць злачынстваў і адзінкавае злачынства

У судовай практыцы сустракаюцца выпадкі ўчынення асобай двух ці больш злачынстваў. Пры ўчыненні асобай некалькіх злачынстваў, як правіла, прычыняецца большая маральная, фізічная або матэрыяльная шкода ахоўваемым грамадскім адносінам. Вінаваты ў падобнай сітуацыі выяўляе свае ўстойлівыя адмоўныя адносіны да інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы. Неаднаразовая злачынная дзейнасць адной і той жа асобы адмоўна ўплывае на іншых маральна няўстойлівых людзей, нараджаючы ў іх веру ў магчымасць беспакарана займацца злачыннай дзейнасцю.

Учыненне асобай некалькіх злачынстваў ставіць перад судова–следчымі органамі пытанні, якія звязаны з адмежаваннем адзінкавага злачынства ад некалькіх, з кваліфікацыяй учыненага і прызначэннем за яго пакарання.

**Множнасць злачынстваў** – гэта крымінальна–прававое паняцце, якое вызначае сітуацыю, калі асоба ўчыніла два, тры і больш злачынстваў. Пры гэтым не мае значэння, прыцягваўся вінаваты да крымінальнай адказнасці за раней учыненае дзеянне ці не. Указаная акалічнасць уплывае толькі на форму множнасці. Важна, каб гэтыя злачынствы не страцілі свайго прававога значэння з прычыны пагашэння або зняцця судзімасці; сканчэння тэрміну даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці або даўнасці выканання абвінаваўчага прыгавору, амністыі або памілавання.

У дзеючым КК Беларусі множнасць злачынстваў не выдзелена ў якасці самастойнага крымінальна–прававога інстытута. Аб асобных відах множнасці ў КК гаворыцца ў арт.арт.24, 39, 40, у заўвазе да арт.87, у ч.2 арт.87, ч.2 арт.88, ч.2 арт.89, ч.2 арт.90 і інш. Навука крымінальнага права выдзяляе наступныя формы

множнасці злачынстваў: сукупнасць злачынстваў, паўторнасць злачынстваў, рэцыдыў злачынстваў.

Дакладная кваліфікацыя множнасці злачынстваў магчымая пры ўмове правільнага адмежавання яе ад адзінкавага злачынства. **Пад адзінкавым злачынствам** разумеецца прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне, якое ўтрымлівае прыкметы толькі аднаго злачынства.

Адзінкавае злачынства бывае простым ці складаным. **Простае адзінкавае злачынства** складаецца з аднаго дзеяння або бяздзейнасці (пры фармальный канструкцыі складу) або дзеяння ці бяздзейнасці і грамадска небяспечнага выніку (пры матэрыяльнай канструкцыі складу злачынства).

Да групы **адзінкавых складаных злачынстваў** належаць састаўныя злачынствы; злачынствы, у аснове якіх ляжаць альтэрнатыўныя дзеянні; злачынствы з двума дзеяннямі; злачынствы з кваліфікуючым дадатковым цяжкім вынікам; злачынствы з патрабаваннем адміністрацыйнай прэюдыцыі; працяглыя; прадоўжаныя злачынствы.

Састаўныя злачынствы ўтвараюцца з двух і больш злачынных дзеянняў, кожнае з якіх, калі іх ацэньваць ізалявана, уяўляе сабой самастойнае простае злачынства. Так, напр., сканструяваны склад разбою (арт.89 КК). Разбой – гэта напад з мэтай завалодаць чужой маёмасцю, звязаны з насіллем, небяспечным для жыцця ці здароўя асобы, на якую зроблены напад, або з пагрозай ужывання такога насілля. Пры такім спосабе заўладання маёмасцю злачынная мэта дасягаецца прымяненнем насілля. У такой сітуацыі рознародныя злачынныя дзеянні – насілле над асобай і заўладанне чужой маёмасцю – утвараюць адзінае складанае злачынства.

Да адзінкавых складаных адносяцца таксама злачынствы, у аснове якіх ляжаць альтэрнатыўныя дзеянні. Канструкцыі такіх злачынстваў уключаюць у сябе шэраг юрыдычна раўназначных дзеянняў, калі ўчыненне любога з указаных у законе дзеянняў утварае склад юрыдычна закончанага злачынства. Адначасовае ўчыненне некалькіх альтэрнатыўных дзеянняў будзе разглядацца як адзінкавае складанае злачынства. Напр., у арт.65 КК апісваюцца прыкметы

адзінкавага злачынства (дыверсіі), у аснове якога ляжаць альтэрнатыўныя дзеянні: учыненне выбухаў, падпалаў або іншых дзеянняў, накіраваных на масавае знішчэнне людзей, прычыненне цялесных пашкоджанняў ці іншай шкоды іх здароўю, на разбурэнне або пашкоджанне будынкаў, збудаванняў, шляхоў і сродкаў зносін, сродкаў сувязі ці іншай маёмасці з мэтай дэстабілізацыі грамадскага парадку або дзейнасці дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь. Учыненне любога з пералічаных грамадска небяспечных дзеянняў, накіраваных на масавае знішчэнне людзей, прычыненне цялесных пашкоджанняў або іншай шкоды, утварае склад юрыдычна закончанай дыверсіі. Разам з тым, адначасовае ўчыненне некалькіх альтэрнатыўных грамадска небяспечных дзеянняў з той жа мэтай будзе разглядацца як адзіны склад дыверсіі.

Разнавіднасцю складаных з'яўляюцца злачынствы з двума дзеяннямі. Да такіх злачынстваў адносіцца, напр., спекуляцыя (арт.$150^6$ КК). Пад спекуляцыяй разумеецца скупка на прадпрыемствах (у арганізацыях) дзяржаўнага гандлю і спажывецкай кааперацыі тавараў, прызначаных для рознічнага продажу насельніцтву і перапродаж такіх тавараў з мэтай нажывы. Гэтыя дзеянні (скупка і перапродаж) учыняюцца ў розны час і, як правіла, са значным разрывам, але толькі ў сваёй сукупнасці складаюць адзінкавае злачынства - спекуляцыю.

Да адзінкавых складаных злачынстваў адносяцца злачынствы, кваліфікаваныя наяўнасцю цяжкіх вынікаў. Асаблівасць такіх злачынстваў у тым, што яны ўключаюць у якасці кваліфікуючай прыкметы дадатковы вынік, які ў асобных выпадках уяўляе сабой самастойнае злачынства. Суб'ектыўны бок гэтых злачынстваў мае ўскладнены характар: асоба наўмысна ўчыняе злачынства і па неасцярожнасці выклікае шкоду, з якой закон звязвае больш строгую адказнасць. Толькі ў такім спалучэнні аб'ектыўных і суб'ектыўных прыкмет здзейсненае ўяўляе сабой адзінкавае складанае злачынства, кваліфікаванае наяўнасцю цяжкіх вынікаў. Да злачынстваў з такой канструкцыяй адносяцца, напр., наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне, якое выклікала смерць пацярпеўшага (ч.2

арт.106 КК), незаконнае правядзенне аборту (ч.3 арт.114 КК).

Калі ў падобных сітуацыях дзеянне і вынікі характарызуюцца адной і той жа формай віны (наўмыснай або неасцярожнай), то будзе мець месца не складанае злачынства, кваліфікаванае наяўнасцю цяжкіх вынікаў, а адзінкавае простае злачынства (наўмыснае або неасцярожнае).

Адзінкавымі складанымі з'яўляюцца злачынствы з патрабаваннем адміністрацыйнай прэюдыцыі. У спецыяльных выпадках, прадугледжаных Асаблівай часткай КК, крымінальная адказнасць за злачынства, якое не прадстаўляе вялікай грамадскай небяспекі, настае, калі дзеянне ўчынена на працягу года пасля прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці за такое ж парушэнне. Напр., незаконнае паляванне ацэньваецца ў якасці злачынства, калі яно ўчынена без належнага на тое дазволу або ў забароненых месцах, або ў забароненыя тэрміны, недазволенымі прыладамі і спосабамі, калі гэтыя дзеянні ўчынены пасля прымянення мер адміністрацыйнага ўздзеяння за такое ж парушэнне (ч.1 арт.163 КК).

Працяглае злачынства характарызуецца бесперапынным ажыццяўленнем пэўнага злачыннага дзеяння. Такое злачынства – гэта дзеянне або бяздзейнасць, звязаныя з наступным працяглым невыкананнем абавязкаў, ускладзеных на вінаватага. Такімі злачынствамі, напр., з'яўляюцца: злоснае ўхіленне ад уплаты аліментаў або ад утрымання дзяцей (арт. 120 КК); незаконнае нашэнне, хаванне агнястрэльнай зброі (арт.213 КК); самавольная адлучка (арт.234 КК) і інш.

Працяглае злачынства пачынаецца з моманту ўчынення якога–небудзь злачыннага дзеяння або з акта злачыннай бяздзейнасці і заканчваецца з прычыны дзеяння самой асобы, накіраванага на спыненне злачыннага стану (напр., яўка з пакаяннем), або з прычыны ўзнікнення сітуацыі, якая перашкаджае далейшаму ўчыненню злачынства (напр., затрыманне злачынца), або ў выпадку, калі знік абавязак асобы, невыкананне якога стварала злачынны стан (напр., у выпадку смерці дзіцяці ў вінаватага спыняецца абавязак плаціць аліменты адпаведна з рашэннем суда). Працяглае

злачынства незалежна ад тэрміну яго ўчынення ацэньваецца як адзінкавае злачынства.

Прадоўжанае злачынства характарызуецца шэрагам прыкмет: накіраванасцю да адзінай мэты, пасягненнем на адну групу грамадскіх адносін, адзінствам канчатковага выніку.

Гэтыя прыкметы характарызуюць унутраную сувязь усіх дзеянняў, якія складаюць прадоўжанае злачынства. Адзінымі павінны быць і аб'ект прадоўжанага злачынства і злачынны вынік. Так, напр., прадоўжаным будзе раскраданне маёмасці часткамі з адной крыніцы. Аб'ектыўны бок прадоўжанага злачынства складаецца з некалькіх дзеянняў, аб'яднаных параўнальна адзіным спосабам учынення злачынства. Важнай якаснай адзнакай прадоўжанага злачынства з'яўляецца адзінства суб'ектыўнага боку, якое адлюстроўваецца ў наяўнасці ў асобы адной і той жа формы віны, аднолькавых матываў і адзінай мэты дзейнасці.

Судовая практыка Рэспублікі Беларусь пад прадоўжаным раскраданнем разумее неаднаразовае незаконнае бязвыплатнае завалоданне маёмасцю, што складалася з раду тоесных злачынных дзеянняў, якія маюць агульную мэту незаконнага заўладання маёмасцю і складаюць у сваёй сукупнасці адно злачынства (гл.: п.20 Пастановы N 3 Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 17 чэрвеня 1994 г. // Судовы веснік. 1994. N 3).

## §2. Сукупнасць злачынстваў і яе віды

У дзеючым КК азначэння сукупнасці злачынстваў няма. Яе паняцце вынікае са зместу арт.39 КК. Пад **сукупнасцю злачынстваў** разумеецца ўчыненне асобай двух і больш злачынстваў, прадугледжаных рознымі артыкуламі або рознымі часткамі артыкула Асаблівай часткі КК, ні за адно з якіх яна не была асуджана.

Абавязковай прыкметай сукупнасці злачынстваў з'яўляецца ўчыненне асобай двух або больш дзеянняў, кожнае з якіх уяўляе сабой асобнае, самастойнае злачынства. Апрача гэтага, для наяўнасці сукупнасці злачынстваў неабходна, каб учы-

неныя дзеянні ахоплівaліся рознымі артыкуламі Асаблівай часткі КК або, у надзвычай рэдкіх выпадках, асобнымі часткамі ці пунктамі аднаго артыкула крымінальнага закону, маючымі самастойныя санкцыі.

Большасць артыкулаў Асаблівай часткі КК прадугледжвае адказнасць за адно злачынства. Разам з тым, у Асаблівай частцы КК ёсць артыкулы, якія ў розных сваіх частках маюць прыкметы розных злачынстваў. Напр., арт.213 КК вызначае адказнасць за нашэнне, хаванне, набыццё, выраб або збыт агнястрэльнай зброі (апрача гладкаствольнай паляўнічай), баявых прыпасаў або выбуховых рэчываў без адпаведнага дазволу (ч.1) і нашэнне, выраб або збыт кінжалаў, фінскіх нажоў ці іншай халоднай зброі без адпаведнага дазволу (ч.3).

Гэта розныя злачынствы, прадугледжаныя рознымі часткамі аднаго артыкула. Такім чынам сканструяваны і некаторыя іншыя артыкулы Асаблівай часткі КК (напр., ч.1 і 2 арт.157, ч.1 і 2 арт.174, ч.1 і 3 арт.191, ч.1 і 3 арт.192, ч.1 і 2 арт.195 КК).

Для наяўнасці сукупнасці злачынстваў неабходна, каб асобай было ўчынена два або больш такіх розных злачынстваў, ні па аднаму з якіх не было вынесена прыгавору.

У сукупнасць не могуць уключацца злачынствы, па якіх прайшлі тэрміны даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці або маюцца іншыя падставы, якія пагашаюць юрыдычнае значэнне ўчыненага дзеяння (напр., калі адказнасць скасавана актам амністыі або калі асоба вызвалена ад крымінальнай адказнасці), ці маюць месца працэсуальныя перашкоды для прыцягнення да крымінальнай адказнасці (адсутнасць, напр., скаргі пацярпеўшага па справах прыватнага абвінавачання).

Сукупнасць злачынстваў неабходна адмяжоўваць ад канкурэнцыі крымінальна–прававых норм. Не будзе сукупнасці злачынстваў, калі адно ўчыненае дзеянне як бы прадугледжваецца рознымі артыкуламі КК. У такой сітуацыі мае месца канкурэнцыя норм, пры якой злачынства трэба кваліфікаваць па таму артыкулу КК, які больш поўна адлюстроўвае прыкметы ўчыненага, а калі яно ўяўляе сабой спецыяльны від больш агуль-

нага складу злачынства, то па артыкулу, які прадугледжвае адказнасць за гэты спецыяльны від злачынства. Так, напр., дзеянні службовай асобы, атрымаўшай хабар за выкананне ў інтарэсах даючага якіх–небудзь дзеянняў па службе, трэба кваліфікаваць па арт.169 КК, хоць гэта дзеянне змяшчае ў сябе і ўсе прыкметы больш агульнага, родавага складу злачынства – злоўжыванне службовым становішчам (арт.166 КК).

Крымінальны закон не вызначае асобныя віды сукупнасці злачынстваў. У тэорыі крымінальнага права і судовай практыцы прынята адрозніваць сукупнасць ідэальную і рэальную.

Пад ідэальнай сукупнасцю злачынстваў разумеецца ўчыненне шляхам аднаго дзеяння некалькіх самастойных злачынстваў. Ідэальная сукупнасць, напр., будзе мець месца, калі вінаваты крадзе якую–небудзь дэталь машыны, тым самым прыводзячы яе ў непрыгоднасць. Аб наяўнасці ідэальнай сукупнасці сведчыць тое, што ў гэтай сітуацыі адным дзеяннем выкананы склады двух злачынстваў (крадзёж, арт.87 КК; наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці, арт.96 КК).

У шэрагу пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь утрымліваюцца тлумачэнні, якія датычацца кваліфікацыі выпадкаў ідэальнай сукупнасці злачынстваў.

Ідэальную сукупнасць злачынстваў неабходна адрозніваць ад адзінкавага злачынства. Пры ідэальнай сукупнасці адным злачынным дзеяннем прычыняецца шкода двум розным аб'ектам, ахоўваемым дзвюма або больш крымінальна–прававымі нормамі. Калі дзеяннем прычыняецца шкода двум аб'ектам, ахоўваемым адной крымінальна–прававой нормай, ідэальная сукупнасць будзе адсутнічаць, усё здзейсненае будзе разглядацца як адзінкавае злачынства. Напр., аб'ектам грабяжу з'яўляюцца адносіны ўласнасці і грамадскія адносіны, ахоўваючыя недатыкальнасць асобы. Таму адкрытае авалоданне чужой маёмасцю, злучанае з насіллем, не небяспечным для жыцця або здароўя пацярпеўшага, утварае не сукупнасць злачынстваў, а адзінкавае злачынства, прадугледжанае ч.2 арт.88 КК.

Пры ідэальнай сукупнасці маюць месца выпадкі, калі пры дапамозе аднаго дзеяння робіцца замах на злачынства і адначасова выконваецца склад іншага закончанага злачынства. Падобнае адбываецца пры фактычнай памылцы, якая заключаецца ў адхіленні дзеяння. Так, напр., вінаваты ў час сваркі, спрабуючы забіць сваю жонку, прамахваецца і стрэлам з ружжа забівае выпадковага прахожага. У гэтай сітуацыі замах на наўмыснае забойства і неасцярожнае забойства ўтвараюць ідэальную сукупнасць злачынстваў.

**Пад рэальнай сукупнасцю злачынстваў** разумеецца паслядоўнае ўчыненне асобай некалькіх злачынных дзеянняў, кожнае з якіх утварае самастойнае злачынства. Напр., асоба выкрадае агнястэльную зброю, выдадзеную яму для службовага карыстання, а затым ужывае яе для наўмыснага забойства. У гэтай сітуацыі ўчыненае з'яўляецца вынікам розных самастойных розначасовых дзеянняў. Вінаваты спачатку ўчыняе выкраданне агнястрэльнай зброі, затым незаконна яе захоўвае, а потым з яе дапамогай учыняе наўмыснае забойства.

Рэальная і ідэальная сукупнасць маюць істотную розніцу: рэальная ўтвараецца пры ўчыненні некалькіх розначасовых самастойных дзеянняў; ідэальнай сукупнасці прыкмета паўтарэння не ўласціва. У сувязі з гэтым грамадская небяспека злачынстваў, якія ахопліваюцца паняццем рэальнай і ідэальнай сукупнасці, неаднолькавая. Характар паводзін асобы, учыніўшай два і больш злачынства, розны пры рэальнай і ідэальнай сукупнасці. Разам з тым, гэтыя два віды сукупнасці аб'ядноўвае тое, што і рэальная і ідэальная сукупнасць – гэта выпадкі ўчынення адной і той жа асобай мноства (двух або больш) злачынстваў, якія кваліфікуюцца па розных артыкулах КК (частках артыкула). У сувязі з гэтым крымінальнае заканадаўства аб'ядноўвае гэтыя два віды сукупнасці, указвае іх агульныя прыкметы (учыненне асобай двух або больш злачынстваў, прадугледжаных рознымі артыкуламі КК, ні за адно з якіх асоба не была асуджана) і прадугледжвае для іх агульныя правілы назначэння пакарання (арт.39 КК).

Дзяленне сукупнасці злачынстваў на рэальную і ідэальную

мае пэўнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Ідэальная сукупнасць не можа ўтвараць агульнай паўторнасці. Пры рэальнай сукупнасці такое становішча можа мець месца. Пры ідэальнай сукупнасці інакш, чым пры рэальнай, падлічваюцца тэрміны даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці. Пры ідэальнай сукупнасці вылічэнне тэрміну даўнасці па кожнаму з злачынстваў, якія ўваходзяць у сукупнасць, пачынаецца адначасова, а пры рэальнай – у розны час па кожнаму злачынству. Па другому, у залежнасці ад віду сукупнасці, вырашаецца пытанне аб магчымасці вызвалення асобы ад крымінальнай адказнасці з перадачай справы ў таварыскі суд (арт.49 КК). Пры ідэальнай сукупнасці асоба можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з арт.49 КК, а пры рэальнай – такое немагчыма, бо закон забараняе перадаваць справу ў таварыскі суд, калі асоба ўчыніла злачынства паўторна.

## §3. Рэцыдыў злачынстваў

**Рэцыдыў** адрозніваецца ад іншых форм множнасці тым, што асоба ўжо была раней судзімая за ўчыненае злачынства і зноў учыняе злачынства. У крымінальным праве адрозніваюць тры віды рэцыдыву: агульны, спецыяльны і асабліва небяспечны.

**Агульны рэцыдыў** – гэта ўчыненне любога новага злачынства пасля асуджэння хоць бы за адно папярэдняе. **Спецыяльны рэцыдыў** – учыненне пасля асуджэння новага такога ж або аднароднага злачынства. **Асабліва небяспечны рэцыдыў** – гэта пэўная злачынная дзейнасць асобы, раней асуджанай да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства і зноў учыніўшай наўмыснае злачынства, пры наяўнасці ўмоў, прадугледжаных арт.24 КК. У КК тэрміны "агульны рэцыдыў" і "спецыяльны рэцыдыў" не ўжываюцца. Замест гэтых тэрмінаў заканадаўца выкарыстоўвае паняцце "судзімы" або "раней судзімы" (ч.2 арт.85; ч.2 арт.$85^1$; арт.94; ч.2 арт.151; ч.2 арт.$151^5$ і інш.).

У адпаведнасці з арт.24 КК **асабліва небяспечным рэцыдывістам** па прыгавору суда можа быць прызнана:

1) асоба, якая раней асуджалася да пазбаўлення волі за асабліва небяспечнае дзяржаўнае злачынства; бандытызм; выраб або

збыт падробленых грошай або каштоўных папер пры абцяжарваючых акалічнасцях; разбой з мэтай заўладанне маёмасцю пры абцяжарваючых акалічнасцях; наўмыснае забойства (арт.100, 101, п."в" арт.229), акрамя забойства маці свайго нованароджанага дзіцяці; згвалтаванне, учыненае групай асоб, або згвалтаванне непаўналетняй, згвалтаванне, выклікаўшае асабліва цяжкія вынікі, а таксама згвалтаванне малалетняй; захоп заложнікаў; замах на жыццё работніка міліцыі або народнага дружынніка; угон паветранага судна; раскраданне радыёактыўных матэрыялаў, і зноў учыніўшая якое–небудзь з пералічаных злачынстваў, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі на тэрмін не ніжэй пяці гадоў;

2) асоба, раней два разы ў любой паслядоўнасці асуджаная да пазбаўлення волі за асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы: бандытызм; масавыя беспарадкі; выраб або збыт падробленых грошай або каштоўных папер; раскраданне маёмасці пры абцяжарваючых акалічнасцях, разбой з мэтай авалодання маёмасцю; наўмыснае забойства (арт.100, 101, п."в" арт.229), акрамя забойства маці свайго нованароджанага дзіцяці; наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне; згвалтаванне; захоп заложнікаў; атрыманне хабару; замах на жыццё работніка міліцыі і народнага дружынніка; асабліва злоснае хуліганства; угон паветранага судна; раскраданне радыёктыўных матэрыялаў; раскраданне агнястрэльнай зброі, баявых прыпасаў або выбуховых рэчываў пры абцяжарваючых акалічнасцях; незаконныя выраб, набыццё, захаванне, перавозка або перасылка наркатычных сродкаў з мэтай збыту, збыт, а таксама раскраданне іх пры абцяжарваючых акалічнасцях, зноў учыніўшая якоенебудзь з пералічаных злачынстваў, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі на тэрмін звыш трох гадоў;

3) асоба, якая раней тры разы і болей у любой паслядоўнасці была асуджаная да пазбаўлення волі за злоснае хуліганства або за злачынствы, пералічаныя ў п.2 ч.1 арт.24 КК, і зноў учыніўшая злоснае хуліганства або якое–небудзь са злачынстваў, пералічаных у п.2 ч.1 арт.25 КК, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі;

4) асоба, адбываючая пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі

за якое–небудзь са злачынстваў, пералічаных у п.2 і 3 ч.1 арт.24 КК, і зноў учыніўшая наўмыснае злачынства, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі на тэрмін не ніжэй пяці гадоў.

Наяўнасць умоў, якія вызначаны арт.24 КК, не цягне "аўтаматычнага" вырашэння пытання аб прызнанні злачынца асабліва небяспечным рэцыдывістам. У арт.24 КК гаворыцца, што суд, які разглядае пытанне аб прызнанні асабліва небяспечным рэцыдывістам, улічвае асобу вінаватага, ступень грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства, ступень ажыццяўлення злачынных намераў, характар і ступень удзелу ва ўчыненні злачынстваў і іншыя абставіны справы. Рашэнне суда павінна быць матывавана ў прыгаворы.

Пагашаная ці знятая судзімасць, а таксама судзімасць за злачынствы, учыненыя асобай ва ўзросце да 18 гадоў, не ўлічваюцца пры вырашэнні пытання аб прызнанні злачынца асабліва небяспечным рэцыдывістам. Асуджаны лічыцца асабліва небяспечным рэцыдывістам да зняцця з яго судзімасці, прававы статус асабліва небяспечнага рэцыдывіста спыняецца ў гэты момант.

Артыкулы КК Беларусі, якія прадугледжваюць павышаную адказнасць за ўчыненне злачынстваў асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі, прымяняюцца ў выпадках, калі асобы былі прызнаны ва ўстаноўленым законам парадку асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі да ўчынення дадзеных злачынстваў.

У адпаведнасці з крымінальным заканадаўствам рэцыдыў цягне за сабой шэраг прававых вынікаў, звязаных з кваліфікацыяй злачынстваў, прызначэннем пакарання, індывідуалізацыяй адказнасці, вызваленнем ад пакарання.

Спецыяльны і асабліва небяспечны рэцыдыў у выпадках, прадугледжаных артыкуламі Асаблівай часткі КК, выступаюць у якасці кваліфікуючых прыкмет злачынстваў. Так, напр., спецыяльны рэцыдыў прадугледжаны ў якасці кваліфікуючай прыкметы пры парушэнні правілаў аб здзелках з каштоўнымі металамі і камянямі (арт.85 КК), парушэнні ўстаноўленага парадку правядзення валютных аперацый (арт.85[1] КК) і інш. Асабліва небяспечны рэцыдыў з'яўляецца кваліфікуючай прыкметай пры ўчыненні крадзяжу, грабяжу, разбойнага нападу,

махлярства (ч.4 арт.87; ч.4 арт.88; ч.2 арт.89; ч.3 арт.90) і інш.

Агульны рэцыдыў з'яўляецца абцяжарваючай акалічнасцю пры назначэнні пакарання. На падставе п.1 арт.38 КК суд мае права, у залежнасці ад характару першага злачынства, не прызнаць за ранейшай судзімасцю значэння абцяжарваючай акалічнасці.Агульны рэцыдыў уплывае таксама і на вызначэнне віду папраўча–працоўнай калоніі, у якой адбываецца пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі. У адпаведнасці з ч.4 арт.23 КК асобы, раней асуджаныя да пазбаўлення волі і адбыўшыя гэтае пакаранне, у выпадках паўторнага ўчынення злачынства і асуджэння да пазбаўлення волі, адбываюць пакаранне ў папраўча–працоўных калоніях строгага рэжыму. Агульны, спецыяльны і асабліва небяспечны рэцыдывы пры наяўнасці пэўных умоў выклікаюць асаблівы парадак прызначэння судом пакарання. Калі асуджаны пасля вынясення прыгавору, але да поўнага адбывання пакарання ўчыняе новае злачынства, суд да пакарання, прызначанага па новаму прыгавору, поўнасцю або часткова далучае неадбытую частку пакарання па папярэдняму прыгавору (арт.40 КК). Агульны, спецыяльны і асабліва небяспечны рэцыдывы ўплываюць на індывідуалізацыю адказнасці. Так, умоўнае асуджэнне да пазбаўлення волі з абавязковым прыцягненнем асуджанага да працы (арт.23[1] КК) не ўжываецца да злачынцаў, якія былі раней асуджаны да пазбаўлення волі. У адносінах асоб, прызнаных асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі, могуць прымяняцца больш строгія меры пакарання ў выглядзе максімальнага тэрміну пазбаўлення волі да 15 гадоў. У адпаведнасці з арт.49 КК асоба, раней судзімая, не можа вызваляцца ад крымінальнай адказнасці, і матэрыялы аб яе злачынстве не могуць перадавацца на разгляд таварыскага суда.

Асабліва небяспечныя рэцыдывісты пры ўчыненні новага злачынства і асуджэнні да пазбаўлення волі адбываюць пакаранне ў папраўча–працоўных калоніях асобага рэжыму або ў турмах (арт.23 КК). У адпаведнасці з арт.51[1] да іх не ўжываецца ўмоўна–датэрміновае вызваленне ад пакарання ці замена пакарання больш мяккім.

У выпадках, спецыяльна прадугледжаных законам, для пэўнай катэгорыі асоб пасля адбывання пазбаўлення волі можа ўстанаўлівацца адміністрацыйны нагляд органаў міліцыі.

## §4. Паўторнасць злачынстваў

У крымінальным заканадаўстве Беларусі няма азначэння паўторнасці як формы множнасці злачынстваў. Навука крымінальнага права вылучае тры віды паўторнасці злачынстваў: спецыяльную, змешаную і агульную.

Пад **спецыяльнай паўторнасцю злачынстваў** разумеецца ўчыненне двух або болей тоесных злачынстваў, прадугледжаных адным і тым жа артыкулам Асаблівай часткі КК, ні за адно з якіх асоба не была асуджана. Учыненне двух або больш тоесных злачынстваў стварае спецыяльную паўторнасць, калі ні за адно з іх не скончыліся тэрміны даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці або асоба не вызвалялася ад крымінальнай адказнасці хоць бы за адно злачынства. Два або больш тоесных злачынстваў кваліфікуюцца па адным артыкуле Асаблівай часткі КК. Факт паўторнага ўчынення злачынства з'яўляецца ў адпаведнасці з п.1 арт.38 КК абцяжарваючай акалічнасцю.

Таму суд прызначае пакаранне ў межах, якія вызначаюцца артыкулам закону з улікам абцяжарваючай акалічнасці. Напр., прычыненне асобай у розны час некалькім пацярпеўшым наўмыснага менш цяжкага цялеснага пашкоджання кваліфікуецца па ч.1 арт.107 КК. Суд прызначае пакаранне вінаватаму ў межах санкцыі ч.1 арт.107 КК, кіруючыся агульнымі правіламі прызначэння пакарання (арт.36 КК), пры гэтым суд улічвае, што асобай учынена не адно, а два тоесныя злачынствы.

Часам спецыяльная паўторнасць у выпадках, прадугледжаных у артыкулах Асаблівай часткі КК, утварае кваліфікаваныя склады злачынстваў. Напр., у ч.2 арт.85 КК устаноўлена адказнасць за неаднаразовае ўчыненне здзелак з каштоўнымі металамі і камянямі з парушэннем устаноўленых правілаў.

Калі паўторнасць устанаўліваецца як кваліфікуючая прыкмета злачынства, яна не ўлічваецца пры назначэнні пакарання як абцяжарваючая адказнасць акалічнасць (п.1 арт.38 КК).

Спецыяльную паўторнасць належыць адрозніваць ад прадоўжанага злачынства. Паміж грамадска небяспечнымі дзеяннямі, якія ўтвараюць паўторныя злачынствы, няма такой

сувязі, як пры ўчыненні прадоўжаных злачынстваў. З аб'ектыўнага боку пры паўторнасці злачынстваў кожнае дзеянне мае самастойны характар і не з'яўляецца, як у прадоўжаным злачынстве, часткай адзінага злачынства. З суб'ектыўнага боку пры паўторнасці злачынстваў дзеянне характарызуецца самастойным злачынным намерам. У адрозненне ад прадоўжанага злачынства, пры спецыяльнай паўторнасці дзеянні не аб'яднаныя агульнасцю намеру і не накіраваныя да адной мэты. Так, напр., не з'яўляюцца прадоўжаным злачынствам дзеянні Г., які ўчыніў 16, 20 і 21 верасня крадзёж свежай рыбы агульнай вагой 50 кілаграмаў з халадзільніка рыбакомплекса "Нарач". На папярэднім следстве і ў судзе Г. тлумачыў, што не меў мэты выкрасці азначаную колькасць рыбы. Пасля першага крадзяжу некалькі дзён крадзяжоў не рабіў, паколькі баяўся, што злачынства будзе выяўлена, затым праз некалькі дзён ён супакоіўся і зноў стаў учыняць крадзяжы.

У крымінальным заканадаўстве пры апісанні спецыяльнай паўторнасці нараўне з тэрмінам "паўторна" ўжываецца паняцце "неаднаразова" (ч.2 арт.85 КК) або "ў выглядзе промыслу" (ч.2 арт.157 КК). Судовай практыкай Рэспублікі Беларусь тэрміны "неаднаразовасць" і "паўторнасць" у прымяненні да спецыяльнай паўторнасці разглядаюцца як аднолькавыя па свайму зместу паняцці, якія абазначаюць учыненне асобай злачынных дзеянняў, што складаюць для вінаватага асноўную або дадатковую крыніцу незаконнага ўзбагачэння.

**Змешаная паўторнасць** у крымінальным заканадаўстве прымяняецца пры апісанні тоесных і аднародных злачынных дзеянняў.

Пад змешанай паўторнасцю тоесных злачынстваў разумеецца ўчыненне двух або больш тоесных злачынстваў, прадугледжаных адным артыкулам Асаблівай часткі КК, незалежна ад таго, ці была асоба асуджана за ў першы раз учыненае дзеянне. Змешаная паўторнасць тоесных злачынстваў аб'ядноўвае выпадкі спецыяльнай паўторнасці і спецыяльнага рэцыдыву. Напр., у ч.2 арт.115 КК прадугледжана павышаная

адказнасць за згвалтаванне асобай, якая раней учыніла такое ж злачынства.

Асобай, якая раней учыніла згвалтаванне, прызнаецца той, хто ўчыніў у мінулым такое ж злачынства, адносна якога не прайшоў тэрмін даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці, або той, хто мае судзімасць за згвалтаванне, гэта значыць яна не знята і не пагашана ва ўстаноўленым законам парадку.

Пад змешанай паўторнасцю аднародных злачынстваў разумеецца ўчыненне двух або больш аднародных злачынстваў, прадугледжаных некалькімі артыкуламі Асаблівай часткі КК, незалежна ад таго, ці была асоба асуджана за раней учыненае дзеянне. Змешаная паўторнасць аднародных злачынстваў аб'ядноўвае выпадкі спецыяльнай паўторнасці, спецыяльнага рэцыдыву і сукупнасці злачынстваў. Напр., у якасці забойства пры абцяжарваючых акалічнасцях прызнаецца забойства, здзейсненае асобай, раней учыніўшай наўмыснае забойства, за выключэннем забойства, прадугледжанага арт.102 і 103 КК (п."з" арт.100 К). Асоба лічыцца раней учыніўшай наўмыснае забойства, калі яна ў мінулым здзейсніла наўмыснае забойства пры абцяжарваючых акалічнасцях і не прайшоў тэрмін даўнасці прыцягнення яе да крымінальнай адказнасці за гэтае злачынства (спецыяльная паўторнасць); калі яна ў мінулым учыніла наўмыснае забойства, якое кваліфікуецца па любому з наступных артыкулаў: 63, 101, 189[1], п."в" арт.229 КК, і не прайшоў тэрмін даўнасці прыцягнення яе да крымінальнай адказнасці (сукупнасць злачынстваў); калі яна ў мінулым учыніла наўмыснае забойства, якое кваліфікуецца па арт.63, 100, 101, 189[1], п. "в" арт.229 КК, за гэта была асуджана і судзімасць не была пагашана або знята ва ўстаноўленым парадку (спецыяльны рэцыдыў).

У адпаведнасці з заўвагай да арт.87 КК крадзёж будзе лічыцца паўторным, калі:

а) раней асобай быў учынены крадзёж і не прайшоў тэрмін даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці (спецыяльная паўторнасць);

б) раней асобай было ўчынена раскраданне чужой маёмасці, прадугледжанае арт. арт.88, 89, 90, 91, 93, або іншае злачынства, прадугледжанае арт. арт.74, $211^2$, $213^1$, $219^2$ КК, і не прайшлі тэрміны даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці (сукупнасць злачынстваў);

в) раней асобай было ўчынена раскраданне чужой маёмасці любым спосабам або злачынства, прадугледжанае арт. арт.74, $211^2$, $213^1$, $219^2$ КК, і яна за гэта злачынства асуджана і судзімасць не была пагашана або знята ва ўстаноўленым парадку (спецыяльны рэцыдыў).

Змешаная паўторнасць уплывае на кваліфікацыю ўчыненага і прызначэнне пакарання асуджанаму. Змешаная паўторнасць тоесных злачынстваў мае прававыя вынікі спецыяльнай паўторнасці і спецыяльнага рэцыдыву. Змешаная паўторнасць аднародных злачынстваў уключае ў сябе прававыя вынікі спецыяльнай паўторнасці, спецыяльнага рэцыдыву і сукупнасці злачынстваў. Магчымыя наступныя варыянты:

1. Крадзёж, учынены асобай, якая раней учыніла крадзёж, кваліфікуецца з улікам паўторнасці па ч.2 арт.87 КК. Пакаранне за абодва злачынствы прызначаецца, зыходзячы з санкцыі ч.2 арт.87 КК (вынікі спецыяльнай паўторнасці).

2. Крадзёж учынены асобай, якая раней учыніла грабёж, за які яна не прыцягвалася да крымінальнай адказнасці; усё ўчыненае кваліфікуецца па двух артыкулах КК.

Крадзёж кваліфікуецца з улікам паўторнасці па ч.2 арт.87 КК (вынікі спецыяльнай паўторнасці), а грабёж – па ч.1 арт.88 КК.

Канчатковае пакаранне за гэтыя злачынствы прызначаецца па правілах, прадугледжаных арт.39 КК (вынікі сукупнасці злачынстваў).

3. Крадзёж учынены асобай, якая адбывае пакаранне за грабёж. У гэтым выпадку ўчыненае кваліфікуецца па ч.2 арт.87 КК (вынікі спецыяльнай паўторнасці). Да зноў прызначанага пакарання за крадзёж суд адпаведна з арт.40 КК поўнасцю або часткова далучае неадбытую частку пакарання па папярэдняму прыгавору (вынікі спецыяльнага рэцыдыву).

4. Крадзёж учынены асобай, якая адбыла пакаранне за грабёж, судзімасць за які не пагашана і не знята; учыненае

кваліфікуецца па ч.2 арт.87 КК (вынікі спецыяльнай паўторнасці і спецыяльнага рэцыдыву).

Пад агульнай паўторнасцю злачынстваў разумеюць учыненне злачынства, перад якім было здзейснена якое–небудзь іншае злачынства. Паняцце агульнай паўторнасці адлюстроўваецца толькі у п.1 арт.38 КК. Адпаведна з гэтым артыкулам здзяйсненне злачынства асобай, якая раней учыніла якое–небудзь злачынства, з'яўляецца абцяжарваючай адказнасць акалічнасцю. Суд мае права, у залежнасці ад характару першага злачынства, не прызнаць за ім значэння абцяжарваючай акалічнасці.

## *Літаратура:*

Ефимов М.А., Шкурко В.А. Рецидивная преступность и ее предупреждение. Минск, 1977; Караев Т.Э Повторность преступлений. М., 1983; Красиков Ю.А. Множественность преступлений (понятие, виды, наказуемость). М., 1988; Малков В.П. Множественность перступлений и ее формы по советскому уголовному праву. Казань, 1982; Панько К.А. Вопросы общей теории рецидива в советском уголовном праве. Воронеж, 1988; Яковлев А.М. Борьба с рецидивной преступностью. М., 1964.

# Глава 13

# КРЫМІНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

## §1. Паняцце і мэты крымінальнай адказнасці

Крымінальная адказнасць уяўляе сабой разнавіднасць юрыдычнай адказнасці, якая забяспечвае прававую забароненасць злачынстваў і прымяняецца да асобы, калі яна ўчыняе адпаведнае злачынства. Паміж злачынствам і крымінальнай адказнасцю існуе прававая ўзаемасувязь: толькі ўчыненне злачынства з'яўляецца прававой падставай для прыцягнення пэўнай асобы да крымінальнай адказнасці. Асоба, якая ўчыніла злачынства, павінна быць прыцягнута да крымінальнай адказнасці і зазнаць яе, а вызначаныя органы дзяржавы маюць права прыцягнуць злачынца да крымінальнай адказнасці і забяспечыць яе рэалізацыю ў адпаведнасці з законам.

Крымінальная адказнасць, як і іншыя віды юрыдычнай адказнасці, настае толькі пасля ўчынення супрацьпраўнага дзеяння і таму мае рэтраспектыўны характар, ускладаецца на асобу, якая выкарыстала асабістую свабоду наперакор прававой забароне і, нягледзячы на пагрозу крымінальнай адказнасці, учыніла злачынства.

Дзяржава ў нормах крымінальнага права ўстанаўлівае адказнасць за ўчыненне злачынства незалежна ад волі і жадання вінаватага ў злачынстве. Таму ў адносінах да злачынства крымінальная адказнасць набывае і прававы, і дзяржаўна–прымусовы характар. Дзяржаўны прымус гэта спецыфічнае ўздзеянне, якое заснавана на арганізаванай сіле дзяржавы. Аднак не ўсякі дзяржаўны прымус, які заснавана на праве, ёсць крымінальная (юрыдычная) адказнасць. Крымінальная адказнасць, як і іншыя віды юрыдычнай адказнасці, заключаецца ў прымусе асобы да зазнавання неспрыяльных вынікаў асабістага або маёмаснага характару, якія вызначаны санкцыяй крымінальна–прававой нормы.

Так, прымусовае лячэнне асобы, якая ўчыніла злачынства ў стане свядомасці, а потым захварэла псіхічным захворваннем, безумоўна, з'яўляецца формай дзяржаўнага прымусу, які ўжываецца на падставе крымінальнага закону, але не мае ніякіх адносін да крымінальнай адказнасці, паколькі само лячэнне, якое ўжываецца пры дапамозе прымусу, нельга разглядаць як неспрыяльны вынік для гэтай асобы. Крымінальную адказнасць вылучае не проста дзяржаўны прымус, а толькі дзяржаўны прымус асобы да неспрыяльных для яе вынікаў, якія прадугледжаны санкцыямі крымінальнага закону. Таму з агульнага погляду **крымінальную адказнасць** можна вызначыць як заснаванае на дзяржаўным прымусе адпаведнае прымяненне санкцыі крымінальнага закону да асобы, якая ўчыніла злачынства.

Характар злачынства як найбольш небяспечнага для грамадства дзеяння вызначае сутнасць, змест, асаблівасці самой крымінальнай адказнасці, парадак яе ўскладання і рэалізацыі ў адрозненне ад іншых відаў юрыдычнай адказнасці.

Суб'ектам крымінальнай адказнасці можа быць толькі фізічная асоба, якая дасягнула адпаведнага ўзросту і сваімі дзеяннямі ўчыніла злачынства. Крымінальная адказнасць заўсёды ўздзейнічае непасрэдна на асобу злачынца, нават калі яна суправаджаецца прымяненнем такіх мер пакарання, як штраф або канфіскацыя. Асаблівасцю крымінальнай адказнасці з'яўляецца і тое, што яе ўжыванне звязана з прымяненнем у адносінах да злачынца дастаткова суровых, неспрыяльных для яго мер уздзеяння. З гэтым звязана і яшчэ адна яе асаблівасць. Ускладаненне крымінальнай адказнасці ажыццяўляецца толькі судом – шляхам рэалізацыі судовай улады дзяржавы. Парадак ускладання і ўмовы рэалізацыі крымінальнай адказнасці адпаведна рэгламентуюцца нормамі крымінальна-працэсуальнага і крымінальна-выканаўчага права. Аднак сутнасць, змест і межы крымінальнай адказнасці вызначаюцца нормамі крымінальнага права.

Крымінальная адказнасць як акт уздзеяння на асобу, якая ўчыніла злачынства, пачынаецца з асуджэння па прыгавору суда асобы ў якасці злачынца. Вынясенне абвінаваўчага

прыгавору з працэсуальнага боку выяўляе працэдуру ўскладання адказнасці, а з матэрыяльнага (у адпаведнасці з крымінальным законам) – акт асуджэння як злачынца – асобы, якая ўчыніла злачынства. Асуджэнне па прыгавору суда асобы ў якасці злачынца не толькі прававая ацэнка вінаватага. Па сваёй сутнасці яна вызначае сабой асаблівае прававое становішча асуджанага ў сувязі з устанаўленнем для яго рэжыму падкантрольнасці і выпрабавання ў мэтах прадухілення з яго боку здзяйснення новых злачынстваў. Становішча асуджэння ў якасці злачынца асобы, якая ўчыніла злачынства, узнікае з моманту ўступлення ў сілу абвінаваўчага прыгавору і цягнецца да пагашэння або зняцця судзімасці (асуджэння). Увесь гэты перыяд асуджаны і нясе цяжар уздзеяння крымінальнай адказнасці. З пагашэннем або зняццем судзімасці крымінальная адказнасць спыняецца поўнасцю і канчаткова. Такім чынам, сутнасць і межы крымінальнай адказнасці вызначаюцца становішчам асуджэння (судзімасці).

Асуджэнне і судзімасць – паняцці аднаго парадку. Тэрмінам "асуджэнне" вызначаецца прававое становішча, якое ўяўляе агульны рэжым крымінальнай адказнасці. Судзімасць абазначае працяг становішча асуджэння, яго межы. Тэрмін судзімасці залежыць ад кваліфікацыйнай цяжкасці ўчыненага злачынства і ступені яго небяспекі ў канкрэтным выпадку ўчынення.

Становішча асуджэння ўяўляе сабой аснову крымінальнай адказнасці асобы, якая ўчыніла злачынства, рэжым прымусу да выпрабавання і ўжывання мер абмежавання, што звязана з абавязкам асуджанага быць у стане падкантрольнасці органам дзяржавы, якія здзяйсняюць крымінальную адказнасць.

Асуджэнне ўключае магчымасць прызначэння і прымянення на яго падставе мер уздзеяння да асуджанага, якія маюць самастойны характар. Так, на падставе асуджэння можа прызначацца і прымяняцца пакаранне, якое прадугледжана санкцыяй Крымінальнага кодэкса. Пакаранне, якое назначана на падставе асуджэння, можа прымяняцца ўмоўна або з адтэрміноўкай. Асуджэнне непаўналетніх, якія ўчынілі злачынства, можа спалучацца з прымяненнем да іх прымусовых

мер выхаваўчага характару. Такім чынам, можна зазначыць, што асуджэнне і меры абмежавальнага характару, якія яго суправаджаюць, а таксама пакаранне і іншыя самастойныя меры ўздзеяння, якія прымяняюцца на падставе асуджэння, і складаюць змест крымінальнай адказнасці.

У кожным выпадку ў залежнасці ад характару і ступені небяспечнасці ўчыненага злачынства, асобы, якая яго ўчыніла, і іншых абставін, суд вызначае змест і рамкі крымінальнай адказнасці. У залежнасці ад характару мер уздзеяння, якія прымяняюцца да злачынца па прыгавору суда, у рэжыме асуджэння крымінальная адказнасць можа набываць некалькі форм яе рэалізацыі. КК Беларусі вылучае наступныя формы рэалізацыі крымінальнай адказнасці: асуджэнне з прымяненнем назначанага пакарання; асуджэнне з адтэрміноўкай назначанага пакарання (арт.44[1] КК); асуджэнне з умоўным непрымяненнем назначанага пакарання (арт. 43 КК); асуджэнне з прымяненнем мер выхаваўчага характару (у адносінах да непаўналетніх – арт.60 КК); асуджэнне без назначэння пакарання (ч.2 арт.48 КК).

Агульным для ўсіх форм рэалізацыі крымінальнай адказнасці з'яўляецца акт асуджэння асобы, якая ўчыніла злачынства, што надае ёй якасную відавую выразнасць, адмяжоўвае ад іншых відаў юрыдычнай адказнасці. Крымінальную адказнасць трэба таксама адрозніваць ад пакарання і іншых мер уздзеяння, якія спалучаюць і ўваходзяць у змест гэтага віду адказнасці, надаюць ёй розны характар уздзеяння, але самі па сабе не могуць скласці яе прававога паняцця. Крымінальная адказнасць – больш шырокае паняцце, чым пакаранне ці іншая мера крымінальна–прававога ўздзеяння. Крымінальная адказнасць заўсёды звязваецца з асуджэннем, што ўяўляе сабой прававую падпарадкаванасць асуджанага мерам крымінальна–прававога ўздзеяння, якія прымяняюцца на падставе асуджэння, дыферэнцуюць крымінальную адказнасць. Таму крымінальнае пакаранне змястоўна і функцыянальна выяўляе адну з форм магчымай рэалізацыі крымінальнай адказнасці, прытым у найбольш рэпрэсіўным выглядзе. Характар і тэрмін асуджэння як прававой падпарад-

каванасці злачынца да ўздзеяння павінны быць звязаны з небяспечнасцю злачынства, а пры выбранні канкрэтнай меры ўздзеяння, якая прымяняецца на падставе асуджэння (пакаранне, яго від і памер, умоўнае пакаранне, працягласць выпрабавальнага тэрміну, характар прымусовай меры выхавання і г.д., улічваюцца і абставіны, якія характарызуюць асобу вінаватага. Канкрэтныя меры ўздзеяння крымінальнай адказнасці павінны ўздзейнічаць на злачынца мэтанакіравана, абмяжоўваць прававы статус асуджанага з погляду дастатковасці іх для прадухілення новых злачынстваў з яго боку. Ажыццяўленне ў прымусовым парадку праваабмежаванняў у адносінах да асуджанага, якія абумоўлены становішчам асуджэння і мэтанакіраванымі мерамі крымінальна-прававога ўздзеяння, і складае паняцце крымінальнай адказнасці.

З улікам сказанага **крымінальную адказнасць** трэба вызначыць як асуджэнне ад імя дзяржавы па прыгавору суда асобы, якая здзейсніла злачынства, і прымяненне на падставе асуджэння ў адносінах да такой асобы (асуджанага) мер пакарання і іншых мер уздзеяння ў адпаведнасці з крымінальным законам.

Крымінальная адказнасць адрозніваецца ад іншых відаў юрыдычнай адказнасці па сваіх мэтах. **Мэты крымінальнай адказнасці** – гэта асэнсаваныя сацыяльныя вынікі, дзеля дасягнення якіх устанаўліваецца і прымяняецца крымінальная адказнасць.

У шырокім плане мэта крымінальнай адказнасці – папярэджванне ўчынення грамадска небяспечных дзеянняў, якія забаронены крымінальным законам пад пагрозай прыцягнення да крымінальнай адказнасці ў выпадку іх учынення. Пагроза крымінальнай адказнасці, якая прадугледжана крымінальным законам, выконвае мэту папярэджвання злачынстваў ужо з моманту прыняцця закону. Аднак наяўнасць пагрозы не была б эфектыўнай, калі б да крымінальнай адказнасці не прыцягваліся тыя асобы, якія ў сапраўднасці ўчынілі злачынства. Дзеля таго, каб пагроза крымінальнай адказнасці мела прадухіляючае ўздзеянне на няўстойлівых грамадзян,

вельмі важнае рэальнае прымяненне крымінальнай адказнасці да асоб, якія, нягледзячы на яе пагрозу, учынілі злачынства. Папярэджванне злачынства пагрозай крымінальнай адказнасці абумоўліваецца перш за ўсё яе непазбежнасцю ў выпадках учынення злачынства.

Паколькі крымінальная адказнасць прымяняецца да асобы толькі пасля ўчынення ёю злачынства, паўстае пытанне, дзеля якіх мэт мы ўскладаем крымінальную адказнасць на злачынца. У дзеючым КК гаворыцца аб мэтах пакарання. Мэты крымінальнай адказнасці аднолькавыя як для тых выпадкаў, калі крымінальная адказнасць рэалізуецца ў асуджэнні і рэальным прымяненні назначанага пакарання, так і для тых, калі крымінальная адказнасць рэалізуецца без рэальнага прымянення пакарання (умоўнае прымяненне пакарання, адтэрміноўка пакарання і інш.). У арт. 20 КК Беларусі гаворыцца аб тым, што пакаранне прымяняецца да асобы, якая ўчыніла злачынства, у мэтах: а) выпраўлення асуджанага; б) папярэджвання ўчынення новых злачынстваў асуджаным; в) папярэджвання ўчынення злачынстваў іншымі асобамі.

Мэта выпраўлення асуджаных заключаецца ў тым, каб шляхам уздзеяння мер крымінальнай адказнасці выкараніць распусныя погляды, пад уплывам якіх было ўчынена злачынства, выпрацаваць паважлівыя адносіны да закону, правапарадку, прывіць асуджанаму сацыяльна–карысныя навыкі. Безумоўна, крымінальная адказнасць – гэта не лепшы ў педагагічным плане сродак выпраўлення, паколькі ўздзейнічае ён на асуджанага неспрыяльнымі для яго вынікамі, прычыняе яму пакуты і нягоды, у некаторых выпадках даволі сур'ёзныя. Але трэба мець на ўвазе, што такая выключная мера выпраўлення прымяняецца да злачынца апраўдана. Уздзеянне, напр., пакараннем дае выпраўленчы вынік, паколькі гэта вымушае асуджанага задумацца над тым, ці варта дзеля ўчынення злачынства несці пакуты і нягоды крымінальнай адказнасці. Каб крымінальная адказнасць больш эфектыўна выконвала мэту выпраўлення асуджанага, яе рэалізацыя спалучаецца з комплексам мер сацыяльнай

рэабілітацыі (прыцягнення асуджанага да працы, правядзенне выхаваўчай работы з асуджаным, агульнаадукацыйная і прафесійная падрыхтоўка асуджанага).

Мэта спецыяльнага папярэджвання злачынства з боку асуджанага дасягаецца ў першую чаргу яго выпраўленнем. Калі пад уздзеяннем крымінальнай адказнасці асоба не ўчыняе больш злачынства таму, што ўсвядоміла ганебнасць сваіх дзеянняў, крымінальная адказнасць дасягнула мэты выпраўлення і спецыяльнага папярэджвання злачынства. Аднак мэта спецыяльнага папярэджвання дасягаецца не толькі выпраўленнем асуджанага, але і выключэннем магчымасці ўчыніць новае злачынства з яго боку. Асуджаны знаходзіцца пад наглядам органаў дзяржавы, якія рэалізуюць адпаведныя меры ўздзеяння, а калі, напр., прымяняецца такое пакаранне, як пазбаўленне волі, то асуджаны ізалюецца ад грамадства і ў значнай ступені пазбаўляецца фактычнай магчымасці ўчыніць новае злачынства. Безумоўна, прымяненне існуючых мер уздзеяння крымінальнай адказнасці ў рознай ступені ўскладняе магчымасць для злачынца ўчыніць новае злачынства. Мэта спецыяльнага папярэджвання дасягаецца таксама: а) рэальнасцю пагрозы крымінальнай адказнасці; б) справядлівасцю ўскладзеных мер уздзеяння крымінальнай адказнасці, іх разумнай дастатковасцю.

Мэта агульнага папярэджвання дасягаецца шляхам: а) устанаўлення адносна суровых мер уздзеяння крымінальнай адказнасці за ўчыненне злачынстваў; б) спецыфічнай працэдурай ускладання крымінальнай адказнасці; в) непазбежнасцю крымінальнай адказнасці ва ўсіх выпадках учынення злачынства.

Адзначаныя мэты крымінальнай адказнасці цесна ўзаемазвязаны. Толькі ў адзінстве яны раскрываюць сацыяльны змест і прызначэнне крымінальнай адказнасці ў грамадстве.

## §2. Крымінальныя праваадносіны і рэалізацыя крымінальнай адказнасці

Крымінальнае права, як і іншыя галіны права, выконвае свае функцыі шляхам рэгулявання адпаведных грамадскіх адносін.

Сістэма адносін, якія рэгулююцца нормамі крымінальнага права, вызначаецца сацыяльным прызначэннем гэтай галіны права ў жыцці грамадства. Крымінальнае права прызначана забяспечыць ахову грамадства ад небяспечных пасягненняў на яго інтарэсы шляхам забароны пэўных дзеянняў як злачынных пад пагрозай крымінальнай адказнасці за іх учыненне. У адпаведнасці з гэтым у нормах крымінальнага права вызначаюцца грамадска небяспечныя дзеянні, якія забаронены ў якасці злачынных, і меры крымінальнай адказнасці, якія прымяняюцца ў выпадках іх здзяйснення. Ужо гэта дазваляе сказаць, што крымінальнае права рэгулюе грамадскія адносіны, якія абумоўлены забаронай адпаведных грамадска небяспечных дзеянняў як злачынных.

Сістэма адносін, якія ўтвараюць прадмет крымінальна-прававога рэгулявання, складаецца з агульных ахавальных крымінальна-прававых і канфліктных крымінальна-прававых адносін.

Крымінальнае права пачынае выконваць сваю ахоўную функцыю з моманту прыняцця і ўступлення ў сілу закону, якім забараняецца учыненне канкрэтных дзеянняў як злачынных пад пагрозай крымінальнай адказнасці. Ахавальная функцыя крымінальнага права – перасцерагчы грамадзян ад учынення грамадска небяспечных дзеянняў, якія прызнаны крымінальным законам злачыннымі і за ўчыненне якіх прадугледжана крымінальная адказнасць. Паколькі забарона ўчыняць злачынствы прадугледжана нормамі крымінальнага права і носіць публічна-агульны і дзяржаўны характар, то крымінальны закон такім чынам устанаўлівае для грамадзян абавязак не ўчыняць злачынных дзеянняў, а для дзяржавы і яе адпаведных органаў – не лічыць злачыннымі дзеянні, якія не прадугледжаны ў якасці такіх крымінальным законам. Гэтым абавязкам адпавядае права грамадзяніна патрабаваць ад дзяржавы не лічыць злачыннымі дзеянні, якія не прадугледжаны крымінальным законам, і права дзяржавы забяспечыць выкананне патрабаванняў і межаў дзейнасці крымінальнага закону. Такім чынам, на падставе прадугледжанай крымінальным правам забароны на ўчыненне

грамадска небяспечных дзеянняў пад пагрозай крымінальнай адказнасці паміж грамадзянамі і дзяржавай узнікаюць агульныя ахавальныя праваадносіны, якія рэгулююцца крымінальным правам. У сферы агульных ахавальных крымінальных праваадносін рэалізуецца вельмі важны для кожнага грамадзяніна комплекс узаемаадносін дзяржавы і асобы, які звязаны з выкананнем асобай межаў крымінальна-прававой забароны, а таксама з забеспячэннем крымінальна-прававой недатыкальнасці асобы за ўчыненне дзеянняў, якія знаходзяцца за межамі забароненых крымінальным законам. Ахавальныя крымінальна-прававыя адносіны, якія ўзнікаюць на падставе крымінальна-прававой забароны, маюць агульны характар і ўзнікаюць непасрэдна з крымінальнага закону з моманту ўступлення яго ў сілу.

Акрамя агульных ахавальных крымінальна-прававых адносін – прадмет крымінальна-прававога рэгулявання складаюць і адносіны, якія ўзнікаюць у выпадках, калі асоба ўчыняе дзеянне, якое забаронена крымінальным законам. Адзначаныя праваадносіны вытворныя ад агульных ахавальных праваадносін і ўзнікаюць з моманту ўчынення асобай забароненага крымінальным законам дзеяння. Умоўна іх можна абазначыць, як ахавальныя канфліктныя крымінальна-прававыя адносіны. Узнікаюць яны паміж асобай, якая ўчыніла забароненае крымінальным законам дзеянне, і дзяржавай. Ахавальныя канфліктныя праваадносіны маюць сваёй мэтай урэгуляваць прававое вырашэнне пытання аб наяўнасці ці ненаяўнасці падстаў і ўмоў крымінальнай адказнасці ў сувязі з учыненнем канкрэтнай асобай забароненага крымінальным законам дзеяння.

Юрыдычным фактам узнікнення ахавальных канфліктных праваадносін з'яўляецца ўчыненне аб'ектыўна забароненага крымінальным законам дзеяння. Гэта значыць, што дадзенае дзеянне неабавязкова з'яўляецца злачынствам ці будзе прызнана злачынствам, а адпаведная асоба прыцягнута да крымінальнай адказнасці. Так, аб'ектыўна забаронена пад пагрозай крымінальнай адказнасці прычыняць другому

чалавеку фізічную шкоду, і таму паміж тым, хто гэта зрабіў, і дзяржавай у кожным такім выпадку ўзнікаюць ахавальныя канфліктныя праваадносіны. У межах гэтых праваадносін шляхам праваўрэгуляванай працэсуальнай дзейнасці можа быць устаноўлена: а) учыненае дзеянне, якое аб'ектыўна забаронена крымінальным законам, з'яўляецца злачынным і здзейснена вінавата; б) учыненае дзеянне здзейснена пры абставінах, якія выключаюць злачыннасць дзеяння (пры неабходнай абароне, затрыманні злачынца, крайняй неабходнасці), або пры абставінах, якія выключаюць крымінальную адказнасць у адпаведнасці з патрабаваннямі крымінальнага закону (пры добраахвотнай адмове і г.д.); г) учыненае дзеянне здзейснена ў стане бессвядомасці або пры адсутнасці віны асобы; д) асоба, якая ўчыніла забароненае крымінальным законам дзеянне, не дасягнула ўзросту крымінальнай адказнасці. У апошніх трох выпадках учыненае дзеянне, якое аб'ектыўна забаронена крымінальным законам, тым не менш не можа быць прызнана злачынствам з прычыны наяўнасці адзначаных абставін, і таму асоба, якая ўчыніла гэтае дзеянне, не нясе крымінальнай адказнасці. Ахавальныя канфліктныя праваадносіны спыняюцца пры ўстанаўленні названых абставін шляхам прыняцця адпаведнага рашэння ўпаўнаважаным органам дзяржавы.

У тым жа выпадку, калі ўчыненае дзеянне будзе прызнана злачынным і здзейснена вінаватай асобай, якая дасягнула ўзросту крымінальнай адказнасці, ахавальныя канфліктныя праваадносіны набываюць накірунак адносін, у межах якіх вырашаецца пытанне аб крымінальнай адказнасці і забяспечваецца яе рэалізацыя ў выпадку, калі яна будзе ўскладзена на злачынца. Такім чынам, змест ахавальных канфліктных праваадносін складае комплекс узаемных правоў і абавязкаў яго суб'ектаў на падставе норм крымінальнага закону. Так, асоба, якая ўчыніла забароненае крымінальным законам дзеянне, абавязана пры выяўленні ў дзеянні прыкмет канкрэтнага злачынства і наяўнасці ўсіх умоў крымінальнай адказнасці панесці такую адказнасць. У сваю чаргу, яна мае права патрабаваць ад дзяржавы і яе адпаведных органаў

правільнай прававой ацэнкі яго дзеяння наконт таго, складае яно канкрэтнае злачынства ці ёсць абставіны, якія выключаюць гэта, а ў выпадках, калі будзе прызнана, што ўчынена злачынства , патрабаваць справядлівай у межах закону адказнасці. З другога боку, дзяржава абавязана ацэньваць учыненае асобай дзеянне ў адпаведнасці з аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прыкметамі канкрэтнага злачынства і іншымі абставінамі, якія прадугледжаны крымінальным законам. На асобу, якая ўчыніла злачынства, дзяржава абавязана ўскладаць толькі такую адказнасць, якая прадугледжана законам. У сваю чаргу дзяржава мае права, калі будзе прызнана, што ўчыненае асобай дзеянне складае канкрэтнае злачынства, прыцягнуць злачынца да крымінальнай адказнасці, а ў прадугледжаных законам выпадках вызваліць яго ад крымінальнай адказнасці або ад пакарання.

У межах ахавальных канфліктных крымінальна–прававых адносін узнікаюць і рэалізуюцца ўласна праваадносіны крымінальнай адказнасці. Яны ўзнікаюць з моманту ўскладання крымінальнай адказнасці, гэта значыць з моманту асуджэння злачынца па прыгавору суда і назначэння ў адпаведнасці з крымінальным законам індывідуальна абазначаных мер крымінальна–прававога ўздзеяння. Нягледзячы на тое, што праваадносіны крымінальнай адказнасці ўзнікаюць на падставе і ў межах ахавальных канфліктных праваадносін, яны маюць самастойнае значэнне, заснаваны на нормах як матэрыяльнага, так і працэдурнага характару, змест гэтых праваадносін складаюць акты выканання (уздзеяння) крымінальнай адказнасці, якая ўскладзена на злачынца. Рэгулююцца адносіны крымінальнай адказнасці нормамі крымінальна–выканаўчага права, якія вызначаюць працэдуру (парадак і ўмовы) рэалізацыі крымінальнай адказнасці і мер яе ўздзеяння. Узнікаюць праваадносіны крымінальнай адказнасці паміж асуджаным і адпаведнымі органамі дзяржавы, якія рэалізуюць тую ці іншую меру крымінальнай адказнасці ў адносінах да асуджанага.

Узнікненне праваадносін крымінальнай адказнасці не спыняе ахавальных канфліктных праваадносін, на падставе якіх

яны ўзніклі. Ахавальныя канфліктныя праваадносіны спыняюцца толькі са спыненнем крымінальнай адказнасці – пагашэннем або зняццем судзімасці. Са спыненнем ахавальных канфліктных праваадносін спыняюцца і праваадносіны крымінальнай адказнасці. Кожныя з абазначаных праваадносін звязаны з крымінальнай адказнасцю, але па-рознаму. У межах ахавальных канфліктных праваадносін у адпаведнасці з нормамі крымінальнага закону вырашаюцца пытанні падстаў, аб'ёму і межаў крымінальнай адказнасці, магчымасці вызвалення, змянення і спынення крымінальнай адказнасці. Праваадносіны асабіста крымінальнай адказнасці па свайму зместу маюць мэтай вырашэнне пытанняў аб парадку і ўмовах рэалізацыі мер уздзеяння крымінальнай адказнасці ў адносінах да асуджанага.

## §3. Пагашэнне і зняцце судзімасці

Судзімасць вызначае тэрмін асуджэння асобы за ўчыненае злачынства, у межах якой асуджаны знаходзіцца ў стане падкантрольнасці і выпрабавання адносна органаў дзяржавы, якія ажыццяўляюць меры крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з прыгаворам суда і Крымінальным кодэксам. Па свайму зместу **судзімасць** (асуджэнне) уяўляе сабой рэжым крымінальнай адказнасці – прымусу і прымянення прызначанага судом пакарання або іншых мер крымінальна-прававога ўздзеяння ў сувязі з учыненнем злачынства і грамадскай небяспечнасцю асобы, якая яго здзейсніла.

На працягу тэрміну судзімасці за асуджанымі пасля адбыцця (выканання) адпаведнага пакарання ў мэтах забеспячэння яго выпраўлення і выпрабавання ў выпадках, прадугледжаных законам, устанаўліваецца адміністрацыйны нагляд. Такім чынам, на працягу судзімасці рэалізуецца крымінальная адказнасць як прававы вынік учыненага злачынства, захоўваецца прававая сувязь паміж злачынствам і крымінальнай адказнасцю за яго ўчыненне. У сувязі з гэтым новае злачынства, якое ўчынена асуджаным (асобай, якая мае судзімасць за папярэдняе злачынства) лічыцца паўторным зла-

чынствам (рэцыдывам), што сведчыць, як правіла, аб большай грамадскай небяспецы такой асобы, паколькі яна здзейсніла новае злачынства, нягледзячы на асуджэнне за папярэдняе злачынства.

Асоба лічыцца асуджанай з дня ўступлення ў законную сілу абвінаваўчага прыгавору суда да пагашэння або зняцця судзімасці.

Згодна з арт.54 КК працягласць асуджэння (судзімасці) залежыць ад віду і памеру прызначанага судом асноўнага пакарання. У залежнасці ад гэтага вызначаецца парадак пагашэння (аўтаматычнага зняцця) судзімасці пасля адбыцця асуджаным назначанага судом пакарання. Пры гэтым тэрмін судзімасці вызначаецца з фактычна адбытага асуджаным пакарання, што можа не супадаць з прызначаным па прыгавору памерам пакарання ў сувязі з датэрміновым вызваленнем, скарачэннем назначанага пакарання або заменай на больш мяккае пакаранне па вызначэнню суда, акту амністыі ці памілавання.

Асобы, якія былі асуджаны да пакарання ў выглядзе накіравання ў дысцыплінарны батальён, а таксама ваеннаслужачыя, што адбывалі пакаранне на гаўптвахце замест папраўчых работ, лічацца асуджанымі толькі на працягу адбыцця гэтых пакаранняў. Пасля адбыцця азначаных пакаранняў, у тым ліку пры датэрміновым вызваленні ад іх адбыцця, судзімасць пагашаецца.

У адносінах асуджаных да грамадскага ганьбавання, звальнення з пасады, штрафу, пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або папраўчых работ судзімасць пагашаецца па сканчэнні аднаго года з дня адбыцця пакарання. У выпадках замены папраўчых работ пазбаўленнем волі на падставе арт.28 КК тэрмін пагашэння судзімасці вызначаецца як і ў адносінах асуджанага да папраўчых работ.

Пры асуджэнні да пазбаўлення волі судзімасць пагашаецца па сканчэнні з дня адбыцця пакарання (асноўнага і дадатковага):

1) трох гадоў пры асуджэнні да пазбаўлення волі на тэрмін не больш трох гадоў;

2) пяці гадоў пры асуджэнні да пазбаўлення волі на тэрмін звыш трох гадоў, але не больш шасці гадоў;

3) васьмі гадоў пры асуджэнні да пазбаўлення волі на тэрмін звыш шасці гадоў, але не больш дзесяці гадоў.

Калі асуджаны ва ўстаноўленым законам парадку быў вызвалены ад пакарання датэрмінова, тэрмін судзімасці вызначаецца з фактычна адбытага пакарання і вылічваецца з моманту вызвалення ад пакарання (асноўнага і дадатковага). У выпадку замены пакарання на больш мяккае фактычна адбытае пакаранне вызначаецца па правілах арт.45 КК.

Пры ўмоўным вызваленні з месц пазбаўлення волі з абавязковым прыцягненнем да працы (арт.$51^2$ КК) тэрмін пагашэння судзімасці вызначаецца з фактычна адбытага пакарання, але пачынае вылічвацца пасля сканчэння тэрміну абавязковага прыцягнення асуджанага да працы.

Асобы, што былі асуджаны ўмоўна (арт.43 КК), умоўна да пазбаўлення волі з абавязковым прыцягненнем да працы (арт.$23^1$ КК) або з адтэрміноўкай выканання прыгавору (арт.$44^1$ КК), лічацца асуджанымі адпаведна на працягу выпрабавальнага тэрміну, тэрміну абавязковага прыцягнення да працы або тэрміну адтэрміноўкі пры ўмове, што яны не будуць накіраваны для адбыцця назначанага пакарання на падставах, прадугледжаных законам. Пры выкананні данай умовы судзімасць пагашаецца па сканчэнні выпрабавальнага тэрміну (тэрміну абавязковага прыцягнення да працы або часу адтэрміноўкі). У выпадках, калі асуджаны будзе накіраваны для адбыцця прызначанага пакарання, якое было ўмоўным або адтэрмінавана, на падставах, прадугледжаных законам, судзімасць пагашаецца ў адпаведнасці з правіламі п.4–7 ч.1 арт.54 КК.

Калі асуджаны пасля адбыцця пакарання, але да пагашэння судзімасці зноў здзейсніць злачынства, тэрмін судзімасці перапыняецца і пачынае вылічвацца пасля фактычнага адбыцця пакарання (асноўнага і дадатковага) за апошняе злачынства. Пры гэтым асоба лічыцца асуджанай за абодва злачынствы да сканчэння тэрміну пагашэння судзімасці за найбольш цяжкае з гэтых злачынстваў.

Артыкул 54 КК ўстанаўлівае выпадкі, калі судзімасць (становішча асуджэння) можа быць знята па вызначэнню суда. Зняцце судзімасці прадугледжана адносна асуджаных да пазбаўлення волі на тэрмін звыш дзесяці гадоў, а таксама асуджаных, якія прызнаныя асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі. Судзімасць з гэтай катэгорыі асуджаных можа быць знята судом па сканчэнні васьмі гадоў з дня адбыцця пакарання (асноўнага і дадатковага), калі будзе ўстаноўлена, што асуджаны выправіўся і няма неабходнасці лічыць яго маючым судзімасць.

Па вызначэнню суда судзімасць можа быць знята датэрмінова (да сканчэння тэрміну яе пагашэння) па хадайніцтву грамадскіх арганізацый, але толькі адносна асуджаных да пазбаўлення волі, калі яны пасля адбыцця пакарання сваімі паводзінамі і адносінамі да працы даказалі сваё выпраўленне (ч.2 арт.54 КК).

Судзімасць асобы можа быць таксама скасавана на падставе акта амністыі або памілавання.

Пагашэнне або зняцце судзімасці канчаткова анулюе прававыя вынікі ўчыненага злачынства і саму крымінальную адказнасць.

## *Літаратура:*

Прохоров В. С. Преступление и ответственность. Л., 1984; Прохоров В.С., Кропачев Н.М., Тарбагаев А.Н. Механизм уголовно–правового регулирования. Красноярск, 1989; Сталов А.И. Теоретические вопросы уголовной ответственности. Л., 1982; Хомич В.М. Содержание уголовно–правового регулирования (теоретический аспект) // Право и демократия: Межвуз.сб.науч.тр. Минск, 1990. Вып.3; Хомич В.М. Правоотношения уголовной ответственности // Право и демократия: Межвуз.сб. науч.тр. Минск, 1992. Вып.5.

# Глава 14

# КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ

У гісторыі крымінальнага права розных народаў мелася шмат агульнага, аднак выяўляліся і асаблівасці. Распрацаванасць інстытутаў крымінальнага права, характар і інтэнсіўнасць карнай палітыкі мяняліся ў залежнасці ад эпохі, агульнай культуры народа, спосаба жыцця людзей, іх звычаяў і г.д. Гістарычны аналіз праблемы злачынства і пакарання ў Беларусі, як і ўвогуле вывучэнне прававой спадчыны беларускага народа, досыць доўга стрымліваліся шэрагам фактараў. У невялікай колькасці навуковых публікацый толькі закраналася гэта праблема, часцей за ўсё ў выглядзе кароткай характарыстыкі асноўных палажэнняў і інстытутаў крымінальнага права.

## §1. Крымінальнае права феадальнай Беларусі

Непасрэдна праблеме злачынства і пакарання ў феадальнай Беларусі прысвечаны вядомыя толькі вузкаму колу спецыялістаў працы дарэвалюцыйных вучоных І.Н.Даніловіча, Г.В.Дземчанкі, Н.А.Максімейкі, І.А.Маліноўскага. Асаблівай увагі заслугоўваюць праца Маліноўскага "Учение о преступлении по Литовскому Статуту" (Кіеў, 1894 г.) і праца Дземчанкі "Наказание по Литовскому Статуту в трёх его редакциях" (Кіеў, 1894 г.), дзе не толькі даецца навуковы аналіз інстытутаў крымінальнага права, але і абагульняецца і аналізуецца вялікая колькасць судовых дакументаў.

Галоўнай крыніцай вывучэння крымінальнага права з'яўляюцца помнікі права. У першых пісаных помніках права феадальнай Беларусі, што дайшлі да нашага часу, утрымліваліся толькі асобныя крымінальныя прававыя нормы і па іх цяжка судзіць аб узроўні развіцця крымінальнага права. Аднак

першыя заканадаўчыя акты Вялікага Княства Літоўскага (дзяржавы, палітыка–эканамічным цэнтрам якой былі беларускія землі) сведчаць аб пэўнай развітасці крымінальнага права. Напр., у агульназемскіх граматах 1447, 1492 гг. гаварылася аб адказнасці кожнага чалавека за свае злачынствы ў судовым парадку, у адпаведнасці з прававымі нормамі і "подлуг их великости проступков". Першы кадыфікаваны крымінальны закон — Судзебнік Казіміра 1468 г., складзены на аснове мясцовага звычаёвага права і судовай практыкі, развіваў ідэю індывідуалізацыі пакарання, рабіў спробу абмежаваць узрост крымінальнай адказнасці, устанавіў адзіныя для ўсёй дзяржавы віды пакаранняў за злачынствы супраць феадальнай уласнасці і інш.

У Судзебніку выявіўся і новы погляд на мэты пакарання. Ранейшае звычаёвае права галоўнай мэтай пакарання лічыла пакрыццё пацярпеўшаму прычыненай злачынствам шкоды, што дасягалася грашовай кампенсацыяй, якая выплачвалася не толькі вінаватым, але ўсёй сям'ёй ці нават абшчынай. Судзебнік жа вызначыў галоўнай мэтай пакарання застрашванне, хаця не выключаліся і маёмасныя кампенсацыі. Смяротная кара і цялесныя пакаранні прадугледжваліся ў многіх артыкулах Судзебніка. У арт.12 гаварылася: "А над злодзеем милости не надобе". Упершыню ў законе гаварылася аб аналогіі закону. Паводле арт.23 за ўтойванне знойдзенай маёмасці прадугледжвалася пакаранне па аналогіі з крадзяжом.

Судзебнік 1468 г. паклаў пачатак новаму этапу ў развіцці прававой тэорыі і практыкі кадыфікацыі заканадаўства, што завяршылася выданнем трох Статутаў 1529, 1566 і 1588 гадоў.

Пры распрацоўцы Статутаў упершыню былі вырашаны складаныя тэарэтыка–прававыя праблемы і практычныя задачы. Заканадаўца выпрацаваў новую сістэму і структуру размяшчэння прававых нормаў, якая адрознівалася ад прынятай у Еропе класічнай рымскай сістэмы права, абагульніў усё папярэдняе заканадаўства, увёў шмат новых прававых нормаў і г.д., але самае галоўнае – падрыхтаваў адзіны збор законаў

для выкарыстання ў судова–адміністрацыйнай практыцы дзяржавы. Да таго ж трэба адзначыць, што Статут 1588 г., які быў дзеючым заканадаўчым актам амаль да сярэдзіны XIX ст., на сродкі Л.Сапегі быў выдадзены ў Віленскай друкарні братоў Мамонічаў адразу пасля прыняцця і таму стаў даступным шырокаму колу людзей.

Ідэі рэнесанснага гуманізму пранізвалі Статут і знайшлі адлюстраванне ў крымінальных нормах. Звяртаючыся да ўсіх падданых дзяржавы і ўдакладняючы – як да багатых, так і да бедных, вялікі князь абяцаў "справедливость водле права чинити" (р.XI, арт.14 – тут і далей спасылкі на Статут 1588 г.) і "судити и справовати всех станов ... однако и одностайне" (р.IY, арт.3). Закон рэгламентаваў адносна невялікія тэрміны турэмнага зняволення (да аднаго года і шасці тыдняў), забараняў смяротнае пакаранне цяжарных жанчын, замацоўваў павышаную адказнасць за злачынствы супраць жанчын, патрабаваў пры вызначэнні меры пакарання ўлічваць усе акалічнасці справы і суддзям кіравацца толькі законам і ўласным сумленнем, а ў выпадках сумненняў – схіляцца да вызвалення падсуднага ад адказнасці і шмат іншага. Статут быў адным з першых заканадаўчых актаў Еропы, крымінальныя нормы якога былі накіраваны на ахову прыроды, падтрыманне і павелічэнне яе рэсурсаў, рацыянальнае іх выкарыстанне.

Пры распрацоўцы новых крымінальна–прававых норм улічваліся дасягненні сусветнай юрыдычнай навукі. Многія прававыя тэрміны мелі на той час ужо ўстойлівы характар, хаця і выкарыстоўваліся часам у розных значэннях. На працягу XYI ст. большасць інстытутаў і норм крымінальнага права былі значна зменены. Інстытуты неабходнай абароны, крайняй неабходнасці, саўдзелу і г.д. яшчэ не набылі дакладнага юрыдычнага азначэння і перадаваліся шляхам апісання. Заканадаўца, як правіла, карыстаецца звычайнай гутарковай мовай, хаця некаторыя словы набываюць ужо юрыдычны характар і пачынаюць выкарыстоўвацца як спецыяльныя прававыя тэрміны. Пры гэтым часцей за ўсё заканадаўца не дае ім тлумачэння, а сэнс іх можна зразумець толькі праз параўнальны аналіз шматлікіх прававых норм.

Недастатковае развіццё юрыдычнай тэхнікі прыводзіць да шматслоў'я, паўтарэння адных і тых жа палажэнняў, казуістычнасці, няпоўнасці крымінальнага закону. У Статутах не толькі часам адсутнічаюць выразныя фармулёўкі, але і няма добра вызначанай класіфікацыі злачынных дзеянняў, у сувязі з чым заканадаўца суправаджае агульныя палажэнні і азначэнні рознымі агаворкамі, абмежаваннямі і выключэннямі.

У большасці выпадкаў апісанне злачынных дзеянняў уключае залішнія падрабязнасці, індывідуальныя рысы. Заканадаўца спрабуе прадугледзець усе магчымыя выпадкі здзяйснення злачынства і таму некаторыя склады аднаго і таго ж злачынства адрозніваюцца толькі па прыкмеце рознага сацыяльнага стану злачынца або пацярпеўшага. Усё гэта прыводзіць да шматслоў'я і ўскладняе ўспрыманне крымінальнага закону. Акрамя таго, аб'яднанне ў адным артыкуле палажэнняў крымінальнага і працэсуальнага, а часам і іншых галін права стварае цяжкасці ва ўсведамленні сэнсу крымінальна–прававой нормы.

Большая частка крымінальнаправавых норм складаецца з дыспазіцыі і санкцыі ў дастаткова выразным іх выкладанні, хаця маюцца нормы, якія складаюцца з адной толькі дыспазіцыі.

Як правіла, дыспазіцыі пачынаюцца словамі: "естли бы хто", "пакли бы хто", "хто бы", пасля чаго ідзе назва або апісанне злачынства. Часам заканадаўца прыводзіць апісанне таго, што злачынец робіць, і таго, што ён мог бы зрабіць, але не зрабіў. У дыспазіцыю ўключаюцца розныя агаворкі, адступленні ад агульных правілаў і інш. Крымінальныя санкцыі часцей за ўсё пачынаюцца словамі: "таковых", "тогды", "тот" і інш., пасля чаго апісваюцца адпаведныя пакаранні. Як правіла, канструкцыі крымінальных артыкулаў складаныя, грувасткія. Яны нярэдка ўтрымліваюць пераходныя палажэнні, якія гавораць аб тым, што злачынства ёсць парушэнне прававой нормы, што пакаранне прымяняецца толькі ў выпадку даказанасці крымінальнага дзеяння ў судовым парадку і г.д. Акрамя таго, асобны артыкул можа ўтрымліваць некалькі складаў злачынства, аб'яднаных адным

суб'ектам ці аб'ектам злачыннага дзеяння, або ў ім падрабязна рэгламентуюцца працэсуальныя асаблівасці расследавання і інш. Крымінальныя санкцыі прадугледжвалі розныя па свайму характару віды пакаранняў, часам у выглядзе самых мудрагелістых камбінацый, усю разнастайнасць якіх заканадаўца ўсё роўна не мог загадзя прадугледзець і рэгламентаваць.

**Паняцце злачынства.** Працэс эвалюцыі феадальнага крымінальнага права знайшоў адлюстраванне перш за ўсё ў поглядах на сутнасць і змест злачыннага дзеяння. У больш старажытны перыяд, калі на тэрыторыі беларускіх дзяржаў–княстваў (Полацкага, Пінскага, Наваградскага, Берасцейскага і інш.), а таксама першапачаткова на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага панавала звычаёвае права, змест злачыннага дзеяння вызначаецца чыста знешнімі прыкметамі – прычыненнем шкоды прыватнай асобе. Пазней, у XY ст. можна прасачыць барацьбу састарэлага погляду на злачынства з пункту гледжання прыватнай асобы і больш позняга – з пункту гледжання грамадскіх інтарэсаў, калі ў змесце злачынства пачынаюць бачыць больш скрытую прыкмету – умяшанне ў сферу прыватных правоў, а яшчэ пазней – і пасягненне на грамадскі правапарадак.

На працягу XV–XYI стст. выпрацоўваецца спецыяльная юрыдычная тэрміналогія, аднак заканадаўца карыстаецца, як правіла, звычайнай гутарковай мовай, шмат якія словы выкарыстоўваюцца ў розных значэннях і сутнасць іх высвятляецца толькі шляхам тлумачэння. У заканадаўчых актах адзначанага перыяду сустракаюцца розныя назвы злачыннага дзеяння: "выступ", "выступок", "кривда", "учинок", "злочинство", "шкода", "гвалт", "збыток" і інш. Усе гэтыя тэрміны падкрэсліваюць розныя бакі злачыннага дзеяння, у змест якога заканадаўца часта адначасова ўключае і "кривду" для пацярпеўшага, і "шкоду" дзяржаўную, і парушэнне "покоя посполитого", і грэх, "противный пану Богу". Для раскрыцця пэўных характэрных рыс злачынства часам выкарыстоўваюцца тэрміны "учынок", "злочинство", "гвалт", прычым заканадаўца адмяжоўвае ад простага "учинка" "горячий

учинок" злачынства, пасля здзяйснення якога не мінула 24 гадзіны. Словы "злочинство" і "злодейство" ў сэнсе "злой" (дрэннай) справы часцей за ўсё выкарыстоўваліся для азначэння пасягнення на маёмасныя правы. Менавіта таму заканадаўца ў Статуце 1588 г. згрупаваў у адным раздзеле гэтую катэгорыю злачынстваў (р.XIII "О злодействе всякого стану"). Закон часам называе "гвалтам" як само злачыннае дзеянне (у першую чаргу рознага роду самаўпраўствы адносна чужой маёмасці), так і адну з яго характэрных рысаў, адэкватных сучаснаму паняццю "насілле". Заканадаўца часта выкарыстоўвае як агульнавядомыя тэрміны "гвалтовне", "гвалтовным обычаем", не растлумачваючы іх. Са зместаў артыкулаў можна зразумець, што яны вызначаюць прымяненне да пацярпеўшага фізічнага і псіхічнага прымусу.

Даволі рэдкі ў крымінальным законе тэрмін "збыток" адлюстроўваў хуліганскія дзеянні (бясчынства, буянства). Заканадаўца часам замяняў слова "злачынства" словамі "своволенство", "неслушеньство". Гэтым падкрэсліваліся характэрныя рысы некаторых супрацьзаконных дзеянняў, у першую чаргу злачынстваў супраць парадку кіравання, супраць правасуддзя.

Характарызуючы некаторыя склады злачынстваў, заканадаўца адначасова дае ім маральную ацэнку і называе такія злачынныя дзеянні ганебнымі, грэшнымі, амаральнымі. Напр., адзначае, што злачынец дзейнічаў,"пробачивши боязни бозское и встыду людского".

Упершыню паняцце злачынства, больш блізкае да сучаснага сустракаецца ў агульназемскай грамаце Казіміра 1447 г., дзе яно характаразуецца як "проступка". У першым кадыфікаваным крымінальным законе – Судзебніку 1468 г. назіраецца больш выразнае азначэнне супрацьзаконнага характару злачыннага дзеяння, дзе заканадаўца выкарыстоўвае і такія словазлучэнні, як "выступ из права", "над правам сягнуць".

У Статутах першасная ўвага надаецца супрацьзаконнасці злачынства, яго грамадскай небяспецы. У Статуце 1588 г. шмат разоў паўтараецца, што злачынства з'яўляецца агульнашкодным, агульнанебяспечным, супрацьзакон-

ным дзеяннем. Нягледзячы на тое, што феадальны крымінальны закон не ўтрымлівае поўнага і акрэсленага паняцця злачынства, аднак, зыходзячы з аналізу адпаведных крымінальна-прававых норм, можна зрабіць вывад, што злачынствам лічыцца супрацьзаконнае, віноўнае дзеянне, якое ўключае ў сябе элемент грамадскай небяспекі, робіць замах на феадальны грамадскі лад, правапарадак, уласнасць, асобу, яе правы і інтарэсы.

**Склад злачынства.** Крымінальны феадальны закон не ведаў такога паняцця, як склад злачынства. Увогуле заканадаўчыя акты XIV–XV стст. утрымлівалі толькі асобныя крымінальна-прававыя нормы і палажэнні. Толькі ў Статутах 1529 г., 1566 г. і асабліва ў Статуце 1588 г. назіраецца дастаткова поўнае і паслядоўнае выкладанне ўсіх асноўных палажэнняў крымінальнага права, у тым ліку агульныя прынцыпы крымінальнага права, пералік злачынстваў і пакаранняў, азначэнне акалічнасцей, якія выключалі крымінальную адказнасць і інш. Закон добра адзначае таксама ўсе састаўныя часткі складу злачынства, дастаткова выразна апісвае істотныя і тыповыя яго прыкметы.

**Аб'ект злачынства.** Заканадаўца прызнае аб'ектам злачынства канкрэтныя даброты і інтарэсы асоб, аднак размяжоўвае іх адносна саслоўнага становішча. Статут 1588 г., унёсшы ўклад у развіццё тэорыі крымінальнага права, прызнае таксама аб'ектам злачынства адносіны па падтрыманню грамадскага парадку ("покою постолитого") і грамадскай маральнасці (р.XI, арт.60). Адначасова Статут рэгламентуе выпадкі, калі пасягненне на даброты і інтарэсы асоб не лічацца злачыннымі. У прыватнасці, не прызнаецца злачынствам забойства "вываланца" (асобы, прысуджанай да выгнання за межы дзяржавы), а таксама замах на жыццё збеглага дзяржаўнага злачынца. (р.I, арт.7).

Статут рэгламентуе і двухаб'ектныя злачынныя дзеянні. Так, пры замаху на жыццё асобы, якая мела ахоўную грамату вялікага князя, аб'ектам злачынства з'яўляецца не толькі жыццё чалавека, але і парушэнне княжацкай "уставы" (р.I, арт.13).

**Аб'ектыўны бок злачынства.** У XYI ст. шмат увагі надаецца і прыкметам, якія характарызуюць злачынства ў яго знешнім праяўленні: само грамадска небяспечнае дзеянне, прычынная сувязь паміж ім і вынікамі, а таксама месца, спосаб, час і абставіны здзяйснення злачынства. Статутныя нормы гавораць аб тым, што злачынства можа быць здзейснена як у форме актыўных дзеянняў чалавека, так і ў форме ўстрымання ад пэўных дзеянняў, якія былі пажаданы заканадаўцу, так званая злачынная бяздзейнасць (невыкананне воінскіх абавязкаў, некаторых прафесійных абавязкаў, неданясенне аб злачынстве і інш.).

Для наяўнасці складу некаторых дзяржаўных злачынстваў закон лічыў дастатковым выяўленне злачыннай волі ў форме пагрозы ("похвалка", "отповедь"). Замах закон разглядае толькі адносна дзяржаўных злачынстваў і супраць асобы. Дасягненне або недасягненне злачыннай мэты амаль не ўплывае на момант сканчэння злачынства і яго кваліфікацыю. Заканадаўца ў пэўнай ступені адрознівае матэрыяльныя і фармальныя склады злачынстваў, бо часам у апісанне прыкмет аб'ектыўнага боку ўключае і прычынную сувязь паміж дзеяннем і вынікамі. Так, у выпадку смерці пацярпеўшага ад нанесеных яму ран, вінаваты караўся як за забойства. Аднак, калі смерць пацярпеўшага наступала пасля 24 дзён, то заканадаўца ўжо не бачыў прычыннай сувязі паміж дзеяннем і вынікамі (р.XI, арт.53).

У большасці выпадкаў заканадаўца ўключае ў склад злачынства спосаб яго здзяйснення. Вялікае значэнне надаецца месцу здзяйснення злачынства. У артыкулах, дзе гаворыцца, што злачынства адбылося "при дворе господарском", "в месте нашом судовом", "на проезжой дорозе", прадугледжваюцца больш жорсткія санкцыі. Заканадаўца таксама звяртае ўвагу на асаблівую небяспечнасць злачынстваў у месцах, дзе прысутнічае вялікая колькасць людзей. У шэрагу норм звяртаецца ўвага на час здзяйснення злачынства ("в заваде вечерней", "посполитом рушеньи" і інш.) Часам у аб'ектыўны бок злачынства ўключаюцца іншыя абставіны (напр., супраціўленне прадстаўніку

ўлады пры выкананні ім службовых абавязкаў). У пэўных выпадках такія дзеянні ўтвараюць асобны склад злачынства, напр., забойства ў стане неабходнай абароны.

**Суб'ект злачынства.** Прынцып асабістай адказнасці абвяшчаўся ў першых заканадаўчых актах Вялікага княства Літоўскага. Грамата Казіміра 1447 г. гаварыла, што кожны злачынец сам адказвае за свае "проступки" і не можа несці адказнасці "ни жена за проступку мужа своего, а ни отец за проступку сына, а ни иный прироженый, а ни слуга ..." Выключэнне рабілася толькі ў адносінах да дзяржаўных злачынстваў. Акрамя таго, трэба адзначыць, што ў адносінах простых людзей доўгі час дзейнічала старажытнае звычаёвае права з яго калектыўнай адказнасцю. Так, у копным судаводстве ў выпадку, калі след злачынца прыводзіў да пэўнай вёскі, жыхары яе павінны былі знайсці і выдаць злачынца або калектыўна пакрыць усе панесеныя ад злачынства страты і выплаціць судовыя штрафы.

Суб'ектам злачынства закон прызнаваў толькі чалавека (нават калі шкоду зрабіла жывёла), які дасягнуў пэўнага ўзросту і быў у поўнай памяці (наяўнасць свядомасці). Упершыню аб узросце крымінальнай адказнасці згадвае Судзебнік 1468 г., дзе гаворыцца, што дзеці да сямігадовага ўзросту не могуць перадавацца ў рабства на адпрацоўку злачынства, учыненага бацькам (арт.1). Заканадаўца ў XYI ст. вагаецца ў вызначэнні ўзросту крымінальнай адказнасці. Так, у Статуце 1529 г. гаворыцца аб паўналецці асоб толькі ў сувязі з грамадзянска-прававымі адносінамі Статут 1566 г. рэгламентуе ўжо крымінальную адказнасць з 14–гадовага зросту, а Статут 1588 г. канчаткова замацоўвае яе з 16–гадовага ўзросту. Шкода ад злачынства, здзейсненага непаўналетнім, кампенсавалася бацькамі або іншымі сваякамі ці апекунамі.

Як правіла, не падлягалі крымінальнай адказнасці псіхічна хворыя асобы. Заканадаўца не дае поўнага азначэння стану бессвядомасці, аднак адрознівае "дурней" і "шалёных", якія "за допущеньем Божьим от розуму отошедши". Гэтыя асобы пры здзяйсненні злачынстваў падлягалі спецыяльнай ізаляцыі і нагляду з боку сваякоў, слуг ці "вряда", г.зн. мясцовай

адміністрацыі. У выпадку ўцёкаў з–пад варты яны маглі быць падвергнуты турэмнаму зняволенню, а пры здзяйсненні новага злачынства ў асобных выпадках і больш цяжкаму пакаранню (р.XI, арт.35).

Закон гаворыць і аб стане алкагольнага ап'янення. Злачынствы, якія былі здзейснены "з опильства", лічыліся здзейсненымі "по злому умыслу" (р.XI, арт.15, 22).

**Суб'ектыўны бок злачынства.** Статут 1588 г. дастаткова выразна размяжоўвае віну наўмысную і неасцярожную і выкарыстоўвае тэрміны "умыслне", "неумыслне" як агульнавядомыя. У наўмысных злачынствах акрэсліваюцца два элементы: усведамленне суб'ектам супрацьзаконнасці свайго дзеяння і жаданне здзяйснення яго. Для характарыстыкі наўмыснасці злачынства заканадаўца выкарыстоўвае словы "ведаючы", "умыслне" і інш. Сведчанне жадання асобы здзейсніць злачынства мы бачым у шэрагу дыспазіцый, дзе апісваецца характар дзеяння злачынца: "тайно", "скрыто", "исподтишка", "гвалтовне" і інш. Адназначна характарызуюцца як наўмысныя дзяржаўныя злачынствы.

Адносна неасцярожнай віны заканадаўца непаслядоўны. Так, пры "неумыслном а пригодном мужобойстве", якое адбылося пры пэўным збегу акалічнасцей ("с пригоды, а не хути, не в зваде, але з неведомости"), закон выпускае з віду асноўную прыкмету адрознення выпадку (казусу) ад неасцярожнасці–адсутнасць магчымасці прадбачання небяспечных вынікаў, хаця само паняцце "казус" вядома заканадаўцу пад назвай "пригода". Неасцярожнасць, як правіла, цягнула за сабой толькі выплату штрафу, які ў выпадку забойства меў назву "галоўшчызна". Статут 1588 г. асабліва адзначаў як неасцярожнае злачынства забойствы: 1) у час палявання; 2) пры будаўніцтве дома, калі цагліна ці што–небудзь іншае звалілася на галаву чалавека; 3) пры сячэнні дроў, калі зляцеў тапор з тапарышча; 4) пры спіленні дрэва, калі яно звалілася на чалавека; 5) пры стральбе з лука або з ружжа, калі страла або куля адхіліліся ў бок і трапілі ў чалавека (р.XI, арт.23). Праяўленую неасцярожносць асоб, якія па роду сваёй дзейнасці павінны былі добрасумленна выконваць пэўныя аба-

вязкі, заканадаўца часам адносіць да наўмысных злачынстваў. Так, турэмны наглядчык адказвае за ўцёкі зняволенага, адвакат – за тое, што "ку шкоде кому што у права недбальствам своим упустил", і інш.

Матыў злачынства амаль не ўплываў на ступень небяспекі і пакаральнасці, аднак у шэрагу артыкулаў заканадаўца звяртае ўвагу на яго як на абцяжарваючыя або змякчаючыя адказнасць акалічнасці (напр., забойства ў "зваде" (сварцы), у стане моцнага душэўнага хвалявання і інш.). Мэта злачынства была абавязковай прыкметай крымінальных дзеянняў, якія здзяйсняліся з прамым намерам. У некаторых выпадках заканадаўца ўводзіць у разрад характэрных прыкмет злачынства ўказанне на мэту ўчынкаў суб'екта. Так, уцёкі ў непрыяцельскія землі прызнаваліся злачынствам, калі здзяйсняліся з мэтай прычынення шкоды "господару, и речи посполитой", г.зн. вялікаму князю і дзяржаве (р.I, арт.6). Указанне на мэту не толькі служыць доказам наўмыснасці дзеяння, але часам з'яўляецца падставай для размежавання асобных відаў злачынстваў. Так, забойства брата або сястры з мэтай заўладання спадчыннай нерухомасцю вылучана Статутам 1588 г. у асобны склад злачынства (р.XI, арт.8).

**Саўдзел і датычнасць да злачынства.** Статутавае заканадаўства добра ведае саўдзел і адрознівае яго асноўныя формы: простую, пры якой усе саўдзельнікі прымаюць удзел ва ўчыненні дзеянняў, што складаюць дадзенае злачынства (савыканаўства); складаную з падзелам роляў; злачынную суполку — устойлівае аб'яднанне асоб для сумесных учыненняў злачынстваў. Аднак часам нават Статут 1588 г. блытае розныя віды саўдзелу. Адсутнічае паслядоўнасць і пытанні пакарання садзельнікаў.

У шэрагу артыкулаў віды саўдзельнікаў выразна акрэслены. Як правіла, аднолькавую адказнасць нясуць усе ўдзельнікі злачынства, якія былі савыканаўцамі. Так, за наўмыснае забойства шляхціца людзьмі "простага стану" ўсе злачынцы караюцца смерцю (р.XI, арт.39). Тым не менш часам, асабліва ў сувязі з саслоўнай прыналежнасцю чалавека, адказнасць размяркоўваецца нераўнамерна. Напр., за забойства шляхціца,

якое адбылося "в зваде", смяротнай кары падлягаў адзін шляхціц або смерцю караліся трое простых людзей (па Статуту 1566 г. — сямёра), астатнія саўдзельнікі падвяргаліся турэмнаму зняволенню ці штрафу, прычым закон не рэгламентуе, па якіх падставах адбываўся выбар (р.XI, арт.29, 39).

Пры складанай форме саўдзелу закон вылучае арганізатара злачынства (называючы его часам галоўным злачынцам), выканаўцаў і "помочников", г.зн. памагатых, якія садзейнічалі выкананню злачыннага дзеяння "конми, зброею, людьми албо пенезми" і інш. (р.XI, арт.38). Апошнія асобы павінны былі прывесці ў суд выканаўцаў, і караліся яны ў залежнасці ад ступені ўдзелу і іншых абставін. Пры гэтым Статут 1588 г. ўдакладняў, што "слуги панов своих за помочники розумены быти не могуть" (р.XI, арт.1).

Закон надае шмат увагі такому віду саўдзелу, як падбухторванне, вызначаючы ролю асобы, што з'явілася ініцыятарам здзяйснення злачынства шляхам узбуджэння ў іншай асобы жадання ажыццявіць злосны намер. У выпадку, калі падбухторшчык ажыццяўляў свой намер фізічнымі сіламі другой асобы ("з направы своее через кого колвек"), то за цяжкія злачынствы, як правіла, абодва караліся аднолькава (р.XI, арт.17, 60 і інш.). Калі ж заканадаўца бачыў у дзеяннях гэтых асоб толькі "кривду" або "шкоду", а не грамадскую небяспеку адказвалі толькі выканаўцы. Пры адсутнасці выканаўцы задаволіць пацярпеўшага павінен быў падбухторшчык, які пры гэтым меў права самастойна шукаць выканаўцу (р.X, арт.41).

Падбухторшчык псіхічна хворага чалавека разглядаўся як выканаўца: "хто такому шалёному брони додал альбо его ку збытку словы побудил, тогда тот сам водлуг важности выступку за то утерпети повинен" (р.XI, арт.35).

У законе агаворваліся і выпадкі неабходнага саўдзелу, калі для наяўнасці складу злачынства патрэбна была сукупная дзейнасць некалькіх асоб. Да іх належалі: дуэль, выкраданне замужняй жанчыны з мэтай шлюбу, двоежонства, "чужоложство" (пралюбадзейства), шлюб у недазволеных ступенях роднасці.

Заканадаўца XYI ст. жадае адмежаваць злачынства ад іншых з'яў грамадскага жыцця, хутчэй раскрыць злачынства, а таксама хутчэй ізаляваць злачынца. Асобы, якія ведалі аб злачынстве, калі іх дзейнасць не знаходзілася ў прычыннай сувязі са злачынным вынікам, як правіла, не прыцягваліся да адказнасці. Аднак Статуты ведаюць некалькі відаў загадзя не абяцанага дзеяння, якое не мела прычыннай сувязі са злачынным вынікам і ўтварала самастойны склад злачынства (датычнасць да злачынства): укрывальніцтва злачынства, неданясенне аб злачынстве, карыстанне вынікамі злачынства і патуранне.

Асобую заканадаўчую рэгламентацыю атрымала ў Статуце 1588 г. укрывальніцтва злачынства, якое праяўлялася ў актыўных паводзінах асобы з мэтай хавання злачынцаў, а таксама хавання прылад і сродкаў здзяйснення злачынства. Закон гаворыць аб "переховыванъи" злачынцаў, прыняцці іх на службу (р.XI, арт.36; рXIY, арт.13); дапамозе ва ўцёках або дапушчэнні ўцёкаў да судовага разгляду справы (р.XIY, арт.13); стварэнні перашкод службовай асобе пры затрыманні злачынца (р.IY, арт.32); вызваленні асуджанага (р.IY, арт.31) і інш.

Пакаранне за ўкрывальніцтва залежала ад цяжкасці злачынства, катэгорый злачынцаў і іншых абставін. Так, асобы, што хавалі "злочинцев, разбойников, злодеев явных, людей выволаных", караліся так, як і самі злачынцы (р.XI, арт.36).

Аб'ектыўны бок такога віду датычнасці да злачынства, як карыстанне здабыткамі злачынства, адлюстраваны словамі: "тех речей злодейских ведома поживал" (р.XI, арт.36). Аднак у дыспазіцыі гэтай прававой нормы не ўдакладнялася, якіх менавіта "речей", і не давалася азначэння паняцця "поживал". Гаварылася толькі аб абавязковай умове ведання, што ў карыстанні знаходзіліся "речи злодейские".

Адносна неданясення аб злачынствах Статут, па агульнаму правілу, не прадпісвае падданым дзяржавы даносіць аб злачынных дзеяннях, але закон робіць выключэнне і нават абяцае ўзнагароду ў выпадку данасу аб падрыхтоўцы

дзяржаўнага злачынства. У Статуце прадугледжана цяжкае пакаранне ("честь и горло тратити мають") за неданясенне паўналетніх сыноў аб падрыхтоўцы іх бацькам дзяржаўнага злачынства, аднак закон патрабуе пры гэтым пераканаўчых доказаў таго, што сыны злачынца былі "ведомыми тое здрады отцовское" (р.I, арт.3).

Такі від датычнасці да злачынства, як злачыннае патуранне, прыраўноўваўся да саўдзелу, і вінаваты караўся аналагічна з выканаўцам. У сувязі з гэтым прамым абавязкам службовых асоб дзяржавы (ваяводаў, старостаў, дзяржаўцаў, войта і інш.) быў нагляд за выкарыстаннем гандлярамі правільных мер і вагаў, а таксама барацьба са злачыннасцю, тайнымі корчмамі і г.д.

**Абставіны, якія выключаюць злачыннаць дзеяння.** У адпаведнасці з дэкларованымі Статутам 1588 г. прынцыпамі справядлівасці, законнасці судаводства закон вызначае і падставы, якія выключалі злачынны характар дзеянняў. Гэта перш за ўсё неабходная абарона (добра вядомая ўжо ў Статуце 1529 г.), крайняя неабходнасць, а ў некаторых выпадках рэалізацыя прыватнага права і згода пацярпеўшага.

Найбольшую распрацоўку ў законе атрымаў інстытут неабходнай абароны. У Статуце 1588 г. гаворыцца, што стан неабходнай абароны мае месца тады, калі "за початком" нападаючага асоба вымушана абараняцца ад замаху ("ку обороне примушоный"), г.зн. асоба правамерна абаранялася. Дзеяннямі асобы, адносна якой адбываецца агрэсія і якая абараняецца, кіруе не злая воля, а неабходнасць. Яна вымушана абараняць жыццё, здароўе, маёмасць, прычым не толькі сваё, але і трэціх асоб.

Заканадаўца канкрэтна не гаворыць, але добра разумее, што стан неабходнай абароны мае месца ў пэўных межах, таму падкрэслівае супрацьзаконнасць нападу. Нормы Статута рэгламентуюць, што стан неабходнай абароны можа быць супраць "гвалтовника", яго "помочников", супраць злодзея, супраць выкрадальніка жонкі і інш. Не можа быць неабходнай абароны супраць асоб, якія дзейнічаюць на законных падставах. Закон не прызнае таксама неабходнай

абароны "в зваде". Забойства ў сварцы зачыншчыка трактавалася як неасцярожнае і за яго выплачвалася толькі галоўшчызна (р.XI, арт.22). У выпадку забойства таго, хто "засел на дорозе", закон гаворыць аб стане неабходнай абароны і выключае крымінальную адказнасць – "от горла, головщизны, везенья и от шкоды волен будетъ" (р.XI, арт.21). Аднак пры гэтым заканадаўца патрабуе наяўнасці сапраўднай (рэальнай) небяспекі, г.зн. ажыццяўлення нападаючым пэўных дзеянняў з мэтай рэалізацыі свайго злачыннага намеру. Прычым заканадаўца не абмяжоўвае стан неабходнай абароны момантам сканчэння замаху, а падаўжае яго да таго моманту, калі будзе вернута страчанае або будзе злоўлены злачынец. Момант затрымання "злодея утекаючего" і з'яўляецца момантам сканчэння стану неабходнай абароны (р.IY, арт.62).

Лічыцца правамернай неабходная абарона ў выпадку, калі слуга абараняе свайго пана, або госць – гаспадара домаўладання (р.XI, арт. 19, 25). Трэба адзначыць, што закон не патрабуе суразмернасці абароны характару і небяспецы замаху, аднак рэгламентуе некаторыя працэсуальныя асаблівасці расследавання такіх спраў, як умовы правамернасці неабходнай абароны. У прыватнасці, аб забойстве нападаючага закон патрабаваў неадкладна паведаміць бліжэйшым суседзям і "судоваму вряду", а труп павінены былі агледзець возны (асоба, якая выконвала следчыя функцыі і была судовым выканаўцам), панятыя. Яго трэба было даставіць ў бліжэйшы суд. Акрамя таго, адразу ж у судзе асоба, якая забіла нападаўшага, павінна была прынесці прысягу аб тым, што знаходзілася ў стане неабходнай абароны (р.XI, арт.2022).

Крайняя неабходнасць, як акалічнасць, што выключала злачынны характар дзеяння і яго каральнасць, прызнаецца Статутам 1588 г. у двух выпадках: пры здачы крэпасці непрыяцелю па прычыне голаду "гвалтовного" (р.I, арт.3) і пры забойстве чужога сабакі "кием або якою бронею, себе боронечи не пометом, ани стрелбою" (р.XIII, арт.13).

Прызнаючы за прыватнымі асобамі права ўзбуджэння крымінальнага праследавання, заканадаўца адначасова дае ім

права на правядзенне некаторых працэсуальных дзеянняў, неабходных для своечасовага выяўлення і замацавання доказаў. Напр., у выпадку крадзяжу пацярпеўшы мае права "обыйск вчинити" ў доме западозранага, а апошні не можа супрацьдзейнічаць рэалізацыі гэтага прыватнага права асобы. Не прызнаюцца крымінальнымі і некаторыя выпадкі самаўпраўства: "грабёж" асобы, злоўленай пры парубцы чужога лесу (р.X, арт.5), або пры патраве (р.XII, арт.2) і г.д.

**Класіфікацыя і віды злачынстваў.** У першых пісаных заканадаўчых актах старажытнай Беларусі ўтрымліваліся толькі асобныя крымінальна–прававыя нормы, бо панавала яшчэ звычаёвае права. Аднак у вобласці злачынства і пакарання ўжо наглядаецца спроба згрупаваць злачынствы ў пэўнай паслядоўнасці. Статуты XYI ст. здзейснілі поўную кадыфікацыю заканадаўства дзяржавы. Трэба адзначыць, што класіфікацыя крымінальных дзеянняў, якая грунтавалася перш за ўсё на аб'екце злачыннага замаху, нават у Статуце 1588 г. яшчэ далёкая ад дасканаласці. Аднак мы бачым ужо дастаткова распрацаваную пэўную сістэму размяшчэння прававых нормаў. Так, самыя цяжкія, на думку заканадаўцы, дзяржаўныя злачынствы размешчаны ў асноўным у першым раздзеле ("О персоне нашой господарской"); злачынствы маёмасныя і супраць асобы сканцэнтраваны галоўным чынам у адзінаццатым раздзеле ("О гвалтех, о боех, о головщизнах шляхецких"); назва чатырнаццатага раздзела адпавядае яго зместу – "О злодействе всякого стану"; злачынствы супраць правасуддзя змешчаны ў чацвертым раздзеле ("О судьях и о судех"); воінскія злачынствы – у другім раздзеле ("О обороне земской") і г.д.

Адначасова мы бачым, што разам з аднароднымі злачынствамі сустракаюцца і такія, што ўключаны ў пэўны раздзел на падставе зусім выпадковых прыкмет. Акрамя таго, у раздзелах, дзе ў асноўным сканцэнтраваны крымінальна–прававыя нормы, сустракаюцца і канстытуцыйныя, грамадзянска–прававыя, працэсуальныя і іншыя нормы.

Прафесар І.А.Юхо адносна статутавага заканадаўства падзяляе злачынствы на: 1) дзяржаўныя; 2) супраць парадку кіра-

вання і правасуддзя; 3) воінскія; 4) супраць рэлігіі і царквы; 5) супраць маралі; 6) супраць жыцця, здароўя і гонару людзей; 7) маёмасныя злачынствы; 8) злачынствы слуг і феадальназалежных людзей супраць феадалаў. Акрамя таго, па спосабу ўзбуджэння спраў у судзе ён падзяляе іх на тры катэгорыі: 1) злачынствы, справы па якіх узбуджаліся прадстаўнікамі дзяржаўнай улады незалежна ад наяўнасці пацярпеўшага ці яго згоды; 2) злачынствы па справах прыватнага абвінавачання; 3) злачынствы па справах змяшанага абвінавачання, па якіх абвінаваўцамі выступалі як прадстаўнікі дзяржаўнай улады, так і прыватныя асобы.

Разам з класіфікацыяй злачынстваў па аб'екту пасягнення Статут 1588 г. дзеліць іх на "речи крававые, где о горле идеть" і на "речи меньшие, не крававые, где о горле не идеть", г.зн. класіфікуе іх па ступені цяжкасці (небяспечнасці). У законе адсутнічае азначэнне паняцця гэтых тэрмінаў, а таксама і поўны пералік іх, аднак у артыкулах удакладняецца: адразу за словамі "речи крававые" ідуць словы – "за што горлом караюць" або "где о горле идеть", і наадварот: пасля слоў "речи меньшие" ідуць словы – "где о горле не идеть". Адзін з артыкулаў Статута змяшчае прыкладны пералік "речей крававых": забойства, разбой, згвалтаванне, падпал, наезд, спалучаны з забойствам, пасля чаго заканадаўца гаворыць: "и иншие речи крававые, то ест за што горлом караюць" (р.XIY, арт.35). Усё гэта дае падставы меркаваць, што прыведзеныя паняцці адпавядаюць сучаснаму азначэнню цяжкіх і менш цяжкіх злачынстваў.

**Пакаранне і яго мэты.** Інстытут пакарання ў сваім гістарычным развіцці прайшоў некалькі стадый. Спачатку сам пакрыўджаны з дапамогай свайго роду помсціў крыўдзіцелю. Пазней само грамадства пачало кантраляваць гэтыя працэсы і паступова ўстанаўлівала абавязковасць пакаранняў за канкрэтныя праступкі. У больш познія часы дзяржава бярэ на сябе місію пакарання, хаця прызначаецца яно галоўным чынам у інтарэсах пацярпеўшага. Аднак паступова каральная дзейнасць падпарадкоўваецца ідэі грамадскай карысці і інтарэсы пацярпеўшага выціскаюцца інтарэсамі дзяржавы.

На фарміраванне інстытута пакарання ў Беларусі вялікі ўплыў зрабіла хрысціянская рэлігія і царква – як праваслаўная (усходняя), так і каталіцкая (заходняя). А асабліва гэта знайшло адлюстраванне ў статутавым заканадаўстве. У прадмове да Статута 1588 г., якая складалася з маніфесту караля Жыгімонта і двух прамоў Льва Сапегі, якія ён зрабіў перад каралём і сеймам у час прадстаўлення друкаванага экзэмпляра Статута, вызначаныя асноўныя палажэнні тэорыі крымінальнага права таго часу. У прадмове гаворыцца, што парушэнне закону – гэта не толькі парушэнне чалавечай волі, але і волі Божай. Злачынствам "пан Бог бывает оображон", таму пакаранне неабходна для збавення ад грахоў. Пакараннем забяспечваецца ахова "святой правды и справедливости". Яно неабходнае таксама для падтрымання грамадскага спакою і ўмацавання агульнай свабоды. Пры адсутнасці пакарання не было б і фактару, які б стрымліваў "злых" людзей ад злачынных дзеянняў, а ў грамадстве панавала б самавольства моцнага, што непазбежна прывяло б да пагібелі дзяржавы. У артыкулах Статута падкрэсліваецца, што пакаранне павінна напаткаць злачынца менавіта дзеля "покою посполитого", "абы небезпечность не множилась", "абы злость ся в паньствах наших християнских не множилась" (р.I, арт.25; р.IY, арт.32, 62, 105; р.XI, арт.14; р.XIY, арт.29 і інш.).

У сувязі з тым, што пакаранне злачынцаў адпавядае прынцыпу святой справядлівасці і з'яўляецца гарантам грамадскай бяспекі, забеспячэнне яго прымянення -- абавязак дзяржавы. Аднак з пункту гледжання пацярпеўшага пакаранне выступае і задавальненнем "кривды". Заканадаўца выказаў гэта ў класічнай фармулёўцы: "нихто ни от кого в невинности своей терпеть не повинен".

У Статуце не заўсёды можна вылучыць поўныя і лагічна паслядоўныя прававыя прынцыпы, бо ў ім змешаныя погляды розных эпох, аднак ужо даволі выразна акрэслена сістэма публічных пакаранняў, якія імкнуцца выціснуць тую форму пакаранняў, што панавала ў папярэдні перыяд часу.

Заканадаўца выкарыстоўвае розныя тэрміны для абазна-

чэння пакарання ("каранье", "вина", "скаранье", "покута", "казнь"), якія адлюстроўваюць тыя ці іншыя характэрныя рысы дадзенага інстытута. Так, "вина" абазначала ў большасці маёмасныя пакаранні і турэмнае зняволенне, "покута" цялесныя і ганебныя пакаранні. Пакаранне выступае карай за злы ўчынак, мерай дзяржаўнага прымусу, а часам сродкам помсты і запалохвання. Яно праяўляецца ў прычыненні фізічных і маральных пакут, матэрыяльных страт, абмежаванні ў правах і інш. У многіх крымінальна-прававых нормах статутаў санкцыі падзяляюцца на тры часткі: спачатку вызначалася асабістае пакаранне парушальніку закону, затым акрэсліваўся род і памер грашовых штрафаў і нарэшце ўказвалася на неабходнасць кампенсацыі шкоды і панесеных страт ("маеть шкоду платити ", "нагородити", "справити", "оправовати",).

Калі ў старажытнасці пакаранне насіла рысы прыватнага задавальнення пацярпеўшага і з'яўлялася, па сутнасці, заменай помсты першабытнага чалавека, то з развіццём дзяржавы яно пранікаецца задачамі публічнай адплаты і аховы грамадсва ад шкодных і злых дзеянняў. У сувязі з гэтым галоўнымі мэтамі пакарання становяцца адплата ў адносінах да злачынца і застрашванне ў адносінах да патэнцыяльных злачынцаў. Найбольш выразна гэта ўпершыню праявілася ў Судзебніку 1468 г., дзе гаварылася аб забароне вызваляць злачынца ад пакарання. У статутавым заканадаўстве Г.В.Дземчанка выдзяляе галоўныя мэты пакарання і другарадныя. Да ліку галоўных адносяцца: задавальненне пацярпеўшага і загладжванне прычыненай шкоды; запалохванне; папярэджванне злачынстваў; адплата за здзейсненае злачынства.

Задавальненне пацярпеўшага дасягалася не толькі выплатай штрафу, але часткова і прымяненнем іншых, напр., асабістых пакаранняў. Часам задавальненне дасягалася шляхам прызнання вінаватым сваёй памылкі і просьбы аб прабачэнні. У сувязі з гэтым у некаторых выпадках вінаваты павінен быў публічна прасіць прабачэння. У судовай практыцы феадальнай Беларусі такія выпадкі былі нярэдкімі і часам суправаджаліся цікавай працэдурай. Так, за абразу гонару суддзяў

Галоўнага Літоўскага Трыбунала асуджаны павінен быў залезці пад судовую лаўку і адтуль заявіць: "я солгал яко пёс" і гаўкнуць тры разы па–сабачаму.

У другой палове XYI ст. уяўленне аб строгасці крымінальнага закону становіцца неаддзельным ад самога паняцця закону: у артыкулах Статута ў судовых пастановах пастаянна гаворыцца аб "строкгости посполитого права". Закон накіроўваецца на тое, каб застрашыць злачынца і іншых асоб, таму фізічныя і маральныя меры пакарання здзяйсняюцца публічна, часцей у месцах, дзе прысутнічала вялікая колькасць людзей (на кірмашах, у гандлёвых месцах і інш.).

Аднак заканадаўца ў гэты час ужо добра ўсведамляе, што адной з галоўных мэт пакарання з'яўляецца папярэджванне злачынстваў, і таму прававыя нормы павінны паказваць патэнцыяльным злачынцам, што ім нявыгадна парушаць закон, таму што будучае пакаранне пераважвае набыткі ад учыненага злачынства. Гэта думка заканадаўцы праходзіць праз усе статуты.

Злачынствы папярэджваюцца і немінучасцю пакарання. У крымінальных нормах і судовых пастановах мноства разоў сустракаюцца станоўчыя ўказанні на гэтую мэту пакарання, часцей за ўсё словамі: "забегаючи, ажебы злодейство и злость людская погамована была". Для папярэджвання злачынстваў заканадаўца імкнецца таксама ўстанавіць такую меру пакарання, якая б ліквідавала магчымасць здзяйснення новага злачынства. Напр., ілжэсведкі пазбаўляюцца права выступаць у судзе, злосных злачынцаў садзяць у турму і інш.

У гэты перыяд пакаранне яшчэ носіць характар і адплаты за злачынства. Старажытнейшае правіла "вока за вока, зуб за зуб" з'яўляецца прынцыпам, якім кіруецца заканадаўца. Пакаранне не толькі паражае адпаведны орган, якога пазбавіўся пацярпеўшы, але і здзяйсняецца такім жа чынам: "утял, урезал, выбил" (р.XI, арт.27).

Паколькі пакаранне грунтуецца на волі Бога і мае мэтай збавенне ад зробленага граху, то яно з'яўляецца і Божай карай. Злачынства – гэта зневажанне Бога, і каб ён злітаваўся, патрэбна пакараць злачынца, праліць яго кроў, падвергнуць

мукам і пакутам, якія ачышчаюць. Гэтай тэорыяй тлумачыцца практыкаваўшаяся ва ўсіх народаў на ранніх стадыях іх развіцця прынясенне ў ахвяру злачынцаў, а пазней жывёл як сімвалічнае ачышчэнне. У пэўнай ступені пакаранне ў Статутах захоўвае характар такога ачышчэння, бо яно з'яўляецца і "покутай" і часам выступае як дапаўненне да царкоўнай "покуты" – публічнага пакаяння.

Да ліку дадатковых мэтаў пакарання ў Статутах Г.В.Дземчанка адносіць: матэрыяльныя выгады дзяржавы, выпраўленне злачынцаў, заахвочванне да праследавання злачынцаў. Заканадаўца лічыў, што пакаранне павінна прыносіць і матэрыяльныя выгады дзяржаве. Шляхта на сеймах пераконвала караля, што ад крымінальных штрафаў "на потребу земскую большая сумма прибудет". Грашовыя спагнанні складалі важны артыкул прыбыткаў гаспадара, яго службовых асоб, а таксама іншых асоб, якія мелі судовыя паўнамоцтвы.

Ахова правапарадку і грамадскай бяспекі дасягалася рознымі спосабамі і каральнымі мерамі і ўсё гэта, на думку заканадаўцы, павінна было прывесці да перавыхавання, выпраўлення злачынца, сведчаннем чаго магло быць яго шчырае раскаянне.

**Віды пакаранняў.** Пры вызначэнні меры пакарання закон перш за ўсё ўлічваў саслоўнае становішча як злачынца, так і пацярпеўшага. Аналіз статутавага заканадаўства гаворыць аб пэўнай сістэме пакаранняў з падзелам відаў пакарання на асноўныя і дадатковыя. Да першай катэгорыі належалі, штрафы на карысць пацярпеўшага і дзяржавы, іншыя маёмасныя пакаранні, турэмнае зняволенне, пазбаўленне гонару і правоў, цялесныя пакаранні, смяротная кара. Да ліку дадатковых належалі "выволанье" (выгнанне за межы дзяржавы), пазбаўленне правоў, пакаянне.

Самымі пашыранымі ў перыяд феадалізму былі маёмасныя пакаранні, якія прымяняліся і ў якасці дадатковых. Штраф на карысць сваякоў забітага называўся галоўшчызнай (плата за галаву забітага). Памеры штрафу залежалі ад саслоўнага становішча забітага: за шляхціца – 100 коп грошай (капа 60 адзінак), за рамесніка, мешчаніна 30 коп грошай, за цяглага

селяніна 25 коп і г.д. За нанясенне пабояў і ран штраф быў меншы і называўся "навязка". Закон рэгламентаваў штрафы на карысць дзяржавы і судовых устаноў ("вина", "гвалт" і інш.). Сістэма штрафаў была разнастайнай і даволі складанай.

За шэраг злачынстваў у якасці асноўнай або дадатковай меры пакарання прадугледжвалася канфіскацыя маёмасці злачынца. Напр., такое пакаранне мела месца за ўхіленне шляхціца ад воінскай службы, няяўку на месца збору войска, самавольную адлучку з ваеннага лагера і інш. Канфіскоўваліся таксама і прадметы злачыннай дзейнасці.

Турэмнае зняволенне прымянялася ў старажытнасці ў якасьці часовага затрымання злачынца да суда, і турмамі станавіліся розныя прыгодныя для гэтай мэты памяшканні. Пазбаўленне волі як адзін з асноўных відаў пакарання пашыраецца ў Беларусі ў XYI ст. Нягледзячы на рэгламентаванне законам тэрмінаў зняволення (напр., тры, шэсць, дзевяць тыдняў, адзін год і шэсць тыдняў), на практыцы зняволенага часам трымалі ў турме да таго часу, пакуль ён не заплаціць штраф, кампенсуе страты ці не знойдзе сабе паручыцеля. Статут 1588 г. рэгламентаваў рэжым утрымання зняволеных і патрабаваў наяўнасці пры кожным гродскім судзе турмаў (р.IY, арт.31).

Цялесныя пакаранні, якія дастаткова шырока прымяняліся да людзей "простага стану", падзяляліся на балючыя (біцце дубцамі, палкамі, бізунамі) і членашкодніцкія (адсячэнне рукі, нагі, вуха і г.д.). Апошнія прымяняліся па прынцыпу "таліёна": вока за вока, зуб за зуб. Часам членашкодніцтва служыла папярэджваннем людзей аб тым, што перад імі былы злачынец. Напр., злодзеяў каралі адразаннем аднаго вуха, а зводніц і ўтрымальнікаў прытонаў – адразаннем носа, вушэй і вуснаў.

Да шляхты прымянялася такое пакаранне, як абвяшчэнне па–за законам і выгнанне за межы дзяржавы (баніцыя, вываланне). Такая мера пакарання прымянялася да абвінавачаных у цяжкіх злачынствах шляхціцаў, якія не з'явіліся ў суд па павестках, а таксама да тых, хто адмаўляўся выконваць рашэнні суда (р.IY, арт.30, 35, 96). Пры гэтым на "вечное выволанье" без права памілавання асуджаліся тыя, хто не

выконваў судовых пастаноў, або, атрымаўшы ахоўную грамату ("ліст жалезны") для пошукаў доказаў сваёй невінаватасці, не змог іх знайсці на працягу вызначанага тэрміну (як правіла, на працягу года і шасці тыдняў). Жонка "вечного выволанца" лічылася ўдавою, а дзеці сіротамі, што цягнула за сабой пэўныя грамадзянска-прававыя наступствы. Афармлялася "выволанье" спецыяльным вялікакняжацкім лістом ("лист выволаны"), у якім меліся звесткі аб асобе злачынца, сутнасці і акалічнасцях яго справы і змяшчалася забарона жыхарам дзяржавы даваць такой асобе прытулак. Яго забойства не цягнула за сабой пакаранне (р.XI, арт.4).

Акрамя выгнання за межы дзяржавы, Статут прадугледжваў высылку з гарадоў асоб, якія "без службы живучи, всякою работой не бавятся", а гуляюць у косці і п'янствуюць (так званыя гульцяі або люзныя). Закон патрабаваў два разы папярэдзіць гэтых людзей, а затым "дубцы бьючи вон з мест и местечок выганяти" (р.XII, арт.24).

У адносінах да шляхты закон прадугледжваў як дадатковую меру пакарання пазбаўленне гонару, што было звязана са стратай шляхецкіх "вольностей". Пазбаўляліся гонару вываланцы, асуджаныя да смяротнай кары і памілаваныя злачынцы, асобы, што ўхіляліся ад воінскага абавязку, а таксама тыя асобы, якія пабывалі ў руках ката. За ўсе дзяржаўныя злачынствы ў якасці дадатковай меры пакарання прадугледжвалася, што злачынец "почтивость тратитъ" (р.I, арт.3).

Закон рэгламентаваў і такі від пакарання, як вызваленне ад пасады, які прымяняўся ў якасці дадатковай меры за дзяржаўныя і воінскія злачынствы, а таксама за злачынствы супраць правасуддзя. Пазбаўленне пасады аўтаматычна цягнула за сабой страту шляхецкага гонару. Закон вельмі клапаціўся пра гонар і годнасць асоб шляхецкага саслоўя. За абразу шляхціца прадугледжвалася публічнае прынясенне прабачэння пацярпеўшаму ў судзе або іншым грамадскім месцы.

У Статуце гаварылася і аб такім асаблівым дадатковым пакаранні, як пакаянне Напр., за прычыненне цяжарнай жанчыне цялесных пашкоджанняў, у выніку якіх яна скінула мёртвы плод, злачынец павінен быў, акрамя турэмнага

зняволення і выплаты навязкі, дадаткова на працягу года чатыры разы стаяць па вялікіх святах на высокім месцы каля царкоўных дзвярэй і "грех свой перед людми входячими и выходячими явне вызнавати, а потом того обецовати с пилностью стеречыся и не допущати" (р.XI, арт.15).

Смяротная кара прадугледжвалася перш за ўсё за здзяйсненне дзяржаўных злачынстваў, а таксама за злачынствы супраць рэлігіі і царквы, правасуддзя, парадку кіравання, супраць жыцця і здароўя людзей і інш. Статут рэгламентаваў простую смяротную кару (павешанне, адсячэнне галавы) і кваліфікаваную (спаленне, чвартаванне і інш.). Пакаранню смерці праз павешанне падлягалі разбойнікі, злодзеі, якіх злавілі на гарачым учынку, злодзеі-рэцыдывісты і інш. За падробку вялікакняжацкіх грамат і пячатак прадугледжвалася спаленне на кастры. Кваліфікаванай смяротнай карай, як правіла, каралася большасць дзяржаўных злачынстваў. Пакутлівым і ганебным спосабам каралася забойства дзецьмі сваіх бацькоў (р.XI, арт.7).

Прымяненне смяротнай кары абмяжоўвалася рамкамі закону. Статут дакладна вызначаў, за якія канкрэтна злачынствы, у якім працэсуальным парадку суд мог прыгаварыць абвінавачанага да "каранья горлом". Нягледзячы на тое, што крымінальны закон перш за ўсё абараняў шляхту і замацоўваў адносна яе значна меншыя пакаранні за здзяйсненне злачынстваў у параўнанні з простымі людзьмі, у Статуце ўпершыню прадугледжвалася смяротная кара для шляхціца за забойства простага чалавека. Прымянялася яна пры ўмове затрымання злачынца на гарачым учынку або пры бясспрэчнасці віны, пацверджанай пераканаўчымі доказамі, інакш адказнасць шляхціца абмяжоўвалася выплатай галаўшчызны (р.XII, арт.1). Гэта норма выводзіла Статут у лік самых прагрэсіўных законаў свайго часу. Увогуле, як адзначаюць даследчыкі, нягледзячы на жорсткасць прадугледжаных законам пакаранняў, яны былі больш гуманнымі параўнальна з тымі, што існавалі на той перыяд часу ў іншых еўрапейскіх дзяржавах. Абвешчаныя ж Статутам прагрэсіўныя прававыя прынцыпы служылі прыкладам у законатворчасці іншых краін.

## §2. Крымінальнае заканадаўства пасля далучэння Беларусі да Расіі

Права феадальнай Беларусі XYI ст. аказала значны ўплыў на развіццё заканадаўства Польшчы і Расіі. Так, нормы Статута 1588 г. былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы Саборнага Улажэння 1649 г.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі карэнных змен у крымінальным праве першапачаткова не адбылося. Статут 1588 г. працягваў дзейнічаць. Па ўказанню Сената ў 1811 г. яго толькі пераклалі на рускую мову і выдалі ў Санкт–Пецярбургу на польскай і рускай мовах як дзеючы закон для Беларусі і Літвы. Паступовая перабудова судовай сістэмы, асабліва ліквідацыя ў Беларусі гродскіх і земскіх судоў, садзейнічала зменам у крымінальным праве. 15 чэрвеня 1840 г. канчаткова адмяняецца дзейнасць Статута 1588 г. і пачынаюць дзейнічаць крымінальныя нормы расійскага Зводу законаў 1832 г.

Звод законаў уступіў у сілу з 1 студзеня 1835 г. Нормы крымінальнага права былі змешчаны ў XY томе Зводу, а таксама часткова ў XI і XIY тамах.

З 1 мая 1846 г. увайшло ў дзеянне Улажэнне аб пакараннях крымінальных і папраўчых, прынятае ў 1845 г. Гэта быў сапраўдны крымінальны кодэкс Расійскай імперыі, які з пэўнымі зменамі (асабліва ў 1885 г.) дзейнічаў да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Улажэнне аб пакараннях мела больш за дзве тысячы артыкулаў (у рэдакцыі 1885 г. – 1711 артыкулаў), нормы вызначаліся казуістычнасцю, але заканадаўчая тэхніка была больш дасканалай у параўнанні з XY томам Зводу законаў.

Пакаранні дзяліліся на крымінальныя і папраўчыя. Да першых належалі смяротная кара, катарга, ссылка. Дадатковым да іх было пазбаўленне ўсіх правоў стану. Папраўчымі пакараннямі з'яўляліся (для прывілеяваных саслоўяў) ссылка, спалучаная з пазбаўленнем усіх саслоўных і службовых правоў. Для асоб, якія не былі вызвалены ад цялесных пакаранняў, замест ссылкі прызначаліся арыштанцкія работы на тэрмін ад аднаго да дзесяці гадоў з дадаткам: ад 50 да 100 удараў розгамі.

Акрамя асноўных пакаранняў ужываліся дадатковыя: царкоўнае пакаянне, канфіскацыя маёмасці, аддача пад нагляд паліцыі і інш.

У красавіку 1863 г. пачаўся марудны працэс адмовы ад цялесных пакаранняў. У жніўні 1864 г. цялесныя пакаранні былі адменены для царства Польскага.

У 1864 г. быў прыняты Статут (Устаў) аб пакараннях, якія накладаюцца міравымі суддзямі. Ён прадугледжваў злачынствы (праступкі), за ўчыненне якіх асоба каралася пазбаўленнем волі тэрмінам да двух гадоў. Статут меў больш дасканалую заканадаўчую тэхніку.

22 сакавіка 1903 г. адбылося зацвярджэнне Крымінальнага ўлажэння, якое павінна было паступова замяніць Улажэнне аб пакараннях крымінальных і папраўчых 1845 г. (у рэдакцыі 1885 г.).

Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. адпавядала заходнееўрапейскаму ўзроўню крымінальнага заканадаўства тых часоў і значнай ступені зрабіла ўплыў на стварэнне і развіццё савецкага крымінальнага права.

Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. істотна адрознівалася ад Улажэння аб пакараннях 1845 г., яно змяшчала 687 артыкулаў і мела больш дасканалую сістэму. Першая глава "Аб злачынных дзеяннях і пакараннях наогул" утрымлівала 72 артыкулы і складалася з васьмі "аддзяленняў" з наступнымі нормамі: аб паняцці злачынства, аб сістэме пакаранняў, аб класіфікацыі злачынных дзеянняў (1); аб дзеянні Улажэння ў прасторы (2); аб пакараннях (3); аб умовах стаўлення ў віну злачыннасці дзеяння (4); аб відах вінаватасці (5); аб змякчэнні пакарання і яго замене (6); аб акалічнасцях, якія ўзмацняюць адказнасць (7); аб абставінах, якія выключаюць адказнасць (8). Фактычна першая глава Крымінальнага ўлажэння была Агульнай часткай гэтага кодэкса.

Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. падзяляла злачынствы на тры асноўныя групы: 1) цяжкія злачынствы, за якія прадугледжваліся смяротнае пакаранне, катарга або ссылка на пасяленне; 2) злачынствы, за якія ў якасці меры пакарання прадугледжвалася зняволенне ў папраўчым доме, крэпасці або

турме; 3) праступкі, за якія вышэйшым пакараннем з'яўляўся арышт або грашовы штраф.

У адрозненне ад Улажэння аб пакараннях, якое гаварыла аб акалічнасцях, што выключаюць наяўнасць свядомасці, Крымінальнае ўлажэнне давала азначэнне стану бессвядомасці як стану, які выключае крымінальную адказнасць.

Малалецтва падзялялася на тры перыяды: 1) узрост безумоўнай адсутнасці свядомасці; 2) перыяд умоўнай наяўнасці свядомасці; 3) узрост змякчэння пакарання. Дзіця ва ўзросце да 10 гадоў прызнавалася ў стане безумоўнай адсутнасці свядомасці. Падлеткі ва ўзросце ад 10 да 17 гадоў караліся пры ўмове прызнання судом, што яны дзейнічалі з "разуменнем", аднак пакаранні для іх вызначаліся значна мякчэйшыя, чым для дарослых. Змякчалася пакаранне і для злачынцаў ва ўзросце ад 17 да 21 года, часцей за ўсё шляхам памяншэння тэрмінаў. Па Крымінальнаму ўлажэнню 1903 г. смяротнае пакаранне для іх замянялася бестэрміновай катаргай.

Неабходная абарона і крайняя неабходнасць адносна Крымінальнага ўлажэння былі магчымыя пры абароне ўсіх правоў, як сваіх, так і чужых. Крайняй неабходнасцю прызнаваўся і стан голаду, у сувязі з чым у выпадку крадзяжу для спатолення голаду дапускалася спасылка на крайнюю неабходнасць. Такім чынам, у параўнанні з Улажэннем аб пакараннях 1845 г. (у рэдакцыі 1885 г.) значна пашыраліся межы прымянення гэтых інстытутаў.

Адносна вінаватасці правапарушальніка закон разглядаў як выпадковыя вынікі, надыход якіх нельга было прадбачыць пры ўсёй уважлівасці да сваіх учынкаў, і такія дзеянні не караліся. У адрозненне ад Улажэння аб пакараннях, новы закон не распазнаваў намер раптоўны і загадзя абдуманы. Неасцярожная форма віны была добра распрацавана, Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. вызначала: "злачыннае дзеянне лічыцца неасцярожным не толькі, калі вінаваты яго не прадбачыў, хаця мог і павінен быў яго прадбачыць, але таксама калі ён хоць прадбачыў наступленне вынікаў, абумовіўшых злачыннасць гэтага дзеяння, але легкадумна меркаваў такія вынікі папярэдзіць".

Крымінальны закон бачыў небяспеку ва ўсіх стадыях злачыннай дзейнасці, акрамя выяўлення намеру. Падрыхтаванне да злачынства каралася толькі па найбольш цяжкіх злачынствах. Замах караўся менш строга, чым скончанае злачынства.

Сярод маёмасных пакаранняў асабліва пашыранымі былі канфіскацыя і штраф, прычым закон рэгламентаваў толькі спецыяльную канфіскацыю – адабранне прылад злачынства і рэчаў, набытых злачынным шляхам. Цяжкім пакараннем лічылася ссылка на катаржныя работы. З 1906 г. у сувязі з адменай адбыцця катаргі на востраве Сахалін у межах еўрапейскай часткі Расіі арганізоўваюцца катаржныя турмы.

Смяротная кара, як самы цяжкі від пакарання, прымянялася па абмежаванай колькасці артыкулаў, аднак у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. яна пачала шырока прымяняцца. У сувязі з гэтым у Расіі разгортваецца кампанія за адмену смяротнай кары, тым больш, што ў шэрагу краін Еўропы (Румыніі, Галандыі, Партугаліі, Італіі, Нарвегіі) яна ўжо была адменена.

У якасці дадатковага пакарання прадугледжваліся тры віды пазбаўлення правоў: а) пазбаўленне ўсіх правоў стану, г.зн. страта саслоўных правоў, тытулаў, чыноў, знакаў узнагарод, права паступаць на дзяржаўную або грамадскую службу, абмежаванне маёмасных і некаторых іншых правоў; б) пазбаўленне ўсіх асабістых правоў і прывілей, як асабістых, так і па стану набытых, што выяўлялася ў забароне паступаць на службу, запісвацца ў гільдыі, выступаць сведкам у грамадзянскім працэсе, быць трацейскім суддзёй, апекуном, павераным; в) пазбаўленне некаторых правоў і прывілей у залежнасці ад саслоўнай прыналежнасці асобы выяўлялася галоўным чынам у пазбаўленні выбарчых правоў у саслоўныя ўстановы.

Агульнай частцы Крымінальнага ўлажэння ўдалося пазбавіцца ад феадальна–казуістычнага характару большасці норм Улажэння аб пакараннях 1845 г.

Асаблівая частка Крымінальнага ўлажэння па ўзроўню заканадаўчай тэхнікі значна саступала Агульнай частцы. Яе недахопамі былі залішняя казуістычнасць крымінальна–прававых забарон, празмерная колькасць бланкетных дыс-

пазіцый, недасканаласць сістэматызацыі.

Лёс Крымінальнага ўлажэння 1903 г. быў складаны. Законам ад 7 чэрвеня 1904 г. былі ўведзены ў дзеянне главы "Аб бунце супраць Вярхоўнай улады і аб злачынных дзеяннях супраць Свяшчэнняй Асобы Імператара і Членаў імператарскага Дома", "Аб дзяржаўнай здрадзе", "Аб смуце". У 1906 г. была ўведзена ў дзеянне глава "Аб парушэнні засцерагаючых веру пастаноў". У адносінах да гэтых глаў падлягала прымяненню і Агульная частка Улажэння. У дзеянне былі ўведзены каля трыццаці артыкулаў з іншых глаў. Але ў поўным аб'ёме Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. у Расіі ўведзена не было.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. дзейнічала ў Польшчы, Літве, Латвіі, Эстоніі. А на тэрыторыі Заходняй Беларусі пастановай нямецкіх акупацыйных улад у 1915 г. Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. было ўведзена ў поўным аб'ёме, дзе і дзейнічала да моманту прыняцця польскага крымінальнага кодэкса 1932 г.

## §3. Крымінальнае права Беларускай ССР

Да 1 студзеня 1919 г. ў Беларусі, як складанай частцы РСФСР, дзейнічалі крымінальныя законы федэрацыі, палажэнні якіх з'явіліся падставай крымінальнага заканадаўства БССР.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адпаведна з выдадзеным 24 лістапада 1917 г. Дэкрэтам СНК РСФСР "Аб судзе" № 1 судам дазвалялася кіраваццa ў сваёй дзейнасці законамі звергнутых урадаў пастолькі, паколькі яны не скасаваныя і не супярэчаць рэвалюцыйнаму сумленню і рэвалюцыйнай правасвядомасці (арт.5). Фактычна дарэвалюцыйнае крымінальнае заканадаўства было адкінута.

У першых дэкрэтах савецкай улады ўводзілася крымінальная адказнасць за найбольш небяспечныя для новага ладу дзеянні: за псаванне канфіскаванай памешчыцкай маёмасці, спекуляцыю, хабарніцтва, дэзерцірства і інш. Паступова склалася сукупнасць несістэматызаваных норм Агульнай і Асаблівай частак крымінальнага права.

Пасля стварэння БССР судовыя і іншыя карныя ўстановы

па сваёй ініцыятыве кіраваліся крымінальна-прававымі актамі РСФСР. Мела значэнне тая акалічнасць, што з канца лютага 1919 г. і да ліпеня 1920 г. значная частка тэрыторыі БССР была акупіравана палякамі і заканадаўчая дзейнасць адыйшла на другі план. Прыкладам крымінальна-прававога акта Савета Абароны ССР Літвы і Беларусі была пастанова ад 9 чэрвеня 1919 г., якая прадугледжвала расстрэл за продаж спіртных напіткаў і адданне пад суд ваеннарэвалюцыйнага трыбунала за куплю гэтых напіткаў.

Крыніцамі крымінальнага права БССР у гэты час былі: 1) заканадаўчыя акты РСФСР (пастановы з'ездаў Саветаў, дэкрэты ВЦВК ці СНК, цыркуляры і пастановы НКЮ); 2) заканадаўчыя акты БССР (Канстытуцыя, пастановы з'езда Саветаў, пастановы ЦВК ці СНК, цыркуляры і пастановы НКЮ БССР); 3) рэвалюцыйная правасвядомасць. Роля апошняй была вельмі значнай. Суддзі часам самі вызначалі злачыннасць дзеяння, від і памер пакарання. Так, Мінскі рэвалюцыйны трыбунал за агітацыю супраць савецкай улады пазбавіў асуджанага волі на нявызначаны тэрмін: "да заканчэння грамадзянскай вайны".

12 снежня 1919 г. НКЮ РСФСР выдаў першы кадыфікаваны акт па крымінальнаму праву: Кіруючыя пачаткі па крымінальнаму праву РСФСР. Гэты акт з'яляўся правобразам Агульнай часткі будучага Крымінальнага кодэкса РСФСР. Ён меў восем раздзелаў: 1) аб крымінальным праве; 2) аб крымінальным правасуддзі; 3) аб злачынстве і пакаранні; 4) аб стадыях здзяйснення злачынства; 5) аб саўдзеле; 6) віды пакарання; 7) аб умоўным асуджэнні; 8) аб прасторы дзеяння крымінальнага права.

Судовая практыка БССР у адрозненне ад "Кіруючых пачаткаў" ведала не толькі ўмоўнае асуджэнне да пазбаўлення волі, але і ўмоўнае асуджэнне да прымусовых работ і нават да пакарання смерцю.

У 1921–1922 гг. заканадаўчыя органы БССР творча запазычвалі законы РСФСР, часта робячы папраўкі з улікам мясцовых умоў. 24 мая 1922 г. быў прыняты Крымінальны кодэкс РСФСР. Гэта быў першы савецкі крымінальны кодэкс, пабудаваны на прынцыпах сацыялістычнага права. IY Усе-

расійскі з'езд дзеячаў юстыцыі, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх савецкіх рэспублік, выказаў пажаданне, каб гэты КК быў адзіным для ўсёй савецкай тэрыторыі. Калі 1 чэрвеня 1922 г. КК РСФСР увайшоў у сілу, судовыя органы БССР сталі ім карыстацца без афіцыйнага ўказання. 24 чэрвеня 1922 г. III сесія ЦВК БССР прыняла пастанову "распаўсюдзіць дзеянне Крымінальнага кодэкса РСФСР на ўсю тэрыторыю Беларусі з 1 ліпеня 1922 г." З 1924 г. гэты кодэкс стаў афіцыйна называцца Крымінальны кодэкс Беларускай ССР.

КК 1922 г. меў адкрыта класавы характар. Арт.10 гэтага КК прадугледжваў магчымасць прымянення крымінальнага закону па аналогіі, што стварала небяспеку злоўжыванняў на практыцы.

Пасля стварэння ў 1922 г. Саюза ССР у адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1924 г. быў прыняты шэраг агульнасаюзных крымінальных законаў: Асноўныя пачаткі крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік 1924 г.; Палажэнне аб вонскіх злачынствах 1924 г. (з 1927 г. у новай рэдакцыі); Палажэнне аб злачынствах дзяржаўных (контррэвалюцыйных) і асабліва для Саюза ССР небяспечных злачынствах супраць парадку кіравання 1927 г.

На падставе гэтых законаў з 1926 па 1929 гады ў савецкіх саюзных рэспубліках былі прыняты новыя крымінальныя кодэксы. У прыватнасці, КК РСФСР у 1926 г., КК Украінскай ССР у 1927 г. Крымінальны кодэкс Беларускай ССР быў прыняты 23 верасня 1928 г. III сесіяй ЦВК БССР YIII склікання і ўведзены ў дзеянне з 15 лістапада 1928 г. (ЗЗ БССР. 1928. № 30. Арт.287).

КК БССР 1928 г. істотна адрозніваўся ад КК іншых саюзных рэспублік. Замест тэрміна "Агульная частка" нормы агульнай часткі аб'ядноўваліся пад назвай "Агульныя палажэнні". Увесь КК меў адзіную нумарацыю раздзелаў. Структура кодэкса была наступнай.

I. Агульныя палажэнні

II. Контррэвалюцыйныя злачынствы

III. Злачынствы супраць парадку дзяржаўнага кіравання

А. Злачынствы супраць парадку дзяржаўнага кіравання,

асабліва небяспечныя для Саюза ССР

В. Іншыя злачынствы супраць парадку дзяржаўнага кіравання

IY. Воінскія злачынствы

Y. Службовыя злачынствы

YI. Злачынствы супраць асобы

YII. Маёмасныя злачынствы

Звяртае на сябе ўвагу тое, што перавага аддаецца крымінальна–прававой ахове дзяржаўных інтарэсаў. Аб гэтым сведчыць не толькі структура КК, але і змест арт.1: "Крымінальны кодэкс Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі мае сваёй задачай судова–прававую ахову сацыялістычнай дзяржавы дыктатуры пралетарыяту ад грамадска небяспечных дзеянняў (злачынстваў) шляхам прымянення да правапарушальнікаў (злачынцаў) указаных у Кодэксе мер сацыяльнай аховы".

Артыкул 4 КК 1928 г. вызначае паняцце злачынства: "Грамадска небяспечным дзеяннем (злачынствам) прызнаецца ўсякае дзеянне або бяздзеянне, накіраваныя супраць асноў савецкага ладу або правапарадку, устаноўленых рабочасялянскай уладай на пераходны да камунізму перыяд". Гэтае азначэнне называе матэрыяльную прыкмету злачынства – грамадскую небяспечнасць дзеяння, але не ўказвае на крымінальную супрацьпраўнасць дзеяння. Тлумачыцца такі падыход зместам арт.6: "Калі злачынства не прадугледжана гэтым Кодэксам, то падставы і межы адказнасці, а таксама меры сацыяльнай аховы вызначаюцца судом на падставе тых артыкулаў Кодэкса, якія прадугледжваюць найбольш падобныя па роду і важнасці злачынствы (аналогія)". Адмова ад прынцыпу "няма злачынства без указання аб тым у законе" была агульнай для ўсіх КК саюзных рэспублік таго часу і стварала перадумовы для злоўжывання крымінальным законам.

У арт.5 КК БССР 1928 г. дадзена класіфікацыя злачынстваў: "Злачынствы падзяляюцца на дзве катэгорыі:

а) накіраваныя супраць асноў савецкага ладу і б) усе астатнія.

За злачынствы першай катэгорыі ў гэтым Кодэксе ўстанаўліваецца толькі ніжэйшая (мінімальная) мяжа, ніжэй

якой суд не можа назначыць меру сацыяльнай аховы. За злачынствы другой катэгорыі ў Кодэксе ўстанаўліваецца толькі вышэйшая (максімальная) мяжа".

КК БССР 1928 г. утрымліваў шэраг норм, аналагу якім не было ў КК іншых саюзных рэспублік. Адпаведна з арт.42 грамадскае ганьбаванне абавязкова аб'яўлялася ў друку. Больш строгая мера сацыяльнай аховы згодна з п."г" арт.49 вызначалася судом, калі злачынства ўчынена асобай, якая ўжо асуджалася за якое-небудзь злачынства, за выключэннем выпадкаў, калі дадзеная асоба прызнаецца несудзімай. Такім чынам, КК БССР пераважнае значэнне надаваў факту асуджэння, а не факту здзяйснення злачынства ў мінулым наогул. Як і КК іншых саюзных рэспублік, КК БССР разглядаў учыненне злачынства групай як акалічнасць, якая абцяжарвае адказнасць. Аднак пры вызначэнні групы ў Асаблівай частцы КК БССР указвалася колькасная прыкмета: учыненне злачынства "групай з трох асоб і больш".

Адрозніваўся КК БССР 1928 г. ад іншых кодэксаў і па колу дзеянняў, якія лічыліся злачынствамі. У КК БССР, напр., не было складаў злачынстваў, вядомых у КК РСФСР 1926 г.: давядзенне да самагубства (арт. 141), схіленне да самагубства або садзейнічанне яму (арт.141), здзяйсненне рэлігійных абрадаў у дзяржаўных або грамадскіх установах (арт.126), неаказанне дапамогі пры сутыкненні суднаў на моры (арт.176) і інш.

У КК БССР былі склады злачынстваў, якія не прадугледжваліся КК РСФСР 1926 г., напр., выдумка і распаўсюджванне ілжывых чутак або неправераных звестак, якія могуць выклікаць грамадскую паніку (арт. 104), непаведамленне належным установам аб небяспечным для жыцця становішчы іншай асобы, неаказанне ёй дапамогі (арт.230) і інш.

Пасля ўвядзення ў дзеянне КК 1928 г. і да прыняцця Канстытуцыі СССР 1936 г. у кодэкс уносіліся заснаваныя на агульнасаюзных законах шматлікія дапаўненні. Закон становіцца больш жорсткім.

Прыкладам таму з'яўляецца Закон СССР ад 7 жніўня 1932 г. "Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў

і калектывізацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці", адпаведна з якім раскраданне сацыялістычнай маёмасці нават пры змякчаючых акалічнасцях каралася пазбаўленнем волі не ніжэй дзесяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

29 чэрвеня 1934 г. у КК уведзены арт.633, адпаведна з ч.2 якога "паўналетнія члены сям'і здрадніка, якія сумесна з ім пражывалі або знаходзіліся на яго ўтрыманні да моманту ўчынення злачынства, падлягаюць пазбаўленню выбарчых правоў і ссылцы ў аддаленыя раёны Сібіры на пяць гадоў". Такім чынам, беспадстаўна пашыраліся межы крымінальнай адказнасці і парушаўся прынцып асабістай вінаватай адказнасці.

Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 7 красавіка 1935 г. за шэраг злачынстваў уведзена крымінальная адказнасць з дванаццацігадовага ўзросту, што знайшло адлюстраванне ў арт.14 КК.

Пачынаючы з другой паловы 30-ых гадоў праявілася тэндэнцыя да пашырэння паняцця злачыннага. Напр., уведзена крымінальная адказнасць у адносінах цяжарных жанчын, якія робяць сабе аборт; устаноўлена так званая судовая адказнасць за самавольны ўход з прадпрыемстваў і устаноў, за прагул без уважлівай прычыны, за самавольны праезд у таварных паяздах.

У кастрычніку 1937 г. максімальны тэрмін пазбаўлення волі бы павялічаны да 25 гадоў. У 1939 г. былі адменены артыкулы аб ўмоўна-датэрміновым вызваленні з месц зняволення.

Крымінальнае заканадаўства арыентавала судовую практыку на агульнае ўзмацненне рэпрэсій.

Канстытуцыя СССР 1936 г. прадугледжвала, што Крымінальны кодэкс павінен быць адзіным для ўсяго Саюза ССР. У сувязі з гэтым пасля 1936 г. практычна спынілася выданне новых крымінальна-прававых норм заканадаўчымі органамі саюзных рэспублік.

Значным крокам наперад у накірунку дэмакратызацыі крымінальнай палітыкі і крымінальнага заканадаўства з'явілася прыняцце Вярхоўным Саветам СССР 25 снежня 1958

г. Асноў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік (Ведомости Верховного Совета СССР. 1959. № 1. Ст.6). У прыватнасці, гэта адлюстравалася ў адмаўленні ад прымянення крымінальнага закону па аналогіі, у пераходзе савецкага крымінальнага права да прынцыпу "няма злачынства без указання аб тым у законе". У Асновах атрымаў развіццё прынцып гуманізму, прыкладам таму з'вілася зніжэнне максімальнага тэрміну пазбаўлення волі, павышэнне ўзросту, з якога пачынаецца крымінальная адказнасць, пашырэнне прымянення ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання і інш.

На падставе Асноў і Законаў СССР аб крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя злачынствы і аб крымінальнай адказнасці за воінскія злачынствы (усе ад 25 снежня 1958 г.) у саюзных рэспубліках з 1959 па 1961 гг. былі прыняты крымінальныя кодэксы.

КК БССР, прыняты 29 снежня 1960 г. і ўступіўшы ў дзеянне з 1 красавіка 1961 г., у значнай ступені абмяжоўваў вобласць крымінальна каральных паводзін. Па-першае, адменена крымінальная адказнасць за шэраг дзеянняў, якія лічыліся злачыннымі па КК 1928 г., напр.: пераплаўка дзяржаўнай разменнай металічнай манеты ў зліткі ... (арт.851), ухіленне ад устаноўленага законам персанальнага ўліку інжынераў, тэхнікаў, аграномаў і іншых спецыялістаў народнай гаспадаркі (арт.102), парушэнне ўстаноўленых правілаў аб правядзенні фатаграфічных, кінематаграфічных і іншых здымак (арт.1083), спагнанне кватэрнай платы вышэй устаноўленага органамі ўлады памеру з рабочых і служачых... (арт.142), дыскрэдытаванне ўлады (арт.212), прымушэнне жанчын да аборту (арт.2171), пакража электрычнай энергіі (арт.244), ліхвярства (арт.259).

Вобласць крымінальна каральных паводзін абмяжоўвалася, па-другое, і тым, што пэўныя дзеянні прызнаваліся злачынствам пры ўмове іх здзяйснення пасля прымянення да вінаватых мер грамадскага, дысцыплінарнага ці адміністрацыйнага ўздзеяння, напр., выраб і збыт самагону (арт.155), незаконнае паляванне (арт.163).

На жаль, КК 1960 г. утрымліваў і нормы, якія не адпавядалі

агульнапрызнаным міжнародным нормам аб правах і свабодах чалавека: парушэнне пашпартных правілаў (арт.194), сістэматычнае займанне бадзяжніцтвам або папрашайніцтвам (арт.204), прыватна–прадпрымальніцкая дзейнасць і камерцыйнае пасрэдніцтва (арт.150).

Істотна абмяжоўвала духоўную свабоду асобы норма аб адказнасці за антысавецкую агітацыю і прапаганду (арт.67). Маштабы рэпрэсій па гэтай норме СССР былі значнымі.

За працяглы перыяд дзеяння КК 1960 г. шматразова і грунтоўна мяняўся і дапаўняўся. Змест КК у другой палове 90–ых гадоў істотна адрозніваецца ад першапачатковага варыянту кодэкса.

Асабліва інтэнсіўныя змены адбыліся пасля абвяшчэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. 3 верасня 1991 г. КК БССР атрымаў назву КК Рэспублікі Беларусь. Пачалася падрыхтоўка праекта новага КК Рэспублікі Беларусь, канцэпцыя якога была распрацавана кафедрай крымінальнага права Белдзяржуніверсітэта. У сакавіку 1993 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ухваліў праект у першым чытанні. Большасць змяненняў і дапаўненняў у КК пасля гэтага запазычваліся з праекта і адпавядалі абранаму накірунку развіцця крымінальнага заканадаўства.

Сацыяльна–эканамічныя і палітычныя змены ў краіне адлюстраваліся і ў змесце крымінальнага заканадаўства. 15 чэрвеня 1993 г. Законам Рэспублікі Беларусь "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь" у КК уключаны нормы аб крымінальнай адказнасці за грамадска небяспечныя дзеянні ў сферы прадпрымальніцтва: незаконны выпуск (эмісія) каштоўных папер (арт. $84^1$), падлог праспекта эмісіі каштоўных папер (арт.$84^2$), ілжэпрадпрымальніцтва (арт.$150^1$), выманьванне крэдыту або датацый (арт.$150^2$), ілжывае банкруцтва ($150^3$), злоснае банкруцтва (арт.$150^4$), зрыў пакрыцця страт крэдытору (арт.$150^5$), устанаўленне і падтрыманне манапольных цэн (арт. $151^4$), нядобрасумленная канкурэнцыя (арт.$151^5$) і інш. Адначасова былі ўнесены змены ў артыкулы аб адказнасці за службовыя злачынствы. Такім чынам, крымінальнае закана-

даўства пачало адаптіравацца да рынкавых адносін у грамадстве, якія паступова пашыраліся і ўмацоўваліся.

Найбольш маштабныя змены ў змесце і структуры КК Беларусі адбыліся пасля прыняцця Закону Рэспублікі Беларусь ад 1 сакавіка 1994 г. "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь і некаторыя іншыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь" (Ведамасці Вярхонага Савета Рэспублікі Беларусь. 1994. № 12. Арт.176).

У арт.1 КК найпершай задачай крымінальнага заканадаўства вызначана абарона жыцця і здароўя чалавека, яго правоў і свабод. Артыкул 7 дае новае азначэнне злачынства, якое набліжана да навуковага разумення гэтай сацыяльна–прававой з'явы.

Адбыліся змены ў сістэме пакаранняў: заканадаўца адмовіўся ад ссылкі і высылкі, павялічыў магчымасці ўжывання штрафу, адмяніў пакаранне смерцю для жанчын.

У КК быў скасаваны раздзел 10 пад назвай "Злачынствы супраць асабістай уласнасці грамадзян", а назва раздзела 7 зменена: замест "Злачынствы супраць сацыялістычнай уласнасці" – "Злачынствы супраць уласнасці". Адпаведна была дадзена новая рэдакцыя артыкулаў гэтага раздзела. Тым самым КК быў узгоднены з арт.13 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая гарантуе роўную абарону і роўныя ўмовы для развіцця ўсіх форм уласнасці.

Іншы загаловак атрымаў раздзел 11: замест "Гаспадарчыя злачынствы" – "Злачынствы ў сферы прадпрымальніцтва і іншай гаспадарчай дзейнасці".

Іншы змест атрымалі шмат якія артыкулы Асаблівай часткі КК, напр., замест нормы "здрада радзіме" прадугледжаны два склады злачынства: здрада дзяржаве (арт.61) і змова з мэтай захопу дзяржаўнай улады (арт.$61^1$). Змянілася характарыстыка такіх злачынстваў, як тэрарыстычны акт і дыверсія, з КК выключаны арт.66 аб адказнасці за шкодніцтва.

У крымінальным заканадаўстве Беларусі ў першай палове 90–ых гадоў адбыліся змены, накіраваныя на пераадоленне ідэалагічнай прадузятасці і кансерватыўных падыходаў да крымінальнай палітыкі.

## *Літаратура:*

Данилович И.Н. Взгляд на литовское законодательство и Литовские Статуты // Юридические записки, издаваемые П.Редкиным. М., 1841; Демченко Г.В. Наказание по литовскому Статуту в трёх его редакциях. Киев, 1894; Довнар Т.И., Шелкопляс В.А. Уголовное право феодальной Беларуси (XY–XYI вв.). Минск, 1995; Малиновский И.А. Учение о преступлении по Литовскому Статуту. Киев, 1894; Статут Вялікага княства Літоскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989; Уголовное право БССР. Общая часть. Минск, 1978. Глава 19; Уголовное уложение // Собрание узаконений и распоряжений правительства. 16 апреля 1903 г. № 88, ст.416; Юхо І.А. Крыніцы беларуска–літоўскага права. Мінск, 1991.

Административная преюдиция, *адміністрацыйная прэюдыцыя*
Административное взыскание, *адміністрацыйнае спагнанне*
Административный надзор, *адміністрацыйны нагляд*
Альтернативный умысел, *альтэрнатыўны намер*
Амнистия, *амністыя*
Аналогия, *аналогія*
Арест, *арышт*
Аутентичное толкование, *аўтэнтычнае тлумачэнне*
Аффект, *афект*
Банда, *банда*
Бандитизм, *бандытызм*
Бездействие преступное, *бяздзейнасць злачынная*
"Ведомости национального собрания республики беларусь", *"Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь"*
Великое княжество Литовское, *Вялікае княства Літоўскае*
Верховный суд республики беларусь, *Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь*
Взяточничество, *хабарніцтва*
Виды наказания, *віды пакарання*
Вина, *віна*
Вменяемость, *наяўная свядомасць*
Внезапно возникший умысел, *раптоўна ўзнікшы намер*
Вовлечение несовершеннолетних в преступную деятельность, *уцягненне непаўналетніх у злачынную дзейнасць*
Военные преступники, *ваенныя злачынцы*
Воинская обязанность, *воінскі абавязак*
Воинские преступления, *воінскія злачынствы*
Воспитательно-трудовая колония, *выхаваўча-працоўная калонія*
Врачебная ошибка, *урачэбная памылка*
Врачебная тайна, *урачэбная тайна*
Врачевание незаконнае, *лячэнне незаконнае*
Выдача государственной и военной тайны, *выдаванне дзяржаўнай і ваеннай тайны*
Выдача преступников, *выдача злачынцаў*
Выманивание кредитов или дотаций, *выманьванне крэдытаў або датацый*
Вымогательство, *вымаганне*
Геноцид, *генацыд*
Головщина, *галоўшчына*
Государственная граница, *дзяржаўная граніца*
Государственная собственность, *дзяржаўная ўласнасць*
Государственная тайна, *дзяржаўная тайна*
Государственное имущество, *дзяржаўная маёмасць*
Государственные преступления, *дзяржаўныя злачынствы*
Грабёж, *грабёж*
Давность исполнения обвинительного приговора, *даўнасць выканання абвінаваўчага прыгавору*
Давность привлечения к уголовной ответственности, *даўнасць прыцягнення да крымінальнай адказнасці*
Дезертирство, *дэзерцірства*
Декрет, *дэкрэт*
Декриминализация, *дэкрыміналізацыя*
Депенализация, *дэпеналізацыя*

Деяние, *дзеянне*
Деятельное раскаяние, *дзейнае раскаянне*
Диверсия, *дыверсія*
Дипломатический иммунитет, *дыпламатычны імунітэт*
Дипломатическое представительство, *дыпламатычнае прадстаўніцтва*
Дискредитация власти, *дыскрэдытацыя ўлады*
Дискредитация деловой репутации конкурента, *дыскрэдытацыя дзелавой рэпутацыі канкурэнта*
Дискриминация, *дыскрымінацыя*
Диспозиция (простая, описательная, бланкетная, ссылочная), *дыспазіцыя (простая, апісальная, бланкетная, спасылачная)*
Дисциплинарный батальон, *дысцыплінарны батальён*
Дисциплинарный проступок, *дысцыплінарная правіннасць*
Длящееся преступление, *працяглае злачынства*
Добровольная народная дружина, *добраахвотная народная дружына*
Добровольный отказ от совершения преступления, *добраахвотная адмова ад учынення злачынства*
Доведение до самоубийства, *давядзенне да самагубства*
Должностное лицо, *службовая асоба*
Должностные преступления, *службовыя злачынствы*
Донос, *данос*
Дополнительные меры наказания, *дадатковыя меры пакарання*
Досрочное освобождение от наказания, *датэрміновае вызваленне ад пакарання*
Достоинство, *годнасць*
Душевная болезнь (психическое заболевание), *душэўная хвароба (псіхічная хвароба)*
Душевное волнение, *душэўнае хваляванне*
Заблуждение, *увядзенне ў зман*
Задержание, *затрыманне*
Задержание преступника, *затрыманне злачынца*
Закон об уголовной ответственности за государственные преступления, *Закон аб крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя злачынствы*
Законодательная власть, *заканадаўчая ўлада*
Законодательство, *заканадаўства*
Замена наказания, *замена пакарання*
Заражение болезнью СПИД, *заражэнне хваробай СНІД*
Заражение венерической болезнью, *заражэнне венерычнай хваробай*
Заранее необещанное укрывательство, *загадзя неабяцанае ўкрывальніцтва*
Заранее обдуманный умысел, *загадзя абдуманы намер*
Захват заложников, *захоп заложнікаў*
Захват транспортных средств, *захоп транспартных сродкаў*
Звания воинские, *званні вайсковыя*
Злостное банкротство, *злоснае банкруцтва*
Злостное уклонение от уплаты алиментов, *злоснае ўхіленне ад выплаты аліментаў*
Злоупотребление властью или служебным положением, *злоўжыванне ўладай або службовым становішчам*
Изготовление или сбыт наркотических и ядовитых веществ, *выраб або збыт наркатычных і ядавітых рэчываў*
Измена государству, *здрада дзяржаве*
Изнасилование, *згвалтаванне*
Имущественные преступления, *маёмасныя злачынствы*
Индивидуализация наказания, *індывідуалізацыя пакарання*
Инкриминирование, *інкрымінаванне*

Иностранные граждане, *замежныя грамадзяне*
Институт правовой, *інстытут прававы*
Исключительная мера наказания, *выключная мера пакарання*
Исполнение наказания, *выкананне пакарання*
Исполнение приказа, *выкананне загаду*
Исполнитель преступления, *выканаўца злачынства*
Исправительно-трудовая колония, *папраўча-працоўная калонія*
Исправительно-трудовое право, *папраўча-працоўнае права*
Исправительно-трудовое учреждение, *папраўча- працоўная ўстанова*
Исправительно-трудовой кодекс республики беларусь, *Папраўча-працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь*
Исправительно-трудовые колонии-поселения, *папраўча-працоўныя калоніі-паселішчы*
Исправительные работы без лишения свободы, *папраўчыя работы без пазбаўлення волі*
Испытательный срок, *выпрабавальны тэрмін*
Казуальное толкование, *казуальнае тлумачэнне*
Кара, *кара*
Квалификация, *кваліфікацыя*
Квалификация преступления, *кваліфікацыя злачынства*
Квалифицированное преступление, *кваліфікаванае злачынства*
Квалифицирующий признак, *кваліфікуючая прыкмета*
Клевета, *паклёп*
Клептомания, *клептаманія*
Кодекс, кодэкс коммерческий подкуп, *камерцыйны подкуп*
Комиссии по делам несовершеннолетних, *камісіі па справах непаналетніх*
Конвенция международная, *канвенцыя міжнародная*
Конституционные права, свободы и обязанности граждан, *канстытуцыйныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян*
Конституция, *канстытуцыя*
Конституция республики беларусь, *Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь*
Контрабанда, *кантрабанда*
Конфискация имущества, *канфіскацыя маёмасці*
Коррупция, *карупцыя*
Косвенный умысел, *ускосны намер*
Кража, *крадзёж*
Крайняя необходимость, *крайняя неабходнасць*
Криминализация, *крыміналізацыя*
Криминалистика, *крыміналістыка*
Криминология, *крыміналогія*
Крушение, *крушэнне*
Легкомыслие, *легкадумнасць*
Лжесвидетельство, *ілжэсведчанне*
Лжепредпринимательство, *ілжэпрадпрымальніцтва*
Лица без граждансва, *асобы без грамадзянства*
Лицо физическое, *асоба фізічная*
Лицо юридическое, *асоба юрыдычная*
Личность преступника, *асоба злачынца*
Лишение воинских и других званий, *пазбаўленне воінскіх і іншых званняў*
Лишение права занимать определенные должности, *пазбаўленне права займаць пэўныя пасады*
Лишение свободы, *пазбаўленне волі*
Логическое толкование, *лагічнае тлумачэнне*

Ложное банкротство, *ілжывае банкруцтва*
Малолетние, *малалетнія*
Массовые беспорядки, *масавыя беспарадкі*
Мафия, *мафія*
Мелкое хищение, *дробны крадзёж*
Мелкое хулиганство, *дробнае хуліганства*
Мера наказания, *мера пакарання*
Места лишения свободы, *месцы пазбаўлення волі*
Мнимая оборона, *уяўная абарона*
Множественность преступлений, *множнасць злачынстваў*
Мотив преступления, *матыў злачынства*
Мошенничество, *махлярства*
Наблюдательные комиссии, *назіральныя камісіі*
Надзор, *нагляд*
Назначение наказания, *назначэнне пакарання*
Наказание, *пакаранне*
Наказание телесное, *пакаранне цялеснае*
Наркомания, *наркаманія*
Наркотические средства, *наркатычныя сродкі*
Нарушение антимонопольного законодательства, *парушэнне антыманапольнага заканадаўства*
Нарушение правил охраны труда, *парушэнне правіл аховы працы*
Нарушение правил торговли, *парушэнне правіл гандлю*
Нарушение тайны переписки, *парушэнне тайны перапіскі*
Нарушение законодательства о труде, *парушэнне заканадаўства аб працы*
Насилие, *насілле*
Небрежное хранение огнестрельного оружия, *нядбайнае захоўванне агнястрэльнай зброі*
Небрежность, *нядбайнасць*
Невменяемость, *бессвядомасць*
Недонесение, *неданясенне*
Незаконная охота и рыбный промысел, *незаконнае паляванне і рыбны промысел*
Незаконное лишение свободы, *незаконнае пазбаўленне волі*
Незаконное задержание, *незаконнае затрыманне*
Незаконное врачевание, *незаконнае лячэнне*
Незаконное изготовление, сбыт и хранение спиртных напитков, *незаконны выраб, збыт і захоўванне спіртных напіткаў*
Незаконное ношение, хранение, приобретение или изготовление оружия, боеприпасов или взрывчатых веществ, *незаконнае нашэнне, захоўванне, набыццё або выраб зброі, боепрыпасаў ці выбуховых рэчываў*
Незаконный выпуск (эмиссия) ценных бумаг, *незаконны выпуск (эмісія) каштоўных папер*
Необходимая оборона, *неабходная абарона*
Неоказание помощи больному, *неаказанне дапамогі хвораму*
Неосторожность, *неасцярожнасць*
Неотвратимость ответственности, *непазбежнасць адказнасці*
Непреодолимая сила, *неадольная сіла*
Неприменение наказания, *неўжыванне пакарання*
Несовершеннолетние, *непаўналетнія*
Неудавшееся соучастие, *няўдалы саўдзел*
Обвиняемый, *абвінавачаны*
Обман покупателей и заказчиков, *падман (ашуканства) пакупнікоў і заказчыкаў*

Обман, *ашуканства, падман*
Обоснованный риск, *апраўданая рызыка*
Обратная сила уголовного закона, *адваротная сіла крымінальнага закону*
Общеопасный способ совершения преступления, *агульнанебяспечны спосаб учынення злачынства*
Общественная безопасность, *грамадская бяспека*
Общественная опасность, *грамадская небяспека*
Общественное воздействие, *грамадскае ўздзеянне*
Общественное порицание, *грамадскае ганьбаванне*
Общественный порядок, *грамадскі парадак*
Общий умысел, *агульны намер*
Оконченное преступление, *скончанае злачынства*
Опись имущества, *вопіс маёмасці*
Определенный (неопределенный) умысел, *вызначаны (нявызначаны) намер*
Опубликование закона, *апублікаванне закону*
Опьянение, *ап'яненне*
Организатор преступления, *арганізатар злачынства*
Организованная группа, *арганізаваная група*
Оружие, *зброя*
Освобождение досрочное, *вызваленне датэрміновае*
Освобождение от наказания, *вызваленне ад пакарання*
Освобождение от отбывания наказания, *вызваленне ад адбывання пакарання*
Освобождение от уголовной ответственности, *вызвалене ад крымінальнай адказнасці*
Оскорбление, *абраза, знявага*
Особо опасный рецидивист, *асабліва небяспечны рэцыдывіст*
Оставление в опасности, *пакіданне ў небяспецы*
Осуждение, *асуджэнне*
Осужденный, *асуджаны*
Ответственность административная, *адказнасць адміністрацыйная*
Ответственность несовершеннолетних, *адказнасць непаналетніх*
Отклонение действия, *адхіленне дзеяння*
Отсрочка исполнения наказания, *адтэрміноўка выканання пакарання*
Отсрочка исполнения приговора, *адтэрміноўка выканання прыгавору*
Отягчающие ответственность обстоятельства, *абцяжарваючыя адказнасць акалічнасці*
Охота незаконная, *паляванне незаконнае*
Ошибка фактическая, *памылка фактычная*
Ошибка юридическая, *памылка юрыдычная*
Передача дела в товарищеский суд, *перадача справы ў таварыскі суд*
Перерыв давности, *перапыненне даўнасці*
Персона грата, *персона грата*
Персона нон грата, *персона нон грата*
Побег, *уцёк*
Побои, *пабоі*
Повреждение имущества, *пашкоджанне маёмасці*
Повторность преступления, *паўторнасць злачынства*
Погашение судимости, *пагашэнне судзімасці*
Подделка документов, *падробка дакументаў*
Подлог, *падлог*
Подмен ребенка, *падмен дзіцяці*
Подстрекатель, *падбухторшчык*
Подстрекательство, *падбухторванне*

Показание заведомо ложное, *паказанне заведама ілжывае*
Покушение на преступление, *замах на злачынства*
Половые преступления, *палавыя злачынствы*
Помилование, *памілаванне*
Попустительство, *патуранне*
Последствия преступления, *вынікі злачынства*
Пособник преступления, *памагаты злачынства*
Пособничество, *дапамаганне*
Посягательство на жизнь, здоровье и достоинство работников милиции, народного дружинника, военнослужащего или иного лица, *пасяганне на жыццё, здароўе і годнасць работнікаў міліцыі, народнага дружынніка, ваеннаслужачага ці іншай асобы*
Потерпевший, *пацярпеўшы*
Потеря документов, содержащих государственную тайну, *страта дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўную тайну*
Похищение, *выкраданне*
Право собственности, *права ўласнасці*
Превышение власти или служебных полномочий, *перавышэнне ўлады ці службовых паўнамоцтваў*
Превышение пределов необходимой обороны, *перавышэнне межаў неабходнай абароны*
Представитель власти, *прадстаўнік улады*
Предупреждение преступлений, *папярэджанне злачынстваў*
Презумпция невиновности, *прэзумпцыя невінаватасці*
Преследование граждан за критику, *праследаванне грамадзян за крытыку*
Преступление, *злачынства*
Преступления против собственности, *злачынствы супраць уласнасці*
Преступления против жизни, здоровья, свободы и достоинства личности, *злачынствы супраць жыцця, здароўя, свабоды і гонару асобы*
Преступления против общественной безопасности, общественного порядка и здоровья населения, *злачынствы супраць грамадскай бяспекі, грамадскага парадку і здароўя насельніцтва*
Преступления против политических, трудовых, жилищных и иных прав граждан, *злачынствы супраць палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых правоў грамадзян*
Преступления против порядка управления, *злачынствы супраць парадку кіравання*
Преступления против правосудия, *злачынствы супраць правасуддзя*
Преступления тяжкие, *злачынствы цяжкія*
Преступная организация, *злачынная арганізацыя*
Преступник, *злачынец*
Преступность, *злачыннасць*
Приговор, *прыгавор*
Приготовление к преступлению, *падрыхтаванне да злачынства*
Прикосновенность к преступлению, *датычнасць да злачынства*
Принудительное лечение, *прымусовае лячэнне*
Принудительные меры воспитательного характера, *прымусовыя меры выхаваўчага характару*
Принудительные меры медицинского характера, *прымусовыя меры медыцынскага характару*
Принуждение к даче показаний, *прымушэнне да дачы паказанняў*
Приостановление давности, *прыпыненне данасці*
Присвоение или растрата, *прысваенне або растрата*
Причинная связь (в праве), *прычынная сувязь (у праве)*
Причины преступности, *прычыны злачыннасці*
Провокация, *правакацыя*

Продолжаемое преступление, *прадоўжанае злачынства*
Промысел преступный, *промысел злачынны*
Пропаганда войны, *прапаганда вайны*
Проституция, *прастытуцыя*
Проступок, *правіннасць*
Прямой умысел, *прамы намер*
Психическая болезнь, *псіхічная хвароба*
Пытка, *катаванне*
Разбой, *разбой*
Разглашение государственной и военной тайны, *разгалашэнне дзяржанай і ваеннай тайны*
Растрата, *растрата*
Расхищение, *раскраданне*
Рецидив преступлений, *рэцыдыў злачынстваў*
Рецидивист, *рэцыдывіст*
Самовольная отлучка, *самавольная адлучка*
Самогоновурение, *самагонаварэнне*
Санкция (абсолютно определенная, относительно определенная, альтернативная), *санкцыя (абсалютна вызначаная, адносна вызначаная, альтэрнатыная)*
Сводничество, *зводніцтва*
Симуляция, *сімуляцыя*
Систематическое толкование, *сістэматычнае тлумачэнне*
Сложная вина, *складаная віна*
Сложное преступление, *складанае злачынства*
Служебная тайна, *службовая тайна*
Случай (казус), *выпадак (казус)*
Смертная казнь, *смяротная кара (пакаранне смерцю)*
Смягчающие ответственность обстоятельства, *змякчаючыя адказнасць акалічнасці*
Смягчение наказания, *змякчэнне пакарання*
Снятие судимости, *зняцце судзімасці*
Собственность, *уласнасць*
Совершеннолетие, *паўналецце*
Совокупность преступлений (идеальная, реальная), *сукупнасць злачынстваў (ідэальная, рэальная)*
Совокупность приговоров, *сукупнасць прыгавораў*
Согласие потерпевшего, *згода пацярпеўшага*
Содержание притонов и сводничество, *утрыманне прытонаў і зводніцтва*
Соисполнитель, *савыканаўца*
Сопротивление представителю власти или представителю общественности, *супраціўленне прадстаніку лады ці прадстаніку грамадскасці*
Состав преступления, *склад злачынства*
Соучастие, *саўдзел*
Специальный субўект преступления, *спецыяльны суб'ект злачынства*
Срок давности, *тэрмін данасці*
Стадии умышленного преступления, *стадыі намыснага злачынства*
Судебная практика, *судовая практыка*
Судебное разбирательство, *судовы разбор*
Судимость, *судзімасць*
Тайна переписки, *тайна перапіскі*
Талион, *таліён*
Телесные повреждения, *цялесныя пашкоджанні*
Территория государственная, *тэрыторыя дзяржаная*

Терроризм, *тэрарызм*
Террористический акт, *тэрарыстычны акт*
Токсикомания, *таксікаманія*
Толкование закона, *тлумачэнне закону*
Тюремное заключение, *турэмнае зняволенне*
Тюрьма, *турма*
Убийство, *забойства*
Увечье, *калецтва*
Уголовная ответственность, *крымінальная адказнасць*
Уголовная политика, *крымінальная палітыка*
Уголовное дело, *крымінальная справа*
Уголовное право, *крымінальнае права*
Уголовно-исполнительное право, *крымінальна- выканаўчае права*
Уголовно-правовые отношения, *крымінальна-прававыя адносіны*
Уголовно-процессуальное право, *крымінальна- працэсуальнае права*
Уголовный закон, *крымінальны закон*
Уголовный кодекс, *крымінальны кодэкс*
Угроза, пагроза уклонение от воинской службы, *ухіленне ад вайсковай службы*
Уклонение от исправительных работ, *ухіленне ад папраўчых работ*
Укрывательство, *укрывальніцтва*
Умысел, *намер*
Уничтожение или повреждение имущества, *знішчэнне або пашкоджанне маёмасці*
Условное осуждение, *умоўнае асуджэнне*
Утрата документов, содержащих государственную тайну, *страта дакументаў, што змяшчаюць дзяржаўную тайну*
Фактическая ошибка, *фактычная памылка*
Фальшивомонетничество, *фальшываманецтва*
Формы соучастия, *формы саўдзелу*
Форс-мажор, *форс-мажор*
Халатность, *халатнасць*
Хищение, *раскраданне*
Хищение огнестрельного оружия, боеприпасов или взрывчатых веществ, *раскраданне агнястрэльнай зброі, баявых прыпасаў або выбуховых рэчываў*
Хранение, *хаванне*
Хулиганство, *хуліганства*
Цель преступления, *мэта злачынства*
Ценные бумаги, *каштоўныя паперы*
Частная собственность, *прыватная маёмасць*
Частное обвинение, *прыватнае абвінавачанне*
Частно-публичное обвинение, *прыватна-публічнае абвінавачанне*
Членовредительство, *членашкодніцтва*
Шантаж, *шантаж*
Шпионаж, *шпіянаж*
Штраф, *штраф*
Эксперт, *эксперт*
Экспертиза судебная, *экспертыза судовая*
Экстрадиция, *экстрадыцыя*
Эксцесс защиты, *эксцэс абароны*
Эксцесс исполнителя, *эксцэс выканаўцы*
Юридическая ошибка, *юрыдычная памылка*
Юрисдикция, *юрысдыкцыя*
Явка с повинной, *яўка з пакаяннем*

# ЗМЕСТ


Глава I.

## ПАНЯЦЦЕ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА

*§1. Прадмет, задачы, прынцыпы і сістэма крымінальнага права.....4*
*§2. Навука крымінальнага права.....15*

Глава 2.

## КРЫМІНАЛЬНЫ ЗАКОН

*§1. Паняцце крымінальнага закону.....20*
*§2. Структура крымінальнага закону.....21*
*§3. Дзеянне крымінальнага закону ў часе.....26*
*§4. Дзеянне крымінальнага закону ў прасторы.....29*
*§5. Тлумачэнне крымінальнага закону.....35*

Глава 3.

## ПАНЯЦЦЕ ЗЛАЧЫНСТВА

*§1. Паняцце і прыкметы злачынства.....40*
*§2.Адрозненне злачынства ад іншых правапарушэнняў.....45*
*§3. Класіфікацыя злачынстваў.....48*

Глава 4.

## СКЛАД ЗЛАЧЫНСТВА

*§1. Паняцце складу злачынства.....52*
*§2.Элементы і прыкметы складу злачынства.....57*
*§3. Віды складаў злачынства.....59*

Глава 5.

## АБ'ЕКТ ЗЛАЧЫНСТВА

*§1. Паняцце аб'екта злачынства.....65*
*§2. Віды аб'ектаў злачынства.....73*

Глава 6.

## АБ'ЕКТЫЎНЫ БОК ЗЛАЧЫНСТВА

*§1. Паняцце аб'ектыўнага боку злачынства.....79*
*§2. Грамадска небяспечнае дзеянне.....80*

*§3. Грамадска небяспечныя вынікі злачынства.....87*
*§4. Прычынная сувязь.....91*
*§5. Спосаб, месца, час і абставіны ўчынення злачынства.....95*

Глава 7.

## СУБ'ЕКТЫЎНЫ БОК ЗЛАЧЫНСТВА

*§1. Паняцце суб'ектыўнага боку злачынства.....98*
*§2. Паняцце віны.....100*
*§3. Наўмысная віна.....103*
*§4. Неасцярожная віна.....110*
*§5. Віна ў злачынствах з фармальным складам.....115*
*§6. Складаная віна.....116*
*§7. Матыў і мэта злачынства.....118*
*§8. Юрыдычная і фактычная памылкі.....121*

Глава 8.

## СУБ'ЕКТ ЗЛАЧЫНСТВА

*§1. Паняцце суб'екта злачынства.....129*
*§2. Наяўнасць свядомасці і стан бессвядомасці.....131*
*§3. Узрост, з якога настае крымінальная адказнасць.....134*
*§4. Спецыяльны суб'ект злачынства.....137*

Глава 9.

## АБСТАВІНЫ, ЯКІЯ ВЫКЛЮЧАЮЦЬ ЗЛАЧЫННАСЦЬ ДЗЕЯННЯ

*§1. Паняцце абставін, якія выключаюць злачыннасць дзеяння.....140*
*§2. Неабходная абарона.....141*
*§3. Затрыманне злачынца.....151*
*§4. Крайняя неабходнасць.....153*
*§5. Апраўданая прафесійная і гаспадарчая рызыка.....157*
*§6. Прычыненне шкоды пры выкананні загаду.....157*
*§7. Іншыя абставіны, якія выключаюць злачыннасць учынку.....158*

Глава 10.

## СТАДЫІ ЎЧЫНЕННЯ НАЎМЫСНАГА ЗЛАЧЫНСТВА

*§1. Паняцце стадый наўмыснага злачынства.....163*
*§2. Паняцце падрыхтавання да злачынства і замаху на злачынства.....168*
*§3. Паняцце скончанага злачынства і яго адрозненне ад скончанага замаху.....173*

*§4. Кваліфікацыя падрыхтавання і замаху, назначэнне пакарання за іх.....176*
*§5. Добраахвотная адмова ад учынення злачынства і дзейнае раскаянне.....180*

Глава 11.

## САЎДЗЕЛ У ЗЛАЧЫНСТВЕ

*§1. Паняцце саўдзелу.....187*
*§2. Віды саўдзельнікаў.....191*
*§3. Формы саўдзелу.....196*
*§4. Адказнасць саўдзельнікаў.....198*
*§5. Датычнасць да злачынства.....203*

Глава 12.

## МНОЖНАСЦЬ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

*§1. Множнасць злачынстваў і адзінкавае злачынства.....207*
*§2. Сукупнасць злачынстваў і яе віды.....211*
*§3. Рэцыдыў злачынстваў.....215*
*§4. Паўторнасць злачынстваў.....218*

Глава 13.

## КРЫМІНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

*§1. Паняцце і мэты крымінальнай адказнасці.....224*
*§2. Крымінальныя праваадносіны і рэалізацыя крымінальнай адказнасці.....230*
*§3. Пагашэнне і зняцце судзімасці.....235*

Глава 14.

## КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ

*§1. Крымінальнае права феадальнай Беларусі.....239*
*§2. Крымінальнае заканадаўства пасля далучэння Беларусі да Расіі.....263*
*§3. Крымінальнае права Беларускай ССР.....267*

## КАРОТКІ РУСКА–БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК КРЫМІНАЛЬНА–ПРАВАВЫХ ТЭРМІНАЎ

.....277

**Вучэбнае выданне**

Баркоў Аляксандр Уладзіміравіч
Грушоў Ігар Алегавіч
Доўнар Таіса Іванаўна
Дубавец Пётр Азаравіч
Кічыгіна Кацярына Васілеўна
Хоміч Уладзімір Міхайлавіч
Цімошанка Васіль Васілевіч
Цішкевіч Іван Станіслававіч
Шаўцоў Юрый Леанідавіч

# КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА БЕЛАРУСІ

## (закон, злачынства, адказнасць)

**Навучальны дапаможнік**

**Пад рэдакцыяй А.У.Баркова**

Рэдактар – Святаслаў Асіноўскі
Мастацкі рэдактар – Уладімір Якунін
Камп'ютэрны дызайн – Наталля Нішт

Падпісана да друку 20.06.97. Фармат 84×108 1/32. Гарнітура Times. Друк афсетны. Папера афсетная. Ум. – друк. арк. 19. Ул. – выд. арк. 18. Тыраж 2000. Зак.№ 1270.

Выдаведства "Завігар". Ліцэнзія ЛВ 892.
220000, Мінск, вул. Чкалава, 22–6. Т. 229–34–41.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
ў друкарні выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 79.

1.350 р.